**Генрых Далідовіч**

# Свой дом

*Раман*

Мінск
Мастацкая літаратура
1992

Рэдэнзенты кандыдат філалагічных навук Т. К. Грамадчанка,
кандыдат гістарычных навук М. С. Сташкевіч

Новый роман известного писателя Генриха Далидовича «Свой дом» завершает трилогию «Хозяин-камень». В центре авторского внимания — драматические события 1918 года, когда образовывалась белорусская государственность, зарождалась республика. Среди героев романа — известные имена: Зм. Жилунович, А. Червяков, А. Мясников, И. Сталин и другие.

Автор использует много новых архивных материалов, которые долгое время находились в спецхранах.

**Частка першая. БНР**

Некаторыя, безумоўна, як дзеці, думаюць: падпісаў дагавор, значыць, прадаўся д'яблу, пайшоў у пекла. Гэта проста смешна, калі ваенная гісторыя гаворыць ясней яснага, што падпісанне дагавора пры паражэнні ёсць сродак збірання сіл.

*Ленін*

Працi цячэння вады
Зможа толькі жывое паплыць...

*Максім Багдановіч*

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

### 1

Алесь Нямкевіч замест выбітых шыбін уставіў фанеру (хтосьці надоечы «абстраляў» вокны новай, савецкай, школы ледзяшовымі кавалкамі), ды ў пакой былой прыватнай гімназіі ўсё роўна дзьмуў лютаўскі ветравей, а на падаконніку збіраўся сыпкі, колеру пытляванай мукі, снег.

Бялюткая насыпка не раставала, большала з кожнаю хвілінаю: у будынку які ўжо дзень не было ні электрычнага святла, ні пячнога ацяплення — як казалі, услед за банкаўскімі, паштова-тэлеграфнымі службоўцамі засабатажнічала і старая адміністрацыя на некаторых заводах, фабрыках, на электрастанцыі, а таксама і ў забеспячэнскіх канторах, што давалі гораду вугаль, дровы, харч і фураж. Новыя ўлады аддавалі некага пад рэвалюцыйны трыбунал ці суд, некага ўгаворвалі альбо ўціхамірвалі, замянялі сваімі людзьмі і намагаліся навесці лад, але збоі былі кожны дзень.

Бязладдзе, як бачыў Алесь, пабольшала апошнім часам. І не толькі таму, што набірала моц зіма. Яно ўспыхнула, быццам нейкая эпідэмія, пасля таго, калі бальшавікі спачатку абазвалі Устаноўчы сход “учарашнім днём рэвалюцыі”, а ў ноч з 6 па 7 студзеня[1] разагналі яго, і з асаблівай злосцю — пазней, калі 28 студзеня кіраўнік савецкай дэлегацыі на перамовах з немцамі ў Брэсце Троцкі адмовіўся падпісваць мір, нечакана і, галоўнае, нібы не бачачы вялікай пагрозы, заявіў, што Савецкая дзяржава вайну спыняе, а сваю армію дэмабілізуе...

---

[1] 1918 года.

Спачатку мала хто паверыў у гэта. Але калі галоўкаверх Крыленка загадаў пакінуць пазіцыі і калі праз Мінск адзін за адным папаўзлі перапоўненыя воінствам эшалоны, усе ўбачылі на свае вочы: так, гэта — праўда.

Хвалявала, ліхаманіла Мінск і тое, што ўжо які час, з 12 студзеня, лічы, над бокам ішла крывапралітная сутычка з польскімі легіёнамі, з якімі, гаварылі, заадно асобныя часці Украінскай і Беларускай рад, а таксама якім нібы сімпатызуюць і немцы. Казалі, пасля таго калі пасланыя савецкім урадам польскія сацыялісты на чале з Уншліхтам не знайшлі адной мовы з Доўбар-Мусніцкім, савецкія войскі пайшлі ў наступленне і пацяснілі легіянераў — тыя гэтымі днямі, ходзяць чуткі, просяць помачы ў немцаў...

Алесь уздыхнуў і перавёў позірк з акна на клас: дзеці, хлопчыкі і дзяўчынкі, сядзелі за сталамі ў паліто, кажушках і шынялях, раз за разам хукалі на адубелыя пальцы і, мусіць, з нецярпеннем чакалі канца змены — былі ўжо ўрокі геаграфіі, рускай мовы, гісторыі арыфметыкі, а вось цяпер, як дазволілі ў Савеце, быў апошні пазакласны ўрок беларускай мовы.

Тутэйшыя, сыны і дочкі мінскіх рабочых, пакаёвак, дворнікаў і дробных служачых, як і дзеці бежанцаў з заходніх абласцей, добра гаварылі па-беларуску, іх толькі трэба было вучыць пісаць без памылак ды вучыць далей, а вось тым, хто жыў да вайны за межамі краю, было нялёгка. Але і гэтыя не пайшлі з урока, сядзелі разам з усімі і надзіва захоплена намагаліся спасцігнуць вельмі блізкую ім і ў той жа час даволі адметную мову.

«Калі не настройваць народ на народ, не бэсціць нечую культуру, дык во, бач, няма ніякіх эксцэсаў...— з любасцю пазіраючы на светлыя, цёмныя галоўкі дзяцей розных нацыянальнасцей, падумаў Алесь.— Вось інтэрнацыяналізм на справе!»

Павярнуўся і агрубелымі ад холаду пальцамі пачаў крэмзаць на дошцы дамашняе заданне гэтаму класу — дзеці моўчкі перапісвалі яго ў свае сшыткі, папяровыя лісткі, блакноты, на лістоўкі — ва ўсё, што яны і Алесь дасталі для вучобы.

Калі перапісвалі, ён усміхнуўся:

— Усё, сябры. Да пабачэння!

Дзеці — а ў гэтым класе былі падлеткі да дванаццаці гадоў — мігам падскочылі, пахапалі вушанкі, паперыны, загудзелі, і, радыя, як і ўсе навучэнцы ўсіх часоў, што можна вырвацца з класа, пабегаць, пагарэзаваць, а то і трапіць дома ў цяпло і да стала з ежаю, развіталіся і несліся з класа.

Калі выбег апошні навучэнец — самы нізкі, у даўжэзным шынялі — і забыўся зачыніць за сабою дзверы, вось цяпер Алесь дазволіў сабе паднесці да рота бледныя, ужо даволі маршчыністыя рукі і пахукаць на іх. Далоні крыху сагрэў, але вось цела з кожнаю хвілінаю калела ўсё больш і больш. Заадно вельмі хочацца есці. Падумаў: сагрэцца неўзабаве зможа ў гаспадынінай хаце, а вось надзеі на шчодрую яду амаль ніякай: вунь пайшоў ужо другі тыдзень лютага, а яшчэ не далі ні пайка, ні платы за студзень.

На добры толк, можа, варта было б кінуць-рынуць гэты беспрытульны Мінск, палітыку, блуканні у лавбірынце і ехаць у свае Янкавіны, дзе было б нялёгка, але дзе так не галеў бы. Ды і там Волька Супраневіч — тая, хто (апроч маці і сястры) найбольш утрымала ў ім павагу да жаночага роду, спадзяванне на сямейнае шчасце. Ён колькі ўжо разоў клікаў, каб ехала сюды, да брата Петруся (а гэта значыць — і да яго, Алеся), яна ж, адпісваючы лісты, зноў прызнавалася, што кахае, але ехаць у горад не асмельвалася ды шкадавала пакідаць бацьку пры сварлівых нявестках.

У гімназісцкім дворыку аж апякло, прабрала да касцей вячэрнім холадам. Здаецца, ніколі ў жыцці ён так не мёрз, як гэтай зімой.

Прахожых на гэтай, нядаўна Паліцэйскай, а цяпер ужо з новай назвай вуліцы амаль не было. Вунь толькі насустрач, угнуўшы галаву і схаваўшы твар ад ветру, шкрабецца адзінокі мужчына. Ага — Васілевіч.

Бачачы даўняга сябра (а таму цяпер яшчэ цяжэй, бо трэба карміць не толькі сябе, але і жонку ды дзяцей), Алесь аж зморшчыўся ад болю: што ні робіць Сямён, як ні выжыльваецца, але не лягчэй яму, а яшчэ наадварот — усё горш. І на душы цяжка, бо ёй трэба зноў раздвойвацца альбо нават і растройвацца.

Васілевіч ледзь не ўткнуўся ў яго — той, відаць, вельмі спяшаўся сюды з нейкай навіною з клуба рабочай моладзі (а пад гэты клуб новая ўлада рэквізавала палац Скуранога), дзе ён загадваў бібліятэкаю. Падняў галаву — і ў сутонні відаць было: узрушаны. Ён заўсёды быў эмацыянальны, лёгка ўзбуджальны і ранімы. А цяпер — зусім. Лічы, жыве пагалоскамі, якіх кожны дзень процьма. І ўсе, лічы, супраць бальшавікоў і такіх, як ён з Алесем,— «бальшавіцкіх прыхвасняў».

— Ты ідзеш дадому? — забыўшыся павітацца, запытаў Васілевіч.

— Іду хоць куды. Абы сагрэцца,— пажартаваў Алесь, сцягнуў пальчатку і падаў руку.

Васілевіч ткнуў сваю правую, але, мусіць, тут жа і забыўся, што вітаюцца, загаварыў, пра што думаў:

— Хадзем са мною. Да Ландара.

— Чаго? — здзівіўся Алесь.— Патрабаваць пайка і платы?

— Кліча, як кажа, на сур'ёзную размову.

Пайшлі. Па Захараўскай ужо.

Уцемнівалася. Без ліхтароў, без асветленых вітрын крам і лавак, без рэкламы і электрычнага святла ў вокнах змрачнеліся Архірэйскае падвор'е, Аляксандраўскі сквер, дамы навокал. Нідзе не было відаць ні вазоў, ні аўтамабіляў, ні багата апранутых людзей — з новым стрыманым, нават строгім ладам у Мінску знікала губернская пампезнасць і ўсталёўвалася нейкая незвычайная, нават аскетычная прастата, якую вунь цяпер (ужо на Петраградскай) увасабляе міліцэйскі патруль у шынялях і кажушках, з вінтоўкамі за плячыма.

Варта пільна агледзела іх (ці не буржуі імкнуцца на які-небудзь тэрарыстычны акт альбо на сваю тайную сходку?), але не зачапіла — душою адчула: не буржуі і не зламыснікі.

— Пад вечар са Скураным палаяўся...— ні з таго ні з сяго заспавядаўся Васілевіч.— І сёння не вытрымаў, прыпёр паглядзець, што робіцца ў яго палацы. Пабегаў, а пасля прыскочыў да мяне і давай лямантаваць: «новыя гаспадары» забрудзілі дом! Вунь зрываюць са сцен і кідаюць пад ногі старажытныя мастацкія карціны, на іх месца вывешваюць дэмагагічныя лозунгі і транспаранты, сякуць мэблю і паляць ёю ў печы, чытаюць касмапалітычныя лекцыі і даклады, заклікаюць адзін адпаго да сусветнай рэвалюцыі, выпускаюць свае прымітыўныя газеты, а калі прыспічыць, бегаюць мачыцца ў камін — у «буржуазны, мяшчанскі атрыбут...». Папікаў і мяне за «варварства», патрабаваў: не бурыце дом! Я хадзіў да старшага ў клубе, да Браніптэйна, спрабаваў угаварыць яго, каб шанавалі народнае дабро, мастацкія творы, але той мне нават злажыцца не даў: я, па-ягонаму, сапсаваны буржуазнай культурай, не разумею, што цяпер трэба ўсё старое разваліць і пачаць будаваць новае!.. Карацей, толькі з кулакамі ўратаваў бібліятэку: кнігі Гамера, Шэкспіра, Пушкіна, Талстога, Міцкевіча, Купалы і Коласа. І, ведаеш, не толькі гэты ачмурэлы альбо цынічны адукаваны старшы, але і іншыя, мінчукі ды выхадцы з вёсак, азвярэлі на культуру і літаратуру. Яны таксама хочуць стварыць новае, сваё, хоць некаторыя з іх амаль не ўмеюць чытаць і пісаць, вывучылі на памяць толькі некалькі марксісцкіх лозунгаў...

2

Ландар, з накінутым на плечы паліто, хукаючы ў складзеныя далоні, выйшаў ім насустрач з-за заваленага паперамі стала, над якім

вісела цьмяная газавая лямпа. Падаў аднаму і другому невялікую, але чэпкую руку, заадно пільна зазіраючы ў вочы. Нібы па позірку хацеў пазнаць іхні настрой, сімпатыю альбо непрыязь да яго.

— Халаднавата? — усміхнуўся, бачачы, што госці, нават пабыўшы крыху ў прыёмнай, не сагрэліся.— Але, на жаль, і тут не цяплей— паказаў рукой на досыць прасторны пакой з картай Расіі, са сталамі літараю «Т» і крэсламі абапал іх ды з партрэтам Карла Маркса. Шыбы ў вокнах, надта ніжнія, былі тоўстыя ад снежнай намаразі.

Сеў з краю бліжэйшага стала, накрытага чырвоным, выцертым локцямі на згібе і сям-там прапаленым цыгарэтамі сукном, узмахам рукі запрасіў іх таксама сесці.

— Ну, які дух у горадзе? — запытаў.— Абываталь нас кляне ці спачувае?

— І тое, і другое,— шчыра адказаў Васілевіч, сядаючы насупраць і паціраючы даўгаваты, з барадавачкай збоку нос, кончык якога зачырванеўся звыш меры.

— Цяжка, браткі-беларусы,— прамовіў Ландар, апусціў галаву, пагладзіў высокі лоб, а пасля і невялікія вусікі, напачатку вузкую, а на падбародку ў форме кліна ці то сіваватую, ці то аб'інелую ад холаду і пары бараду.— Мы нямала чаго ўжо дабіліся тут: зламалі стары і наладзілі новы апарат, разагналі альбо ўціхамірылі контррэвалюцыю, нацыяналізавалі многія заводы, фабрыкі, а на астатніх установілі рабочы кантроль, узялі пад свой назірк банкі, дзялеж харчавання, сочым за цэнамі, утаймоўваем спекулянтаў, адкрываем школы, рабочыя клубы і хаты-чытальні, але...

Адкінуўся, заплюшчыў выкатныя вочы і, не адплюшчваючы іх, дадаў:

— Вельмі ж цяжкая дасталася спадчына і вельмі ж неспрыяльны цяпер час!

— А па-другое, мітынгаваць, разбураць старое нашмат лягчэй, чым ладзіць новае і талковае?! — пажартаваў Васілевіч.

Ландар не адказаў. Пасядзеў моўчкі хвіліну і, не вытрываўшы холаду (а можа, і не толькі яго), падняўся і, здаецца, узбуджана захадзіў па кабінеце.

— Скажыце, калі ласка, шчыра: вы кантактуеце з вашым, беларускім, падполлем? — нечакана запытаў пра тое, пра што яны абодва зусім не чакалі.

— Не,— паспешна адказаў Васілевіч.— Мы стрымліваем дадзенае вам слова.

— На жаль...— уздыхнуў Ландар, паціраючы шыю.

Яны вырачылі вочы: што такое? Як усё гэта зразумець?

Ландар запыніўся каля карты ў паўзмроку і, не паварочваючыся, спакойна загаварыў далей:

— Пасля таго калі на пачатку студзеня ВЦВК рашыў ужыць суровыя меры супраць тых партый, што хочуць замахнуцца на дзяржаўную ўладу, у нас тут, як кажуць, развязаліся рукі. Мы маглі б вылавіць увесь падпольны Выканкам Савета ці, як вы называеце, Рады Усебеларускага кангрэса, аб'явіць яго контррэвалюцыйным і строга судзіць. Але мы не кінуліся з расправаю. Мы зняволілі толькі верхаводаў Цэнтральнай беларускай вайсковай рады і Лашковіча, якія, па нашых звестках, заключылі тайны саюз з Доўбар-Мусніцкім, прадалі яму і нашы, і вашы інтарэсы, рыхтавалі тут, у Мінску, узброенае паўстанне супраць нас. Астатніх вашых мы не зачапілі. Далі час паразважыць, адмовіцца ад сваіх экстрэмісцкіх задум і пачаць супрацоўнічаць з Савецкай уладаю.

Ландар на хвіліну замаўчаў, а пасля прадоўжыў:

— Вы ўсе, у тым ліку і сацыялісты, балюча перажываеце разгон вашага снежаньскага з'езда. Не толькі правы Баравік, але і левы Жылуновіч пратэставаў супраць нас на Трэцім Усерасійскім з'ездзе, абвінавачваў Мяснікова і мяне, Савецкую ўладу ва ўзурпатарстве, глухаце да нацыянальных пачуццяў беларускага народа. Але найлепшы лекар — час. Жылуновіч, Чарвякоў і іншыя петраградскія беларусы хутка перапакутавалі сваю крыўду, не адцураліся ад Савецкай улады. І яна адказала сваім жэстам. Як бачыце, СНК РСФСР спецыяльным дэкрэтам утварыў Беларускі нацыянальны камісарыят на чале з Чарвяковым, дае яму немалыя функцыі — гэта значыць цэнтр павышае ўвагу да вас, беларусаў. Я пакуль што не ведаю добра, у што выльецца гэтая ўвага, але бачу ясна: пра вас думае Ленін, вамі займаецца Сталін...

Ландар пацепнуў плячыма ад холаду, азірнуўся — яны слухалі ўважліва: і гэты ж Ландар дагэтуль не гаварыў з імі пра такое цярпліва. Убачыўшы іхнюю цікаўнасць, гаспадар пакоя вярнуўся з паўзмроку да асветленага стала, спыніўся насупраць і паклаў азяблыя рукі на спінку высокага крэсла.

— Мы знаем: вы, таварышы Васілевіч і Нямкевіч, лаяльныя да нас,— сказаў, пільна пазіраючы ім абодвум у вочы.— Але вось іншыя вашыя — не... Хутка падышоў да свайго стала, узяў лісток, падаў ім, а сам вярнуўся на ранейшае месца.— Вось доказ, што той-сёй пайшоў у падполле і рыхтуе нам удар у спіну...

Сямён і Алесь пачалі чытаць папісанае на рускай мове:

«Постановление Совета Съезда.

Обсудив вопрос о положении 1-го Всебелорусского Съезда и Совета Съезда, Совет на закрытом своем заседании 18-го декабря 1917 года постановил: 1) Считать 1-й Всебелорусский Съезд насильственно разогнанным. 2) Совет Съезда признать исполнительным органом Съезда, на обязанности которого лежит проведение в жизнь всех решений и постановлений Съезда. 3) Пополнить Совет Съезда делегатами от землячеств и других групп, делегировавших своих представителей со Съезда в Совет и предоставить право отвода, отзыва и кооптации. 4) Областной Комитет при Всероссийском Совете Крестьянских Депутатов, Московская исполнительная комиссия, Великая Белорусская Рада, Временное краевое бюро и т. п. организации немедленно прекращают свое существование и передают все свои дела и принадлежащее имущество в распоряжение Совета. 5) Центральная Войсковая Рада существует как подчиненный орган Совету Съезда. 6) 2-й Всебелорусский Съезд созывается в самый кратчайший срок. 7) В целях увеличения авторитетности Совета и преемственности работ президиумом Совета должен быть президиум Совета, пополненный одним товарищем председателем и двумя секретарями».

І Васілевіч, і Нямкевіч аж застылі ад узрушэння: сапраўды Баравік і іншыя ўжо змагаюцца супраць Саўнаркома Заходняй вобласці.

— Пераканаліся, як той-сёй стрымлівае сваё слова? — запытаў Ландар.

Яны змаўчалі. Не маглі нічога сказаць.

— Сітуацыя, таварышы, цяпер паганая. Адбылася павальная дэмабілізацыя старой рускай арміі. Цяпер на Заходнім фронце засталося ўсяго каля 250 тысяч жывой сілы, з іх страявых — 70 тысяч. Многія пазіцыі зусім аголеныя. Значыць, шлях немцам на Мінск, Смаленск, Маскву і Петраград, лічы, адкрыты...

— Дык што думаў Троцкі, зрываючы мір і заяўляючы пра дэмабілізацыю рускай арміі? — не выцерпеў, усклікнуў Васілевіч.

— Як вы можаце здагадацца, у нас, на вялікі жаль, наконт міру ці вайны з немцамі няма адной думкі,— апусціў вочы Ландар.— Што датычыць мяне, то я — не прыхільнік міру з імі... Але...— Уздыхнуў.— Цяпер мы ўсе чакаем экстраннага Сёмага з'езда РСДРП (б), услед за ім — Надзвычайнага чацвёртага Усерасійскага з'езда Саветаў, дзе пойдзе размова пра гэтую сітуацыю. Па-другое, ёсць ужо дэкрэт, каб утварыць нашу, Чырвоную Армію. Адпаведна, трэба як мага хутчэй...

— Пачакайце,— запаліўся Васілевіч.— Як я зразумеў з вашага намёку, немцы могуць не чакаць, пакуль вашы ў Петраградзе будуць палемізаваць, утвараць новую армію, а пачаць наступаць?

— Якраз так, дарагія браткі-беларусы,— пахмурна прамовіў Ландар.— Сёння яны перадалі: паслязаўтра, 18 лютага[2] у 12 гадзін, узновяць тут баявыя дзеянні...

Ландар замаўчаў. Пакутліва зацяліся і яны, моўчкі, але цяжка перажываючы гэтую не такую ўжо нечаспадзяваную, але вельмі непрыемную вестку, што грувасткім каменем прыціснула іх.

— Дык што — на днях мы можам апынуцца пад акупацыяй? — разгублена запытаў Васілевіч.

— Можаце...

— А вы? Саўнарком Заходняй вобласці?

— Мы,— не падымаючы галавы, панyла прамовіў Ландар,— рыхтуемся да эвакуацыі...

— А край? Мінск? Увесь люд?

— Сітуацыя такая, што вы, на жаль, мусіце трапіць у сферу кайзераўскага ўплыву...— развёў Ландар рукі.— Мы ўжо не зможам стрымаць агрэсара.

— Дык што ж гэта такое, Карл Іванавіч? — падхапіўся Васілевіч.— Сапраўды, як кажуць, нібы існуе нейкая змова Троцкага, а праз Троцкага і Савецкага ўрада з кайзерам?! Нібы наўмысна адчынены ўсе шлюзы немцам!

— Змовы няма, ёсць толькі амбітны ход Троцкага ды цяжкая для Савецкай улады сітуацыя...

— Хтосьці красамоўнічае, спрачаецца, гуляе, а нам — пад чужаземнае ярмо?

— Я думаю: усё гэта будзе часовае.

— Не ведаю, Карл Іванавіч. Але іншае знаю добра: усім гэтым вы не заваюеце новай сімпатыі. Наадварот, можаце шмат страціць з таго, чаго дабіліся.

— Я згодзен з вамі,— адказаў Ландар.— Але... Не мы з вамі самадумам рашылі так, не нам з вамі на сіле штосьці змяніць...

Замаўчаў на хвіліну, пасля рэзка перамяніў гамонку:

— Трэба, таварышы, даверліва пагаварыць. Пра дужа далікатныя рэчы,— Прамовіў, прыкусіў ніжнюю губу.— Значыць, вы пачулі ўжо: на днях мы пакінем Мінск і на днях тут ужо могуць быць немцы. Вашы, канечне, адразу выйдуць з падполля і паспрабуюць спажыць сітуацыю ў сваю карысць.

Ландар адышоў ад стала, ступіў раз-другі, а пасля рэзка павярнуўся.

---

[2] 1918 года. Тут і далей даты па новым стылі.

— Яны, канечне, хацелі б не выпусціць нас жывымі,— сказаў ён.— Ды толькі мала сілы счапіцца з намі. Яны вылезуць на паверхню, калі ў горад увойдуць немцы. Могуць сустрэць тых з абдымкамі, паплакаць і папрасіць задаволіць іхнія амбіцыі. Нямецкае камандаванне, ясна, паспрабуе іграць на вашых нацыянальных пачуццях, як іграе ўжо ў Вільні з літоўцамі. Як ведаеце, там яшчэ летась яно згадзілася ўтварыць Літоўскую дзяржаву. Але толькі пад кайзераўскай апекай. І літоўскія сепаратысты дзеля сваіх эгаістычных мэт згадзіліся, каб Германія анексіравала іхні «любімы родны кут...». Дарэчы, літоўцы ў сваю чаргу загульваюць з вашымі. Каб далучыць да сябе і вашы землі...

Усміхнуўся, пацёр падбародак. Запытаў:

— Адчуваеце, куды хілю?

— Не зусім,— адказаў Васілевіч, запыніўшыся каля Нямкевіча і паклаўшы рукі на спінку суседняга крэсла.

— Мы просім, каб вы вярнуліся да сваіх і здолелі трапіць у іхняе ядро...

— Чаго?

— Для разведкі і для падпольнай работы ў нашу карысць.

Яны абодва апусцілі галовы, замаўчалі. Што ні кажы, незвычайная просьба!

— Калі баіцеся сваіх альбо па перакананнях не можаце згадзіцца на такую адмысловую просьбу, дык бог вам бацька,— сказаў Ландар.— Тады я вам нічога не гаварыў, а вы нічога не чулі. А калі згодныя памагчы Савецкай уладзе, то я звяду вас з кім трэба, і вы ўжо сёння атрымаеце інструкцыю.

Васілевіч перавёў позірк на яго, Нямкевіча: што адкажам? Ён разгубіўся, пацікнуў плячыма.

— Паверце, таварышы, ні Доўбар-Мусніцкі, ні кайзер, ні суседзі-нацыяналісты вам не паспрыяюць,— пачаў ці то ўгаворваць, ці то тлумачыць Ландар.— Ім будуць замінаць іхнія асабістыя апетыты. Калі вам хто і паможа, дык гэта толькі вялікая Расія і справядлівая Савецкая ўлада. Толькі мы не збіраемся цешыць вашых паноў і іхніх прыхвасняў, мы хочам даць палёгку рабочым, салдатам, сялянам. І яны ўжо адчулі: толькі мы клапоцімся пра іх, і яны, вось убачыце, будуць супраць акупанта і яго хаўруснікаў, захочуць аднавіць тут іменна нашу ўладу з яе дэкрэтамі пра мір і зямлю. Дык што — здрада, ганьба памагчы нам і свайму народу?

— Мы не супраць,— прамовіў Васілевіч.— Але...

— Што — «але»? Прашу, гаварыце шчыра.

— Вы, бальшавікі, што працуеце ў Мінску, вельмі ж абыякавыя да нацыянальнага пытання. Нам з Алесем цяжка растлумачыць ваш гэты холад.

— Я ж казаў: у сталіцы спее новая думка наконт гэтага, у тым ліку і да беларускай справы.

— Мы будзем змагацца супраць акупанта і яго паслужлівых марыянетак,— сказаў Васілевіч.— Але і вам, Карл Іванавіч, а таксама Мяснікову. Калмановічу, Кнорыну і іншым, трэба ступіць крок-другі насустрач нам і нашым пачуццям ды інтарэсам...

— Есць! усміхнуўся Лапдар, падаў ім руку. Пасля хуценька падышоў да дзвярэй, адчыніў іх, паклікаў дзяжурнага і загадаў: — Правядзіце таварышаў у аддзел па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам.— А ім пажадаў на адыход: — Поспехаў, сябры!

3

Алесь вяртаўся на кватэру ўзрушаны.

Ён не мог апамятацца ад нечаканай размовы са старшынёй Мінскага Савета і з чалавекам з асобага аддзела, які ўзяў ад Васілевіча і яго распіску, што яны «будуць змагацца супраць ворагаў Савецкай улады», расказаў, што ім трэба рабіць, даў будучыя паролі, яўкі, назваў псеўданім іхняга старшага сувязніка.

Бач, думаў-разважаў Алесь, як яно ўсё паварочваецца! Па-першае, чакай немцаў, якіх ужо столькі стагоддзяў не было на гэтай шматпакутнай зямлі, а па-другое, вунь на якую дарогу трэба выходзіць! Вунь каму служыць! Таму, супраць каго многія мінскія знаёмыя і сябры — Скураны, Шуляк, Баравік, Еўзікаў, Лашковіч!

Набліжаючыся да гаспадынінай хаціны — а яе, дрэў, іншых дамоў, увогуле ўсёй вуліцы доўга не было відаць у цемнаце і ў завірусе,— ён з хваляваннем утледзеў: якраз у яго пакоі свеціцца жоўтым вочкам акно.

Калі неўзабаве зайшоў у хату, у свой прытулак, дык аж не паверыў сваім вачам. Яго чакалі госці. І не абы-якія. На канапцы, на якой ён спіць, сядзелі землякі: памужнелы за апошні час, яшчэ болей уцыганелы Пятрусь Супраневіч (ён цяпер памочнік начальніка мінскай міліцыі), а побач з ім — яго сястра, чарнавокая Волька.

Можа, ад таго, што разгублены Алесь запыніў надоўга позірк якраз на ёй (у спрытных валёначках, доўгай спадніцы, у расшпіленым новым, густа нацёртым чырвонай цэглай кажушку, у белай блузцы, што вабліва напіналася на высокіх грудзях), Волька пыхнула чырванню, таксама збянтэжылася.

— Прывячайце во, Алеська, нявесту,— усміхнулася гаспадыня, зусім ужо ацяжэлая ад хваробы цётка Паўліна. Яна, канечне ж, выпытала ўжо, хто і адкуль гэтая маладая пара, здагадалася, чаго завітала сюды Волька.

Алесь павітаўся, падаў руку — спачатку размякчэламу пры цяпле і ў шынялі Петрусю, а пасля напружанай і расчырванелай дзяўчыне. Яна злёгку пацiснула ў адказ, але не падняла на яго вачэй. Нават і пасля, калі ён распрануўся і прысеў насупраць, гэтаксама, мусіць, пыхнуў чырванцом, бо нечакана надта суха запалалі шчокі і кончыкі вушэй.

Толькі ўжо за вячэраю знікла ўсіхная скаванасць, і супакоеная, ужо не пыхкая і не трапятлівая Волька смялей затрымлівала на ім цёплыя позіркі, хараша свецячыся душэўнай радасцю, узрушанасцю ад сустрэчы. І пазней, калі ўлучылі момант застацца ў пакойчыку ўдваіх (Пятрусь выйшаў на кухню пакурыць, а цётка Паўліна падалася заварваць гарбату), яна са згодаю прытулілася, замерла ў доўгім слодычным пацалунку. Праўда, першая адхілілася, змусіла яго сесці крышку воддаль, толькі згадзілася, каб патрымаў яе руку ў сваёй.

— Якія янкавінскія навіны прывезла? — з ласкаю запытаў ён.

— А пра што табе найперш хочацца ведаць? — гулліва запытала ў адказ.

— Ты прыехала назусім ці толькі на дзень-другі?

— А гэта будзе відаць ад таго, як вы тут мяне прымеце...

— Праўда? — шчасліва ўсклікнуў ён, моцна сціснуў яе невялікую, але дужую, ведама, сялянскуіо, руку.— Ты можаш застацца?

Яна, чарнявая, з крышку прыплюснутым носам, ужо з тоненька разлітым па свежым твары чырванцом, напоўненая маладым здароўем, гарэзна, нават какетліва ўсміхнулася. Але нічога не прамовіла, толькі мацней пацiснула яго руку, а пасля паварушыла вялікім пальцам па яго далоні.

— Дзякую,— падняў і пацалаваў яе руку.— Ты — малайчына!

— Нісколечкі! — не згадзілася.— Я абы-якая. Сама за свет паляцела!

— Не, мілая. Ты — малайчына,— ён пагладзіў яе рукою сабе па шчацэ.— Ты прынесла мне сёння вялізную радасць. Мне цяпер вельмі хочацца жыць, працаваць, быць з табою, верыць у сваю мару і шчаслівую долю.— Дадаў шэптам:— Я кахаю цябе. Вельмі-вельмі. Чуеш?

Хітнула галавою, аблашчыла яго ўлюблёным позіркам. Але вызваліла руку, прыклала кончыкі пальцаў да скроняў і на хвіліну заплюшчыла вочы.

— Табе кепска? — занепакоіўся ён.

— Не,— прашаптала.— Мне якраз добра. Толькі вось галава закружылася... Давай пагаворым пра другое.

— Добра, мілая,— згадзіўся.— Раскажы, як жывы-здаровы нашы Янкавіны?

— У Янкавінах — вялікая радасць,— закладваючы за вушы непаслухмяныя пасмачкі валасоў, адказала Волька.— На тым тыдні сышла ад нас салдатня. Кажуць, ці то вайне канец, ці то нашы і без міру-згоды ідуць дадому. Услед за салдатамі спакавалі дабро і выбраліся Сяргеенкі, Лядзяш...

У яго міжволі заштуршкавала сэрца. Значыць, Кацярына, якую ён некалі так кахаў, выехала з вёскі і, можа, навек ужо згубіцца ад яго ў вялікім свеце.

— Добра,— аднак не пашкадаваў, а пацешыўся ён. Гэтым супакоіў маладое раўнівае Вольчына сэрца.

— Вярнуліся ўсе, хто быў у Амэрыцы,— пачала расказваць яна далей.— Наш Андрэй, Віпцук Драздовіч, Алесь — твой стрыечны брат. З арміі прыйшоў парапены пісар, Дзежка. Ну, а ў вас...— Зірнула з няёмкасцю.— Не ведаю, што і як казаць...

— Нелады?

— І вялікія,— уздыхнула.— Гіполь выпівае, б'е Ядзю, а Янак не ладзіць з Анелькаю. Адразу пасля каляд яна нават упрочкі сыходзіла, тыдзень з гакам не хацела вяртацца да вас. Але потым вашы і яе бацькі прывялі. Ды жыцця ў яе ўсё роўна няма.

— Янак сустракаецца з Зосяю? — ціха і скрушліва запытаў.

— Гуляюць...— сарамліва адказала.— Янак жа цяпер за старшыню валаснога камітэта, дык яна, бессаромная, бегае па вечарах да яго ў воласць...

— Я не хвалю яго, але і ганіць не магу....— задумліва прамовіў ён.

— Ведама ж, каб не разлучылі яго некалі з Зосяю, дык такога не было б...

— Разлучылі старыя законы, клопат пра зямлю,— сказаў ён. Пасля ўстрапянуўся, зноў узяў яе руку ў сваю.— А вось мы з табою не пазважаем ні на былыя завядзёнкі, ні на што-небудзь іншае — пажэнімся, і ўсё!

Яна, здаецца, не столькі ўзрадавалася, колькі напужалася — кіўнула галавохо на дзверы на кухню і прыклала пальчык да вуснаў: ціха ты!

Ён хацеў сказаць, што не трэба гэтак таіцца, але не паспеў. Вярнуліся гаспадыня і Пятрусь. З карзіначкай чорных сухароў і ёмістым жоўтым самаварам. Калі папілі гарбаты, паслухалі гаспадыніны расказы пра яе вясковую маладосць, госці сабраліся адыходзіць.

— Заставайцеся, Волечка, у нас,— зусім нечакана запрасіла цётка Паўліна маладую госцю.— Куды вы пойдзеце? Прывыкайце ўжо да нашай хаціны. Будзьце Алесю жонкаю, а мне — памочніцаю.

Вольга, апранаючы кажушок, зноў, як і на пачатку сустрэчы з Алесем, молада заірдзелася. Пятрусь, каб не ўмешвацца ў сестрыны сардэчныя тайны, завінуўся апранугца і выйсці з пакоя.

— Жывіце, глядзіце адно аднаго, калі любасць маеце,— дадала гаспадыня.— Вайна ці не вайна, лад альбо рэзрух, але маладыя мусіць пра маладое думаць...

Алесю вельмі хацелася, каб засталася Волька, але ён ведаў: прасі ці не прасі — не застанецца. Цнатлівае вясковае выхаванне не дазволіць ёй увайсці і да любага без шлюбу.

— Петрусёў таварыш пяройдзе ў другі пакой, дык для мяне будзе ложак...— замітусілася, хуценька адказала Волька, страючыся не сустракацца з яго вачыма.

— Глядзі, дзіця маё, сама,— прамовіла на выгляд суровая, а на самай справе добрая цётка Паўліна.— Але помні, што я сказала.

Калі выйшлі на двор і ішлі да Петруся, які стаяў ужо за брамкаю і курыў, Волька ўсцешана падзялілася з Алесем радасцю:

— А гаспадыня твая — сардэчная кабета.

— І, галоўнае, яна добрую параду табе дала...— шэптам дадаў ён.

Волька злавіла яго руку і моцна сціснула: я твая, але ты не спяшайся!

Алесь змаўчаў, з вялікай радасцю адчуваў гэты аддавы поціск любімай дзяўчыны і пасля, калі ўтраіх ішлі ў віхуры па замеценай вулачцы — Пятрусь першы, за ім — Волька, за ёю — ён,— аж здзівіўся: ні мароз, ні вецер са снегам ужо не выстуджваюць цела і душу так, як выхаладжвалі яшчэ нядаўна. Можа, і таму, што ён за нейкую гадзіну-другую сагрэўся дзявочай пяшчотаю: бывае, часамі яна цяплейшая за ўсё на свеце.

4

— А, бальшавічкі! — з кпінаю сустрэў іх у пярэдняй Скураны. У шэра-сінім халаце, з-пад якога выглядалі кароткія і тоўстыя галёнкі ды лыткі, у тапачках, пахуднелы — нават, здаецца, з падцягнутым жыватом. Праўда, прыкметна пастарэлы.— Як вы толькі і асмеліліся зайсці сюды, да клятага буржуя!

Непрыхільна сустрэтыя Васілевіч і Нямкевіч чакалі, што гаспадар пакажа рукой на пляцоўку: прэч! Але не, зачыніў за ім дзверы, кіўнуў: заходзьце, распранайцеся.

Яны ўжо ведалі, што новая ўлада дала Скураному не вельмі вялікую кватэру — па пакоі на аднаго чалавека. Цяпер той павёў іх, мусіць, у свой кабінет — досыць прасторны, з канапаю і некалькімі крэсламі, без пісьмовага стала. У кутку на падлозе ляжалі горкаю кнігі — ці то тое-сёе з таго, што дазволілі ўзяць яму са свайго палаца, ці то цяпер купленае на рынку. Адзінае акно-дзверы было завешана таннаю фіранкаю.

— Бачыце, як жыве былы дзяржаўны мул?! Пралетарый!

— Выбачайце, дзядзька Рыгор,— спакойна адказаў Васілевіч,— але мы з Алесем усё яшчэ жывём на прыватных кватэрах.

— Значыць, слаба прыслужнічаеце,— паздзекаваўся Скураны, сядаючы на канапу.

Васілевіч апусціўся побач, Нямкевіч — насупраць, на працёртым крэсле са скуранымі чорнымі падлакотнікамі.

— Ну што, э-э, прывяло вас сюды? — прыплюшчыў калючыя вочкі, праз вузкія змяіністыя шчылінкі зірнуў на іх Скураны.

— Што цяпер рабіць, дзядзька Рыгор? — запытаў Васілевіч.

— Чаму — «цяпер»? — ажывіўся той.

— Кажуць, будуць наступаць немцы...

— А што ж вашы гаспадары? Не будуць абараняць нас, Расію?

— Савецкія ўстановы ў Мінску пакуюць ужо валізкі...

— Дык і вы бяжыце з бальшавічкамі! Імкніцеся да Леніна, да нашых землячкоў Чарвякова і Жылуновіча, якія трохі пастагналі ад нашага ўсіхнага болю, пашумелі дзеля прыліку і пайшлі ў лёкаі да Саветаў!

— Мы не хочам адступаць з бальшавікамі.

— А! — падскочыў Скураны, нервова і дробненька затупаў па пакоі.— Апякліся!

Васілевіч і Нямкевіч, быццам шкоднікі, паапускалі галовы.

— Так вам і трэба, даверлівыя авечкі! — гневаўся Скураны.— Жніце тое, што самі пасеялі! А якраз жа вы летась, улетку, настроілі ўсіх нашых супраць мяне, адабралі старшынёўства, якраз вы першыя тут пабеглі на паклон да бальшавікоў! — Развёў рукі.— Наце! Ешце! Любуйцеся двудушнікамі і гандлярамі!

Запыніўся, сеў на канапу.

— Ці, можа, я незаслужана абражаю дабрадзеяў? — ухмыльнуўся.— Што там такое, што яны гвалтоўна зрынулі законны Часовы ўрад, а нядаўна разагналі Устаноўчы сход, якога чакала ўся Расія?! Хіба так ужо важна, што сабраліся лепшыя расійскія розумы, каб паразважаць, вызначыць, што і як рабіць далей?! Не! Яны — самыя мудрыя, гуманныя і талковыя! А можа, э-э, спадары, я перабольшваю,

можа, не страшна, што забіраюць руль толькі ў свае рукі і змушаюць усіх астатніх скакаць над іхнюю дудку?!

Васілевіч і Нямкевіч зацята маўчалі, хоць іншым часам маглі б сказаць і тое-сёе насуперак, цярпліва чакалі даверу.

Скураны ж не заціхаў, бушаваў:

— Ці мо, э-э, я, стары дурань, не разумею: там, куды нас гоняць са штыкамі, будзе зямны рай? Так? — запытаў, зрабіў паўзу, а пасля ледзь не спапяліў іх гнеўным позіркам.— Тады патлумачце, калі ласка, што гэта за рай, заснаваны на крыві і слязах?

Васілевіч і Нямкевіч па-ранейшаму, як громаадводы, бралі на сябе гаспадарову гняўлівасць.

— Я, э-э, не штудзіраваў іхняга куміра Маркса, але адзін сталы эканаміст нядаўна сказаў мне: марксізм — пятая іудзейская рэлігія ці тэорыя,— далей выгаворваўся Скураны.— Спроба па-новаму (ужо не з хрысціянскіх, а з палітычных і эканамічных пазіцый)ператрэсці ўсё ў свеце, зляпіць такую мадэль, каб ёй спавіць свет, як немаўля. Сапраўды, што гэта і дзеля чаго: класавая барацьба, сацыяльная рэвалюцыя, дыктатура пралетарыяту, адмена прыватнай уласнасці, інтэрнацыяналізм і іншыя іхнія лозунгі? Ці не задумана тут найперш тое, каб нацкаваць гультая і няўмеку на дбайнага гаспадара, знішчыць яго, разбурыць нацыянальныя капіталы, дзяржавы, нацыі, культуры, сагнаць увесь людскі род у адзін абязлічаны статак, заняволіць катаржнай працаю ды кіраваць з бізуном і пернікам? І пасля, што гэта за запаведзь: «Весь мир насилья мы разрушим до основанья, а затем мы наш, мы новый мир построим...» Які гэта будзе новы свет на развалінах цывілізацыі?

— Мы не можам ні згаджацца, ні спрачацца з вамі, бо добра не ведаем усіх марксісцкіх канцэпцый,— прамовіў Васілевіч.

— А чаго тады, э-э, паспяшаліся ў наймітьі? — абурыўся Скураны.— Чаму так паверылі ў іхнюю гаварню? Чаму заплюшчваеце вочы на тое, што яны зляцеліся з усяго свету, камандуюць, нецярпімыя да іншамысных, глухія да нацыянальных пачуццяў малых народаў? Ці вы, э-э, спадзеіцёся: нікому дагэтуль не ўдалося стварыць рай на зямлі, а вось ім удасца?! Праз сацыялізм! І на нашых касцях! — Тыцнуў у Васілевіча пальцам,— Дурні, не спакушайцеся! Любыя, у тым ліку і самыя вабныя, а то і гуманныя, ідэі павінны асвечвацца справаю, дабром, красою, урэшце, шчасцем усіх людзей. Да аднаго чалавека! А пакуль што гэтага, паважаныя, не відно. Пакуль што і «новае, цудоўнае будучае» робіцца па старых законах кулачнага бою! Ды ўжо адно тое, што сярод бальшавікоў-лідэраў столькі яўрэяў — люду, які не мае сваёй радзімы, культуры і не цэніць, адпаведна,

гэтага ў іншых, шмат вярзе пра ўсеагульную любоў, але жыве дзеля свайго кашалька, ясна гаворыць пра тое, што іхні славуты сацыялізм будзе найперш дзеля іх, а не дзеля нас... Недарэмна, невыпадкова, паўтараю, яны хлынулі сюды нават з багатай і дэмакратычнай Амэрыкі... Хто з пустымі рукамі, а хто і з капіталам амерыканскіх сіяністаў...

— Ці варта так перабольшваць, дзядзька Рыгор? — асцярожна запярэчыў Васілевіч.— У кожным народзе ёсць розны люд...

— Хе-хе! — хмыкнуў, паматляў галавою Скураны.— Ці вы шмат чаго яшчэ не ведаеце, ці прыкідваецеся, што прасцячкі! У кожным народзе ёсць розны люд, але не ў кожнага народа ёсць такая тысячагадовая спайка, узаемапомач і такое служэнне сваім, дзеля сваёй ідэі! Не ўсе маюць такі спрыт прыкідвацца беднымі, прыгнечанымі, красамоўнічаць пра ўсеагульную любоў, але прыладкавацца і ўчэпіста даіць чужую дзяржаву, чужы люд найперш дзеля сябе... А мы... А! Ні спайкі, ні хітрасці, ні... Працавітасць ды ўгодлівасць — вось наш партрэт! А вы...

— Мы ж і прыйшлі да вас, старэйшага, каб параіцца, што рабіць цяпер...— прыкінуўся авечачкаю Васілевіч.

— Я магу з вамі таварышкавацъ толькі тады, калі вы цалкам парвіцё з узурпатарамі і дэспатамі! — рэзка, але ўжо і прымірэнча сказаў гаспадар.— А заадно і з нашымі выскачкамі...

— Кажу ж, дзядзька Рыгор, мы не хочам ісці з бальшавікамі, пакідаць край на глум і чужую волю...— прамовіў Васілевіч.

— Да слова, во пра гэты адыход,— ужо з ахвотаю падхапіў Васілевічаву думку, засмакаваў Скураны.— Вось і тут іхняя сутнасць, мараль не на словах, а на справе. Уладу-то яны выхапілі ад усіх, але вось утрымаць яе цяжка. То не ведаюць, што і як рабіць далей, грызуцца між сабою альбо прыкідваюцца, што не ладзяць, то не дае разгарнуцца апазіцыя. Дык яны, каб не пацярпець фіяска, пайшлі на хітры і каварны ход: пускаюць на Маскву і Петраград немцаў. Ідзіце, таварышы ворагі, хапайце-глытайце расійскую зямлю!

Скураны крыва ўсміхнуўся, трыумфаваў: чуеце, каму вы, паршыўцы, служыце?!

— Калі немец рушыць, пачне захопліваць расійскія вёскі і гарады, набліжацца да сталіц, то бальшавіцкія сябры і непрыяцелі, усе расійцы схамянуцца і затрывожацца. Бальшавікі ж, як адчуваю, паддадуць страху, падагрэюць патрыятычныя пачуцці, якія яшчэ нядаўна ўшчэнт разбуралі, і заклічуць усю Расію ўзяць у рукі вінтоўкі і даць немцам адпор. Такім чынам, узначаліўшы патрыятычны парыў, яны не толькі адцягнуць ад сябе небяспечную ўвагу, але і ўмацуюцца...

— Неверагодна! — загаварыў Нямкевіч.

— Уся гісторыя, міл-чалавек, з неверагоднасцей! — пахітаў галавою Скураны.— Думаю, і гэтая сусветная вайна і як вынік яе гэтыя рэвалюцыі — таксама ўсё загадкавае, але не зусім выпадковае. Усё прадуманае, падстроенае, каб уцягнуць народы ў бойню, змучыць, накіраваць гнеў на свае ўрады, зрынуць іх і даць руль тым, каму трэба... Тут, у Расіі, удалося ажыццявіць задуманае, цяпер на чарзе — Германія, Аўстра-Венгрыя, Асманская імперыя... Удасца, як яны кажуць, зрабіць сусветную рэвалюцыю — удасца і асядлаць свет. Адпаведна, цяпер адны бальшавікі за тое, каб эксперыментаваць сваё на Расіі, будаваць свой сацыялізм у адной ёй, другія — толькі за ўсезямны пераварот...

Пасля зноў падняўся, захадзіў па пакоі.

— Але я вельмі не веру, што ўдасца так лёгка агламэздаць увесь свет, як агламэздалі Расію. Бо не ўсюды такія даверлівыя, як нашы людзі,— сказаў.— Але ладна, чорт з імі! Сыходзяць адгэтуль — ну і дзякуй богу! А вось калі сюды прыйдуць немцы, то мы павінны сустрэць іх як самых дарагіх гасцей...

— Няпрошаны госць — не дужа жаданы госць,— прамовіў Васілевіч.

— Як сказаць! — Які ўжо раз абарваў яго Скураны.— Калі хтосьці ставіць на іх стаўку, дык, скажыце, чаму не зрабіць тое ж і нам?

— Дык вы...

— Я не вярбую вас,— перапыніў, памякчэў гаспадар.— Па-першае, не змушаю думаць так, як думаюць іншыя, па-другое, хто я вам?

Але пазней, калі ўсё ж вытрымаў панскі этыкет, папаіў гарбатаю і развітваўся, шматзначна ўсміхнуўся:

— Паразважце добра, паразважце як след... Не прымуць вашы сябры — прыходзьце, пагаворым, параімся, як жыць далей...

— Сапраўды, злы наш пан,— прамовіў Нямкевіч, калі яны апынуліся на сцюжным двары.

— Люта ненавідзіць бальшавікоў і яўрэяў,— сказаў Васілевіч.— З-за таго, што рэквізавалі яго палац, карціны і бібліятэку.

— Затое, бач, аж трымціць, каб захаўрусаваць з немцамі.

— Спадзяецца, што праз іх верне сваё багацце і, можа, падыме свае акцыі,— патлумачыў Васілевіч, а пасля нечакана тыцнуў локцем яму ў жывот і паказаў вачыма на ўжо блізкі сквер каля Саборнай плошчы.

Там, наставіўшы каўнер паношанага паліто, патупваў то на адной, то на другой назе па-ранейшаму таўсматы Муха. Ясна, што некага чакаў. Можа, і іх, калі сувязны. Няўжо ён — той, пра каго так добра

гаварыў чалавек з аддзела барацьбы з сабатажам і контррэвалюцыяй, хто будзе кіраваць імі, калі сюды прыйдуць немцы? Якраз тут жа, у скверы, павінна ўжо сёння адбыцца іхняя першая сустрэча з сувязным.

Убачыўшы іх, Муха сумеўся. Відаць, не чакаў, што іменна яны будуць яго намочнікамі.

— «Вы не чакаеце прывітання ад свайго дзядзькі?» — падаючы руку, знарочыста зухавата запытаў Васілевіч, называючы дамоўлены пароль.

Муха падаў руку, але са здзіўленнем зірнуў па Васілевіча: што ты пляцеш? Які такі дзядзька? Значыць, не, Муха — не сувязны. Прыйшоў на іншую, сваю сустрэчу.

Пасля, калі пахадзілі па замеценай сцяжыне, перакінуліся словам-другім пра навіны, Муха раз-пораз зыркаў на гадзіннік і азіраўся па баках — відаць, выгледжваў таго, каго чакаў. Але ніхто ў сквер не заходзіў. Праўда, вунь паказаўся каля гасцініцы «Еўропа» дзядок, але адразу ж павярнуў на былую Губернатарскую вуліцу. Ды Муха доўга праводзіў яго пільным позіркам.

Неўзабаве Муха адкараскаўся ад іх, застаўся ў скверы, а яны падаліся сваімі дарогамі: Васілевіч — дадому, Нямкевіч — да Волькі.

5

— Эй, буржуй, выходи! — адчыніўшы цяжкія рыпучыя дзверы, гукнуў малады рыжы ахоўнік.

Лашковіч, лежучы на цвёрдых дашчаных нарах пад паліто, няўцямна зірнуў на таго: ну, што яшчэ трэба? Зусім жа нядаўна цягалі, дапытвалі, пагражалі! Бачачы, што той настойліва чакае пры адчыненых дзвярах, паволі падняўся, апрануў наверх пакамечанага за гэтыя, лічы, тры тыдні касцюма выцертае да бляску паліто, узяў злямчаны капялюш і паслухмяна паплёўся з камеры, па даўняй ужо звычцы не спрачаючыся з турэмнымі наглядачамі. Але ў доўгім і вузкім падслепаватым, толькі пры святле аднаго далёкага ліхтара калідоры сцепануўся і наструніўся: з суседніх камер-адзіночак выводзілі і іншых яго калег па няволі — высокага, тонкага, у афіцэрскіх шапцы і шынялі Еўзікава, а таксама грузнага, у генеральскім уборы, толькі без пагонаў Петрыкевіча.

Лашковіча прытрымалі, а тых, наадварот, пагналі наперад, на выхад. Мусіць, дзеля таго, каб яны не сустрэліся і не перамовіліся. Прывыкшы да такіх турэмных парадкаў, Лашковіч не пазважаў на іх, нават вельмі не думаў, куды і чаго іх вядуць. Гоняць — ідзі, бо ты, бяспраўны, мусіш слухацца. Але зусім нечакана ён не толькі ажы-

віўся, але нават устрапянуўся: загуло, аж затрэслася ўсё турэмнае сутарэнне. Спачатку не мог здагадацца, што робіцца, а пасля азірнуўшыся, убачыў: па калідоры сюды, на двор, бягуць адзін за адным салдаты з вінтоўкамі. Усе ўзбуджаныя, запыханыя.

Рыжы ахоўнік руляю вінтоўкі прыціснуў Лашкевіча да сцяны — даваў дарогу.

— Што за шум-бурум? — запытаў Лашковіч у свайго апекуна.

— Много будешь знать — состаришься,— буркнуў той.

— Молодец! — падражніў Лашковіч.— Исправно несешь тюремную службу. Как и рожденный для нее.

— Павесяліся!— зларадна прыстрашыў той.— Хутка запяеш амінь...

— Шевелись, парень! — гукнуў ахоўніку крайні пажылы вайсковец, бегучы і заблытваючыся ў доўгіх полах шыняля.— Поляки подходят к пригороду! И немцы уже недалече!

«Вось яно што! — штосьці мігам апякло душу Лашковічу. Тут жа знікла яго дрымота, вяласць і абыякавасць.— Вось чаму такая мітусня! — Раптоўна заадно ўмлеў.— Пачакай, але куды нас вядуць?»

Неразлучны дагэтуль наглядач адступіў крыху назад і ўбок, трымаючы перад сабою вінтоўку:

— Уперад! І без дурыкаў!

Лашковіч адчуў: халаднее душа. Як не сваімі нагамі выходзіў у двор — заціснуты будынкам і высокаю сцяною, глыбокі, нібы вялізная магільная яміна, пляц.

«Павязуць у глыб Расіі? — апальваў страх розум.— Расстраляюць?»

На заснежаным, але ўтаптаным пляцы іх скупілі, абкружылі з усіх бакоў, і яны, зняволеныя, усе як адзін з прагаю зірнулі на блізкую адчыненую масіўную жалезную браму, за якою бялеўся снег, святлеўся дзень і быў відаць краёк сонечнага, яшчэ скупа блакітнага неба — адным словам, была воля вольная.

— Ну, где же старшой? — нервова азіраючыся, запытаў адзін з самых пажылых канвойных, той, што выводзіў азызлага Петрыкевіча.

Лашковіч, нібы ад удару электрычнага току, рэзка ўскінуў галаву: Еўзікаў і Петрыкевіч, адчуўшы пагрозу, таксама выпрасталіся і нашатэрыліся. Петрыкевіч, хоць і пажылы чалавек, бывалы ўжо генерал, разгубіўся, зморшчыўся, а звычайна рашучы, разважлівы Еўзікаў нервова закусаў поўныя вусны, зірнуў на генерала, пасля перавёў позірк на яго. Спачатку ў яго вачах ажыло недаўменнае запытанне, а неўзабаве заіскрылася дзёрзкае натхненне: варон лавіць не трэба!

Усё зразумеўшы і намагаючыся быць з халодным розумам, Лашковіч паказаў яму вачыма на самага пажылога і, мусіць,

кемлівага ахоўніка, а пасля скасіў вочы на «свайго», які вельмі ўеўся яму за час зняволення. Рыжун у гэтую хвіліну нецярпліва азіраўся, мусіць, чакаючы старшага, які, відаць, вось-вось павінен быў падбегчы і сказаць сваё слова пра іхні лёс. На загарэлай дужай шыі рыжага вытыркнуўся вялікі кадык, нацёрты да чырвані каўняром цвёрдага шыняля. Спажыўшы момант і з нянавісцю пазіраючы на чужую шыю, Лашковіч імгненна і з усяе сілы рабром правай далоні смалянуў на гэтым кадыку. Рыжы ахнуў, устрапянуўся, вырачыў вочы і разявіў рот, але ні абараняцца, ні нападаць не мог, захаўкаў, як выкінутая на бераг рыбіна, выпусціў з рук вінтоўку, сагнуўся і закрыў твар далонямі.

Лашковіч схапіў вінтоўку і, ужо ўзброены, здольны не толькі для абароны, але і для нападзення, ускінуў галаву: Еўзікаў, вырываючы зброю, валтузіўся са старым — той, невысокі, але каржакаваты, не паддаваўся. Астатнія два маладыя салдаты ад нечаканасці аталапелі.

— Зброю — на дол! — Лашковіч рашуча навёў на іх вінтоўку і, калі тыя наслухмяна пашпурлялі, зноў закамандаваў: — Марш да сцяны! І мордай — на зямлю!

Нізкі і высокі маладыя салдаты подбегам патрусілі адгэтуль, а Лашковіч улучыў момант і наском чаравіка ўдарыў старому канваіру пад калена — той падкасіўся, упаў, і з яго аслабелых рук Еўзікаў ужо лёгка вырваў вінтоўку.

— Ляжаць! — загадаў і старому Лашковіч.

Аднак той не паслухаў, пачаў надымадца.

— Ах, бандзюгі! — не спалохаўся, а, наадварот, загарэўся ад гневу.— Я...

Лашковіч шчоўкнуў затворам:

— Да сцяны, стары пень!

Той, светлавалосы, нават нібы без броваў, напалову бяззубы, і са злосцю, і з насцярогаю зірнуў на Лашковіча — і, убачыўшы, што ён не пашкадуе, застрэліць, захацеў жыць. Падняўся і, скачучы на левай назе, борздка патрухаў да сцяны.

— Пабеглі! — кіўком галавы Лашковіч паказаў сваім на выхад.

Гэтая сутычка адбылася так нечакана і хутка, што брамны вартавы не толькі не перашкодзіў, але і шарахнуўся ў памяшканне, бачачы, што яны бягуць на яго з вінтоўкамі і цырымоніцца не будуць.

Яны ж, без замінкі вымкнуўшыся за браму, п'янеючы ад дзёрзкасці і ад марознага свежага паветра, шпарка пабеглі. Да Праабражэнскай. Бо справа, па Захараўскай, было завельмі шматлюдна.

Гонкі Еўзікаў імчаў першы, за ім улёг Лашковіч. Ззаду тупацеў генерал.

За Багадзельнаю вуліцаю Еўзікаў спачатку азірнуўся, а пасля запыніў бег. Дагнаўшы яго, толькі цяпер павярнуў назад галаву і Лашковіч: Петрыкевіч цяжка валюхаў, коўзаўся, падаў і вельмі цяжка ўскарэбваўся на ногі, бег і зноў ляцеў потырч. Вось зноў гупнуўся кулём, але цяпер нават і не паспрабаваў варушыцца, ляжаў, выцягнуўшы рукі.

— Вернемся, паможам,— утаймоўваючы дыханне, прамовіў Лашковіч.

— Нельга ж траціць ні хвіліны! — зморшчыўся Еўзікаў. Хоць і шпарка бег, але ўсё роўна белы. Быццам палатно.— Можа, выправіліся ўжо ўслед за намі.

— Трэба...

Еўзікаў пакрывіўся, але, бачачы, што пагоні не відаць, моўчкі падаўся назад, да распластанага генерала.

— Радыкуліт, спадары,— паскардзіўся той і адчайна заенчыў, калі яны моўчкі пачалі падымаць яго.— Кідайце, ратуйцеся самі. Вы маладыя, вы трэба справе, а я...

— Ідзіце праз сілу, генерал,— сказаў Лашковіч, кладучы Петрыкевічаву цяжкую руку сабе на карак.— Вам таксама трэба жыць, змагацца, а не спяшыць на плаху...

Яны сілай павалаклі генерала, кіруючыся да Траецкага прадмесця, дзе была адна з іхніх падпольных явак.

Былая Губернатарская вуліца (як казалі, цяпер ужо імя Маркса), блізкая Саборная плошча (па-новаму плошча Свабоды), былі ажыўленыя — імчалі да вакзала сані з жанчынамі, з дзецьмі і клункамі, ішлі строем вайскоўцы, купкамі — цывільныя. Хоць на іх, збеглых з турмы, у гэтай сумятні ніхто не зважаў, яны, выскачыўшы на рог плошчы і вуліцы, паасцерагаліся вытыркацца, абачліва пачалі ціснуцца да сцяны. А калі згледзелі, што няма варты, адчыненыя дзверы ў былым губернатарскім доме, дзе летась увосень размяшчаліся Беларуская вайсковая цэнтральная рада і Вялікая Беларуская рада, а пасля іх разгону — Саўнарком, хуценька шмыгнулі туды.

Дзверы за сабою зачынілі. Павалаклі зусім ужо ацяжэлага генерала па лесвіцы — на ёй, як далей і на калідоры, было процьма параскіданых папер: ясна, што саўнаркомаўцы нядаўна вельмі спешна пакідалі будынак.

У былой сваёй канцылярыі запыніліся, апусцілі абвялага генерала на адно з уцалелых крэсел, што стаяла ў кутку, а самі кінуліся да акна з выбітымі шыбамі і з сарванай фіранкаю, пазіраючы на Саборную плошчу: па ёй цёк і цёк людскі ручэй.

— Даюць драла бальшавічкі і іхнія прыслужнікі,— праз зубы сказаў Еўзікаў.— Не паспеўшы як след справіць ведзьмін баль...

Лашковіч змаўчаў: у гэтую хвіліну падумаў пра Васілевіча і Нямкевіча. Што — тыя, прыгрэўшыся каля Саветаў, таксама сыходзяць з імі? Разумныя ж, шчырыя, бітыя хлопцы, а, бач, гэтак паверылі пераможцам-дэмагогам і дэспатам! Як ні адгаворваў, усё роўна пайшлі служыць тым, хто на словах спачувае, шмат дакляроўвае, а на справе душыць неміласэрна!

— Што рабіць, дзядзька Максім? — паважна, як і трэба маладзейшаму, запытаў у яго Еўзікаў.

— Ужо апамятаўся, аддыхаўся? — усміхнуўся ён.

— Няма калі цацкацца з сабою, трэба не траціць ні хвіліны,— адказаў той.

— Вайсковы, дык добра адчуваеш сітуацыю,— прамовіў Лашковіч.— Сапраўды, не варта драмаць, выпускаць тое, што само ідзе ў рукі.

Еўзікаў слухаў з павагаю і паслухмянасцю, чакаў парады ўжо сталага палітыка.

— Ты, Язэп, заставайся тут,— наказаў Лашковіч.— Пастарайся ўтрымаць гэты будынак,— гаварыў, а заадно і на хаду думаўразважаў, што і як рабіць ім далей.— Трэба зноў асталявацца якраз тут. Значыць, будзь з гэтай хвіліны новым гарадскім камендантам.

— Ёсць! — казырнуў Еўзікаў. У знак згоды з ім, старэйшым і ветэранам руху.

— Ну, а я пабягу клікаць з падполля з'ездаўскую Раду, падымаць нашы баявыя дружыны — ўлада ў Мінску цяпер сама просіцца да нас...

6

Ландар стомлена прысеў за свой старшынёўскі стол. Замаўчаў. Сцяў вусны і Мяснікоў, толькі нервова паходжваў па кабінеце.

Абодвум было цяжка. І адзін, старшыня Мінскага Савета, і другі, старшыня Паўночна-Заходняга абласнога камітэта РСДРП (б), камандуючы Заходнім фронтам і старшыня Аблвыкамзаха, да самага аноўняга часу былі тут вельмі ўплывовыя людзі, нямала зрабілі для новага вобліку краю і Мінска, а вось цяпер на вачах трацілі моц і сілу, станавіліся звычайнымі савецкімі служачымі, якім не варта ўжо заставацца ў Мінску ні на дзень.

Зазваніў тэлефон.

Ландар, папраўляючы накінутае на плечы пальто, тут жа ўзяў трубку, нібы адрачона прыклаў яе да вуха: цяпер тое, што гаварылі

яму, ці тое, што казаў ён некаму, было толькі яшчэ адною навіною, але вялікай важкасці ўжо не мела. Многае ўжо ішло-кацілася па волі лёсу і сітуацыі, што ўзнікала з-за нечай вышэйшай волі.

— Таварыш старшыня,— як адчулася, вельмі ўсхвалявана загаварыў начальнік аддзела па барацьбе з контррэвалюцыяй і сабатажам.— Горад становіцца бескантрольны! На вуліцы вывальваюць спекулянты і гандляры, чые правы мы ўрэзалі, усякія цёмныя людзі, рабаўнікі, ворагі Савецкай улады. Гэтая пошасць нацкоўвае абывацеляў супраць нас, пачынае рабаваць крамы, асабліва яўрэйскія, нападае на міліцыянераў, на іншых савецкіх служачых...

— Ужывайце тыя правы, што маеце! — незадаволена, нават нязвыкла для сябе груба сказаў Ландар.

— Таварыш старшыня, мы ўжо не можам утаймаваць стыхію,— адчаіўся той.

— Дык якое, па-вашаму, выйсце?

— Трэба як мага хутчэй пакідаць горад.

— Гэта мы ведаем і без вас,— ужо мякчэй прамовіў Ландар.— Карацей, прасачыце, каб мы не пакінулі тут казну і галоўныя нашы дакументы.

— А якія новыя ўказанні па эвакуацыі нашых служачых?

— Паўтараю вам: мы эвакуіруем тых, каму найперш пагражае расправа. Астатнія таварышы няхай сваім ходам кіруюцца на Смаленск. Між намі кажучы, гэткім чынам будзе выбірацца з Мінска нават штаб фронту...

Ці то разгублены, ці то засмучаны начальнік аддзела заціх; Ландар не стаў чакаць, чым яшчэ ён занепакоіць, паклаў трубку. Якраз у гэтую хвіліну ў кабінет шпарка зайшоў камендант Савета, спакойна, але напружана сказаў іншую навіну:

— Таварышы, польскія легіянеры разбілі наш атрад пад Асіповічамі і ва ўвесь дух пруць сюды, а немцы падыходзяць да Заслаўя... І яшчэ...

— Што «яшчэ»? — запыніўся, рэзка запытаў Мяснікоў. Закусіў ніжнюю губу, здаецца, аж да крыві.

— Толькі што пазваніў Клёнаў: у астрогу — мяцеж, раззброена варта,— па-ранейшаму нібы непарушна, але ўзрушана дакладваў камендант.— Збеглі верхаводы Беларускай вайсковай рады, арыштаваныя легіянеры Доўбар-Мусніцкага, а таксама крымінальнікі. А гэта азначае, таварышы, што хутка хаос у горадзе будзе накіраваны супраць нас...

— Ну, такую тваю! — вылаяўся Мяснікоў, махнуў у паветры кулаком.— Як маглі выпусціць нацыяналістаў і доўбарчыкаў?! Расстраляць мала за такое разявак!

— Мы, таварыш Пятроў, можам накухталяць збеглых? — запытаў у каменданта Ландар.

— На жаль, не,— развёў рукі той.— Вайсдорф сабраў усяго 200 надзейных чырвонаармейцаў. Калі мы пашлём хоць чвэртку на пошукі і пакаранне, то, па-першае, няма надзеі, што яны справяцца з тымі, а па-другое, я не магу запэўніць, што аслаблымі сіламі мы ўтрымаем станцыю, свой цягнік...

— А трэба было б даць сволачам напаследак у зубы! — пашкадаваў Мяснікоў, кончыкамі пальцаў тручы лоб. Відаць, балела галава ад апошніх бяссонных начэй. Калі зноў зазваніў тэлефон, нечакана кінуўся, падняў трубку. Паслухаўшы крыху, ажывіўся: — Ну, што добрае скажаш, Майсей Іосіфавіч?

Значыць, званіў Калмановіч — новы старшыня Саўнаркома Заходняй вобласці і фронту.

Пасля, калі той ці штосьці расказаў, ці спытаў, з пахмурным жартам прамовіў:

— Кінь усё гэта, Майсей! Едзь на вакзал. Будзем даваць лататы, пакуль нас не захапілі і не здалі Доўбар-Мусніцкаму ці немцам.

7

Лашковіч пашыбаваў у горад падымаць на ногі сваіх; Петрыкевіч, стогнучы, нават падвываючы ад радыкулітнага болю, як яго апусцілі, так і сядзеў зняможана ў кутку канцылярыі, а Еўзікаў, каб не пакутаваць ад марудлівага чакання, а заадно і супакоіцца, падумаць, што і як рабіць, пачаў прагульвацца па былым губернатарскім доме.

Шпацыруючы, вось зайшоў у былы губернатарскі кабінет — гэты вялікі, цяпер з голымі сценамі пакой быў засмечаны звыш меры. Падбіваючы ботамі згрувашчаныя на падлозе кіпы папер, газет і плакатаў, Еўзікаў пайшоў да шырокага стала, што ляпіўся ў капцы пакоя, на хаду падняў паваленае і кімсьці парэзанае нажом крэсла, рассунуў нагамі хлам, паставіў крэсла на жоўты паркет і апусціўся — якраз сюды, на стол з паперамі, на тэлефон, на яго самога свяціла з двара няяркае, слабое ад лютаўскага марозу, але тут, у пакоі, цёплае перадвячэрняе сонца. У яго залацістых промнях закружылася-затанцавала, можа, і мільён дробненькіх пылінак.

Ён міжволі ўзяў трубку — тэлефон, здаецца, працаваў. Ён аж разгубіўся: куды і каму пазваніць, калі зараз пачуе голас тэлефа-

ністкі? Пагэтаму не стаў чакаць запытальнага голасу, паклаў прыгожую бела-жоўтую трубку на жалезныя бліскучыя рычажкі.

Дзіва, падумаў, што толькі не бывае на свеце! Яшчэ нядаўна, год назад, тут важна сядзеў губернатар, пазней атабарваліся ўстановы Часовага ўрада, Саветаў, а вось цяпер сеў за гэты стол ён — сын сялян Еўдакіі і Сцяпана Еўзікавых з вёскі Пячкоўка Мсціслаўскага павета, капітан рускай арміі, адзін з кіраўнікоў цяпер падпольнай Беларускай цэнтральнай вайсковай рады, і яму, як сказаў Лашковіч, адзін з кіраўнікоў Вялікай Беларускай рады і адзін з членаў прэзідыума снежаньскага Беларускага з'езда, трэба рыхтавацца стаць новым гарадскім камендандам.

Камендант дык камендант! Ні людзей, ні зброі, ні нават машынкі і машыністкі, каб надрукаваць загад, што якраз ён цяпер павінен стаць гаспадаром горада. Міжволі яго вочы апусціліся на падлогу — у кутку ў папяровым звале тырчаў чырвоны тоўсты аловак. Ён падняў яго — дзюбкі не было. Нічога, і гэта ўжо добра, што ёсць чым пісаць.

Раскусіў аловак, вызваліў таўставатую чырвоную сарцавіну, затым перабраў на стале паперы, знайшоў чысты аркушок і пачаў выводзіць: «БЕЛАРУСКАЯ КАМЕНДАТУРА».

Затым, накалупаўшы пазногцем з паламаных крэсел цвічкоў, падабраў з падлогі сухі чарнільны прыбор з тоўстага шкла і шпарка выйшаў на сонечную і, як было ўжо відаць, бязлюдную Саборную плошчу, пачаў прыбіваць да дзвярэй гэтую паперу. Калі адышоўся, каб зводдаль зірнуць на сваю творчасць, дык убачыў: з Багадзельнай вуліцы шпарка вынырнуў гурт цывільных і вайсковых узброеных людзей. Наперадзе, можа, і дваццаці чалавек крочыў маладжавы мужчына ў дыхтоўным чорным паліто і капелюшы, у акулярах. Па меры таго як ён набліжаўся, былі відаць яго даўгаваты нос, тонкія нервовыя вусны і чорныя заліхвацкія вусікі. Абадзінскі. Адзін з тутэйшых польскіх дзеячаў і, як кажуць, блізкі сябра грамадоўца Мухі.

Падышоўшы, Абадзінскі не павітаўся, адразу ўталошыўся на вывеску. Хоць гаварыў па-руску, разумеў і беларускую мову, але цяпер запытаў задзірліва па-польску:

— Цо то ест?

— Тое, што вы бачыце,— па-вайсковаму выразна адказаў Еўзікаў.

— Вы — камендант?

— Я.

— Вы што — усур'ёз думаеце перахапіць і ўтрымаць уладу? — ухмыльнуўся Абадзінскі.

— Усур'ёз.

— А колькі ж у вас, пан камендант, узброенай сілы? Полк? Дывізія? Ці яшчэ і больш?

Еўзікаў вытрымаў прыжмураны, калючы позірк Абадзінскага, які, мусіць, меўся таксама атабарыцца ў гэтым доме, што ўжо сам па сабе шмат сімвалізаваў. Абадзінскі ж, бачачы яго ўпартасць, занерваваўся — спачатку дробненька затрымцелі, нават заторгаліся падстрыжаныя вусікі, а пасля ў вачах з'явілася разгубленасць.

— Хто — там? — кіўнуў ён на будынак.

— Генерал Петрыкевіч.

Гэтая навіна добра астудзіла Абадзінскага, ён ужо здаўся: усё ж генерал ёсць генерал. А можа, падумаў, пры генерале нямала і іншых вайскоўцаў.

— Мы, польская вайсковая арганізацыя і польская міліцыя, выйшлі з падполля,— міралюбна патлумачыў.— Мы пастанавілі...— Запнуўся, адчуваючы, што не варта выдаваць свае сакрэты.— Ну, збіраемся захоўваць лад у горадзе...

— Добра,— напружана, але знешне непарушна прамовіў Еўзікаў, — Далучайцеся да нас, да законнай тутэйшай улады. Я хоць цяпер магу залічыць вашых байцоў у склад мінскага гарнізона.

Шляхецкі гонар змусіў Абадзінскага ўстрапянуцца і пыхнуць чырванню: што — халопы не толькі пасягаюць на ўладу, але і клічуць да сябе на службу яго, панскага сына? Вочы яго злосна заззялі, ён увесь напяўся, але, услед за Еўзікавым зірнуўшы на Юр'еўскую, зноў абвяў: адтуль на Саборную плошчу хутка ішлі ўзброеныя вінтоўкамі і кулямётам цывільныя людзі. Убачыўпты ўзброены гурт каля нядаўняй сваёй рэзідэнцыіі, мігам скінулі з плечукоў вінтоўкі і наставілі іх рулямі сюды. Еўзікаў уздыхнуў з палёгкаю: спяшалася яму на помач адна з іхніх дагэтуль падпольных баявых дружын.

— Каму быць ва ўладзе ў Мінску і ў краі, заўтра-паслязаўтра рошыць генерал Доўбар-Мусніцкі...— бачачы, што яму непярэліўкі, Абадзінскі пачаў адступаць, але на развітанне пахрабрыўся: — Так што вельмі не зарывайцеся!

— Вы — таксама! — кінуў яму наўздагон Еўзікаў.

Праз хвіліну-другую сюды падышла ўжо іхняя дружына на чале з Адасём Аўторкам — маладым, апранутым за ўсё вайсковае, але без пагонаў чалавекам, членам падпольнага Савета снежаньскага з'езда.

— Што за гусакі? — запытаў, падаючы для прывітання руку.

— Супернікі,— задаволены і ад маленечкай перамогі, паціскаючы руку, адказаў Еўзікаў.

— Ці не Абадзінскі?

— Ён.

— Цяпер у горадзе процьма зброі, дык любая шайка можа ўзброіцца і часова захапіць уладу,— прамовіў Аўторак.— І пачысціць сейфы пакінутых кантор.

— Адпаведна не варта траціць ні хвіліны дарма,— сказаў Еўзікаў, — Вы, Адась, пакіньце мне кулямёт, я з ім паспрабую ўтрымаць гэты дом, а вы бярыце пад свой кантроль пошту, тэлеграф, банкі, вайсковыя склады. Прыйдуць іншыя нашы дружыны — адразу пашлю іх вам на падмогу.

У гэтую хвіліну з-за былога губернатарскага дома вымкнуўся на тратуар малады высозны дзяцюк у валёнках і кажушку. Убачыўшы іх, узброеных, збянтэжыўся, запаволіў крок — здаецца, намерыўся даць драла адсюль.

— Эй, хадзі сюды! — махнуў яму рукою Еўзікаў. А калі той, белабрысы, насаты, з расчырванелымі ад марозу шчокамі, асцярожна падышоў, насцярожана заблiскаў шэрымі вачыма, запытаў: — Прозвішча? Прафесія?

— Бутрымовіч,— замямліў дзяцюк.— Качагар.

— Па рыле бачу і па голасе чую: беларус,— усміхнуўся Еўзікаў.— Дык вось што, зямляча: я — новы гарадскі камендант і начальнік гарнізона.— Павысіў голас.— Загадваю: тут жа ўступіць у народную армію і абараняць Бацькаўшчыну.— А пасля старшему дружыны: — Выдайце яму, спадар Аўторак, рэвальвер і бярыце з сабою. Калі будзе парушаць дысцыпліну альбо спрабаваць дэзерніраваць, расстрэльвайце на месцы. Словам, смялей далучайце да сябе насельнікаў. Не толькі мы для іх, але няхай і самі для сябе робяць тое, што трэба.

Аўторак даў збянтэжанаму дзецюку рэвальвер, пакінуў кулямёт і павёў дружыну ў горад. Еўзікаў пастаяў крыху, паназіраў за прыціхлым, прытоеным горадам, а пасля, падхапіўшы кулямёт, вярнуўся ў дом, які ўжо станавіўся яго рэзідэнцыяй.

Петрыкевіч па-ранейшаму седзьма сядзеў у былой канцылярыі на крэсле, быў нібы спаралізаваны. Ці зусім адрачоны ад болю.

— Кажуць, адзін у полі не воін,— усміхнуўся яму Еўзікаў.— Але двое, ды з кулямётам, што ні кажы, ужо сіла! — Паставіў грозную зброю на стол, дулам на Саборную плошчу, патлумачыў: — Прыйшоў ужо з дружынаю Аўторак. Я паслаў яго браць пад ахову ўстановы.

— Добра,— падаў зняможаны голас Петрыкевіч.— Калі прыйдуць нашыя дружыны, шліце іх на паўднёва-ўсходні край Мінска. Клічце мінчукоў. Трэба рабіць як мага болей моцны заслон.

Еўзікаў адразу ж скеміў тое, што хацеў сказаць яму старэйшы і мудрэйшы Петрыкевіч. Яно, палічыў, і слушнае, і ў той жа час небяспечнае.

— Доўбар-Мусніцкі спачувае, гатовы нават памагчы ў нашых клопатах,— нібы пачаў тлумачыць Петрыкевіч.— Але ў яго войску модны польскі дух.

Экстрэмісты могуць падбухторыць, а то і змусіць спажыць момант, адпіхнуць нас і да прыходу немцаў аб'явіць тут польскую ўладу. Дык мы павінны іх затрымаць. Хоць на суткі, хоць на ноч.

«Ёсць у гэтым праўда, але як падмацаваць яе без сілы?»

— Немцаў мы не стрымаем, няма чаго і думаць пра гэта,— моршчачыся ад болю і пагладжваючы паясніцу, гаварыў-разважаў генерал.— Але іх павінны сустрэць не легіянеры, а мы. Адпаведна, першыя мусім уручыць ім сваю петыцыю. Праваронім, як я лічу, апошні наш шанец — адпаведна людзьмі, гаспадарамі ў сваёй хаце не будзем...

— Ужо з падполля выйшла польская вайсковая арганізацыя і міліцыя,— сказаў Еўзікаў.

— Значыць, усё так ідзе і на самай справе, як я думаў,— пахітаў галавою Петрыкевіч.— Калі не будзем варухлівыя, дзёрзкія, нас абавязкова апярэдзяць...

## РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

### 1

Лашковічу і ў цяпле ды пасля гарбаты з лустаю хлеба і сала нездаровілася. Ён сядзеў у кутку пакоя пры цёплым стаяку, закрываў рот крысом паліто і раз за разам бухаў сабе на грудзіну, адчуваючы, што сухоты не толькі дзяруць лёгкае, але і выкідваюць кроплі крыві. Як мог душыў прыкры кашаль: баяўся, каб не хлынула з горла кроў.

Сілаю волі ўтаймоўваў прыступ сваёй страшнай хваробы і заадно намагаўся бачыць ды чуць, што дзеецца і гаворыцца за блізкім круглым сталом, за якім пасярод сядзеў гаспадар, светлавалосы, з прыгожа зачасанымі набок валасамі, у вязаным шэрым свэтары Баравік, а па левую і правую яго руку размясціліся некаторыя іншыя людзі з Выканкома Савета снежаньскага з'езда, а таксама і новае папаўненне ад велікарусаў, украінцаў і яўрэяў. Таго-сяго з іх, чупрыністага, хмурнага Шуляка, лысага, змрачнаватага ў вайсковай форме Заходку, светлавалосую, з накінутай на плечы канаплянкай прыгожую Белякову, высакалобага, з вусамі і бародкай Пячэрскага, ён бачыў у твар, а астатніх Нядолю, Жытніка і Янку Аўторка,— са спіны. Той-сёй павінен быў хутка падысці (па іх пабеглі пасланцы), той-сёй, як Аўторкаў брат, Адась, падаўся ў горад з баявой дружынаю на

помач Еўзікаву і Петрыкевічу, а некаторых паслалі ў розныя мінскія куткі ў разведку.

За апошнія два месяцы, калі пакрыўджаны Скураны не паказваўся на вочы, Васілевіч і Нямкевіч адмовіліся пайсці ў падполле, падаліся на службу да новай улады, а Лашковіч, Еўзікаў і іншыя сядзелі ў турме, у іх адбыліся такія-сякія змены.

Па-першае, мінскія грамадоўцы перапынілі зносіны з петраградскімі суполкамі Жылуновіча і Чарвякова (лічылі, тыя прадаліся бальшавікам), па-другое, ці то пацяплелі, ці то пачалі шукаць з імі саюзу мінскія паалейцыяністы, бундаўцы і нават той-сёй з велікарускіх эсэраў і меншавікоў, каго дасюль аж трэсла ад злосці толькі ад аднаго слова «беларускі». Па-трэцяе, новае ўвішнае і бойкае папаўненне, надта з эсэраўскага лагера, не хацела быць толькі паслушнікамі, снакваля заваёўвала роўнасць, а то і перавагу над тымі, хто летась быў тут на чале нацыянальнага руху.

Як расказаў Лашковічу па дарозе сюды Шуляк, найбольш супернічаюць цяпер грамадовец Баравік і беспартыйны, а на справе спачуваючы эсэрам, а то і эсэр Янка Аўторак. Якраз яны па снежаньскім з'ездзе зайгралі на першай скрыпцы, а на днях, пачуўшы пра паступленне Доўбар-Мусніцкага і немцаў на Мінск, у глыбокай тайне нават ад некаторых сваіх складалі спіс Народнага сакратарыята Беларусі — па іхніх словах, «урада, які цяпер мусіць абараняць інтарэсы дэмакратыі». Задумалі мець ва ўрадзе 20 міністэрскіх пасад, але і самі, а пасля ўжо на сходзе ў спрэчках і барацьбе здолелі зацвердзіць толькі 15 пасланцоў ад розных партый: шэсць ад грамадоўцаў, пяць ад эсэраў, па аднаму ад беспартыйных (можа, і ад эсэраў), Паалей-цыёна[3] і народных сацыялістаў. Той-сёй, асцерагаючыся няяснай будучыні, і сам адмовіўся ўвайсці ў Народны сакратарыят, захацеў адысці ад палітыкі і перачакаць трывожны час.

Баравік і яго прыхільнікі дабіваліся, каб ва ўрадзе было як мага болей тых, хто «жыве іхняй справаю», а Аўторак з сябрамі змагаліся, каб далучылася шмат і тых, хто «прадстаўляе ўсе народы і партыі Беларусь.

Некаторыя ветэраны, Скураны, Васілевіч, Нямкевіч, Шуляк і ён, Лашковіч, ва ўрад не трапілі. Хоць Еўзікава, які таксама ў гэты час быў зняволены, увялі завочна. Як баявога афіцэра, без якога не абысціся ў такі напружаны час. Праўда, калі ён, Лашковіч, заявіўся тут, то адразу пачулася некалькі галасоў, каб кааптаваць і яго. Ды ён замахаў рукамі: не трэба мне такой пашаноты, абыдуся, а вось вы

[3] Паалей-цыён — яўрэйскія партыі і арганізацыі канца 19-га — пачатку 20 стст.

менш дзяліце міністэрскія партфелі, а больш думайце, што і як цяпер рабіць, і рабіце!

— Максім кажа праўду,— вось цяпер прамаўляў Янка Аўторак. Чалавек адмысловы: лысы, у вайсковай форме без пагонаў, сухі. «Канавал», як жартавалі некаторыя, маючы па ўвазе яго ветэрынарную прафесію.— Што і як трэба рабіць?

— Варта арыштаваць Мяснікова, Калмановіча, Ландара, Кнорына і ўсіх астатніх пешак,— сказаў Баравік, які намагаўся не саступаць ні ў чым Аўторку.

— Не, няхай з'язджатоць,— нібы сам ад сябе, а на самай справе насуперак суперніку кінуў Аўторак.— Па-першае, у нас не хопіць сілы ўзяць іх цёпленькімі, а па-другое, трэба засяродзіцца на самым галоўным.

Усе змаўчалі, слухалі. Аўторак хацеў сказаць штосьці яшчэ сваім хрыплым голасам, але ў гэты час пачуўся тупат на кухні, а пасля і стук у дзверы.

Неўзабаве, пасля дазволу, сюды зайшоў рослы дзяцюк у валенках і рыжым кажуху. Яго — ужо пры Лашковічу — пасылалі да Еўзікава.

— Ну, што там? — нецярпліва запытаў Аўторак.

— Яны трымаюць губернатараў дом, клічуць туды. Палякі шныраць па ўстановах, шукаючы грошай, чакаюць легіянераў і страшаць, што возьмуць горад у свае рукі. Камісары і іхнія сем'і збіраюцца на вакзале. Станцыю абараняюць з усіх бакоў сваімі вернымі салдатамі.

— Дзякуй, браце,— матлянуў галавою Аўторак. А калі той выйшаў, дадаў: — Ну, што ж, спадары, прыйшоў час зноў выйсці на святло. Хадзем законна займаць былы губернатарскі дом і кіраваць ужо адтуль. Так вам загадвае сам лёс. Па дарозе і ўжо ў Народным сакратарыяце пакумекаем, як но настроіць супраць, але і стрымаць легіянераў, як правесці камісараў...

Разам з усімі падняўся і Лашковіч, збіраючыся таксама ісці на былую Саборную плошчу.

— Заставайся тут у цяпле, Максіме,— зычліва, а можа, каб неўпрыкмет і адхіліць яго ўбок, сказаў Аўторак.— Прымай тут нашых людзей і адсылай да нас, а заадно пішы зварот да народаў Беларусі. Трэба ўжо заўтра-паслязаўтра абнародаваць яго. Пішы проста, шчыра, як ты гэта і ўмееш.

Лашковіч паслухаў, застаўся. Сапраўды, не варта ісці на холад: балазе вунь сонца ўжо нізкае, вычырвоньвае да агню небасхіл, гасне і, канечне, у гэтыя хвіліны люцее мароз.

Калі мужчынскі гурт дружна вываліў з хаты, сюды вярнулася гаспадыня. Яна дагэтуль стаяла пры брамцы на варце.

З гэтай Пальмірай ён пазнаёміўся толькі летась, калі вярнуўся з Сібіры ў Мінск. Яна была адна з самых прыгожых жанчын, якіх ён калі-небудзь бачыў. Маладая, гадоў дваццаці пяці, невысокая, кругленькая, русявая, з адмысловымі манерамі. Актрыса. У яе, кажуць, у свой час закахаўся нават сам Янка Купала. Кажуць, і яна пакахала паэта. Ды чамусьці не паразумеліся, Купала, па чутках, вельмі неспадзявана жаніўся, а гэтая Пальміра выйшла замуж за Баравіка.

Цяпер яна скінула кажушок, шапачку — зграбненькая, з кароткімі хвалістымі валасамі, не то з туманнай павалокаю, не то з нейкаю млявасцю ў вачах, з пажаднымі вуснамі, яна і захапляла, і скоўвала заадно. Лашковіч не баяўся выходзіць у тайзе сам-насам з мядзведзем, мог быць рэзкі з любым мужчынам, а вось перад гэтай Пальмірай траціў мову.

— Я зраблю вам яшчэ гарбаты,— усміхнулася.

— Дзякую,— прамовіў і апусціў вочы. Зноў здзівіўся: ну чаму ён так дранцвее, робіцца сам не свой? Баравік вунь жа смелы, рашучы з ёю! Ці гэта ва ўсіх такое: жэнішся — дык і пасмялееш з жанчынаю?!

Яна цёпла зірнула (можа, і пашкадавала, што ён яшчэ малады, але ўжо такі хворы) і падалася на кухню. Ён жа, намагаючыся ўзяць сябе ў рукі, узяў самапіску ды памалу вывеў на белым аркушыку: «Першая Устаўная Грамата да народаў Беларусі».

2

Яны прыселі — на хвілінку, каб неўзабаве падняцца і ўжо рушыць у далёкую дарогу.

Звонка падаў свой голас у нямой цішыні тэлефонны званок. Падхапіўся, трубку ўзяў нервова, аброслы за дзень Мяснікоў. Паранейшаму ў шынялі і чорнай скуранай шапцы.

— Ну я, Мяснікоў,— хмурна адказаў таму, хто званіў, і тут жа сам спытаў:— А вы — хто? Які такі ўжо Народны сакратарыят?! Самазванцы!

Не зажадаў болей гаварыць, падаў трубку Ландару. Той прыклаў яе, яшчэ халодную, да вуха і пачуў мужчынскі глухаваты голас:

— Не, шаноўны. Мы — не самазванцы. Мы — з ліку тых 105 чалавек Савета, які выбраў і зацвердзіў наш снежаньскі кангрэс. Цяпер мы як законны Беларускі Прадпарламент бяром на сябе законнае права клапаціцца пра свой народ. А вось вы, чужакі, гвалтам захапілі тут уладу, штыкамі разагналі наш з'езд і ўрад, дык вы сапраўды самазванцы. Але вам нічога не дакажаш, бо ў вас свая

карыслівая мэта, дык і не будзем дыскутаваць. Тым больш што справядлівасць усё ж ёсць: вы, адкуль прыйшлі, туды і ўбіраецеся, а мы бяром уладу, ахоўваем родны край, ад якога нам няма куды ўцякаць. А вось пра іншае пагаварыць трэба...— А пасля занепакоена: — Алё? Алё?

— Слухаем,— спакойна прамовіў Ландар, і калі чалавек з глухім голасам запытаў, хто ён, то назваўся.

— Мы заклікаем вас, Ландар, да сумлення,— сказалі яму ў трубку.

— Да якога?

— Гісторыя некалі ацэніць: добра ці дрэнна тое, што вы кінулі нас пад ногі немцам і Доўбар-Мусніцкаму. Цяпер жа гутарка, кажу, пра іншае. Не на словах, а на справе, будзьце ласкавы, урэшце падбайце пра наш народ. Пра тых, хто на вас працаваў.

— Што вы хочаце?

— Як мы паспелі ўжо абсачыць, вы забіраеце з сабою казну, астатняе падчысцілі ўжо збеглыя з турмы легіянеры. Нам удалося сабраць, як кажуць, толькі крошкі. Значыць, наш люд застаецца без капейкі, асуджаны на голад і выміранне. Адпаведна мы патрабуем: вярніце казну!

— Мы, як і кожны ўрад, які сябе паважае, не можам пакінуць фінансы ворагу.

— Чаму — «ворагу»? Народу! У тым ліку і тым, хто, паўтараю, ужо на вас гнуў спіну!

— А каму, дазвольце вас спытаць, мы павінны перадаць скарб?

— Нам, новаму ўраду.

— Ніколі! Вы спажывіцё на свае карыслівыя мэты альбо паслужліва аддасцё немцам.

— Мы даём чэснае слова, што ўсе грошы будуць толькі для працоўных і служачых.

— Ну-ну!— ухмыльнуўся Ландар, пацёр вольнаю рукою ахаладнелыя нос і шчокі.— Вы і чэснае слова! Хто кляўся асабіста мне, што не будзе змагацца супраць Савецкай улады, але крывадушна парушыў клятву?

— Якраз вы глухатой да нашага болю і дэспатызмам змусілі нас пайсці ў падполле. Вы і ў гэтыя дні — бесы: аддаіцё край, Расею немцам, а з намі, нацыяналамі, ваюеце насмерць!

— Перастаньце, двудушнік! — спакойна, але рэзка перапыніў Ландар.— Мы з дэкрэтамі пра мір, пра зямлю, з нядаўняй «Дэкларацыяй правоў працоўнага і эксплуатуемага парода» зламыснікі?

— Ха-ха! — нервова засмяяліся ў трубку.— Скажыце, калі ласка, дзе ваш дакляраваны мір, дзе зямля?! У сё — цацанка-абяцанка! Вы

дбаеце толькі пра ёселяў і янкеляў! Вось ім даіцё ўсё: уладу, пасады, правы, золата, яны — цяпер новыя паны над намі!

— Мана! Паклёп!

— Карацей, Ландар, калі вы не пакінеце казну, мы затрымаем вас і будзем судзіць! Як ворагаў, рабаўнікоў беларускага народа!

— Рукі кароткія ў вас, спадарок!

У гэтую хвіліну рослы камендант у чорнай скуранай куртцы і шапцы борздка падышоў да акна і, затуліўшы шчокі далонямі, зірнуў уніз, на ўжо ўцемненую Петраградскую вуліцу. Але тут жа рэзка адскочыў.

— Натоўп распраўляецца з нашай вартаю,— усхвалявана прамовіў.— Выходзьма, таварышы! Праз чорны ход!

Ландар кінуў на рычажкі трубку, увішна схапіў пакоўны партфель з дакументамі Савета, важкі, загадзя сабраны чамадан і ўслед за Пятровым і Мясніковым, пакідаючы свой асветлены лямпаю кабінет, подбегай падаўся ў прыёмную, а пасля — па цёмнай лесвіцы ў змрочны двор, з яго — да вакзала, дзе чакаў іх цягнік на Смаленск. Там, як сказалі яму, павінны быць ужо каля ста чалавек з Аблвыкамзаха з сем'ямі, вайсковы атрад, вагоны з дакументамі, зброяй і харчам, некалькі класных вагонаў і платформа з браневікам.

Паўцемнаваты, толькі там-сям з асветленымі войнам! вакзал, як убачыў Ландар, быў ачэплены байцамі з вінтоўкамі — тыя не пускалі да пуцей розны падазроны люд. Згледзеўшы іхнюю тройку, той-сёй з гэтага гурту, мусіць, пад'юшчваючыся ад стыхіі, суцемак і пачуцця ўсёдазволенасці, пагрозна памкнуўся насустрач.

— Назад! Застрэлю на месцы! — Пятроў наставіў рэвальвер на найбліжэйшага таўсматага дзецюка ў ватоўцы з авечым каўняром і ў салдацкай ніапцы, запыніўся, прапускаючы наперад Ландара і Мяснікова.

Дзяцюк, а за ім і астатнія маладыя хлопцы ў шынялях і кажушках замерлі, бо ў гэты час на іх наставілі рулі вінтовак і баііцы. Нечакана дзецюкоў расштурхнула, выбегла сюды высакаватая і тонкая паненка ў доўгай спадніцы, у кароткім кафтаніку і круглай чорнай шапачцы, залямантавала:

— Са-ша!

Пачуўшы гэты голас, Мяснікоў запыніўся — у адно імгненне да яго падскочыла гэтая асоба з клункам, кінулася на грудзі.

— Сашачка, забяры мяне з сабою!

Дзецюкі смачна і на розныя лады зарагаталі:

— Гы-гы-гы!

— За камісарыка захацела!

— Мы цяпер цябе таптаць будзем!

Мяснікоў застаўся пагутарыць са сваёю прыхільніцай, а Ландар з Пятровым скрозь ачапленне падаліся да брамы. І ўжо ім панеслася ўслед:

— Накамісараваліся!

— Прадалі нас немцам!

— Чырвоная сволач!

Не зважаючы на злыя выкрыкі, Ландар падаўся па пероне ўздоўж вагонаў з неасветленымі вокнамі, туды, дзе каля слупа з ліхтаром стаяла купка цёпла апранутых людзей: Калмановіч, Кнорын, Селязнёў, Алібегаў, камандзір аховы Вайсдорф.

Ландар падаў руку Калмановічу — сярэдніх гадоў мужчыну ў валёнках, сялянскіх кажуху і авечай шапцы, таксама сёння абрасламу — і пажартаваў:

— Ну што, у пуць-дарогу, Майсей Іосіфавіч?

— Не вельмі,— маркотна адказаў той.— Усё яшчэ няма паравоза. Расстралялі начальніка станцыі, таго-сяго ў дэпо, трэслі іншых — нічога не памагае. Усе клянуцца: ходкія паравозы ў раз'ездзе.

— Сабатаж,— прамовіў Ландар. І да Пятрова: — Хадзем пазвонім нашым знаёмым у чыгуначны камітэт. Яны павінны памагчы.

Рушылі на станцыю. Яна была пустая і халодная. Пад скупым святлом зайшлі ў кабінет былога начальніка, дзе таксама нікога не было. Толькі над стадом на доўгім дроце вісела лямпа ды на сцяне каля шафкі сіратліва і сумна цікаў стары гадзіннік.

Ландар прысеў на край стала, узяў тэлефонную трубку — тэлефон, на шчасце, працаваў. І калі пачуўся знаёмы прыемны жаночы галасок, ён сказаў:

— Святлана, будзъце ласкавыя: злучыце мяне з чыгуначным камітэтам.

Тэлефаністка злучыла. І досыць хутка.

— Я — Ландар,— прамовіў ён.— Паклічце, калі ласка, Штэймана.

— А яшчэ каго? — пачуўся ў адказ з'едлівы голас. З выклікам, па-беларуску.— Беленькага альбо Смірнова?

— Хто вы? — схмурыўся ён.

— Памочнік мінскага каменданта і начальніка гарнізона Адась Аўторак. Так што, калі чаго трэба, гаварыце са мною.

Ландар рашыў не разводзіць лішняй гавэнды, адразу сказаў пра сваё:

— Нам трэба паравоз.

— І ўсё? Чаго так мала?

— Хопіць з нас і гэтага.

— Яшчэ б! Кідаеце на глум, абабралі да ніткі!

— Слухайце! — не вытрываў, павысіў голас Ландар.— Я не жадаю з вамі палемізаваць. Паравоз! І тэрмінова!

— Ёсць паравоз. І не адзін. Але мы можам даць іх толькі з адной умоваю...

— Якая яшчэ ўмова?

— Вярніце нам трыццаць тысяч рублёў.

— Мы не дадзім вам ні капейкі!

— Ну, дык самі цягніце вагоны!

Там, у камітэце, паклалі трубку — тут, на гэтым канцы дроту, у ягоиай трубцы раз за разам запіпікала. Назойна, ненрыемна. Пунсавеючы ад злосці, Ландар патрымаў крыху трубку, нібы не верачы ў пачутае нахабства, а пасля папрасіў тэлефаністку, каб зноў злучыла яго з былым камітэтам. Але цяпер тая даволі доўга (за гэты час прыйшоў ужо сюды Мяснікоў з Калмановічам) не магла дазваніцца: відаць, той нахабнік перамаўляўся са сваімі, якія, бач, сапраўды ўжо выйшлі з падполля і пачалі самаўпраўнічаць у горадзе. Жыццё ўжо і іх навучыла на ходу падэшвы адрываць.

Аднак ён не паспеў сказаць Мяснікову і Калмановічу пра ультыматум, бо ў гэты час тэлефаністка дала знак, што можна гаварыць па тэлефоне.

— Ландар,— зноў першы назваўся ён. І патрабавальна ўжо: — Неадкладна прышліце прыхаваны спраўны паравоз!

— Хвілінку,— груба перабіў яго ўсё той жа прыкры, глухаваты бас.— Мы прыйдзем зараз да вас на перамовы. Падбайце, каб нас прапусцілі на станцыю і ахоўвалі.

Той чалавек зноў першы абарваў размову. Ландар, як і дагэтуль, з непрыемным пачуццём хвіліну-другую патрымаў трубку ў руцэ, няўцямна пазіраючы на яе. Адчуў: аж трасе ад абурэння. Па-першае, вунь як ужо размаўляюць, а па-другое, ужо ведаюць, што яны якраз тут, на станцыі.

— Ну, што? — нецярпліва запытаў пунсовы Мяснікоў (можа, расхваляваўся пасля размовы з настойліваю паненкай), узяў з яго рукі трубку і паклаў яе на рычажкі.

— Ідуць на перамовы,— знайшоў сілы ўсміхнуцца. Хоць, мусіць, не вельмі весела.

— Якія перамовы? — выкрыкнуў Мяснікоў, хапіўся за кабур.— Да сцяны сволач!

— На жаль, не паставіш,— уздыхнуў Ландар. І Пятрову: — Ідзіце сустракайце парламенцёраў.

Той паслухаў, падаўся са станцыі і праз паўгадзіны вярнуўся з незнаёмымі трыма мужчынамі: двое з іх, пажылыя, былі ў цывільнай вопратцы, а трэці, малады, стройны, відаць, нядаўні афіцэр,— у шынялі, але без пагонаў. Усе мелі павязкі на рукавах.

— Адась Аўторак,— казырнуў, басавіта сказаў малады паўвайсковец.— Памочнік каменданта і начальніка мінскага гарнізона. Таксама маю паўнамоцтвы ад Народнага сакратарыята Беларусі, які цяпер, пасля вашага ганебнага ўцёку, выйшаў з падполля і бярэ ўладу ў свае рукі...

— Нас не цікавіць, з якой нары ты вылез і што ты за таракан! — перапыніў яго Мяснікоў.— Давай паравоз ці паставім зараз да сцяпы!

Гэты Аўторак самалюбна і з нянавісцю бліснуў бялкамі вялікіх вачэй, пагардліва змераў позіркам невысокага Мяснікова з галавы да ног і даволі стрымана працадзіў праз зубы:

— Я — баявы афіцэр, праліваў кроў на фронце. Па-другое, прадстаўляю законны орган тутэйшай улады. Па-трэцяе, парламенцёр. Дык я рашуча пратэстую супраць хамства,— і, ужо задыхаючыся ад злосці: — І супраць парушэння ўсіх адпаведных у такіх умовах правіл...

— Што вы ад нас хочаце? — без выбачэння, але міралюбна запытаў Калмановіч. Чуючы спакойны голас старшыні Саўнаркома, успыльчывы Мяснікоў, закусіўшы ніжнюю губіну, адышоўся ў кут пакоя, пачаў невідушча пазіраць у цёмнае акно.

— Мае калегі — члены новага чыгуначнага камітэта,— вытрымліваў дыпламатычны этыкет, раўніва захоўваў усе адпаведныя працэдуры гэты настырны Адась Аўторак.— Спадар Лазаковіч,— кіўнуў на інтэлігентнага худога мужчыну ў паліто і капелюшы,— ад беларускіх служачых. Пан Збыхальскі,— хітнуў на таксама худога, але трохі маладзейшага мужчыну ў ватоўцы і ботах,— ад польскіх рабочых-бежанцаў. Мы, трое, упаўнаважаны ўручыць вам ультыматум: калі вы хочаце выбрацца адгэтуль жывыя і здаровыя, то павінны вярнуць сто тысяч. Тут жа. Нам.

Расшпіліў гузік на шынялі, прасунуў пад яго руку і дастаў невялікі канверт. Падаў хмурнаму Калмановічу.

— Мы вам ужо ўсё сказалі на гэты конт,— не беручы канверта, прамовіў той.— А слоў сваіх, як ведаеце, мы на вецер не кідаем.

— Тады мы мусім спыніць перамовы,— з выклікам сказаў Аўторак, паклаў на стол свой канверт, казырнуў і па-страявому павярнуўся. За ім моўчкі падаліся і цывільныя.

— Ну, такую тваю! — вылаяўся Мяснікоў.— Дарэмна мы цацкаліся дагэтуль з імі, не выкасілі як след!

— Што будзем рабіць, таварышы? — запытаў Ландар.— Можа, кінем ім адчапное?

— Ні ў якім разе! — заявіў Мяснікоў.— Мы самі не толькі ўмацуем іх, але і зробім у абывацельскіх вачах героямі!

— Але ж і затрымліваацца небяспечна,— паразважаў уголас Ландар.— Увойдзе ў горад Доўбар-Мусніцкі — абкружыць і асадзіць. Не возьме сам, дык датрымае да прыходу немцаў.

І тут, нібы на нейкай дамове, пачуліся далёкія вінтовачныя стрэлы — спачатку хлёсткія, адзінокія, а пасля ўсё часцейшыя і бязладныя. Мусіць, хтосьці страляў у запале і апантанасці. Вось нават захлебястаў кулямёт. Ландар падняў вочы на свайго каменданта — той моўчкі шпарка падаўся на двор. Адтуль нечакана засвістала блізкая станцыйная вадакачка. Неўзабаве ёй у адказ з гнятлівым выццём абзыўнулася некалькі паравозных гудкоў.

— Тэрмінова трэба здабыць паравоз,— задумліва прамовіў Ландар, — Любымі сродкамі.

— Выйсце бачу адно,— рашуча сказаў Мяснікоў.— Яны — нам ультыматум, а мы — ім!

— Які — наш? — запытаў Ландар.

— Навесці гарматы, кулямёты з браневіка на горад і, калі не дадуць паравоза, адкрыць агонь!

— Ты добра ўсведамляеш, што ты раіш? — усклікнуў у ражаны такою думкаю Ландар.

— А што параіш ты? Аддаць казну і прыехаць у Смаленск з голымі рукамі? Сустракайце: мы — абласны ўрад, але толькі без капейкі!

Усе змаўчалі, абдумваючы тое, што сказаў Мяснікоў.

— Іншага рэальнага выйсця я не бачу...

Вярнуўся камендант Савета, адразу з парога сыпнуў навіною:

— Ужо на Петраградскай сутыкнуліся беларускія і польскія нацыяналісты. Адны і другія спрабуюць да ўварвання Доўбар-Мусніцкага авалодаць Мінскам. Неўзабаве, таварышы, яны могуць атакаваць і станцыю, наш цягнік. Я ўзмацніў ачапленне, загадаў паставіць на гарышчы станцыі кулямёт, але... У іх, адчуваецца, таксама шмат зброі...

— Дачакаемся! Даперамаўляемся! — прыстрашыў Мяснікоў.

— Не, таварышы, абстрэл горада — гэта самая крайняя мера,— сказаў Ландар.— Агнём мы разбурым не толькі Мінск — найперш веру ў нас.

— А яны нас не пашкадуюць!

— І ўсё ж трэба дабівацца свайго мірным шляхам,— прамовіў Ландр і падаўся да выратавальнага тэлефона.

Але не паспеў падняць трубкі — зноў заявіліся тыя трое з чыгуначнага камітэта.

— Мы вылучаем новыя ўмовы,— казырнуўшы, сказаў знаёмы ўяад Адась Аўторак.— Народны сакратарыят больш дакладна падлічыў, колькі вы за сто дзён свайго панавання вінныя народу. Каля трыста тысяч. Аддасцё цяпер жа — праз паўгадзіны будзеце мець новенькі паравоз,— а пасля знарочыста прыстрашыў: — Перасцерагаю: наша разведка дакладвае, што мінскія ўскраі ўжо займае конніца Доўбар-Мусніцкага...

— А пяцьсот тысяч не хочаце? — ускіпеў Мяснікоў.— Ці мільён?

— Глядзіце самі,— нібы са спачуваннем, а на самай справе з пагрозаю зноў падаў голас паўвайсковец.— Больш мы сюды не прыйдзем, ушчуваць альбо прасіць не будзем. А паколькі мы з Доўбар-Мусніцкім саюзнікі, дык, можа, і ўжывём супраць вас зброю...

Акінуўшы ўсіх позіркам (ці не напужаліся?), Аўторак зрабіў працяглую псіхалагічную паўзу, а пасля, бачачы, што вялікага страху не нагнаў, зноў фарсіста казырнуў і, падаючы сам сабе годнасці, пакінуў станцыю.

— Проста на вачах нахабнеюць! — паматляў галавою Мяснікоў.— А мы цырымонімся...

— Што ж, ты кажаш праўду,— пахітаў галавою і Калмановіч,— Калі яны злучацца з рэгулярным польскім войскам, то гэта — ужо не жарты,— Павярнуўся да Мяснікова: — Што ж, перамовы спыняем. Рыхтуй, галоўнакамандуючы, апошнюю тут баявую аперацыю...

— Вось гэта па-дзелавому! — супакоіўся, нават узрадаваўся той і шустра падаўся да Вайсдорфа — начальніка аховы цягніка.

Ландар і Калмановіч замаўчалі. І адзін, і другі ўзбуджана, гнятліва захадзілі ў розных накірунках і позах па кабінеце: Ландар церабіў сваю бародку, а Калмановіч прасунуў руку пад вопратку і мацаў грудзіну — там, дзе трывожна білася сэрца. А час між тым бег. Вось мінулася апоўнач, пайшло на новы дзень.

Зазваніў тэлефон.

Трубку падняў найбольш блізкі да апарата Калмановіч — з падпухлымі ад бяссоння вачыма, але рэзкі, нервовы.

— Я — старшыня Народнага сакратарыята Беларусі,— пачуўся нібы знаёмы хрыплы голас, але на самай справе гэта гаварыў не парламенцёр, а хтосьці іншы.— Мы ставім вам апошні ультыматум: ці вы вяртаеце 500 тысяч, ці мы праз паўгадзіны пачынаем рашучы штурм станцыі і цягніка! Само на сабе зразумела, бой ёсць бой, жыццё ў ім нікому не гарантуецца...

— Чаму — пяцьсот тысяч? А можа, мільён? — паздзекаваўся Калмановіч.

— Мы ідзём па кампраміс. У нашых і сваіх інтарэсах.

— Ясна,— голас у Калмановіча пасталеў.— А цяпер слухайце наш першы і апошні ультыматум. Калі вы праз тыя ж паўгадзіны не падасцё нам сгіраўны паравоз, мы накрыем горад, вас ураганным агнём з гармат і кулямётаў!

— Варвары!

— Усё! — адчакапіў Калмановіч.— Заўважце час. Трыццаць хвілін вам на ўсё: і на роздум, і на ваша выратаванне.

Калмановіч рашуча паклаў трубку. Ён першы, а за ім і ўсе астатнія выйшлі на перон — тут пачынала ўжо рассейвацца начная цемрадзь і на ўсходзе пульсаваў, набухаў світанак. Цяў мароз, хрумстка рыпеў пад нагамі бела-шэры, сям-там з бліскучымі іскрынкамі снег.

Яны не пайшлі да платформы з браневіком, дзе цяпер мітусіліся байцы, ведаючы, што вайскоўцы на чале з Вайсдорфам і Мясніковым зробяць тое, што трэба, як след. Ландар разумеў: абстрэл Мінска — мусовая крайнасць, але ўсё роўна душой супраціўляўся гэтаму: пабурацца не толькі старажытныя будынкі, але і загіне шмат невінаватых людзей. Маўчаў. Заўважыў: усхваляваны і Калмановіч — раз за разам зыркае на свой гадзіннік і спрабуе ўбачыць, колькі ўжо хвілін прайшло з моманту адліку ультиматуму.

— Няўжо не пашкадуюць свой горад, сваіх людзей? — ціха запытаў.

Вось апошнія салдаты схаваліся ў браневіку — у наваколлі стала ціха-ціха, аж вусцішна. Як і перад сапраўдным боем.

Ад платформы з браневіком адарваўся і подбегам пачаў набліжацца сюды чалавек. Мяснікоў. Запыніўшыся, сказаў задыхана:

— Усё. Мы гатовыя.

— Праз дваццаць хвілін можна пачынаць...— ціха прамовіў Калмановіч.

Мяснікоў нічога не адказаў, зноў подбегам пашыбаваў — да платформы.

І тут у напружанай цішыні выразна пачуўся далёк! паравозны гудок, а неўзабаве данеслася ўжо і шпаркае чуханне. Праз хвіліну-другую станцыю асвяціў далёкі пук святла.

— Збаяліся-такі! — усцешыўся Калмановіч.

Як хутка ўбачылі, прыйшло аж два паравозы. Да іх накіраваліся гуртам: Мяснікоў, начальнік аховы Вайсдорф, Ландар і Калмановіч.

— Само па сабе зразумела, залпы адмяняем,— ужо пры пыхлівым паравозе крыкнуў на вуха Калмановічу Мяснікоў.— Калі маем два паравозы, то, лічу, адзін з нашымі людзьмі трэба паслаць наперад і праверыць мост цераз Свіслач.

— Давай,— махнуў са згодаю рукой Калмановіч. І Ландару, з палёгкаю ўздыхнуўшы: — Хадзем у свой вагон. Хоць прысядзем, а то зусім памлелі ўжо ногі.

Як бачылі, праз некалькі хвілін па камандзе Вайсдорфа трое байцоў узабраліся ў кабіну машыніста першага паравоза і загадалі таму выманеўраваць і ехаць да Свіслачы, а другі паравоз у гэты час таксама пачаў манеўраваць, каб стаць наперадзе іхніх вагонаў.

Даволі хутка паравоз, што быў у разведцы, вярнуўся — усё, як сказалі, было добра, дык яго, як і другі паравоз, пачалі прычэпліваць да вагонаў.

Ландар увесь гэты час стаяў каля свайго тамбура, хочучы на свае вочы бачыць, што і як робіцца. Хоць салдаты падганялі чыгуначнікаў і ўсё рабілася без лішняй затрымкі, але ўсё роўна час бег шпарка, а яны ніяк не маглі скрануцца з месца.

Нарэшце свіснуў паравозны гудок. Раз-другі.

— По вагонам! — пачулася гучная каманда Вайсдорфа.

Са станцыі, а таксама і з-за яе пабеглі сюды салдаты з ачаплення. Але не паспелі яны ўсе ўціснуцца ў вагоны, як ужо сюды, на перон, узбеглі цывільныя людзі з вінтоўкамі — відаць, баявыя дружыны гэтага наваяўленага Народнага сакратарыята. Праўда, яны не стралялі, не перашкаджалі садзіцца ў вагоны — канечне ж, іх ахалоджвалі наведзеныя на станцыю ствалы гармат і кулямётаў з платформы.

— Таварыш Ландар,— на падножку ўжо ўсчапіўся і Вайсдорф,— праходзьце, калі ласка, у вагон і станьце падалей ад акна. Чорт іх ведае, можа бабахнуць каторы...

Ён паслухмяна падаўся ў вагон — на самым пачатку яго стаяў Калмановіч і ўзіраўся ў акно. Цяпер адступіў, даў яму месца побач з сабою.

У вагоне было цёмна, але цёпла. Як адчуў Ландар, ад цяпла адразу ж запалымнелі шчокі.

Цягнік торгнуўся, заляскаў жалеззем, нават нібы пакаціўся назад, а пасля затросся, крануўся і пачаў пацíху набіраць ход, адкочвацца ад станцыі і горада, які яшчэ спаў і, канечне ж, не ведаў, што шумела-бурліла на вакзале.

Толькі ён хацеў не тое што сказаць, а падумаць з палёгкаю: «Усё, паехалі нарэшце!», як цягнік нечакана не то рэзка затармазіў, не то гвалтоўна тарганўся, тут жа гучна і адчайна засвістаў паравоз,

пачуўся лязгат-трэск, і гэты вагон быццам хіснуўся, быццам нават прыпадняўся — і Ландара, і Калмановіча ды Вайсдорфа аж адкінула ад акна да сцяны купэ.

Цягнік спыніўся.

— Што такое, ёлкі-палкі? — абуральна вырвалася ў Вайсдорфа. Тут жа, займеўшы раўнавагу і абапіраючыся абедзвюма рукамі аб сцены, падаўся на выхад. Ландар — за ім. Калмановіч — услед.

Сышоўшы на расчышчаны ад снегу насып і зноў удыхаючы марознае паветра, Ландар убачыў: іхні вагон мала сказаць закалыхаўся, ён увогуле сышоў з рэек і небяспечна стаў на краі ўзбочыны. Наступны вагон пагрозліва нахіліўся, а вагон з кулямётчыкамі зусім п獨ракуліўся.

— Падстроілі ўсё ж, гады, крушэнне...— вылаяўся Вайсдорф, прысеў, абгледзеў усё, а пасля падняўся і патлумачыў: — Падымаць вагоны, манеўраваць некалі, таварыш Калмановіч. З хвіліны на хвіліну можа быць і горшае... Раю: людзям з хваста цягніка выйсці, хутка перанесці ў ацалелыя вагоны кулямёты, тое-сёе з харчу і — гайда далей...

— Давайце,— суха адказаў старшыня Саўнаркома.

Вайсдорф падаў каманду — чырвонаармейцы высыпалі з вагонаў і пачалі хуценька пераносіць зброю і скрынкі з харчам, пасля перакулілі нахіленыя вагоны і прычапілі хваставыя. Ландар з Калмановічам тупалі па ўзбочыне, мусіць, абодва аднолькава люта палымнеючы злосцю на станцыйных чыгуначнікаў і на верхаводаў з Народнага сакратарыята — канечне ж, якраз тыя падбухторылі ўчыніць гэтую аварыю.

Падышоў Мяснікоў.

— Можа, смалянём па станцыі на развітанне? — запытаў.— Падзякуем як след за такія праводзіны?

— Не,— кортка кінуў Калмановіч.— Будем вышэй злачынства і асабістай крыўды...

Праз паўгадзіны, калі пачало ўжо світаць, яснецца паваколле, цягнік зноў крануўся, пакінуў Мінск і хутка паімчаў на Смаленск.

3

Лашковіч сустрэў паасобку дзесяткі тры цывільнага люду, пяць баявых дружын і паслаў усіх на Саборную плошчу. Пазней, калі ўвабралася ў сілу ноч, ніхто больш не прыходзіў.

Ён, напісаўшы тое, што яму даручалі, паляжаў крыху нераспрануты на канапе, спрабаваў заснуць, але не змог — мусіць, ад вялікага

ўзбуджэння. Паварочаўся крыху і не вытрымаў самоты, падаўся да сваіх.

Каля прыцемненага ўвахода ў штаб Народнага сакратарыята яго затрымалі вартавыя. Спачатку запыталі пароль, а пасля загадалі запыніцца — адзін з узброеных ахоўнікаў ггадаўся ў дом і пеўзабаве прывёў адтуль старшага. Той, асвяціўшы яго ліхтаром, пазнаў у твар, дазволіў зайсці, сказаў, што сёння іхні пароль у горадзе «Над Бацькаўшчынай чыстае неба».

У былым губернатарскім кабінеце, цяпер скупа асвечаным адною лямпай, закіданым паперамі, сядзелі абапал пастаўленых літарай «Т» амаль усе «міністры», сярод іх і тыя, хто далучыўся да беларускага руху зусім нядаўна: эсэры Макрэеў, Бялевіч, Рэдзька, Белкінд, Злобін, паалейцыяніст Гутман. Заадно, нібы мухі на агонь, самі прыбіліся сюды і былы галава Гарадской думы член ЦК Бунда Ванштэйн, меншавік Пайкес, эсэр Шумскі, той-сёй з кадэтаў і іншых усерасійскіх партый, хто не меў і не будзе мець душы да беларускай справы, але хто вымушапы прыстаць да іхняга берага па волі лёсу.

Лашковіч запыніўся, прыпёрся каля вушака і запыніў пільны позірк на гэтым розным людзе ў дыхтоўным паліто і футрах, у вайсковых шынялях, сялянскіх кажушках альбо ватоўках.

«Мусіць,— падумаў,— меў рацыю Чэхаў, калі гаварыў: часам не так звязвае любоў, сяброўства, павага, як агульная нянавісць да чаго-небудзь».

Пасярод стала важна сядзеў адзін з новых іхніх лідэраў Янка Аўторак — у зашпіленым шынялі і вайсковай фуражцы. Ён то падымаў тэлефоннуто трубку і слухаў, штосьці раіў, то званіў сам кудысьці, ушчуваў, заклікаў да большай смеласці і напорыстасці.

Большая палова душою, сэрцам адчула яго ўчэпісты назірк — павярнулі сюды галовы адразу некалькі чалавек.

— Максім, чаго ты як сірата? — махнуў яму рукою Баравік,— Хадзі сюды, будзем мазгаваць разам!

Ён падышоў, сеў на вольным крэсле напрыканцы стала, моўчкі дастаў з нагруднай кішэні згорнуты ў трубку лісток і падкінуў Баравіку.

Той узяў, разгарнуў і, прабегшы вачыма па напісаным, ажывіўся:

— Вось, спадары, накід Устаўной Граматы да народаў Беларусі. Паслухайма.

І пакуль Аўторак, крыху адвярнуўшыся, зноў гаварыў з кімсьці па тэлефоне, Баравік пачаў чытаць, а пасля першы пахваліў:

— Добра!

Здаецца, спакойна слухалі грамадоўцы і саюзнікі-эсэры, а вось новыя «прыяцелі», як заўважыў Лашковіч, перажываюць хваравіта: хмурны, з навіслымі чорнымі бровамі лідэр мінскіх меншавікоў-падпольшчыкаў Пайкес нервова прыкусіў губу, эсэраўскі важак Шумскі зацерабіў рыжую бародку, а Ванштэйн у душы раўніва, а на выгляд паблажліва ўхмыльнуўся: бач, як шпарка лапатнікі рвуцца з гразі ў князі!

— Якое ваша слова, спадары? — зноў ажыўлена запытаў Баравік.

— Не спешите ли? — падаў голас Пайкес.— Ведь неизвестно, что скажут немцы...

— Відаць, што пан Пайкес доўга сядзеў у пограбе, не вылазіў на свет...— нечакана па-беларуску загаварыў Ванштэйн.— Здаецца, толькі ён адзін не ведае, што спадар Аўторак разам з іншымі калегамі не хаваўся, быў на мірных перамогах у Брэсце, здолеў словам-другім перакінуцца сам-насам і з немцамі. Калі савецкая дэлегацыя не прызнала беларускую, то нямецкая, наадварот, сустрэла прыхільна, дазволіла аб'явіць дэкларацыю, дзе патрабавалася прызнаць Беларусь як дзяржаўную адзінку... Так што, пан Пайкес, цяпер немцы ставяцца перад дэ-факта...

Пайкес звяў. Баравік пераможна ўсміхнуўся:

— Якія яшчэ будуць пытанні, парады? Мы, не ў прыклад Мяснікову ды Ландару, нікому не затыкаем рот, не навешваем ярлыкі!

Руку падняў Шумскі, адзін з нядаўніх заядлых ворагаў. Цяпер, чырвоны, узбуджаны, ён крактануў раз-другі, а пасля загуў:

— Во-первых, нужно более четко сказать об общих нынешних усилиях наших партий, а во-вторых, подчеркнуть, что мы желаем сохранить и упрочить революционные демократические завоевания...

— Што яшчэ? — запытаў Баравік, на хаду тое-сёе папраўляючы ў напісаным Лашковічам.

— Лично я хочу знать яснее: какими видит Народный секретариат взаимоотношения с немцами? — зноў падаў голас Шумскі.

— Трэба ясна сказаць нашым сялянам пра зямлю,— услед за ім прамовіў засяроджаны, худы Нядоля.

— Мы не можам, спадары, адразу ўсё патлумачыць,— ухіліста і абачліва прамовіў Баравік, абводзячы ўсіх позіркам.— Спачатку мы абнародуем наш погляд на цяперашнюю сітуацыю. І землякам, і немцам. Пасля абнародуем і больш канкрэтную праграму. А што датычыць немцаў, то мы павінны быць абачлівыя з імі, але заадно і патрабаваць свайго...

— Я згодны,— падняў руку Ванштэйн.— Але ад сябе прашу: скажыце, калі ласка, адно-другое слова, што дакляруеце іншародцам нацыянальна-персанальную аўтаномію.

— Што — расчляніць Беларусь на астраўкі? — успыхнуў, ускідваючы бровы на круты лоб Пячэрскі.

— Вы ж, паважаны, добра слухайце,— спакойна адказаў яму Ванштэйн.— Я не гавару пра нацыянальна-тэрытарыяльную, а толькі пра нацыянальна-персанальную аўтаномію. Гэта значыць, я, іншыя нацмены павінны ведаць: вы, беларусы, стаўшы пануючым народам, не будзеце прыгнятаць, асімілёўваць нас, як мы ўсе асімілёўваліся дасюль. І другое. Трэба не замінаць, каб адраджаліся органы Часовага ўрада — Мінская гарадская дума і Мінская губеранская земская ўправа. У знак падзякі, думаю вы будзеце мець ад нас значную помач.

— Як я разумею, вы марыце найперш аднавіць сваю ўладу, верную экс-старшыні Керанскаму? — запытаў высакалобы, вусаты Жытнік.— А нас, каранных, зноў адпіхнуць убок?

— Я так не мару,— памякчэў, расшпіліў на сабе шыкоўнае паліто Ванштэйн,— Па-першае, цяпер якраз вы ў сіле, а па-другое, я за тое, каб мы ўсе разам фарміравалі беларускую дзяржаву. Як і напісана ў накідзе, на сумесным Усебеларускім Устаноўчым Сойме, скліканым на самай дэмакратычнай аснове.

— Як для нас, дык дагэтуль не было і знаку дэмакратыі, а як для некага, то мы павінны быць звыш шчодрыя! — забурчаў Жытнік.

— Такая ўжо наша планіда...— пахітаў галавою Баравік, а пасля Ванштэйну: — Народны сакратарыят абдумае вашу просьбу.— І да ўсіх: — Ну, а цяпер, спадары, давайце паслухаем новую рэдакцыю Першай Устаўной Граматы.

Усе згадзіліся. Баравік важна, як і трэба міністру, пачаў чытаць:

«Родная старонка наша апынулася ў новым цяжкім стане. Дзе цяпер улада, што была тут, няведама, мы стаімо перад тым, што край можа быць заняты нямецкімі войскамі. Мы павінны ўзяць свой лёс ва ўласныя рукі. Беларускі народ павінен здзейсніць сваё права на поўнае самаазначэнне, а нацыянальныя меншасці — на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію. Правы нацыі павінны знайсці сваё здзяйсненне шляхам склікання на дэмакратычных асновах Устаноўчага Сойму. Але і да склікання Устаноўчага Сойму ўся ўлада на Беларусі павінна належаць тым народам, якія на ёй жывуць, Выканаўчы камітэт Рады першага Усебеларускага з'езду, папоўнены прадстаўнікамі рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасцяў, здзяйсняючы мэты З'езду, абвяшчае сябе часовай уладай на Беларусі для

кіравання краем і склікання, як можна хутчэй, Усебеларускага Установчага Сойму на аснове агульнага, простага, роўнага, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права для ўсякага дарослага, ня лічачыся з нацыянальнасцю, вызнаннем і родам. Часовую народную ўладу краю, якая ставіць сабе мэтай абарону і зацверджанне заваяванняў рэвалюцыі, будзе здзяйсняць створаны намі Народны сакратарыят Беларусі, які ад гэтага дня пачаў выконваць свае абавязкі. Пэрсанальны склад сакратарыяту будзе апублікаваны пасля».

— Ну, як? — калі прачытаў, Баравік падняў шавялюрыстую галаву і зычліва акінуў усіх позіркам.

— Добра,— першы з усіх пахваліў гэтую Грамату Ванштэйн.

Астатнія таксама адобрылі. Моўчкі.

— Ну а калі будзем абнародваць гэтае слова? — запытаў Баравік.

— Ужо заўтра,— прамовіў Шуляк.

— Не, сябры,— асцярожна стрымаў Ванштэйн.— Не варта задзірацца з немцамі. Спачатку трэба было б перакінуцца словам-другім з імі, а пасля ўжо больш-менш ясна гаварыць пра будучыню краю.

— Ці разумная ўжо такая звышасцярога? — як заўсёды, пахмурна спытаў Шуляк.— Лічацца з дужым і смелым, а не з баязлівым!

— Ну і экстрэмізм, дружа, ды яшчэ ў ваенны час, вельмі не паспрыяе,— спакойна астуджаў гарачыя галовы Ванштэйн.— Каб мы мелі сілу, былі нараўне з немцамі, то мы не толькі не мелі б з імі гешэфту, але далі б у зубы і адагналі прэч! Няма сілы — гні спіну, прасі...

У гэты час Аўторак паклаў трубку, зняў фуражку і, выціраючы лысую галаву, адвабіў усіх ад спрэчкі навіною:

— Спадары, Еўзікаву з дружынамі ўдалося адцясніць атрад Абадзінскага за Даўгабродскую і Каломенскую вуліцы. Перагароджваюць шлях Доўбар-Мусніцкаму да цэнтра барыкадамі. Усе асноўныя мінскія ўстановы, а таксама электрастанцыя, дэпо, крамы, пошта і тэлеграф пад нашым кантролем. Цяпер уся ўвага — на вакзалы...

— Я не раіў бы, сябры, счэпліваццa і з легіянерамі,— перасцярог Ванштэйн.— З фанабэрыстым і пыхлівым панствам трэба паводзіцца віртуозна. Цешыць яго самалюбства і гнуць сваё. Іначай яно сілаю захопіць Мінск і аб'явіць тут польскую ўладу.

— Ні Расія, ні Германія не згодзяцца, каб тут была Польшча,— падаў голас Аўторак,— Наадварот, яны ўвесь час заціскалі яе, не давалі ходу ні на Усход, ні на Захад.

— Каб прадухіліць канфлікт, можа, мне пайсці на перамовы з Доўбар-Мусніцкім? — запытаў у Аўторка Баравік, маючы на ўвазе, што ён добра ведае польскую мову, а таксама здольны і пастаяць за сябе, і саступіць у меру.

— Давай,— нешматслоўна згадзіўся той.

— Хадзем, Максім,— запрасіў Баравік. Канечне, з-за таго, што ён, Лашковіч, асабіста знаёмы з камандуючым польскага войска.

4

Баравік, Шуляк, Жытнік, Заходка і Лашковіч, хто ўзброены вінтоўкаю, хто рэвальверам, моўчкі крочылі па цёмпым, нібы вымерлым і ў той жа час трывожным горадзе: спачатку рыпелі хрумсткім шэрым снегам па аслоненай высокімі дамамі былой Губернатарскай, пасля — па яснейшай Захараўскай і вось, мінуўшы ціхую, пакрытую лёдам Свіслач, шыбалі па Даўгабродскай.

Лашковіч тупаў, апусціўшы галаву. Меў дзіўнае адчуванне: ці то займаецца цяпер чымсьці сур'ёзным, ці то штосьці імітуе. Можа, гэтая няўпэўненасць была ад таго, што ніяк не мог змусіць сябе думаць: ты — не толькі былы настаўнік, вучоны без званняў, эсэр-катаржанін, ты — член Выканкома Рады Усебеларускага з'езда, значыць — дзяржаўны муж! Але ніколі не быў ва ўладзе, не ведаў яе сілы і смаку, дык і не мог пераламаць сябе на іншы лад. Храбрыўся, а ў душы нейкі прыкры шашаль усё еў нечань: куды і чаго ты, мужык, лезеш?! Ты ж не які-небудзь Ванштэйн; той сядзеў ужо ў кіруючым крэсле, дык і мае права зноў прагнуць руля! Можа, і дзеля яго гатовы хаўрусаваць і з табой. Абы быць на паверхні!

Калі мінулі з вечнай пячаткай цішыні і мудрасці могілкі, Лашковіч падняў галаву: воддаль, можа, ужо і ў канцы вуліцы, на выгане палыхаў агонь. Праўда, яго языкоў не было відаць: полымя шугала за дамамі, высвечвала ўвесь небакрай, і ўгору ды сюды, пранізваючы ноч, імкнуліся яго далёкія водсветы. Ад іх снег не то жаўцеўся, не то па-крываваму барвовеў. Калі пачалі набліжацца, то кінулася ў вочы: жоўта-чырвоныя водбліскі ад агню ярка, нібы ад люстэрка, адбіваюцца ў шыбінах цагляных і драўляных хат.

Неўзабаве ўжо з узгорка згледзелі як след: за гарадской ускраінай на выгане палае адразу аж некалькі вогнішчаў. Крокаў за сто да іх, на самым канцы вуліцы — барыкады. Каля іх — людзі. Доўгія цені ад іх падаюць аж сюды, ім над ногі. Ясна, сцяміў Лашковіч, кастры гараць дзеля таго, каб высвеціць як на далоні гасцей — часці Доўбар-Мусніцкага, якія, па чутках, павінны вось-вось заявіцца тут.

Далёка, можа, і на вакзале, раз-другі даў свісток паравоз, завыла вадакачка. Не, значыць, горад не вымер, ён жыў сваім жыццём.

Адарваўшыся ад умерзлага ў снег і лёд вясковага плота-частаколу, ім дарогу перагарадзіла трое ўзброеных вінтоўкамі мужчын: адзін — у шынялі, другі — у кажушку, трэці — у ватоўцы.

— Пароль? — запытаў паўвайсковец.

— «Над Бацькаўшчынай чыстае неба»,— адказаў Баравік.

— Праходзьце,— пачуўся той жа голас, і патруль саступіў ім дарогу.

Хутка яны падышлі да паўасветленых барыкад — зваленых у адну гару саней, бочак, бярвенняў. Каля іх таўклося каля сотні людзей, а на заслоне было прыладкавана некалькі гармат і кулямётаў. Насустрач ім выйшаў вайсковец. У каракулевай папасе, шынялі і пры пагонах. Еўзікаў. Ого, палкоўнік! На некалькі званняў падрос за адзін дзень!

— Што чуваць?— запытаў у яго Баравік, пазіраючы на добра асветлены выган-упадзіну, за якім таксама асвятляўся край прыгараднай вёскі.

— Была польская разведка,— адказаў Еўзікаў,— З хвіліны на хвіліну павінны падысці першыя часці.

— Які настрой у легіянераў? — пацікавіўся Баравік.

— Здаецца, памяркоўны. Адчуваецца: Доўбар-Мусніцкі загадаў не канфліктаваць з намі. За вёскаю,— Еўзікаў махнуў пальчаткаю на поўдзень,— дэлегацыя Абадзінскага. Будуць сустракаць сваіх. Астатнія збеглыя з турмы легіянеры, кажуць, рабуюць вайсковыя склады і сейфы.

Еўзікаў замоўк, уталопіўся на недалёкую вёску: з яе вымкнуўся белы конь, за ім — іншыя, цёмныя, і неўзабаве ўжо аж застракацела ў вачах ад коней і людзей на іх.

— Пайшлі,— прамовіў Еўзікаў, молада крутнуўся, спрытна перадолеў барыкаду і пайшоў насустрач таму, хто першы ехаў на белым кані. Яны, Лашковіч са сваімі падарожнымі, ледзьве паспявалі за ім.

Лашковіч крочыў і адчуваў: па-здрадніцку неўтаймоўна забілася сэрца, а цела скаланае дрыготка. Мусіць, ад трывогі: палічацца з імі легіянеры ці не?

Крокаў за пятнаццаць Еўзікаў замаршыраваў па-страявому, крокі за тры запыніўся пасярод дарогі і ўскінуў правую руку да скроні. Коннік — а гэты важны вайсковы чын быў ужо не ў форме былой царскай арміі, а ў цьмяным (на самай справе зялёным) казакіне, аблямаваным смушкаю, з невялікім каўняром, на якім былі пятліцы, з двума радамі бліскучых гузікаў на грудзіне, у адмысловай фуражцы з арлом — лена падняў руку з некалькімі сагнутымі пальцамі. З яго запясця павіс невялікі спрытны бізун. Збоку вісела шабля ў ножнах, а ў тых, хто быў за ім, за плячыма тырчалі карабіны.

— Палкоўнік Еўзікаў — ваенны камендант і начальнік гарнізона горада Мінска,— па-вайсковаму цвёрда на беларускай мове адчаканіў нядаўні Лашковічаў калега па звальненні. Павярнуўся да іх.— А

таксама — дэлегацыя Народнага сакратарыята Беларусі, які з сённяшняга дня трымае ўладу ў Мінску.

— Генерал Пухальскі,— спакойна і важна адказаў чаканы госць. Пасля дастаў з-пад казакіна і, трошкі нагінаючыся, падаў Еўзікаву пакет, але без, як належыць, сургучнай пячаткі.

Еўзікаў падышоў, узяў, разарваў і, паколькі тут было больш-менш светла, пачаў чытаць. Лашковіч за гэты час убачыў, што да генерала пад'ехаў і запыніўся каля яго малады вайсковец. Здаецца, знаёмы. Ага, ды гэта ж — зямляк Алеся Нямкевіча. Гарбуковіч ці як там яго. Каб быў тут побач і Алесь, дык цікава, а заадно і трагічна было б: свае людзі, з адной вёскі, а трэба было б быць па розных баках барыкад! Лёс! І не першы раз за доўгую гісторыю!

Еўзікаў, прачытаўшы ліст, перадаў яго Баравіку. Той — зусім хутка яму, Лашковічу.

«Панове! Спадары з Рады Усебеларускага з'езда! — на лісце з бланкам Польскага корпуса пісалася спачатку па-польску, а ніжэй і па-беларуску.— Шчыра і сардэчна віншую вас з вызваленнем ад бальшавіцкай навалы! Прашу прыхільна сустрэць маіх легіянераў, Вашых саюзнікаў па барацьбе супраць нацыянальнага прыгнечання польскага і беларускага народаў, а таксама маю ласку прасіць як след размясціць іх — пераважна ў паўднёва-ўсходняй частцы Мінска. Я загадаў афіцэрам і салдатам корпуса захоўваць лаяльнасць і не ўмешвацца ў Вашыя палітычныя клопаты. Пра вышэйсказанае я паведаміў ужо нямецкаму камандаванню, якое прыхільна ставіцца да нас з Вамі. З павагай Ваш генерал Доўбар-Мусніцкі».

— Мы не адмаўляемся супрацоўнічаць,— таксама без збянтэжання сказаў госцю-генералу Баравік,— Толькі давайце ясна і дакладна абазначым па карце мяжу паміж нашымі ўзброенымі сіламі.

«Малайчына! — у думках пахваліў яго Лашковіч.— Добра гучыць: «Паміж нашымі ўзброенымі сіламі»!

Гарбуковіч хутка патлумачыў усё на польскай мове генералу — той спачатку ўважліва паслухаў, а пасля, як згледзеў Лашковіч, ухмыльнуўся, насмешліва акідваючы позіркам то Баравіка ў паліто і капелюшы, то Еўзікава, які сам сябе крыху падвысіў у званні, іх, астатніх «урадоўцаў», то зусім на непрыступныя барыкады і жменьку ўзброенага люду за імі. Але ўголас генерал нічога пе прамовіў, махнуў рукой з бізуном — тут жа з-за спіны выехаў на рыжым кані малады афіцэр з вузенькімі заліхвацкімі вусікамі, наблізіўся да Еўзікава, саскочыў долу і дастаў з планшэта карту Мінска.

Калі яны перамовіліся і чырвоным алоўкам правялі мяжу, падзяліўшы горад, лічы, на дзве палавіны («Ці будзе мець якую-небудзь сілу

гэтая, на першы погляд, джэнтэльменская дамова?» — з трывогаю падумаў Лашковіч, акідваючы позіркам з-пад акуляраў шматлікае польскае коннае войска), Еўзікаў загадаў сваім людзям адкаціць і аднесці ўбок нацэленыя на дарогу гарматы ды кулямёты, разбіраць барыкады.

— Ведаеце, панове, вы мяне здзівілі! — ужо зычліва ўсміхнуўся пазней генерал, калі спешыўся і рукаўся з імі.— Па-першае, у вас шмат высокіх мужчын! Я ўяўляў па вашых земляках, што ў нашым корпусе: вы нізкія і каржакаватыя. Аж вы ладныя хлапакі! Ні адна армія не адмовілася б ад такіх малайцоў! Па-другое, надта ж скора вы зарыентаваліся! Мы, чэсна сказаць, не чакалі такога вашага спрыту!..

5

Назаўтра, надвячоркам, Нямкевіч і Васілевіч у дамоўлены час зноў прыйшлі на сустрэчу ў скверык каля Саборнай плошчы.

Учора нікога тут не дачакаліся. Але вось цяпер каля заснежанага кветніка тупаўся чалавек — шчуплы, гонкі, сутулаваты, у кароткім густа нацёртым цэглаю кажушку і заечай аблавушцы, бледны і з вялікімі сумнымі вачыма. Алесь Нядоля. Паэт, былы эсэр, а цяпер грамадовец.

Сустрэў іх з юнацкай сарамлівай усмешкаю, першы падаў руку.

— «Вы не чакаеце прывітання ад свайго дзядзькі?» — са здзіўленнем, але разважліва, слова ў слова паўтарыў завучаны пароль Васілевіч.

— «Мой дзядзька павінен сам прыехаць»,— як і трэба, адказаў Нядоля. Зноў усміхнуўся. Прыязна, цёпла. Ад таго, што гэтак глыбока ўразіў іх.

— Ты — патайны бальшавік? — адразу пецярпліва атакаваў яго цікаўны Васілевіч.

— Больш сустракацца тут не будзем...— стрымана зусім пра іншае сказаў Нядоля, і Васілевіч адразу ж астыў, адчуўшы, што часамі не варта лішне пытацца.

Нядоля ж хітнуў галавою на былы губернатарскі дом, над дзвярыма якога ўжо вісеў бела-чырвона-белы сцяг:

— Мае з вамі інструктары не прадбачылі, што якраз насупраць будуць вокны «Беларускай камендатуры»... Па-другое, да Еўзікава просіцца былы агент ахранкі Сінілаў — кажуць, вельмі хітры ліс. Так што трэба быць асцярожнымі.

Прамовіў і павёў іх са скверыка да будынка былога акруговага суда, дзе ў свой час судзілі і Лашковіча, і Нядолю, і яго, Нямкевіча,

адтуль — па схілістай вуліцы, пасярод якой была расчышчаная палоса для конкі, уніз, да Свіслачы.

— Сыходзіцца будзем вось тут, каля гэтай вярбы,— неўзабаве ляпнуў далонню па старым нізкім, раскідзістым, з патрэсканай карою дрэве, у шчыліны якога хтосьці панатыкаў спаленыя запалкі і паперкі ад цукеркаў.— Ну, а цяпер пару слоў пра тваё нецярпенне, Сымон. Не, хлопцы, я не бальшавік. Але я паверыў ім і хачу спрыяць іхняй задуме. Для падпольнай работы яны пакінулі не толькі нас. Вы будзеце трымацца за мяне, я — за іншых, а тыя будуць трымаць сувязь са Смаленскам і Масквою.

Пайшлі ўздоўж няроўнага, спаласаванага дзіцячымі санкамі свіславіцкага берага.

— Наш з вамі клопат такі,— па хаду расказваў Нядоля.— Будзем сачыць за кожным крокам Доўбар-Мусніцкага, нямецкага камандавання, а таксама за тымі нашымі, хто пачне хаўрусаваць з акупантамі. Як бачыце, гэтыя суткі ў горадзе напружана, легіянеры фанабэрацца, бывае, нават раззбройваюць нашы патрулі на нашым жа баку, рабуюць, але на большае не лезуць. Не з-за вялікай любові да Народнага сакратарыята, а з-за боязі да немцаў. Ведахоць: тыя прыгрэлі Віленскую раду, не супраць пагуляць і з намі ў Мінску.

Дайшлі да гарбаватага моста, па якім у гэтыя хвіліны белы, у чорныя яблыкі конь шпарка цягнуў фаэтончык на санях, павярнулі назад. Можа, і ўсе падумалі пра тое, што сёння ў горадзе зноў, нібы з-пад зямлі, з'явілася шмат фаэтонаў, багата апранутых людзей, і Мінск з пурытанскага пачынаў вяртаць ранейшую губеранскую пампезнасць. Але ўголас ніхто пра гэта не сказаў. Сапраўды, у кожнага побыту свае манеры, свая філасофія і псіхалогія.

— Значыць, вы ўжо заўтра павінны прыйсці ў Народны сакратарыят,— вучыў Нядоля.— Пакайцеся, папрасіце даравання. Трэба, каб вы зноў былі тут. Хоць бы радавымі руху.— Нечакана адышоў убок, закашляўся (кажуць, і ён хворы на сухоты. Іх наўмысна прывілі яму ў маскоўскай турме). А калі вярнуўся, дадаў: — Пакуль што настрой у Народным сакратарыяце супярэчлівы. Адны — за цесны саюз з Доўбар-Мусніцкім, «апалячаным беларусам», другія — з «моцнай Германіяй», трэція — з Расіяй, не зважаючы на выбрыкі Мяснікова, чацвёртыя — супраць усіх, толькі за сябе. Нам трэба трапіць ва ўсе фракцыі. Да германафілаў, думаю, варта прымкнуць табе, Сымон.

— Ды не ляжыць для гэтага ў мяне душа, Алесь,— зморшчыўся Васілевіч.— Гэтым, лічы, загадзя асуджаеш сябе на народную пагарду!

— Спачатку, можа, будзе і пагарда,— згадзіўся Нядоля,— Але пазней час усё расставіць на сваё месца. Цяпер якраз табе, Сымон, аднаму з лідэраў мінскіх грамадоўцаў, чалавеку гарачаму, найбольш паверацъ, калі ты будзеш бэсціць Ландара і Мяснікова ды клікаць шукаць ратунку ў Германіі. Табе, Алесь, з памяркоўным, разважлівым характарам, нашчадку белых католікаў, лепш за ўсё імітаваць сімпатыю да Доўбар-Мусніцкага.

— Ну, а сам да якой фракцыі прыхілішся? — запытаў Васілевіч.

— Да «незалежнікаў»,— адказаў Нядоля.

— Калі можаш, адкажы шчыра: што ты цяпер думаеш на самай справе пра сённяшнюю сітуацыю, пра наш рух? — зноў зацікавіўся Васілевіч.

— Ясна, хлопцы...— усміхнуўся той.— Не думайце, калі ласка, што я і вершы пішу, і ў руху нашым бяру ўдзел без любові да свайго. Не. Я сапраўды хачу самаазначэння Беларусі. Але я супраць вымольвання яго ў акупантаў. Я — за саюз з Расіяй, без якой, паверце, нам не ўтрымацца. Значыць, раз мы з душой да Расіі і бальшавікоў, то і яны павінны ўважыць нас. Тое, што Ландар, Мяснікоў, Кнорын і іншыя, якія дасюль трымалі тут усё ў сваіх руках, не прызнавалі ні нас, ні Беларусі, яшчэ не апошняе бальшавіцкае слова. Партыя, Ленін, веру, будуць болей уважлівыя і мудрыя. Паверце і вы ў гэта.

— Я ўжо разгубіўся,— прызнаўся Васілевіч,— каму верыць, а каму не?

— Калі мы, хлопцы, якраз у гэтую цяжкую для бальшавікоў часіну паможам найперш ім, то яны, думаю, рана-позна як след ацэняць гэты жэст.— Запыніўся, падаў руку Васілевічу,— Дамовіліся?

— Дамовіліся.

— І з табой, маўчун? — пацiснуў руку і Нямкевічу.

— І са мной,— адказаў ён, — У мяне, прызнаюся, яшчэ даўняя сімпатыя да бальшавікоў. З дарэвалюцыйнага часу.

— Ну й цудоўна! — усцешыўся Нядоля.

Пасля, калі іхні старшы сувязны пайшоў сваёю дарогай (на новую сходку Народнага сакратарыята, які засядаў, лічы, няспынна), Васілевіч пабег кудысьці па сямейных клопатах, а Нямкевіч шпарка, угнуўшы галаву, пакрочыў да «Новага тэатра», што быў на скрыжаванні Захараўскай і Багадзельнай вуліц.

Ужо за Губернатарскаю хтосьці паклікаў яго па мянушцы:

— Дзед!

Ён рэзка запыніўся, падняў галаву: хто і адкуль кліча? Ага, Лашковіч. Ідзе вунь ад мужчынскай гімназіі — можа, і ад Мухі.

— Куды гэтак разагнаўся? — запытаў, падаючы руку. Усё ў леташнім, купленым з рук паліто, у знаёмым старым капелюшы. Толькі вось шалік новы — зялёны, варсісты.

Нямкевіч чамусьці сумеўся. Здаецца, найбольш, што сустрэўся якраз з ім, Лашковічам — земляком, пакутнікам. Бадай, як ніхто, няўдачнікам.

— Прызнавайся: чэшаш да мамзелі?

— Да зямлячкі,— збянтэжана ўсміхнуўся ў адказ.— Яна — Волька. Сястра Петруся Супраневіча, які...

— Што ж, гуляць, цешыцца з нечымі маладымі сёстрамі — добрая рэч, мець сям'ю, жыць як чалавек — увогуле цудоўна! — уздыхнуў Лашковіч,— Але ж хто, хлопцы, павінен цягнуць крыж? Муха затаіўся, Скураны ўсё яшчэ крыўдзіцца ды сам ірвецца ў лідэры, вы з Сымонам адвярнуліся... Дык з кім чагосьці дабівацца? Са сваімі няданімі непрыяцелямі?

Сароміць. Але ўжо не так рэзка ды нецярпіма, як бэсціў летась, у канцы года. Здаецца, нават запрашае зноў ісці разам.

— Чуў, што мы пачалі рабіць гэтыя дні?— запытаў. Мякка, зычліва.

— Чуў.

— Ну й што кажа люд?

— Здаецца, сімпатызуе вашаму Народнаму сакратарыяту,— трохі паліслівіў Нямкевіч,— Многія глядзяць як на заступнікаў.

— Хоць нарэшце, можа, паразумнеюць крыху,— пацешыўся Лашковіч.— Ну, а вы што з Сымонам? І драпака не далі, і ад нас адбіліся?

— Мы не ведаем, што цяпер рабіць...— рашыў, як кажуць, пусціць слязіну Нямкевіч. Апусціў вочы. Не мог сустрэцца з Лашковічавым чэпкім позіркам. Перад ім не толькі маніць, але і недагаворваць вельмі цяжка.

— Вяртайцеся, блудныя сыны, у лона царквы! — спагадна прамовіў Лашковіч.— Калі ўзялі былых непрыяцеляў, то не адмовімся ад вас, ветэранаў руху...— Усміхнуўся, ляпнуў па плячы.— Ну бяжы! Спалучай хэнць да дзяўчыны з клопатам пра Бацькаўшчыну! Заўтра сачы за навінамі: сюды прыбываюць немцы, а мы павінны абнародаваць вельмі важны дакумент!

Лашковіч зычліва падштурхнуў, і Нямкевіч з палёгкай пашыбаваў далей. Ён які ўжо час асцерагаўся сустрэцца нос у нос з гарачым і жорсткім Лашковічам, баяўся: той адразу ж разгадае яго цяперашнюю тайну. Ажно выйшла ўсё лепш, чым думаў.

Неўзабаве згледзеў: Волька ўжо чакае яго. Вунь у валёначках, новым кажушку і белай пуховай хустцы, зграбная, стаіць каля адна-

павярховага, прадаўгаватага, на фоне блізкага трохпавярховага Польскага банка нізкага, з вузкімі зашторанымі вокнамі кінатэатра і чытае вывешаныя паміж вокнамі афішы са здымкамі з фільма.

Калі яе брат Пятрусь разам з іншымі міліцыянерамі падаўся пехатою на ўсход, на Смаленск, Волька адразу ж загарэлася вяртацца дадому, у Янкавіны.

Ён угаворваў застацца ў горадзе, даць у царкве на запаведзь і перайсці жыць да яго, але яна не згадзілася, змусіла ісці на вакзал — браць білет на стаўбцоўскі цягнік. Але выехаць з Мінска ёй не ўдалося: на станцыі сказалі, што цягнікі на Стоўбцы ўжо не ходзяць. Той бок ужо з тыдзень акупаваны немцамі. Волька паплакала ад адчаю, пакаялася, што ў такі вірлівы час уздумала падацца ў свет, а пасля пабрыла разам з ім, аддаўшы свой лёс у яго рукі...

Нямкевіч ціха падышоў. Гарэзна абняў Вольку і цмокнуў у шчаку. Яна ўздрыгнула ад нечаканасці, але сёння ўжо не папікнула, што вось такое вытварае на людзях. Праўда, на пацалунак не адказала і позіркам з ім не спяшалася сустрэцца — канечне ж, ад маладога сораму з-за таго, што адбылося ў іх у пазамінулую ноч...

— Гэта — я,— прашаптаў, тулячы сваю шчаку да яе.

— Ды чую, што ты...— адказала. Здаецца, не вельмі каб весела.

— Шмат чакала? — запытаў з віною.

— Не.

Адпусціў. Яна на міг падняла на яго вочы і тут жа сарамліва адвяла іх. Пайшлі. Да блізенькай Багадзельнай — насупраць, на гмаху Польскага банка, вісеў бел-чырвона-белы сцяг. Такія ж сцягі вунь па ўсёй цэнтральнай Захараўскай вуліцы. З тумбаў, як паспеў ужо заўважыць, паздзіраны старыя, савецкія афішы, аб'яўкі і сям-там ужо наклеены розныя лісткі на беларускай мове.

— Выбачай,— папрасіў.— Сустрэў сябрука, перакінуліся словам-другім.

— Я не злуюся па цябе,— адразу ж зразумела яго тон.— Я... Ну, брыдка мне...

— Чаго?

— Гуляю, гультую...

— Адпачні,— паспрабаваў супакоіць яе.— Хіба мала ўжо нагаравалася на полі, на сенакосе альбо дома?

— Там цяжка было, а тут разлянуюся...— Усміхнулася. І дакорліва паматляла галавою,— Божа, колькі люду не робіць, а ўдзень бадзяецца па вуліцы?! Хто іх толькі апранае і корміць?!

— Каб ты ведала, сярод гуляк не толькі дармаеды. Наадварот, шмат тых, хто недзе працуе,— патлумачыў,— У вёсцы ўзімку людзі

сядзяць па хатах, а тут любяць пашпацыраваць, пачуць навіны альбо што-небудзь купіць.

— І яшчэ...— Прамовіла Волька і не дагаварыла.

— Што — «яшчэ»?

— Пакуль стаяла адна, дык аж двое падышло. Адзін — маладзы, лупаты, а другі — пажылы, жывацісты. «Барышня, вы не мяня падждаеце?»

— Дык гэта ж добра!

— Што — «добра»?! — здзівілася. Аж падняла свае густыя броўкі.

— Паглядная, стройная ты ў мяне!

— От кажаш...— Нібы папікнула, але, здаецца, усцешылася, што ён якраз вось так сказаў. Але не ўтрывала, зноў напала на горад: — Шмат спакусы ўсякай — шмат і распусты...

— Пажывеш тут болей — зменіш думку. Вось паглядзіш.

Трошкі паблукалі па Багадзельнай вуліцы (як ён у душы ні хацеў, але Волька па прыкладзе гарадскіх кабет не асмельвалася ўзяць яго пад руку), з любасцю паглядзелі на Петрапаўлаўскую царкву, дзе яны былі пазаўчора, блаславіліся, каб стаць мужам і жонкаю, а пасля зайшлі ў кінатэатр. Спачатку патупалі ў фае, дзе яшчэ раз агледзелі знаёмыя ўжо здымкі модных замежных кінаакцёраў, а таксама карціны мінскіх мастакоў, а пасля падаліся ў залю — досыць вялікую, з мноствам радоў крэсел, скупа асветленую і, як адчувалася, халодную. Відаць, новы гаспадар, Лідскі — кажуць, далёкі сваяк Лідскага-літаратара, які цяпер вяшчае ў Петраградзе — эканоміў на святле і цяпле.

У залі было не шмат люду. Лічы, усе маладыя. Найбольш дзяўчаты. Нямкевіч з Волькаю селі ззаду ўсіх.

— Не глядзі так...— папрасіла яна, намагаючыся сядзець струнка і засяроджана пазіраць на сцэну.

— Чаму?

— Няёмка... Падумаюць абы-што пра мяне...

— Няхай думаюць. Яны не ведаюць жа нас, а мы — іх!

— Сяроўна...

Неўзабаве патухла святло, над іхнімі галовамі застракатаў апарат — ад яго на белую шырму на сцэне паласнуў светлы пук. Спачатку на шырме абазначыўся чатырохкутнік, а ў ім усё мільгала, перакрыжоўвалася, а то і выбельвалася да рэзі ў вачах, што Волька і сёння аж закрылася далонню, а потым мітусня запынілася і з'явіліся літары. Тут жа задрынкаў на піяніна схаваны за шырмаю музыкант, а пазней, калі пачалі паказвацца на экране людзі, іграў то хутка і гучна, то ціхенька — у лад таму, што адбывалася ў кіно.

— Што гэта за паны? — запытала Волька.

— Невысокі барадаты вайсковец — цар Мікалай, кабета ў белай сукенды і капялюшыку — царыца, а за імі — усякія паны,— адказаў ён, у душы абураючыся, што гэты Лідскі паказвае сёння не падакляраваны замежны фільм, а выцягнуў на свет з запечка кіно пра таго, хто ўжо адрынуты самой гісторыяй. Непрыемна, нават прыкра пазіраць цяпер, як цар з царыцаю самаадрачона моляцца, нібы міла гладзяць па галовах дзяцей, як іхняя світа шыкоўна балюе, бессаромна зводзіць народнае дабро.

— Я нічога не разумею, што там робіцца...— прызналася Волька.

— Нам паказваюць, якія добрыя цар і царыца, як яны клапоцяцца пра Айчыну і свой народ,— шэптам адказаў ён, беручы яе руку. Цяпер, у паўзмроку, яна з ахвотаю дала яе, закахана адказвала на поціскі, а калі ён нахіляўся, то і асцярожна, на імгненне-другое падстаўляла яму вусны.

Пазней, калі ўжо ішлі дадому, заўздыхала:

— Я не разабралася, што там паказвалі, але адно ўбачыла добра: чыста, хораша і багата жывуць на свеце людзі! Не тое што мы ў сваіх Янкавінах!

— Цяпер, Волька, няма ні цара, ні таго жыцця.

— Значыць, нехта іншы будзе гэтак раскашоўвацца!

— Цяпер, можа, будзе ўсё іначай.

— Я цёмпая, нічога людскага дагэтуль не бачыла, Алеська,— яшчэ глыбей уздыхнула.— Але ведаю: хто пануе, той і шыкуе. Хто гне спіну, абліваецца ад поту на рабоце, той заўсёды гаруе, скібінцы хлеба рады...

— Цяпер, Волька, можа, пачнецца жыццё, пра якое дагэтуль нават і не снілі!

— Не ведаю,— пацiснула плячыма.— Але здаецца мне, што пры любой уладзе адны будуць працаваць, а другія жыраваць...

— Давай верыць у лепшае!

Яна не адказала. Адкуль і што магла яна ведаць пра тое «лепшае»?! Ды і ён нічога не знаў пра гэта. Але падбадзёрыў. Каб падняць яе дух, умацаваць веру і надзею, без чаго чалавеку жыць цяжка, а то і ўвогуле няма чаго спажываць патрэбнае ўсім паветра. Затым, калі вярнуліся ўжо на сумесную сваю кватэру, мітуслівa памагала гаспадыні, стараючыся той дагадзіць, і ўвесь час аж гарэла ад сарамлівай чырвані, што прыйшла сюды, да Алеся, а ўрэшце, калі патушылі святло і абое прытуліліся пад коўдраю, выдыхнула з болем:

— Можа, пагарачылася я, Алеська? Брыдка неяк. Без шлюбу, без вяселля жыць пачалі...

— Калі не кахаеш, дык што ж, кайся...— пачаў шукаць ён не столькі дакоры, як тое, што супакоіла б яе.

— Што ты гаворыш, Алеська? — зноў, як і апошнія дні, не то пакрыўдзілася, не то здзівілася, што не разумее яе сумненні.

— Калі я табе хоць трохі любы, дык і не кайся. Будзем радавацца, што якраз тут, у Мінску, сышліся нашы сцежкі-дарожкі! — Прашаптаў, прыгарнуў яе, нібы зусім малую, кволую, трапяткую, лёгка знайшоў яе вусны, прыпаў да іх.

Яна спачатку імкнулася яшчэ штосьці сказаць, паскардзіцца альбо падакараць сябе, але пасля ўспыхнула ад сваёй маладой крыві і запаліла адмысловым агнём яго, яшчэ прагнага да жыцця, да маладога шалу.

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

### 1

Зранку 21 лютага па Лібава-Роменскай чыгунцы ў горад паволі прычухкаў паравоз, абчэплены воінствам у шэра-зялёных шынялях, у вастраверхіх бліскучых касках і з вінтоўкамі ў руках.

Немцы!

Паравоз запыняўся каля гарадскіх пераездаў — з яго злазілі тры-чатыры салдаты і абгледжвалі масты, а заадно і ўсё пад імі, а пасля ехалі далей — да Віленскага вакзала. Тут, выстраіўшыся на пероне, іх пачціва сустрэў патруль на чале з Адасём Аўторкам, які за гэтыя дні вярнуў на плечукі шыняля свае капітанскія нагоны.

Паравоз запыніўся, даў працяглы прывітальны гудок і густа пыхнуў белым дымам у ранішняе шэрае неба — з падножкі паволі і важка сышоў сярэдніх гадоў худатвары, рабацiністы афіцэр з шашкай. Спакойна падышоў і казырнуў:

— Іх бін обэрлёйтнант Шранк. Фарштэей зі дойч?[4]

— Яволь[5],— ускінуў руку да скроні Аўторак.

І далей:

Ш р а н к *(аскетычна і суха).* З кім я маю гонар гаварыць?

А ў т о р а к. Я — памочнік начальніка мінскага каменданта.

Ш р а н к. Я маю загад разведаць сітуадыю ў Мінску.

А ў т о р а к *(усхвалявана).* Бальшавікі адышлі. Цяпер горад падзелены: у адной палавіне — легіянеры Доўбар-Мусніцкага, у другой — мы, Народны сакратарыят Беларусі.

---

[4] Я — паручнік Шранк. Разумееце па-пямецку?

[5] Але

Ш р а н к *(па-дзелавому суха).* Асабіста вы — карэнныя?

А ў т о р а к *(насцярожана і з хваляваннем).* Але. Я — капітан Аўторак, памочнік каменданта і начальнік гарнізона горада Мінска.

Ш р а н к *(непарушна і рашуча).* Я маю загад кантактаваць якраз з вамі. Як памочнік мінскага нямецкага гораданачальніка павінен перадаць, што вам трэба:

1. Урачыста сустрэць пямецкуто армію і ўспрыняць яе місію як вызваленчую;

2. Размясціць штаб нашай 10-й арміі, камандуючага генерала Эрыха Фолькенгейма, усіх генералаў і афіцэраў, нашых доблесных салдат;

3. Паспрыяць, каб у горадзе быў лад, працавалі ўсе ўстановы, крамы, рэстараны, кінатэатры і публічныя дамы, туалеты, каб кожны наш воін змог адпачыць і не адчуваў да сябе варожага настрою.

А ў т о р а к *(пакутуючы ад такога загаднага тону, але з асцярогаю).* А што вы, пан паручнік, нясіцё нам, прыгнечанаму царом і бальшавікамі народу?

Ш р а н к *(па-ранейшаму без эмоцый).* Я не ўпаўнаважаны, пан капітан, гаварыць на гэтую тэму.

А ў т о р а к *(узрушана, але стрымана).* Я папрашу, пан паручнік, перадаць свайму камандаванню наш маніфест, які мы сёння аб'явілі свайму народу,— дастаў з кішэні і падаў госцю паперыну са словамі «Першай Устаўной Граматы да народаў Беларусі».— А што да вашай просьбы, я тэрмінова перадам яе ў Народны сакратарыят.

Ш р а н к *(пачуўны гэтае «а што да вашай просьбы», упершыню ўсміхнуўся, прыплюшчыўшы вочы і крывячы вусны. Пасля падняў левую руку, адхіліў кончык рукава і, зірнуўшы на гадзіннік, сагнаў з твару і гэтую, мусіць, прыемную яму ўхмылку, зноў строга прамовіў).* Праз паўтары гадзіны, пан капітан, тут, на гэтым пероне, мы чакаем ваш славуты хлеб-соль...

Аўторак ад такой нахабнасці нічога не мог адказаць, толькі моўчкі, сцяўшы вусны, казырнуў — пасланец ужо назначанага мінскага нямецкага гораданачальніка задаволіўся, і, таксама ўскінуўшы руку, крутнуўся, і падаўся да паравоза.

Калі візіцёры-разведчыкі ад'ехаліся, каб усцешыць сваё камандаванне, што «Мінск каля нямецкіх ног», Адась Аўторак не вытрываў і пры падначаленых, якія нічога не зразумелі з іх адмысловай перамовы, але былі прыгнечаныя ад убачанай ухмылачкі пямецкага афіцэра, узарваўся:

— Ашчаслівіў! Старымі тэўтонскімі замашкамі!

**2**

Роўна праз паўтары гадзіны, як кажуць, цюцелька ў цюцельку, на Віленскі вакзал важка прыпоўз доўгі цяжкі цягнік, на паравозе якога развейваўся чырвона-бела-чорны, з вялікім чорным арлом германскі сцяг. З вокнаў, з тамбураў, шчыльпа прыткнуўшы твар да твару, выцікоўвалі вайскоўцы. Іхнія твары былі засяроджаныя і строгія. Ці то важнічалі, ці то выяўлялі свой звычайны характар, які ішныя народы лічаць за нямецкую пыху.

Цягнік суцішваў і суцішваў ход, пасля торгнуўся, заляскаў жалеззем і ўрэшце запыніўся. Нейкі час ніхто не саступаў з яго; толькі праз хвіліну-другую ў вагоне, што стаў якраз насупраць увахода ў вакзал, адчыніліся дзверы, і ў праёме паказаўся высокі і мажны мужчына ў чаравіках, цемнаватых штанах з чырвона-залатымі лампасамі, у дыхтоўным шынялі з двума радамі бліскучых гузікаў, з бліскучымі пагонамі і высокай фуражцы. Пажылы, з бухматымі светлымі вусамі, сінявокі.

Ён спачатку падняў вочы на вастравежавы другі наверх вакзала: там, на яркіх шпілях (на адным з якіх вісеў бела-чырвона-белы сцяг), на даху са светлай бляхі, на белых узорыстых карнізах і ў трох вузкіх, але доўгіх вокнах, гулялі ранішнія маладыя, вясёлыя сонечныя промні. Першы ж, выцягнуты ўздоўж пуцей наверх асвятляўся яшчэ скупа, густа рудзеў ад некалі чырвонай, а з часам пабурэлай цэглы, а на гладкім шэрым пероне ўлёгся цень ад вагонаў, падзелены клінкамі — ад прасветаў паміж вагонамі. Агледзеўшы чужы сцяг ды сонечны верх вакзала, генерал апусціў позірк па людзей: на саліднага, у чорным паліто з рыжым бабровым каўняром і бабровай шапцы Скураnога з кіёчкам, на шарэнгу маладых дзяўчат у фіялетавых андараках з бела-чырвона-зялёна-сінімі палосамі, у белых, з чырвонымі арнаментамі фартухах і рукавах, сініх гарсэтах ды белых з чырвонаю вышыўкай намітках — самая сярэдняя дзяўчына ўрачыста і годна трымала на белым, з чырвонымі ўзорамі ручніку бохан хлеба з салонкаю. Пасля важны госць агледзеў генерала Пухальскага у зялёным казакіне з корпуса Доўбар-Мусніцкага, палкоўніка Еўзікава ў шынялі і папасе, цывільных Абадзінскага і Ванштэйна, абодвух у капелюшах і з акулярамі, а таксама гурт пасланцоў ад усіх мінскіх слаёў, што тоўпіўся ззаду, пры самым вакзале. Апроч Еўзікава, больш ніхто з Народнага сакратарыята сюды не прыйшоў; сам падахвоціўся прывітаць немцаў «ад імя тутэйшых нацыянальных сіл» Скураны, які добра ведаў нямецкую мову і якога маглі тыя ведаць як былога важнага саноўніка; Народны сакратарыят у гэтыя пікантныя хвіліны рашыў

застацца ў цяні. Тым больш што было нямала тых, хто рашуча адмовіўся кланяцца, як яны сказалі, заваёўнікам.

Генерал паволі апусціўся на перон — за ім услед пачалі выходзіць старэйшыя афіцэры з гэтага класнага, з іншых вагонаў.

— Гутэн таг, майнэ Гэррэн![6] — заззяўшы, нібы артыст, высокі армейскі нямецкі чын казырнуў Скураному. Пасля напружыўся і, цяжка падбіраючы словы, дадаў: — Я віншуй вас, панов'е, з вызваленьне... бальшавіц... ярма!

Усцешыўся, што выгаварыў загадзя завучанае на памяць, і зусім па-прыяцельску падаў руку невысокаму, таксама шчодраму на артыстычную ўсмешку бываламу саноўніку Скураному.

— Данке! Данке шон![7]— увішна і пачціва схіліў ён галаву. І, пазіраючы генералу ў вочы, намагаючыся зазірнуць яму ў душу, зашпарыў далей: — Мы, беларусы, а таксама сыны іншых нацый і народнасцей, шчыра рады сустракаць вас, нашых вызваліцеляў з-пад расійскай і бальшавіцкай няволі, рады паднесці вам наш гасцінны хлеб-соль! Просім у наш горад, пан генерал!

Той уважліва слухаў, таксама глыбока зазіраў Скураному ў вузкія хітрыя вочы і задаволена хітаў галавою, нібы памагаючы гаварыць жаданыя для яго вуха нямецкія словы, а заадно быццам п'ючы нектар з чутага. Пасля, калі невысокі Скураны перастаў падымацца на дыбачкі, каб хоць дацягнуцца галавою да пляча вайскоўцу, і саступіў убок, генерал падышоў да невысокай, у меру паўнаватай русявай дзяўчыны, адшчыкнуў на трэшчынцы бохана невялікі сухі кавалачак, тыцнуў у соль, укінуў у рот, пажаваў і, падняўшы ўверх палец, закрактаў:

— Гут! Вундэрбар![8]

Пасля юрліва, хоць быў пажылы ўжо, з сіваватымі тоўстымі вусамі і сівымі скронямі, ужо з многімі не сваімі, а ўстаўнымі залатымі зубамі, абгледзеў спрытныя плечукі, поўныя грудзі, малады і свежы тварык русяўкі, ляпнуў раз-другі яе, збянтэжаную, запалымнелую, па шчацэ:

— Айнэ шонэ Мэдхен![9]

Не азіраючыся, махнуў рукой — ззаду, з афіцэрскай світы, шпарка вымкнуўся рыжак, Шранк, і аддана зірнуў у вочы. Генерал штосьці ціха буркнуў — Шранк хуценька адшпіліў свой карычневы, з жоўтаю

---

[6] Добры дзень, панове!
[7] Дзякуй! Вялікі дзякуй!
[8] Добра! Цудоўна!
[9] Красуня!

акантоўкай партфель, дастаў з яго стос шакаладных плітак і, ужо таксама прыязна ўсміхаючыся, раздаў іх дзяўчатам.

Генерал схіліў галаву перад імі — з падзякаю ды ад свайго захаплення дзявочай красою, а пасля, раптоўна сагнаўшы з твару ўсмешку, перавёў позірк на паважлівую дэлегацыю. Тут як тут каля яго зноў апынуўся Шранк і пачаў па-руску тлумачыць услед за начальнікам, які вёў далей сваю дыпламатычную місію:

— Панове! Камандзір адной з нашых слаўных дывізій генерал Карл Фінкельштэйн дзякуе за цёплы прыём. Як добра сказаў ваш калега, нямецкая армія прыйшла ў Мінск і пойдзе далей на Усход не з заваёўніцкімі, а якраз з гуманнымі намерамі. Мы не збіраемся захопліваць вашы землі, занявольваць вас. Мы хочам вызваліць вас, Расію ад бальшавіцкай дэспатыі, прынесці вам доўгачаканы мір, лад, спакой. Жывіце, працуйце сабе на здароўе, гаспадарце ў сваім доме самі. Умешвацца, тым болей насільнічаць, як гэта рабілі бальшавікі, мы не збіраемся. Нямецкая грозная, але справядлівая зброя нацэлена не на расійскія народы, а на жменьку ўзурпатараў, што спажылі момант і захапілі ўладу, спрабуюць узбунтаваць і падпарадкаваць увесь свет. Наша наступленне — гэта адзіны разумны спосаб выратаваць род людскі, вас ад нячыстай сілы...

Прамовіўшы, генерал зноў артыстычна ўсміхнуўся, бліскаючы жоўтымі зубамі, а пасля паблажліва пляснуў у далоні — за ім дружна запляскала яго непарушная, строгая світа, а таксама і дэлегацыя.

— А цяпер я папрашу мінскія ваенныя ўлады памагчы нам як след раскватэраваць нашы часці.

Тут жа з гурту рухава выйшаў Еўзікаў з Адасём Аўторкам і, паказваючы на карце, пачаў, падбіраючы нямецкія словы, тлумачыць генералу, дзе і якія казармы былой рускай арміі можа ўзяць сабе яго воінства.

Калі ўсё ўладзілі, генерала і яго штаб запрасілі прайсці за вакзал, дзе іх чакалі легкавікі, санкі з коўдрамі, вагоны конкі, і навезлі ўсіх на кватэры. Праз хвіліну-другую на вакзале, паволі перакідваючыся ў горад, загучалі рэзкія нямецкія каманды:

— Габахт! Рухт! Рэхтс ум! Лінкс ум! Маршырэн марш! Курзэр Шрытт! Онэ Шрытт![10]

Калі роты, батальёны выйшлі і пастроіліся на вакзальнай плошчы, наперад вымкнуўся атрад маскарадна апранутага нямецкага аркестра, задзьмуў у бліскучыя медныя трубы і рушыў у горад. За ім, падымаючы галовы і насупліваючыся ад бравурнага пераможнага маршу,

[10] Смірна! Вольна! Направа! Налева! Шагам — марш! Карацей крок! Шырэй крок!

затупацелі страевікі, а неўзабаве начало ўязджаць і новае папаўненне — кавалерысты на масіўных, таўстаногіх конях і пяхота на грузавіках. Гэтыя нямецкія салдаты, што стаялі за высокімі бартамі ў шэра-зялёных шынялях, з насунутымі на самыя вочы каскамі, з вінтоўкамі і цьмянымі цесакамі, былі нібы каменныя, пазіралі цяжка і сапраўды звысоку.

Пасля полудня пямецкая салдатня паразыходзілася па прытоеным, пакорлівым Мінску, накінулася ў лаўках па булкі, сала і кумпякі, купляючы іх за нямецкія маркі, а пасля паперлася ў кінатэатры, у паркі. Афіцэры павалілі ў рэстараны.

**3**

Увечар, калі сонца (яно сёння то выблісквала на блакітным небе, то некалькі разоў за дзень хавалася за шэрай паваліокаю) асела за небакрай, у рэстаране гасцініцы «Еўропа» пачаўся банкет.

У пласторнай, асвечанай электрычнай люстрай зале стаялі сталы літараю «П», пасярод, на самым ганаровым месцы, селі генерал Фінкельштэйн і Скураны, які за апоншія дні ажывіўся, нават заззяў, адчуваючы свой зорны час. Па правай генералавай руцэ парассаджваліся яго старшыя афіцэры, а на левай Скуранога — яго прыхільнікі, пасланцы мінскага купецтва, у тым ліку і яўрэйскага, людзі са старога, царскага, апарата, органаў Часовага ўрада, а таксама запрошаны Лашковіч, які ведаў нямецкую мову.

Вось падняўся з фужэрам шампанскага Скураны — пахуднелы, але жвавы, у чорным дыхтоўным гарнітуры, камізэльцы, белай кашулі і чорным, з белымі палосачкамі гальштуку. Такія ж, як кажуць, выглянцаваныя, былі і ўсе астатнія яго калегі — хацелі выглядаць перад немцамі не лапатнікамі, а выкшталцонымі еўрапейцамі. Нават і безграшовага, і неахвочага да «саноўнага» адзення Лашковіча прыбралі шыкоўна — за кошт аднаго з прысутных тут купцоў-мільянераў, які здолеў зберагчы сваё золата ад Саветаў.

— Господа! — паварочваючы галаву на выпрамленых, у парадкай форме і з рэгаліямі на грудзіне нямецкіх афіцэраў, мякенька прамовіў Скураны.— Поскольку ваш переводчик не знает белорусского языка, я, как и условились, буду говорить по-русски.— І далей: — Руская мова — цудоўная мова. Але яна, будучы моваю рускіх цароў, чыноўнікаў, а нядаўна і Часовага ўрада, Саветаў, нарабіла нам шмат шкоды. Вось паўтары сотні гадоў ёй выцясняюць, душаць нашу старажытную мову, афіцыйную мову былога Вялікага княства Літоўскага, свядома русіфікуюць нас, забіваюць нашу душу. Скажу шчыра: мы вельмі чакалі рэвалюцыі, ускладвалі на яе вялікія надзеі. Але

дарма. І Часовы ўрад, і Саветы, як да іх і цары, не пажадалі лічыцца з намі, не пакраталі нават пальцам, каб даць нам, шматмільённаму народу, дзяржаўнасць, права на родную мову, культуру, на ўласнае імя. Пагэтаму шчыра і сардэчна сустракаем вас у лепшым мінскім доме із сімвалічнаю назвай «Еўропа». Мы — гэта пасланцы найбольш свядомых, настроеных з сімпатыяй да вялікай Германіі беларусаў...

Рабаціністы Шранк, які сядзеў каля генерала, тут жа затлумачыў усё па-нямецку; гаспадары, каго называў Скураны, прыпадымаліся і схілялі галовы.

— А таксама тут, за гэтым сталом, і пасланцы многіх іншародцаў краю, члены палітычных партый, у тым ліку і ўсерасійскіх,— знаёміў далей Аўторак.— Член ЦК Бунда і былы галава Мінскай думы пан Ванштэйн, адзін з лідэраў Паалей-цыёна Гутман, лідэр мінскіх сацыялістаў-рэвалюцыянераў Шумскі, лідэр мінскіх меншавікоў Пайкес. Тут — і, як кажуць, дзелавы свет: купец пан Нобель і ўладальнік вядомай на ўвесь Мінск крамы пан Левін.

Калі пазнаёміў, Скураны, то пакручваючы ў руках фужэр і пазіраючы на іскрыстае бурштынавае віно, то падымаючы вочы на спакойных, толькі цікаўных нямецкіх афіцэраў, вёў сваю прывітальную, а заадно і разведчыцкую прамову далей:

— Мы добра ўяўляем, хто да нас прыйшоў. Нямецкі воін. Мужны, гераічны, нават, можа, жарсткаваты. Але мы ведаем: гэты воін — не дзікун, а еўранеец. Адукаваны, культурны і гаспадарлівы чалавек...

Трошкі скаваныя гаспадары заляскалі.. Пачакаўшы тлумачэння, ажывіліся, падтакнулі воплескамі і генерал з афіцэрамі.

— Мы лічым, што ў гэтага воіна-чалавека яшчэ і чулае, высакароднае сэрца. Як і ў тых у Берліне, хто вас сюды паслаў. Таму мы з надзеяй глядзім на вялікую Германію: якраз на яе цяпер кладзецца гістарычная місія — зберагчы свет ад бальшавіцкай эпідэміі і заадно заступіцца за прыгнечаныя народы былой царскай Расіі. Асабіста мы ўскладваем усе свае запаветныя мары і спадзяванні найперш на вас: вы можаце памагчы нам ажыць з попелу, паставіць на ногі нашу маладую дзяржаву, каб мы, як пісаў наш паэт, занялі свой пачэсны пасад паміж народамі! З гэтай шчырай надзеяй я і падымаю тост за нямецкую армію-вызваліцельніцу, за вялікую і культурную Германію!

Пасля велічна ўстаў і выпраміўся рослы рыжаваты, з глыбокімі залысінамі генерал.

— Дзякуем за такія прыемныя словы, пан Скураны,— прамовіў ён, таксама трымаючы ў руцэ фужэр шампанскага.— Як я ўжо сказаў сёння на вакзале, мы сапраўды прыйшлі сюды і пойдзем, калі трэба будзе, далей толькі з гуманнымі мэтамі. Мір, лад, справядлівасць —

вось наш дэвіз руху на Усход. Іншага, паверце, мы не маем у душы. Таму рады бачыць, што вы разумееце нас, хочаце пасаюзіцца. За дружбу і згоду, панове!

Затым, калі замацавалі саюз звонам фужэраў, трошкі падсілкаваліся, прамовы пасыпаліся адна за адною: скажа слова гаспадар, тут жа ўстане хто-небудзь і з гасцей, шчодра дадасць красамоўства да таго, што ўжо гаварылі. Найбольш немцы таўклі ў ступе пра сваю міласць і паважлівасць, а таксама хвалілі беларускую кухню, са смакам уплятаючы салату, парэзаныя скрылі кіслай капусты, аблітыя смятанаю салёныя грыбы, сухую кілбасу, паляндвіцу, бліны з мачанкаю, дзе былі яшчэ катлеты і рабрынкі. І самагонку цягнулі прагавіта, крэкчучы ад задавальнення ды ад таго, як яна агнём пячэ ў горле ды ў жываце.

Недзе а палове дзесятай асалавелы, набрынялы чырванню генерал Фінкельштэйн падняўся з поўнай, як кажуць, аглаблёвай чаркай. Злёгку патыцкаў па вуснах белаю хустачкай і падрыхтаваўся гаварыць. Значыць, хоча падзякаваць і збірацца ўжо на сваю кватэру.

— Бэстэн Данк, майнэ Гэррэн, фюр дэн гэрцліхэн Эмпфанг! — прамовіў ён.— Данке, данке шон![11]

— Біттэ! Кайнэ Урзахэ![12]— падхапіўся таксама пачырванелы Скураны. Услед за ім усталі і ўсе астатнія.

Генерал яшчэ раз падзякаваў ім усім кіўком галавы, а пасля крактануў і дадаў:

— Мы не супраць і яшчэ доўжыць наш цудоўны баль, але мусім пакінуць гэты гасцінны будынак сапраўды з сімвалічнаю назвай...— Зірнуў на гадзіннік.— Праз трыццаць хвілін, панове, наступіць камендацкі час і ўсіх, хто запозніцца, затрымаюць і прывядуць у арыштанцкую...

Скураны і іншыя гаспадары, як кажуць, ледзь не праглынулі языкі: што — ахоўваць лад у горадзе будзе не беларуская камендатура? Немцы не раяцца, а самачынна робяць усё, што ім хочацца?

— Выбачайце, панове,— убачыўшы іхнюю разгубленасць, сказаў Фінкельштэйн.— Ваеннае становішча змушае нас падбаць пра бяспеку нашага войска...— Усміхнуўся, але і ў той жа час пільна ўсіх агледзеў, нядобра прыплюшчыў блакітныя, цяпер, пры святле, бясколерныя вочы.

Пасля, калі выйшлі на марозны двор, да асветлепага вайсковымі нямецкімі ліхтарамі легкавіка, генерал — ужо ў шынялі, фуражцы, у

---

[11] Дзякуем, панове, за цёплы прыём! Дзякуй, вялікі дзякуй!
[12] Калі ласка! Няма за што!

пальчатках — улучыў хвіліну, узяў за гузік паліто сцішэлага Лашковіча, адвёў убок.

— Мне сказалі, што вы блізкія да вашага Народнага сакратарыята,— прамовіў.— Вы, паважаныя, сёння зрабілі ажно тры памылкі. Першае: не прыйшлі сустракаць нас. Другое: паспяшаліся абнародаваць Маніфест пра свой урад без нашай згоды і без згоды Берліна. І трэцяе: вы не вывесілі ў горадзе ніводнага нашага сцяга...

Строга паківаў перад носам пальцам, нібы гаспадар парабку, падыхаў гарэлкаю, а потым, быццам не бачачы, што ўражаны Лашковіч хоча тое-сёе патлумачыць, а то і запытаць, вярнуўся з усмешкаю да аўтамабіля.

Неўзабаве, калі немцы раз'ехаліся на машынах, што рэквізавалі для сваіх патрэб Еўзікаў, да прыгнечанага Лашковіча падышоў Скураны і цікаўна запытаў паўшэптам:

— Э-э, што ён табе сказаў?

— Каб мы цяпер меней плялі інтрыгі, меней клапаціліся толькі пра сябе, а болей дбалі пра наша святое...— рэзка адказаў той. Пстрыкнуў па носе старому хітруну, які вельмі ж увіваўся каля нямецкага генерала, разы са тры мімаходзь, а то і адкрыта гундзеў таму, што бальшавікі адабралі ў яго жыллё і маёмасць, давялі да галечы, а пра тое, пра што трэба было гаварыць найбольш, нібы забыўся.

**4**

Назаўтра да Васілевіча зноў завітаў узбуджаны Скураны.

Цяпер, як і раней, у лепшыя свае часы, той выглядаў адмыслова, па-панску. У шыкоўным паліто з рыжым бабровым каўняром, такога ж колеру папасе, з белым шалікам і з чорным кіёчкам. Вяльможны, ганарысты. Ужо ні кроплі не падобны на таго, якім быў яшчэ ўчора-пазаўчора,— разгублены, нават панікльі, апушчаны.

Скураны спакойна і санавіта зайшоў у былы свой кабінет з бібліятэкай, звысоку і з выклікам зірнуў на яго (а ён сядзеў за пісьмовым сталом і пісаў артыкул), буркнуў:

— Ну, здароў, таварышок...

Не столькі павітаўся, колькі пакпіў. І далей:

— Глядзі ты, які выслужлівы савецкі чыноўнік! Гаспадары збеглі, кінулі-рынулі ўсё, а ён пільнуе імі нарабаванае...

Васілевіч адказаў на такое непачцівае прывітанне, але ў гамонку не кінуўся — Скураны, бачачы гэта, неяк адразу астудзіўся, паволі сцягнуў папаху, паклаў верхам на стол, укінуў у яе чорныя скураныя пальчаткі, расшпіліў паліто і патупаў кароценькімі ножкамі ўздоўж

кніжных шаф, учэпіста ўзіраючыся ў роўненька пастаўленыя кнігі розных памераў і колераў.

— Усё, э-э, на месцы? — нібы пажартаваў, а на самай справе кальнуў, нібы шылам.— Не папасвіўся?

— Каб гэтае дабро было вашым, дык, можа, і пажывіўся б,— рэзка прамовіў ён.— А раз яно стала народным, то бярог і берагу яго.

Скураны аж сцепануўся:

— Ха-ха! Народнае дабро!

— Народнае. У аснове сваёй.

— Што ты хочаш сказаць?

— Тое, пра што падумалі і вы...

— Я нічога ні ў кога не ўкраў. А вось твае новыя сябры, бальшавікі, укралі гэта ў мяне.

— Нацыяналізавалі. Як народнае.

Скураны падышоў, стаў насупраць. Выпнуў жывоцік. Не такі абвіслы, як летась, але ўсё роўна прыкметны.

— Усё, таварышок...— Ухмыльнуўся.— З сённяшняга дня гэты «народны» дом, ці, лепш сказаць, народная прыбіральня зноў становіцца маёй законнай маёмасцю. Так што, таварышок, прыйдзецца пайсці адсюль прэч і панесці з сабой увесь бальшавіцкі дух!

Васілевіч душой адчуў: Скураны здолеў як след падкаціцца да вышэйшага нямецкага камандавання, і тое пайшло яму насустрач, вярнула ягоны палац.

— Зноў становіцеся буржуа? — пакпіў ужо Васілевіч.

— Станаўлюся,— храбрыўся той.— Беларускім буржуа. Адным з нямногіх, адным з самых свядомых і верных народу, які мала варты і маёй свядомасці, і маёй вернасці...

Бачачы, што за апошнія дні Скураны наводшыбе, а ход падзей узялі ў свае рукі іншыя, людзі з Народнага сакратарыята, Васілевіч ужо не адчуваў вялікай патрэбы цырымоніцца альбо гуляць са Скураным, як гуляў да нямецкага прыходу ў Мінск. Пагэтаму ён цяпер сækануў таму ў вочы:

— Калі б вы шчыра дбалі пра народ, дык не завіхаліся б сюды перабірацца.

— Дазволь запытаць — чаму?

— Няхай бы тут і далей быў рабочы беларускі клуб.

— Ох, які шчыры, добранькі за чужы кошт! — ашчэрыўся Скураны.— А што шчырае, добрае зрабілі мне гэтыя рабочыя-мінчукі? Нічога! Бо разам з камісарамі абражалі, трэслі, ставілі да сцяны, абрабавалі, выкінулі на вуліцу, паламалі, папалілі мэблю, знішчылі старыя і дарагія карціны, па-хамску снаганілі будынак! Дык што — я

павінен не зважаць на ўсё гэта, туліцца ў каморцы і назіраць, што будзе далей?

Сеў. Насупраць.

— Не, дарагі. Калі яны да сваей, як ты кажаш, народнай маёмасці такія варвары, то не варты такой ласкі. На далейшы глум дабро я не аддам.

Уталопіўся маленькімі прыплюшчанымі хітрымі вочкамі.

— Так?

Васілевіч не адказаў, пачаў збіраць і складваць у просценькую папяровую папку свае паперы.

— Так, дарагі. Яны ап'янелі ад волі, не, не столькі ад волі, як, э-э, ад нацкоўвання, па бальшавіцкім кіўку рынуліся нішчыць цывілізацыю, дабро, лічачы, што нішчаць стары свет... Яны не бачылі, што бальшавікі далі б ім крыху пасвавоііць, выпусціць гнеў, злосць, непрыязнь да адукаваных і багатых, а пасля жалезнай рукой загналі б іх у стайню... І немцы, думаю я, суцішаць, змусяць падпарадкоўвацца, стагнаць, але кланяцца...— Развёў рукамі.— Бо іншага выйсця, каб закілзаць раз'юшаны натоўп, няма... Ні адной уладзе не абысціся без насілля...

Бачачы, што Васілевіч намерыўся ісці адгэтуль, затрымаў:

— Прысядзь. Пагамонім, э-э, троху.

Васілевіч затрымаўся.

— Вось, да слова, хачу ведаць, што ты думаеш пра немцаў?

— А вы?

— Ну я, сам бачыш, задаволены імі. Сустрэлі мяне хораша, вярнулі маю маёмасць, згодныя кантактаваць са мной як з палітычным дзеячам... А вось да тваіх нядаўніх калег, сацыялістаў, яны насцярожаныя.

— Ад чаго?

— Ад таго, што Народны сакратарыят амаль у апазіцыі да іх, не зважае, не раіцца, а ўсё робіць сам. Нібы ён толькі гаспадар у горадзе і ў краі.

— Ясна,— пахітаў галавой Васілевіч.— Акупант ёсць акупант! На вуснах — мёд, але ў руках — кій, а ў думках — хцівасць!

— Можа, у чымсьці ты і маеш рацыю. Але, скажу табе шчыра, немцы многае і дазваляюць,— адказаў Скураны.— На іхніх вачах афармляецца ўрад, рэспубліка, а яны амаль спакойныя. Я, прызнаюся, на іхнім месцы не быў бы гэтакі безуважлівы...

— Раўнуеце да ўдач Народнага сакратарыята?— усміхнуўся Васілевіч.

Скураны, седзячы насупраць, зноў прыплюшчыў невялічкія вочкі, зноў зірнуў незычліва — на яго лобе са складкамі, на глыбокіх залысінах выплыла, заблішчэла потная раса. Проста дзіва. Колькі таго чалавека — малы, тоўсценькі, няўклюдны, а гэтакі хітры і злы!

— Я, дарагі, э-э, не ведаю, як усё пойдзе далей,— стрымаўся, сказаў спакойна.— Але, думаю, неўзабаве немцы схамянуцца, супыняць гэты Народны сакратарыят, не дазволяць, каб ён вельмі ўмацаваўся.

Апошняе сказаў, здаецца, з задавальненнем. Канечне, раўнуе, зайздросціць Баравіку, Аўторку, Еўзікаву, якія цяпер сталі лідэрамі беларускага руху, спадзяецца, што тыя спатыкнуцца, а ён у гэты час выхапіць з іх рук лейцы. Недагаворвае шмат, тоіцца, але ўсё ж можна адчуць: ён не супраць паінтрыгаваць, узвысіцца ў цяперашняй заблытанай сітуацыі. Нібы зразумеў, што Васілевіч здагадваецца пра яго патаемныя думкі, падняўся, затупаў зноў па сваім кабінеце.

— Давай гаварыць шчыра,— прамовіў,— што нам трэба? Бальшавіцкія на слых прыгожыя, а на справе небяспечныя і пагібельныя ідэі? Не. Трошкі ўмераныя сацыялістычныя помыслы Народнага сакратарыята? Не.

— Дык вы — за рэстаўрацыю капіталізму? Старога ладу?

— Як вас ужо сапсавалі! — павярнуўся, зірнуў на яго Скураны,— Капіталізм, буржуй, старарэжымнік — гэтыя і іншыя нармальныя словы пудзіла ўжо для вас! Адчуйце вы, дурныя галовы: капіталіст — гэта не бандыт, не злодзей, не нейкі цмок, а найперш — гаспадар! Калі ўсё належыць усім, то толку не будзе. А вось калі над усім ёсць гаспадар, які не толькі сумленнем, але і кожнай крывінкай дбае пра гаспадарку, лад, прыбытак, дык гэта — тое, што трэба, каб жыць як след!

— Значыць, вы — за праграму Часовага ўрада?

— Але. На першы погляд гэтая праграма нібы не для ўсяго народа, нібы толькі для такіх, як я, але на самай справе яна — і для ўсіх. Гэты спосаб яшчэ не вычарпаўся, у ім шмат разумнага, яго трэба толькі ўдасканаліць. Пераломныя, кажу, вабныя, але згубныя навацыі нам не патрэбны. Яны — найперш для балбатуноў, гультаёў, якія пры іх усплываюць на паверхню, зажыруюць, але ў рэшце рэшт разваляць усё...

Васілевіч змаўчаў. Што тут скажаш? Скураны ёсць Скураны. Пяе пра тое, што па душы.

— І зразумей, дарагі,— Скураны падняў і паківаў тоўстым пальцам.— Немцы сацыялістычныя ідэі ніколі не падтрымаюць. А вось з маімі згодзяцца. Бо яны блізкія ім па духу. Нават больш...

— Пачакайце,— перапыніў яго Васілевіч.— Але вы чамусьці не зважаеце на адзін момант.

— На які? — запыніўся той.

— А калі бальшавікі не толькі ўтрымаюцца ў цэнтры, але зноў вернуцца сюды?

— Я веру, што гэтага не адбудзецца.

— Ведаеце, усякае можа быць. Па-першае, неспакойна ў самой Германіі. Па-другое, заўважце, не такі ўжо жалезны лад у яе арміі. Многія салдаты хочуць ужо вярнуцца дадому. І яшчэ ёсць адзін нюанс.

— Які? — падышоў, зноў сеў насупраць Скураны.

— Капіталістычны лад не захоча вяртаць народ. Ён ужо настроены на іншае.

— Што я магу, э-э, табе адказаць. Калі бальшавікі вернуцца, дык ні я са сваёй праграмай, ні Народны сакратарыят са сваімі ідэямі не ацалеем, бальшавікі пачнуць бурыць тое, што задумалі. А вось калі не вернуцца, то, думаю, нам немцы памогуць уладкавацца па-разумнаму...

— Гэта значыць — вы не супраць згадзіцца на тое, каб па спінах нашага люду пагуляў нямецкі бізун?

— Паўтару яшчэ раз, э-э, дарагі: не было, няма і не будзе ўлады, што не ўжывала б насілле... Рана-позна мусім выкарыстоўваць яго і мы...— Развёў рукі.— Так ужо робіцца-дзеецца спрадвеку... Бізун і пернік — неад'емныя атрыбуты ўсіх часоў, усіх сістэм і ўсіх урадаў... Праўда, пры ўсім гэтым трэба вытанчаная дэмагогія, хлусня, цацанкі-абяцанкі народу...— Скрывіўся ва ўхмылцы, пагладзіў некалі поўны, а цяпер абвіслы і нібы пусты падволіч.— Калі ты, дарагі, не гатовы да гэтага, дык табе не варта займацца такой мудрай і цяжкай справай, як палітыка... Ясна?

Пасля, калі праводзіў яго, Скураны паблажліва паляпаў па плячы:

— Ладна, заходзь. Пагамонім яшчэ, паглядзім, што і як рабіць далей... Нямецкую стрыманасць, а то і гульню трэба спажыць як след...

**5**

На дварэ было ясна — высілася блакітнае неба, ззяла не вельмі цёплае, але па-маладому яркае сонца, у прасторы, а таксама ў парку, на вуліцы трымалася нейкая адмысловая маразнаватая празрыстасць,— як і належыць, не здавалася, брала сваё зіма, ды ўжо настойліва, узбуджаючы прыроду і хмелячы чалавечую душу, ішла вясна. Праўда, вось такое супадзенне холаду і цяпла было толькі ўдзень, а ўночы паранейшаму яшчэ лютаваў, нібы спаганяючы сваю апошнюю злосць, мароз.

Васілевіч, апусціўшы галаву, шпарка адыходзіў ад палаца Скуранога і які ўжо раз за сваё жыццё адчуваў гнятлівы, нават пакутлівы стан: вось зноў без работы, без кавалка хлеба. Як хочаш жыві, кармі вялікую сям'ю, а ў дадатак да ўсяго зноў адарваны ад берага, вынесены на струмень незразумелай плыні. Куды кіравацца, да чаго прыстаць? Ну і час! Ну і эпоха! Чакаў-чакаў столькі перамен, дачакаўся — ажно з імі яшчэ цяжэй! Вір! Неразбярыха! Ні ў чым не гаспадар сам сабе, ва ўсім залежыш ад чаканых і нечспадзяваных падзей, чужой волі. Хоць плач, хоць вешайся ад свайго бяссілля.

Несвядома азірнуўся: за ім ішоў чалавек. Невысокі, прысадзісты, ва ўсім цывільным — у ботах, у кажушку і авечай аблавушцы. Можа, і заможны селянін, можа, і гараджанін. Убачыўшы, што на яго ўгледзеліся, нібы сумеўся, запаволіў крок. Няўжо шпік? Але ад каго? Ад Ландара? Ад Скуранога? Ці ад немцаў?

Затахкала сэрца. Утуліў галаву, пакрочыў па пачышчаным і пасыпаным пяском ходніку далей; калі неўзабаве павярнуў на іншую вуліцу, дзе ўжо стаяла нямала двухпавярховых камяніц, зноў азірнуўся: цывільны сапраўды ішоў за ім. Васілевіч яшчэ трохі пратэпаў, а пасля, калі наблізіўся да невысокай тоўстай тумбы з аб'явамі на нямецкай і рускай мовах, запыніўся — прыкінуўся, што мае вялікі інтарэс да гэтых папер.

Як пачуў па кроках, мужчына неўзабаве падышоў, таксама запыніўся каля тумбы. Леваруч, збоку. Здаецца, дыхаў няроўна, з хваляваннем.

— Выбачайце,— прамовіў. Па-беларуску.— Вы — Сымон Васілевіч?

— Я,— насцярожана адказаў ён, перавёў позірк на нечаканага спадарожнага. Малады, гадоў дваццаці трох, з кірпатым носам, з шэра-зеленаватымі вачыма. Нібы знаёмы. Недзе зусім нядаўна сустракаліся.

— Я — ад Чарвякова і Жылуновіча — Цішкі Гартнага...— сказаў той.— Мне трэба з вамі пагаварыць.

Ага, цяпер ясна. Значыць, ён — адзін з тых беларусаў, каго лёс закінуў у Петраград і хто не знік у людскім моры, гуртуецца з землякамі і бярэ ўдзел у беларускім руху. Калі сябруе з Чарвяковым і Жылуновічам, дык альбо бальшавік, альбо левы грамадовец. Значыць, летась, у снежні, быў на Усебеларускім з'ездзе, дык вось і бачыліся там, кінуліся адзін аднаму ў вочы. Пачакай-пачакай. Ці то Усціловіч, ці то Лагун. І адзін, і другі — пасланцы ад рабочых, левыя, разам з Чарвяковым і Жылуновічам нападалі на іх, мінскіх грамадоўцаў.

— Я прыехаў сюды легальна, але вось цяпер, калі тут немцы, мушу падпольнічаць.

— Вы...

— Для вас я — Язэп...

Васілевіч. Ясна. Пагаворым тут ці зойдзем куды ў зацішнейшае месца?

Я з э п. Давайце перакінемся словам-другім тут з вамі, а пасля вы заведзіцё мяне да Лашковіча.

В а с і л е в і ч. А вы ведаеце, што я пасля разгону нашага кангрэса супрацоўнічаў з Савецкай уладай, а Лашковіч быў у падполлі, кажуць, перамаўляўся з Доўбар-Мусніцкім, каб разам змагацца супраць Мяснікова, Калмановіча, Ландара — карацей, супраць бальшавікоў?

Я з э п. Чулі. Нават і пра тое, што Лашковіч разам з іншымі сваімі калегамі быў зняволены.

В а с і л е в і ч. Што ж, я — тут, як кажуць, да вашых паслуг. Праўда, я цяпер адзінокі. Як дзік-бадзяга.

Я з э п. Чарвякоў і Жылуновіч прадбачвалі, што вы можаце апынуцца ў такой сітуацыі...

В а с і л е в і ч. То слухаю вас.

Я з э п. Яны шчыра, сардэчна просяць: калі ласка, не хаўрусуйце з немцамі, не дайце запляміць ні сябе, ні беларускі рух.

В а с і л е в і ч. Асабіста я не маю ніякай ахвоты нюхацца з чужынцам-акупаптам.

Я з э п. А Лашковіч? Баравік? Аўторак альбо Еўзікаў? Адным словам, падпольны Савет Усебеларускага з'езда? Народны сакратарыят?

В а с і л е в і ч *(уздыхнуў)*. Не ведаю. Апошнія два месяцы мы не толькі не перамаўляліся, але нават і не бачыліся. Але па маніфесце, што яны цяпер абнародавалі, не відаць, каб імкнуліся да хаўрусніцтва.

Я з э п. Але і не відаць, каб заклікалі змагацца супраць акупанта. Ваўсю дакараюць, абвінавачваюць не толькі Саўнарком Заходняй вобласці, але і Савецкую ўладу ўвогуле. А што гэта значыць? Яшчэ крок-другі — і ў абдымках з кайзерам!

В а с і л е в і ч *(памаўчаўшы)*. Не ведаю. Але пакуль што немцы лаяльныя да Народнага сакратарыята.

Я з э п. Пакуль што...

В а с і л е в і ч. Дык давайце пашукаем Лашковіча, пагаварыце з ім. Можа, ён вам болей чаго яснага скажа.

Я з э п. Добра. Вы, калі ласка, ідзіце першы, я пайду за вамі. Крокаў за пяцьдзесят.

Васілевіч паазіраўся: ззаду кльшае дзядок з кійком, спераду крочыць сюды маладая пара — і больш нідзе нікога на гэтай далекаватай ад цэнтра вуліцы.

Рушыў.

Толькі цяпер адчуў: холадна. Пастаяў не шмат, нібы грэўся пад вясёлым сонцам, ажно не, цяпло яшчэ скупое, а мароз моцны, дык прабрала за плечы. Ды паліто старое, выцертае і зверху, і спадыспаду, то мала грэе. Каб іншым разам, дык зараз хуценька пашнураваў бы, але цяпер ішоў стрымана, каб не адстаў, не страціў яго з вачэй неспадзяваны госць.

Увачавідкі спадала, апускалася, а заадно слабела сонца, згортвалася, знікала яснасць, цёплая ласка, паволі запаўняла гарадское наваколле перадвечаровая шэрань, а з ёю дужэў, зласнеў холад, каля высокіх неасвечаных сцен прытойваўся, укладваўся нанач стылы прыцемак.

Калі наблізіўся да шумнаватай Захараўскай вуліцы, дык напружыўся: насустрач ішоў нямецкі патруль. Высокі афіцэр і два салдаты з вінтоўкамі і цьмянымі цесакамі. Яго пільна абгледзелі, але не зачапілі. Як неўзабаве і Язэпа. Здаецца, немцы непрыкметна, без лішняга галасу, але пастойліва і чэпка бяруць усё ў Мінску ў свае рукі, устаноўліваюць свой знешне спакойны, а на справе жалезны лад.

Як і думаў Васілевіч, Лашковіч быў у рэдакцыі. У звыклым зношаным чорным касцюме, у самаробным свэтары, худы, а цяпер ужо не толькі з глыбокімі залысінамі, але і амаль лысы. Але падняў вочы, убачыў — і адразу стаў самім сабою: ажывіўся, а ў вачах за акулярамі заскакалі гарэзна-злыя чорцікі.

— А-а-а! — падняўся, падаў руку,— Бальшавічок!

— Максім,— як толькі парукаліся, забег наперад Васілевіч,— мы з табой пра *ўсё* пагаворым пазней, балазе мы абодва ў Мінску. Цяпер з табой хоча пагаманіць з вока на вока адзін чалавек здалёку.

— Хто? Можа, агент Мяснікова?

— Не.

— Глядзі! Калі таго чорта, дык выганю ці здам немцам!

— Пасланец ад Чарвякова і Жылуновіча.

— Ого! — здзівіўся Лашковіч.— Што ж гэта так ушанавалі нас нашы пралетарцы?

— Дык я, Максім, запрашу яго?

Калі Лашковіч згадзіўся сустрэцца з земляком-петраградцам, Васілевіч выйшаў з пакоя і праз хвіліну-другую прывёў сюды Язэпа. Лашковіч зірнуў на яго таксама са здзіўленнем: чалавеча, я цябе недзе бачыў.

— Ну, не буду вам замінаць,— сказаў Васілевіч, ахвочы пайсці адгэтуль. Каб не слухаць Лашковічавых дакораў.

— Добра,— адказаў той.— Але заўтра-паслязаўтра зайдзі. Палаемся, надумаем пра далейшае жыццё-быццё...

Васілевіч падакляраваў зайсці на днях, ведаючы, што рана-позна павінна адбыцца іхняя цяжкая сустрэча, пакінуў гаспадара і госця ўдвух. А паміж тымі пайшла такая гамонка:

Л а ш к о в і ч. Сам некалькі разоў сядзеў, быў у падполлі, дык усё разумею, нічога не пытаю пра вас. Сядайце, я слухаю.

Я з э п *(хітнуў галавой у знак падзякі, сеў)*. Маю наказ перамовіцца з вамі як з адным тутэйшых лідэраў беларускага руху.

Л а ш к о в і ч *(пільна пазіраючы праз акуляры)*. Калі ласка.

Я з э п *(нашмат маладзейшы за Лашковіча, але спакойны)*. Нас вельмі трывожыць, што цяпер, пры новай сітуацыі ў Мінску, наш рух можа яшчэ болей раскалоцца...

Л а ш к о в і ч *(узбуджана)*. Чаму — «можа раскалоцца»? Ён ужо расколены. Вамі. Калі бальшавікі штыкамі разагналі наш снежаньскі з'езд, дык мы тут пайшлі ў падполле, у апазіцыю, а вы ў Петраградзе прадалі народныя інтарэсы, захаўруснічалі, пачалі выкленчваць міласціну...

Я з э п *(непарушна)*. Мы не адступнікі, як вы абвінавачваеце, мы спрабуем знайсці выйсце з тупіка...

Л а ш к о в і ч *(ядавіта)*. І знайшлі паразуменне, скажам, з хэўрай Мяснікова?

Я з э п. На вялікі жаль, пакуль што — не.

Л а ш к о в і ч. Аз бальшавіцкім цэнтрам?

Я з э п. З цэнтрам у нас наладжваецца мост.

Л а ш к о в і ч *(падхапіўся, захадзіў па пакоі)*. Не цешце сябе ілюзіяй! Мяснікоў дамагаецца таго, што трэба бальшавікам, па-лабаваму, а цэнтр маскіруецца, гуляе і ўсяк не за вас, а за Мяснікова.

Я з э п. Выбачайце, але вам туманіць розум нянавісць да бальшавікоў.

Л а ш к о в і ч *(як вядома, заядлы палеміст)*. А што я, малады чалавек, павінен мець да іх? Любоў? Толькі любоў?!

Язэп змаўчаў, настроіўся слухаць запалістую прамову.

Л а ш к о в і ч *(стаў насупраць, нервова заэкаваў, але загаварыў ціха, з дакорам)*. Давайце, бальшавіцкі прыяцель, зноў успомнім наш леташні Усебеларускі з'езд, пра які, канечне, будзем гаварыць яшчэ не раз. Бальшавікі не маглі яго нам не дазволіць, калі дагэтуль так гучна падакляравалі канец вайне, зямлю сялянам, правы прыгнечаным народам. Але... Як ёсць звесткі, Сталін, даючы дазвол, грошы на Усе-

беларускі з'езд, у той жа час зрабіў усё, каб сапраўднай Беларусі не было. Ён употай сустрэўся з Мясніковым, супакоіў таго («Няхай збяруцца, пачэшуць языкі, пагуляюць у рэспубліку, ва ўрад, але ўладу будзеш трымаць ты»), дамовіўся, што і як рабіць далей. Якраз Сталін падшукаў амбітную, але згодніцкую эсэраўскую суполку Кужэльнага і паслаў яе ў Магілёў да другога эсэраўскага згодніка, Вазілы (дарэчы, тады ў Магілёве знаходзіўся і Мяснікоў як часова галоўнакамандуючы Заходнім фронтам). Але Кужэльны і Вазіла не толькі не здолелі ўтварыць паслухмяную беларускую марыянетку, але нават сабраць з'езд, мусілі ехаць у Мінск, дзе былі галоўныя нашы сілы. Кужэльны і Вазіла паводзіліся тут дзіўна (не то хаўрусавалі з Ландарам, не то спрабавалі абхітрыць яго ў сваіх інтарэсах), ды тон, як самі бачылі, на з'ездзе задалі іншыя. Мы, мінчукі. І калі ў рэшце рэшт перамагла ідэя беларускай дзяржаўнасці, быў сфарміраваны наш урад, дык адразу ж Ландар ужыў загадзя прадуманы другі сталінскі і мяснікоўскі варыянт — распусціць з'езд сілай, спаганіць яго пастановы, аб'явіць нашых урадоўцаў ворагамі народа і Савецкай улады, а самых значных лідэраў арыштаваць. Тры лініі былі на з'ездзе (незалежнікі, абласнікі, аўтанамісты), была моцная сацыялістычная плынь, было нямала бальшавікоў і ім спачуваючых, але па ўсім і па ўсіх удубасілі з-за пляча. Не пайшлі нават на тое, каб раскалоць з'езд і павесці за сабой блізкіх па духу. Зганьбавалі агулам. Каб задушыць дэмакратыю, саюз розных сіл, каб, паўтару, вырваць з карэннем ідэю нашай дзяржаўнасці... Ці не так? Ці не з-за абману, насілля спачатку пратэставалі і вы, бальшавікі ды левыя грамадоўцы-сацыялісты?

Я з э п. Спачатку і ў нас бушавалі пачуцці... Але цяпер...

Л а ш к о в і ч. Што — цяпер? Вы верыце Сталіну, Свярдлову, урэшце Леніну?

Я з э п. Верым. Мы не ведаем: якраз так, як лічыце вы, ці зусім іначай рабіў тады, да слова, нарком па нацыянальных справах Сталін, але цяпер бачым: ён ад імя цэнтральнай улады адносіцца да нас, да Белнацкома сур'ёзна...

Л а ш к о в і ч *(гнеўна)*. «Ад імя цэнтральнай улады!» Я, малады чалавек, больш ні кроплі не веру ў гуманнасць, дэмакратыю ўлады, што гвалтам разагнала Устаноўчы сход — форум, на якім уся краіна павінна была сама вырашыць свой далейшы лес. Усё, усякая дэмакратыя ўжо скончылася, не паспеўшы як след нарадзіцца. Наперадзе бачу я вялікі мардабой, рэкі крыві, слёз і ўсталяванне чагосьці жудаснага, пра што і маёй фантазіі не хапае. «Загонім у шчасце жалезнай рукой!» Што ж гэта, скажыце мне, за шчасце, калі да яго трэба гнаць пад бізуном альбо вінтоўкай? Я ўжо часамі думаю: а ці трэба была нам

увогуле рэвалюцыя, калі пасля яе гэтак прагна і жорстка ўзурпіруюць уладу ўчарашнія рэвалюцыянеры?

Я з э п. Выбачайце, я не жадаю дыскутаваць на гэтую тэму... Адкажыце ясна на іншае...

Л а ш к о в і ч. Не, малады чалавек! Трэба думаць, дыскутаваць і пра гэта. Іначай некалі можна дорага заплаціць, што ў нашы дні не думалі, не аналізавалі, слепа паверылі таму, хто вырваўся на паверхню...

Я з э п. Як я разумею, асабіста вы супрацоўнічаць з Савецкай уладай, з намі не жадаеце?

Л а ш к о в і ч. «Не жадаю» — не тое слова. Лепш сказаць — баюся. Асцерагаюся новага падману, гульні, вельмі не веру ў будучыню вашай прабальшавіцкай суполкі. Яе, можа, стварылі толькі для таго, каб нас супакоіць, завабіць на свой бок, урэшце, каб варожа настроіць супраць немцаў і ўцягнуць наш народ у партызанскую барацьбу...

Я з э п *(усміхнуўся)*. Вось мы кругамі прыйшлі да таго, з чаго пачалі нашу размову: вы і немцы...

Л а ш к о в і ч. Скажу шчыра: асабіста я пакуль што не ведаю, як паводзіцца. Як бачыце самі, немцы нам вельмі не спрыяюць, але і не замінаюць, стрымалі амбіцыі легіянераў Доўбар-Мусніцкага.

Я з э п. Паўтару: Чарвякоў і Шылуновіч напрамілы бог просяць не гешэфтаваць з акупантамі, наладзіць саюз з намі. Мы павінны ісці разам. Да адной мэты.

Л а ш к о в і ч *(зноў сеў насупраць, зірнуў чэпка, наваг трошкі з'едліва)*. Ды я бачу: вы ўсур'ёз паверылі, што цэнтр нашага руху перамясціўся ў Петраград і Маскву, што галоўная яго сіла — якраз вы і што можна дабіцца беларускай дзяржаўнасці толькі ў хаўрусе з Саветамі!

Я з э п. Сапраўды, усур'ёз.

Л а ш к о в і ч. Дзіўлюся вашай веры! І ў бальшавіцкую ласку, і ў сваю шчаслівую планіду!

Я з э п. Без веры не варта брацца нават за штосьці маленечкае.

Л а ш к о в і ч. Даверлівыя душы, летуценнікі, з кім і як вы думаеце згарбузаваць такую цяжкую рэч? Дзяржаўнасць!

Я з э п. Мы пачынаем абапірацца на мільёны нашых бежанцаў. На рабочых, сялян, салдат. На народ.

Л а ш к о в і ч. Ну-ну! Проста-такі знойдзеце выпадкова агромністую помач!

Я з э п. Я добра разумею, над чым вы іранізуеце. Вы, мы дагэтуль любілі свой народ, змагаліся за яго правы, але, давайце прызнаемся, не давяралі яму за яго «неразвітыя нацыянальныя пачуцці». Цяпер,

калі Савецкая ўлада робіць усё ад імя народа і дзеля народа, мы ўсе павінны не толькі верыць свайму люду, але заклікаць яго самому рашаць свой лёс...

Л а ш к о в і ч *(паныла).* І счэзне, знікне ваш кліч, як у пустыні...

Я з э п. Дагэтуль наш люд, можа, не разумеў, чаго мы ад яго чакаем, альбо асцерагаўся ісці за намі. Цяпер, калі добра пагаварыць, і зразумее, і пойдзе разам, паможа дабіцца таго, што нам належыць па праве.

Л а ш к о в і ч *(паблажліва).* Летуценнікі!

Я з э п. І летуценнікі, і рэалісты.

Л а ш к о в і ч. Я, малады чалавек, сын простай сялянкі-гаротніцы. Яна любіць, шкадуе мяне, разумее мае мары і помыслы, спачувае, але... баіцца таго, пра што думаю я. Гэты яе страх перадаўся ёй яшчэ ад бацькі і дзеда. А ў іншых — не толькі страх, але і ўжо абыякасць да свайго лёсу, да сваёй годнасці, пакорлівасць. Спадзявацца на раптоўнае ўваскрасенне, помач такіх забітых душ — марная рэч. Што зробім мы, жменька свядомых інтэлігентаў, тое і будзе.

Я з э п. Не. Цяпер і тут, на радзіме, і там, у бежанстве, наш люд ужо не такі. Вайна, рэвалюцыі змянілі яго. Калі не ўваскрасілі, то абудзілі. Мы не в ы п а д к о в а, як вы кажаце, а свядома думаем знайсці ў ім трывалую падпорку. Іначай, паверце, не варта нават задумліваць ідэю нашай нацыянальнасці, дзяржаўнасці.

Л а ш к о в іч. Я ўсё ж лічу іначай. І пакуль што, як бачыце, ушчыльную да нашага запаветнага падышлі якраз мы.

Я з э п. Зразумейце: усё, што зробіце вы тут пры немцах, не падтрымаюць не толькі Мяснікоў і цэнтр, але не падтрымаем і мы.

Л а ш к о в і ч. Што ж, вы ідзіце адным шляхам, мы пойдзем іншым. Час пакажа, хто меў рацыю. Пакуль што — сур'ёзныя набыткі ў нас. Мы першыя за нашу доўгую і шматпакутную гісторыю наблізіліся да таго, каб аб'явіць народу, усяму свету Беларусь як дзяржаву.

Я з э п. І надоўга?

Л а ш к о в і ч. Хоць на год! Хоць на месяц альбо тыдзень! Абы толькі гэта прагучала!

Я з э п *(з дакорам).* Абы... Захапіліся і не зважаеце, што расколваеце наш рух на часткі.

Л а ш к о в і ч *(развёў рукамі).* Іншага выйсця, на жаль, няма.

Я з э п. Шкада, што вы яго не бачыце і не хочаце шукаць, ухапіўшыся за тое, што апынулася перад рукамі... Не так у нас шмат адукаванага, свядомага пласту, каб не зберагаць яго, а самім распыльваць на грызню, на барацьбу паміж сабой. Так мы, сапраўды, не шмат даб'ёмся, за намі, такімі, не вельмі паспяшаецца народ, нас, такіх,

лёгка спажывуць у сваіх інтарэсах, ператруць нашы ворагі... Паверце, такімі сваімі паводзінамі вы вельмі засмуціце Чарвякова і Жылуновіча — вельмі сумленных людзей, шчырых барацьбітоў за народныя інтарэсы і, выбачайце, адных з самых вядомых, аўтарытэтных цяперашніх нашых лідэраў...

Л а ш к о в і ч *(з ірoніяй пасміхаючыся)*. Вось як! Лапкінскія, Нядоля, Васілевіч, я і іншыя ветэраны — ужо не лідэры? Лішнія альбо павінны прыслужваць?

Я з э п. Не трэба. Давайце без амбіцый.

Л а ш к о в і ч. І вы таксама...

Я з э п. У нас, паверце, не амбіцыі. У нас — рэалізм, клопат пра святую для нашага народа справу.

Л а ш к о в і ч. І ў нас, малады чалавек, тое ж. Толькі, кажу, мы пойдзем сваім шляхам, намагаючыся не ўпусціць спрыяльнага моманту, які, зразумейма, бывае вельмі рэдка... Дзеля гэтага мы гатовыя і ахвяраваць. Не толькі сваей рэпутацыяй, але і сваім жыццём...

**6**

Лашковіч, Васілевіч і Нямкевіч пакінулі Лашковічаву маці каля драўлянага доміка, дзе яна кватаравала з сынам, а самі заспяшаліся на пасляабедзенную сходку Народнага сакратарыята.

Канчаўся люты; як і заўсёды ў гэты час, уночы яшчэ ціснуў мароз альбо сыпаўся снег, але ўдзень мякчэла — ўсё роўна ўладарна ішла вясна. Вышэла, яснела з кожным днём неба, а заадно ярчэла ажыўленае сонца, пахла халоднымі капяжамі, трошкі прыпаранымі дрэвамі і сагрэтымі ў зацішку платамі, драўлянымі і цаглянымі сценамі будынкаў.

Вось цяпер таксама ззяў, нават ужо трошкі сляпіў у паблакітнелай высі яркі кружок, хвалюючы душу блізкімі вясновымі зменамі.

На мінскіх ускраінах усё ішло-наблiжалася, як і раней, само па сабе, па нейкім простым і ў той жа час мудрым спрадвечным крузе, а ў цэнтры за апошнія дні вочы пачалі ўжо прывыкаць і да іншага акаляючага малюнка — да купак нямецкіх афіцэраў і салдат на вуліцах, да германскіх сцягоў на ўстановах, расклееных на тумбах аб'яў, загадаў на нямецкай і рускай мовах.

— Хоць і далі ім нашага перакладчыка, але ўсё роўна ўпарта не хочуць ужываць беларускую мову! — зморшчыўся Лашковіч, паказваючы на адну з вывешаных ужо на Захараўскай вуліцы аб'яў. У ёй мінчукам загадвалася за тры дні здаць агнястрэльную і халодную зброю, узятыя пасля адыходу Саветаў грошы, а салдатам, дэмабілізаваным з рускай арміі,— замальдавацца ў нямецкай камендатуры. У

цывільных канторах трэба было запісацца і ўсім іншым мінскім насельнікам.

— А можа, і лепш, што якраз такія аб'явы не на беларускай мове,— задумліва, разважліва сказаў Васілевіч.— Тут беларуская мова не толькі не палагала б, але, наадварот, бэсціла б нас...

Лашковіч не паспеў адказаць. Па-першае, маючы прагерманскі настрой, думаў, як і за што заступіцца за «дабрадзеяў», а па-другое, ледзь не на іх рухаўся нямецкі канвой — хілы невысокі афіцэрык з шашкай і двое салдат з вінтоўкамі вялі ўверх, можа, і да былой царскай турмы (дзе, да слова, пасядзелі і Лашковіч, Васілевіч ды Нямкевіч), вусатага дзядзьку ў ботах, чорнай куртцы і маладога хлопца ў шынялі.

Наблізіўшыся, нямецкі афіцэр узмахам рукі рашуча загадаў саступіць дарогу. Яны паслухалі, збочылі і доўга праводзілі арыштаваных позіркам: за што ж іх зняволілі?

— Сабатажнікі,— патлумачыў ім выпадковы прахожы ў капелюшы і з кавенькаю.— Кажуць, хацелі сапсаваць электрастанцыю.

Гэта не было вялікай навіною. Як гаварылі ў горадзе, не дужа ласкава сустрэлі немцаў і ў іншых мінскіх мясцінах — у дэпо, на заводах, у сталоўках. Першыя дні нямецкі гораданачальнік званіў ім і прасіў разабрацца, памагчы, а цяпер, бач, пачалі прыструньваць непаслухмяных самі.

«Значыць, ёсць у Мінску і тыя, хто не толькі не лічыць немцаў за дабрадзеяў, але і шкодзіць ім...» — цёпла падумаў Нямкевіч.

Лашковіч так нічога і не прамовіў; Васілевіч жа ўздыхнуў:

— Не, Максім. Не будзе той ідыліі, пра якую вы гаварылі на днях на банкеце ў «Еўропе»...

Далей да свайго «ўрадавага» будынка яны клышалі ўжо моўчкі, прыгнечаныя ўбачаным. Ясна, што і ім, і немцам трэба цягнікі, электрычнасць, харч, але і гэтак жа ясна, што не набудзеш вялікай славы сярод сваіх жа людзей, калі будзеш папікаць іх за тое, што яны шкодзяць. Гэтая шкадлівасць — барацьба. І святая. Па праве заняволеных.

Задуменна ўвайшлі ў прыбраны і вымыты ўжо дом, падняліся ў «міністэрскі» кабінет — у вялікі пакой са сталамі літараю «Т» з крэсламі абапал сталоў і сцен, з новымі фіранкамі на вокнах. «Міністры», іхнія прыхільнікі Народнага сакратарыята сустрэлі іх, найперш Васілевіча і Нямкевіча, спакойна — уволю адчыталі «за савецкія грахі» пазаўчора.

Яны прыселі з краю. Прамаўляў якраз Янка Аўторак — ён сядзеў за галоўным сталом. Не ў шынялі, як гэта было ў першыя дні, а ў мундзіры. Пакой, як і ўвесь дом, быў ужо добра ацеплены.

— Дык зачытваю, спадары, ліст,— павёў рэй далей Аўторак, падносячы блізка да твару белы аркушык.— «Паважаны ягамосць Доўбар-Мусніцкі! Як усе ведаюць, у ноч на 20 лютага г. г. Мінск спешна пакінулі Саветы. Мы ў гэты час выходзілі з падполля і толькі пачыналі кіраваць Мінскам. Хаос, неразбярыху, што былі зусім невялікі час, спажылі мінская польская вайсковая арганізацыя і польская міліцыя, а таксама войскі вашай перадавой часці, што ўступілі ў Мінск 20 лютага. Яны ўзялі за здабычу вялікія сумы грошай, з вайсковых сейфаў і ўстаноў, у тым ліку 12 мільёнаў рублёў з Мінскай паштовай канторы. Паколькі на нас цяпер кладзецца клопат і пра мінскіх, і пра ўсіх насельнікаў краю, просім вярнуць гэтыя 12 мільёнаў рублёў у Народны сакратарыят Беларусі».

— Чаму — толькі 12 мільёнаў? — падаў голас хмурны Шуляк.— Упраўляючы справамі, Заяц, добра падлічыў: доўбарчыкі прысвоілі болей 20 мільёнаў!

— Будзьма рэалістамі, спадары,— сказаў Аўторак.— Запатрабуем менш — дык аддадуць. Запатрабуем усё — не вернуць ні капейкі. Скажуць: мы нічога не бралі...

— На іх скоса пазірае нямецкае камандаванне. Папросім Фолькенгейма — дык ён націсне.

— Давайце будзем абачлівыя,— прамовіў Аўторак.— Хто за тое, каб паслаць Доўбар-Мусніцкаму якраз гэты ліст?

Галасавалі толькі тыя, хто сядзеў цяпер за стадом літараю «Т» — хто меў «партфель». Амаль усе былі «за».

— Далей...— прамовіў Аўторак, але не дагаварыў, зірнуў на дзверы.

За ім павярнулі галовы і амаль усе: сюды зусім нечакана зайшлі госці. Немцы. Высокі, рабаціністы паручнік Шранк, нізкі і тоўсты фельдфебель у масіўных акулярах і з тоўстым сшыткам-гросбухам пад пахаю, два ўзброеныя салдаты і высокі ды худы Сінілаў у форме падпалкоўніка царскай ахранкі. Ён, гэты Сінілаў, на днях перабег ад іх да немцаў і стаў намеснікам іхняга гарадскога паліцмайстра.

Ш р а н к *(адзін наблізіўся да сталоў, абвёў усіх халодным позіркам. Аўторку. Не павітаўшыся).* Вашы ўсе тут?

А ў т о р а к *(падымаючыся з-за свайго стала).* Амаль, пан паручнік. Вы маеце да нас які-небудзь клопат?

Ш р а н к *(ухмыльнуўшыся).* Маю. І вельмі вялікі.

А ў т о р а к *(думаючы, што зноў будзе нейкая прэтэнзія з-за непаладкаў у горадзе).* Мы слухаем вас, пан паручнік.

Ш р а н к *(строга).* Я мушу, панове, сказаць вам не вельмі прыемнае, але мусовае. Мы павінны забараніць у горадзе ўсякую палітычную дзейнасць. Само па сабе зразумела, вашу — таксама.

А ў т о р а к *(бялеючы, але квола ўсміхаючыся).* Вы — добры гумарыст, пан Шранк!

Ш р а н к *(непарушна).* Я не жартую. Я прыйшоў рэквізаваць рэзідэнцыю для патрэб нямецкай арміі.

А ў т о р а к *(разгублена).* А мы?

Ш р а н к. Я ж кажу: вы павінны спыніць сваю палітычную дзейнасць.

А ў т о р а к *(белы ўжо як палатно).* Хто так рашыў? Генерал Фінкельштэйн? Фолькенгейм? Берлін?

Ш р а н к. Хто так рашыў, я не ведаю. Такі загад мне перадаў наш гараданачальнік.

Б а р а в і к *(гнеўна).* Вы-зва-лі-це-лі!!!

Шуляк. Гуманісты і зычліўцы!

Н я д о л я *(у тон апошнім).* Заступнікі прыгнечаных і прыніжаных!

А ў т ор а к *(стрымана, лаяльна).* Панове, не варта гарачыцца. Давайце пазвонім самому камандуючаму Усходнім фронтам, пагаворым з ім. Можа, выявіцца якая-небудзь прыкрая памылка. Быць не можа, каб забараняўся якраз наш палітычны рух!

Ш р а н к. Не, панове. Памылкі няма. Ваенная сітуацыя, акты сабатажу ў горадзе змушаюць нас узяць усю ўладу ў горадзе ў свае рукі. Пад знешняй пакорлівасцю, панове, вы ўсё ж непакорлівыя...

А ў т о р а к. Асабіста мы, пан Шранк, законная ўлада шматмільённага народа!

Ш р а н к. Мы можам дыскутаваць, панове, але вышэйназваны загад ужо ўступае ў сілу.

Ш у л я к *(змрочна).* Пабылі гаспадарамі ў сваім доме!!! Пяць дзён!!!

Ш р а н к *(па-ранейшаму холадна і разважліва).* Ёсць просьба, панове. Не трэба шумець, пратэставаць, а гэта значыць — узбуджаць горад, настройваць супраць нас. Прыйдзе лепшы час — будзе і новы паварот у палітыцы, у тым ліку і нацыянальнай.

Б а р а в і к *(цяжка ўздыхнуўшы).* О, божа! Зноў мы не можам казаць, што баліць душа, няма ні жыцця, ні свету, зноў мусім гнуць спіну і дзякаваць!!!

Ш р а н к *(не ўсё аразумеў, бо Баравік гаварыў па-беларуску).* Прашу, панове, пакінуць дом.

Праз хвілін пятнаццаць, пасля бясплённай перапалкі, усіх — «міністраў» таксама — лічы, бесцырымонна выкінулі на вуліцу, а халодны і

гаспадарлівы Шранк у дадатак па праве дужэйшага прыхапіў з сабою ўвесь іхні «дзяржаўны» скарб — як казаў Лашковіч, каля паўмільёна рублёў...

**7**

Калі «міністры» з Народнага сакратарыята і іх сябры не толькі засмуціліся, але нават палі духам, што з імі гэтак двудушна і жорстка абышліся нямецкія генералы, дык Скураны ажыў, душою адчуў: здаецца, зноў узыходзіць яго зорка...

Сказаць шчыра, яму таксама кальнула ў сэрца, што госці-акупанты гавораць адно, а робяць, бач, зусім інакш, адчуваючы, што ніхто не можа даць ім здачы. Але і ў той ж а час быў рады, што пстрыкнулі па носе якраз яго супернікам — тым, некаторыя з якіх летась, улетку, не толькі адабралі ад яго руль, але ўвогуле амаль адлучылі ад руху.

Разгубленыя, засмучаныя «ўрадоўцы» пабрылі сваёй дарогаю, каб, можа, зноў, як яшчэ нядаўна, сабрацца ўпотай і паразважаць, што і як чыніць далей, а Скураны, як толькі даведаўся пра апошнюю падзею, адразу ж паслаў пакаёвага па калег па іхнім яшчэ і цяпер падпольным Мінскім народным прадстаўніцтве. Пасля, калі прыйшлі акрыялы пасля радыкуліту генерал Петрыкевіч, ксёндз Мяцельскі ў доўгай чорнай сутане, зблажэлы былы рэдактар «Нашай Нівы» Уласаў, ён, тоячы эмоцыі, нібы са скрухаю расказаў ім, што сёння здарылася — асцярожна звінаваціў Народны сакратарыят за «нягібкую» палітыку, а потым, ужо не хітруючы, заявіў, што «цяпер» якраз нам трэба не толькі выйсці на людзі, але ўлічыць няўдачу нашых левых, узяць беларускую справу ў свае рукі». Параіўшыся, прыйшлі да згоды: трэба не адкладаючы, ужо заўтра, пакуль не апомніліся «левыя», яму, Скураному, сустрэцца з нямецкім камандаваннем і як след пагаварыць з ім.

Назаўтра, у марозны сонечны паўдзёнак, Скураны прыбыў на санях да будынка, дзе размясціўся штаб 10-й нямецкай арміі, і папрасіў дзяжурнага афіцэра паспрыяць сустрэцца яму з генералам Фінкельштэйнам, каб пазней, уведаўшы думкі гэтага высокага чына, бачыць: варта ці не варта імкнуцца дапасці да самога камандуючага Усходнім фронтам, а праз яго — можа, і ў Берлін.

Калі дзяжурны афіцэр пачуў, хто ён такі (а ён пайперш назваў свае высокія пасады пры царскай уладзе), яго трохі патрымалі ў прыёмнай, а пасля, праз паўгадзіны, павялі да генерала Фінкельштэйна.

Той, важны, падзьмуты, пры пенснэ, сядзеў за пісьмовым сталом і штосьці чытаў з чырвоным алоўкам у руцэ. Калі Скураны падышоў па зялёным, з чырвонымі палосамі доўгім ходніку, Фінкельштэйн падняў галаву, прыбраў пенснэ, стомлена заплюшчыў вочы, пацёр іх, а пасля,

усміхаючыся, устаў і выйшаў з-за стала. Зноў, як і тады, на вакзальным пероне, аглушыў сваім ростам і цяжкою паставаю: Скураны быў з тых невысокіх мужчын, хто пакутаваў ад таго, што хтосьці вышэйшы, больш шчодра надзелены прыродай мужчынскасцю.

— Рад бачыць і вітаць, пане Скураны! — аж засвяціўся генерал, нагінаючыся і пацiскаючы яго невялікую руку.— Як уладкаваліся ў сваім законным доме?

— Дзякуй! — усміхпуўся і ён, бачачы, што гэты важны вайсковы чын умее не толькі фанабэрыцца, але і дыпламатнічаць,— З вашай ласкі я зноў адчуў сябе чалавекам.

— Мы, пан Скураны, паважаем сапраўдных гаспадароў ва ўсіх нацыях, не дазваляем крыўдзіць іх.

— Бо разумныя і культурныя,— паліслівіў ён, адчуваючы, што калі добра паварушыць мазгамі ды пашукаць патрэбныя слоўцы, то можна будзе тое-сёе з гэтага зубра калі не выцягнуць, дык хоць змусіць яго паласкавець. Заадно Скураны так захапіўся, узяў сябе ў рукі, што і э-экаць перастаў.

— Пабыўшы тут, я ўбачыў: ваш народ вельмі блізкі да заходняй культуры.

— Сапраўды, мы, лічы, аж да дзевятнаццатага стагоддзя мелі цесныяварункі з Еўропаю.

— Прыемна, вельмі прыемна!

Пастаялі, трымаючы руку ў руцэ. Потым генерал павёў у кут кабінета, да абцягнутай чорнай скураю канапы. Селі.

— Ну, які настрой у горадзе, пан Скураны? — запытаў гаспадар кабінета, кладучы нагу па нагу і мільгаючы сваімі лампасамі.

— Трошкі быў узбуджаны, а цяпер паспакайнелы, пан генерал,— адказаў ён, таксама паклаў кароткую і тоўстую сваю нагу на нагу.

— Вы сапраўды лічыце: паспакайнелы? — ужо без усмешкі, але зычліва, мякка запытаў генерал.

— Сапраўды.

— А нам здаецца, пан Скураны, што і ўзбуджэнне застаецца, і нават горш — супраць нас пачынаецца падпольная барацьба. Акты сабатажу, лістоўкі, а таксама напад з-за вугла на нашых афіцэраў — усё гэта нас вельмі насцярожвае...

— Я думаю, пан генерал, бальшавікі і за кароткі час паспелі многім уесціся ў косці. Таму наш люд рады, што яны сышлі, што...

— Выбачайце, пан Скураны,— перапыніў яго Фінкельштэйн.— Ці не выдаеце вы жаданае за існае? Мы хацелі б мець самыя праўдзівыя звесткі. Прыхарошвання, ілюзій нам не трэба.

— Я не ведаю, што і як будзе ў іншых нашых гарадах і вёсках, пан генерал, але лічу: Мінск, стомлены ад вайны і рэзруху, будзе лаяльны, калі пачне адчуваць да сябе гібкую палітыку...

— У чым «гібкую»? — натапырыўся, як вожык, Фінкельштэйн.

— Я разумею, пан генерал, што вы цяпер ваюеце, павінны дбаць пра сваю бяспеку. Але ж вы тут не толькі вайскоўцы, вы — і пасланцы вялікай Германіі, выказнікі яе палітыкі... А тое, што вы ўчора распусцілі Народны сакратарыят, спрыяеце былым, царскім органам улады, робіць на ўсіх цяжкое ўражанне. Нават на тых, хто чакаў вас...

— Пачакайце!— нібы здзівіўся, вытрашчыў вочы Фінкельштэйн.— Вы, як і людзі з Народнага сакратарыята, няправільна, завельмі эмацыянальна ўспрынялі гэты недарэчны інцыдэнт. Наша вышэйшае вайсковае камандаванне не мае да яго ніякага дачынення, мы не супраць вашага руху, яго штаба. Калі ласка, займайцеся сваёй нацыянальнай палітыкай, толькі не замышляйце зламыснага супраць нас...

«Сапраўды не давалі высокай санкцыі на разгон Народнага сакратарыята?— падумаў Скураны.— Ці, памацаўшы нас і ўбачыўшы пратэст, ілжэ цяпер, выкручваецца: бачыце, вінаватыя ва ўсім ніжэйшыя чыны!»

— У Мінску, пан генерал, палічылі: вы, як і бальшавікі, не хочаце пaступацца ўладаю, уважаць нашы інтарэсы — інтарэсы нацыі, прыгнечанай суседнім вялікім народам...— падаў сваю думку за ўсіхную Скураны.— Хоць на Украіне вы прызналі мясцовую ўладу...

— Мне сёння перадалі ліст вашага Народнага сакратарыята, дык і там такая ж крыўда...— прызнаўся Фінкельштэйн, падняўся, падышоў да свайго стала і закурыў. Потым, папыхваючы дымам, пачаў хадзіць па кабінеце, па-ранейшаму нібы здзіўляцца: — Дзіўна! Як вы маглі якраз так падумаць пра нас?!

«Ці хітры як ліс, ці тупы як абух! — зазлаваў у душы Скураны.— Няма ж для чалавека большай пакуты за боль стаптанай душы!»

Пасля ўзяў сябе ў рукі: стоп, не траць развагі! Гэта ты, зняважаны, адчуваеш нацыянальны боль, бяспраўнасць, а той, хто зневажае альбо чэрствы да цябе, не адчувае яго. Нават нібы здзіўляецца: чаго ты дрэнцішся, мучыш сябе і іншных? Хіба твой асабісты боль варты вялікай увагі? Не зважай, жыві нашымі вялікімі інтарэсамі!

— Нацыянальныя пачуцці — вельмі далікатныя пачуцці, пан генерал,— прамовіў Скураны ўслых.— Ужо некалькі стагоддзяў наш народ дабіваецца прызнання, волі, дзяржаўнасці, але ні польскія каралі, ні рускія цары дагэтуль не паварушылі нават пальцам, каб даць нам жаданае. Прыйшлі вы, пасланцы вялікай культурнай нацыі, усе ўсклалі на вас свае запаветныя надзеі — а вы ўзялі і адвярнуліся!

Генерал падышоў, сеў побач.

— Вось нашы нацыянальныя дзеячы і адчаіліся...

— Супакойцеся, калі ласка, пан Скураны,— лагодна папрасіў Фінкельштэйн.— Мы не хочам сварыцца ні з вялікімі пануючымі, ні з прыгнечанымі малымі народамі, тым больш — нажываць сабе ворагаў. Давайце пагаворым спакойна. Вось як, да слова, вы адносіцеся да пераваротаў у Расіі?

— Лютаўскі я падтрымліваю. Кастрычніцкі — не.

— А я, пан Скураны, супраць абодвух. Калі іх дух перакінецца ў Еўропу, далей, то ўсё ў свеце рухне...

— Але ж Народны сакратарыят, а Мінскае прадстаўніцтва, дзе я лідэр, тым больш...

— Да вашай групоўкі, пан Скураны, мы прэтэнзій не маем,— перапыніў яго генерал.— А вось што датычыць Народнага сакратарыята, то... Там, як мы ўжо ўведалі, шмат сацыялістаў. У іхнім Маніфесце — рэвалюцыйныя бацылы!

— Гэта рэальная сітуацыя, пан генерал!

— І так гаворыце вы, былы дзяржаўны муж, маёмасны чалавек, каму перавароты прынеслі зло?!

— Але, пан генерал. Так гавару і я,— уздыхнуў Скураны,— Каб займацца тут палітыкай, трэба добра ведаць: наш люд вітаў падзенне цара, Часовы ўрад і яго рэформы, пазней яшчэ цяплей вітаў дэкрэты пра мір, пра зямлю. Ён ужо ўпарта не захоча вяртацца ў царскія і панскія аглоблі... Мая, як вы кажаце, групоўка ўмераная, мае шмат ворагаў, а вось Народны сакратарыят з сацыялістычнымі элементамі стаў за гэтыя дні досыць папулярны сярод нашага люду...

— Але на ўзбуджаны, ап'янелы ад прыгожых лозунгаў люд можна знайсці ўправу, пан Скураны!

— Цяпер і ў нас, і ў вас, пан генерал, не час бізуна! — Усміхнуўся ён. Нібы па-таварыску, а ў душы з кпінаю да амбітнага, старой прускай школы салдафона,— Цяпер — час перніка...

Той змаўчаў, падхапіўся і задумліва захадзіў па пакоі. Скураны падскочыў, дробненька затупаў побач.

— А як апынуліся ў Народным сакратарыяце яўрэі? — запытаў Фінкельштэйн.— Самі прыйшлі? Вашы іх запрасілі?

— Так ужо сталася, пан генерал, што ў нас тут амаль усе паны-землеўласнікі — палякі, а буржуазія — рускія і яўрэі,— патлумачыў Скураны.— Цяпер, у вайну, яўрэйская буржуазія яшчэ болей абагацела і ўмацавалася. Так што без яе не абысціся. Паклічаш — можа памагчы, бачачы, што можна найперш уварваць сабе, не паклічаш альбо замахнешся на яе інтарэсы — зганьбіць, умярцвіць любую ак-

цыю. А па-другое, яна і сама прагне быць ва ўсіх лагерах. Каб штосьці ўмацоўваць ці, наадварот, штосьці падрываць знутры... Усё ў гэтым свеце, пан генерал, у рэшце рэшт сыходзіцца на яўрэйскім пытанні альбо на масонстве, якое яны кантралююць...

— Ёсць у Народным сакратарыяце бальшавікі — адзін з найбольш ваяўнічых атрадаў сусветнага іудзейства? — запыніўся Фінкельштэйн, зірнуў (нібы чымсьці накрыў) зверху.

— Не. Ёсць толькі іхнія прыхільнікі.

— Шмат іх?

— Трое ці чацвёра, пан генерал.

— Вялікі іхні ўплыў на Народны сакратарыят?

— Не вельмі. Ды, паўтару, петраградскія бальшавікі і іхнія мінскія хаўруснікі сваімі апошнімі хадамі падарвалі тут да сябе давер.

— Мы павінны ўсё пра ўсіх ведаць, пан Скураны,— Фінкельштэйн груба тыцнуў у яго грудзіну пальцам. Пра кожнага тутэйшага палітычнага дзеяча. Каб з кімсьці весці дыялог, трэба добра знаць, чым ён дыхае...

«Ён што — наймае мяне? Філёрам-даносчыкам?»

— Вы павінны памагчы нам, пан Скураны...

Ён вытрымаў цяжкі позірк, але неяк дурасліва ўсміхнуўся. Ад таго, што яго, «былога дзяржаўнага мужа», «маёмаснага чалавека», так нахабна купляюць і на такую агідную ролю.

— Цяпер у Мінску сабраліся розныя, але разумныя нашы людзі,— пачаў ухіляцца ад такой ганебнай місіі і па-свойму спакушаць генерала-акупанта Скураны.— Некаторыя з іх прайшлі праз царскія турмы і катаргу, у людскіх вачах героі-пакутнікі. Калі іх, пан генерал, прыблізіць, памагчы, то многія з іх пагарнуліся б да вас. Думаю, нават у рэшце рэшт згадзіліся б утварыць беларускую дзяржаву, саюзную з Германіяй...

Фінкельштэйн зноў затупаў. Скураны спажыў яго задуменнасць, пачаў ліпка заварожваць:

— Трэба толькі не адварочвацца і не цыкаць на тутэйшыя палітычныя сілы, пан генерал. Наадварот, трэба прыгрэць, падтрымаць. На словах — усіх, на справе — тых, хто згодзен супрацоўнічаць з вамі. Нават з іхнімі сацыялістычнымі ідэямі, якія можна ў любы час патлумачыць па-свойму альбо прыглушыць. Я і мае сябры гатовы быць пасрэднікамі паміж вамі і нашымі левымі... У выніку вы можаце дабіцца многага не зброяй, а гібкай палітыкай...

Генерал маўчаў. Відаць, марудна ўзважваў у думках тое, што чуў. Штосьці яго насцярожвала, але штосьці і вабіла. А Скураны ўсё закалыхваў яго:

— Паверце, і нам, і вам трэба беларуская дзяржава ў саюзе з вамі. Мы задаволім свае мары, людзьмі назавёмся, а вы будзеце мець тут вароты на Усход альбо засланку ад яго... Калі вы, пан генерал, як след дакладзіцё пра гэта ў Берлін, то, думаю, там павінны прыслухацца да нас... Па-другое, вы заадно праверыце Народны сакратарыят, усе тутэйшыя палітычныя сілы. Хто пойдзе на саюз з вамі — значыць, лаяльны, хто забрыкаецца альбо будзе супраць — значыць, не надзейны...

— Шмат з Народнага сакратарыята будзе супроць саюзу з Германіяй?

— Можа, і палова. Ці нават і большая. Некаторыя хочуць поўнай незалежнасці, некаторыя гарой стаяць толькі за хаўрус з Расіяй.

— Я хацеў бы, пап Скураны, пагаварыць з тымі з Народнага сакратарыята, хто лаяльны да нас...

— Я магу паладзіць такую сустрэчу,— адказаў ён. Усміхнуўся, узяў гаспадара за локаць,— Калі, скажам, пан генерал захоча адпачыць ад турбот, прыедзе да мяне ў госці, дзе будуць шахматы, чарка і да чаркі, гарбата...

Скураны залісліў, радуючыся, што далёкі да іхняй ідэі нямецкі вайсковы чын мякчэе і пачынае разважаць. Чорт з ім, можна і папаіць, пасхіляць перад ім галаў, абы ён як трэба нагудзеў Берліну — найперш пра яго і ягоную суполку. Калі Берлін згодзіцца ўтвараць іхнюю дзяржаву і даручыць гэта яму, дык тады і свае не толькі паласкавеюць, будуць здымаць перад ім шапку, але і пабягуць услед, як шчанюкі. А што да Берліна, дык некалі, калі будзе прызнанне, сіла, то можна і абтрэсціся ад яго апякунства...

— Дзякуй, пан Скураны,— ажывіўся, пацяплеў Фінкельштэйн.— Вы — вельмі прыемны субяседнік. Я думаю: мы пасябруем з вамі...

«Фу! — выйшаўшы з кабінета і апранаючы ў цёплай прыёмнай паліто, выдыхнуў Скураны, нібы скінуў цяжкі мяшок з плячэй. Пасля пацешыўся: — Здаецца, добра падаслаў саломы і мякка паваліў на яе бугая!»

8

Спажыўшы вольную хвіліну, Алесь Нядоля прысеў за стол, каб запісаць на паперы верш, што ўжо, лічы, склаўся сам па сабе ў думках і прасіўся на волю.

Пасля, калі прачытаў усё ад пачатку да канца, то зморшчыўся: і тут, і там штосьці не так, трэба многае правіць. Здаецца, ёсць думка, пачуццё, а вось не хапае як следнай выявы. Можа, і ад таго, што няма філалагічпай адукацыі. Калі закончыш рамесніцкае вучылішча,

можаш навучыцца рабіць сталы, табурэткі, шафы, але для добрых вершаў такой навукі малавата. Як часамі не хапае і саманавукі.

Устаў, падышоў да невысокага акна, адсунуў белую фіранку і зірнуў на сваю заснежаную вуліцу: сусед, які жыў насупраць, паіў карову. Лепш сказаць, яго бела-чорная Зязюля папіла ўжо, стаяла і грэлася на сонейку, а гаспадар, дзядзька Пранук, з ласкай часаў жалезнай шчоткай сваю карміліцу, здзіраў з яе пахуднелых за зіму сцёгнаў цвёрдыя чорныя камякі.

«У кожнага свае клопаты,— падумаў Алесь.— Ці мір на свеце, ці вайна...»

Што вось пра яго, дык сёлета ўжо дзесяць гадоў, як надрукаваў свой першы верш у «Нашай ніве». Было тады яму крыху болей дваццаці гадоў, і ён знаходзіўся на катарзе ў Іркуцкай губерні. Вялікая, прыгожая і ў той жа час нямая тайга, добрыя і жорсткія тутэйшыя людзі, жандары-самадуры, адзіноцтва на далёкай чужыне з дарагімі душы, але зусім непатрэбнымі тут беларускімі думкамі і пачуццямі і парадзілі тыя першыя самотныя вершаваныя радкі...

Адбываў катаргу, набываючы на холадзе і ў голадзе сухоты, па начах пісаў вершы. Пасылаў іх у Вільню, тое-сёе апублікавалі пад яго прозвішчам і пад псеўданімам, а многае, можа, і загінула. Як і пасланы перад самай вайной у «Нашу ніву» зборнік вершаў «Матулін дар».

Калі летась, пасля лютаўскай рэвалюцыі, вяртаўся сюды, у родны Мінск, дык球 рознае было на душы: і радасць, і гаркота. Цешыўся, што дачакаўся не толькі волі, але і падзення самадзяржаўя, а маркотнеў ад таго, што, можа, дні яго ўжо злічыла хвароба. Як, да слова, і Лашковічавы альбо Зайцавы.

Ледзь толькі ўвайшоў у родны дом, абняў маці і сястрычак, адразу пачаў шукаць сяброў, а праз іх, найперш праз Лашковіча і Васілевіча, парваў з эсэрамі і далучыўся да грамадоўцаў, стаў адным з рэдактараў газеты «Беларускі шлях». Бог яго ведае, які б далей быў яго лёс, у якім бы лагеры ён апынуўся, каб не былы яго (і Лашковічаў) знаёмы пз Сібіры Міхайлаў-Фрунзе, сцежкі-дарожкі якога прывялі якраз сюды, у Мінск, і тут вылучылі ў буйнага рэвалюцыйнага дзеяча. Іменна пасля гутарак з Фрунзе ён пачаў загарацца бальшавіцкімі ідэямі, памагаў сябрам звальваць вернага прыхільніка Часовага ўрада Скуранога, суцішваў Лашковічавы вулканістычныя страсці, а нядаўна прыйшоў да саюзу з бальшавікамі, згадзіўся падпольнічаць цяпер па іхнюю карысць — хоць яшчэ не цалкам згаджаўся і з іх ідэямі, і з тым, як яны іх ажыццяўляюць. Да слова, ніяк не мог зразумець і ўхваліць Мяснікова, Ландара, Кнорына за тое, што яны гэткія глухія да нацыянальных клопатаў малых народаў Расіі.

Пачуў крокі. Матчыны. Адразу выпрастаўся: маці вельмі перажывае, калі бачыць яго сутулым. Гэта адразу б'е ёй па сэрцы: ён — цяжка хворы...

Маці, невысокая, у атопках, доўгай шэрай сукенцы і з накінутай на плечы хусткай, несла яму на сподачку кубак чаю і лустачку хлеба з кавалачкам любовістага сала.

— Падсілкуйся,— усміхнулася.

Глядзіць, як і малога. Заўсёды ветлівая, абы ў яго быў добры настрой. Ніколі не скажа: не лезь ты зноў у палітыку, вяртайся на мэблевую фабрыку, жаніся — і жыві як чалавек. Ведае, бедная, што на фабрыку ісці яму няможна, бо шкодныя фарбы і лак, што не варта жаніцца, каб не завязваць камусьці свет. Маўчыць, дазваляе рабіць што хочаш, абы не засмучаўся. Шкадуе, беражэ і цішком плача па яго долі, загубленай паганымі людзьмі ды самім сабою.

— Дзякуй, мама,— усміхнуўся. З любоўю, з тым глыбокім пачуццём, якое можна набыць да маці праз сваё асабістае гора, блуканні па свеце ды з адчуваннем, што амаль усе, нават твая любімая дзяўчына і многія сябры, адвярнуліся ад цябе, а вось маці ты стаў яшчэ болей дарагі і мілы.

Падмацаваўшыся, цёпла апрануўся і пашыбаваў у горад, да вярбы над Свіслаччу, дзе павінны ўжо чакаць Васілевіч і Нямкевіч. Сёння ён павінен не толькі выслухаць іх альбо штосьці новае даручыць, але і завесці іх на знаёмую ўжо яму яўку — у кааператыў «Рабочы будаўнік», дзе будзе сходка таго-сяго з пакінутых у горадзе Алібегавым і Мясніковым падпольшчыкаў.

Васілевіч і Нямкевіч сапраўды былі ўжо на дамоўленым месцы сустрэчы.

Ідучы з імі да «Рабочага будаўніка», Нядоля пачаў тлумачыць на хаду:

— Учора, хлопцы, у нас з'явіўся падпольны раённы камітэт РКП(б). Хто яго старшыня і члены, я не ведаю. З-за канспірацыі з вамі хоча сустрэцца і пагаварыць таварыш Бампі з гэтага камітэта. Вось цяпер мы і ідзём да яго.

Пазней, ля самога будынка кааператыва, іх сустрэў яго старшыня — малады, нават яшчэ зусім юны Ходаш Шэпшаль Шэпшалевіч. Ён падаў яму руку, хітнуў галавою Васілевічу і Нямкевічу і павёў іх у сталоўку кааператыва. Там сядзеў малады, як і гаспадар, хлопец у ватоўцы. Гадоў дваццаці двух, не болей. Поўны, нібы вялы ды сонны. Гэта і быў таварыш Бампі, ён жа — Крыніцкі Арон Маркавіч, адказны сакратар падпольнага камітэта.

— Добры дзень, таварышы,— устаў і нечакана ажывіўся ды па-беларуску загаварыў ён. Парукаўся. А зноў сеўшы, смела і ўчэпіста змерваў позіркам іх, старэйшых, зазіраў нібы ў душы.

«Малады, але ранні»,— здаецца, думалі ў гэтую хвіліну Васілевіч і Нямкевіч, якія, мусіць, чакалі, што іх прыме які-небудзь барадач, а не юнак. Ды гэты маладзён не быў ужо зялёны, спрактыкаваны да надпольнай работы тысячамі гадоў сваіх прадзедаў.

— Вы — Васілевіч, а вы — Нямкевіч? — запытаў ён з усмешкаю.— Так? Бачыце, угадаў па тым, як апісаў вас мне таварыш Нядоля, ён жа цяпер — Саша. Вы, Васілевіч, цяпер — Сеня, а вы, Нямкевіч,— Ваня. Згодны?

— Згодны,— адказаў Васілевіч.

— Добра,— Бампі паставіў кулак на кулак і падпёр імі падбародак.— Саша, канечне, расказаў вам ужо, што мы, бальшавікі і іхнія прыхільнікі, пачынаем разгортваць барацьбу супраць нямецкіх акупаптаў і беларускіх нацыяналістаў. Тут, у Мінску, будзем змагацца ў падполлі, а па-за Мінскам трэба ўздымаць партызанскі рух. Тое, што вы, Саша, Сеня і Ваня, будзеце супраць кайзераўцаў, мы не сумняваемся. Вы, як ведаем, шчырыя патрыёты Радзімы. А вось пра тое, што датычыць барацьбы з нацыяналізмам, нам трэба перакінуцца словам-другім. Згодны?

— Згодны,— адказаў Васілевіч.

— Мы ведаем пра ўсе леташнія перыпетыі вашага руху, пра снежаньскі Усебеларускі кангрэс і яго разгон, пра вашы ўзаемаадносіны з Мясніковым, Ландарам і іншымі бальшавікамі. Мы ўхваляем, што асабіста вы, Сеня і Ваня, згадзіліся супрацоўнічаць з Савецкай уладай. Мы толькі хацелі б, каб вы зусім зжылі нацыяналістычныя забабоны, прасякнуліся глыбокім інтэрнацыянальным пачуццём...— Усміхнуўся, не даў гаварыць Васілевічу, які ўжо мыліў вуснамі, каб сказаць сваё: — Ведаю, ведаю: у вас моцныя нацыянальныя пачуцці і вы не хочаце ад іх адмаўляцца!.. Ладна, мы згодны супрацоўнічаць з вамі і такімі, праверыць у справе. А там, як кажуць, час, падзеі пакажуць: падрыхтуецеся вы стаць сапраўднымі бальшавікамі ці не...

Васілевіч і Нямкевіч са згодаю змаўчалі.

— Наш камітэт просіць вас, Саша, Сеня і Ваня, стаць нашымі вачыма і нашымі вушамі ў Народным сакратарыяце Беларусі, які, здаецца, даволі хутка акрыяў ад нямецкай салдафонскай акцыі і зноў пачынае набіраць сілу. Так?

— Так,— хітнуў галавою ён, Нядоля.

— Вы, Сеня, здаецца, у германафільскай фракцыі, а вы, Ваня, у «прыхільніках» Доўбар-Мусніцкага? — усміхнуўся Бамні.

— Як і сказаў нам Алесь,— Васілевіч кіўнуў на яго, Нядолю.

— Як сказаў Саша...— паправіў Бампі.

— Выбачайце,— папрасіў Васілевіч.

— Дык вось, таварышы, мы павінны ведаць усё, што будзе гаварыцца і рабіцца ў гэтых фракцыях. Чым хутчэйшыя і праўдзівейшыя мы (а таксама нашы «смаленцы») будзем мець звесткі, тым большы будзе ў нас давер да вас. І не толькі ў нас. Але і ў «смаленцаў». І ў Сталіна. Згодны?

— Згодны,— зноў, як і дагэтуль, за сябе і Нямкевіча падаў голас Васілевіч.

— Дзякую,— зноў усміхнуўся Бампі.— Будзем лічыць: кантакт ёсць. Адпаведна, таварышы, падбаем і пра гарантыі. Па-першае, трэба прадуманая канспірацыя, па-другое, каб не было правалу. Выбачайце, хоць вы яшчэ не члены ні нашага камітэта, ні арганізацыі, толькі наш актыў, але вы павінны захоўваць у вялікай тайне ўсё, што пачуеце ад нас, і гатовы нанесці самае суровае пакаранне за лішнюю балбатню альбо за здраду... Інакш нашаму саюзу, нашаму змаганню за бальшавіцкія ідэі будзе грош цана... Згодны?

Васілевіч і Нямкевіч хітнулі галовамі.

— Больш сюды самі, таварышы, не прыходзьце,— дадаў Бампі.— Па-ранейшаму ваш старшы — Саша. Усё, што трэба, скажа альбо возьме ад вас ён.— І які раз паўтарыў сваё любімае: — Згодны?

**9**

Сёння, на пачатку сакавіка, зноў на кватэры Баравіка сабраўся разам Выканком Савета Усебеларускага з'езда. Які ўжо раз употай. Цяпер — ад нямецкага камандавання, а заадно і ад суполкі Скуранога, які не толькі цураецца іх, але і пачаў жвава пакручвацца каля немцаў, а заадно ў сакрэце і ад некаторых сваіх новых сяброў з Мінскай думы, губеранскай земскай управы, з Бунда, расійскіх партый.

— Спадары! — абвёў усіх позіркам Янка Аўторак. Як заўсёды, у вайсковай форме без пагонаў, аскетычны. Ён за гэтыя два тыдні яшчэ болей умацаваўся як лідэр.— Як вы ведаеце, бальшавікі і немцы заключылі мір у Бярэсці. Гэта значыць, што нямецкае наступленне на Усход запыняецца: Савецкі ўрад, Ленін дабіліся часу для перадышкі. Мы з вамі не ведаем, колькі будуць гэтыя адмысловыя заручыны, стануць на ногі бальшавікі ці не, але адно мы бачым, адчуваем сваёй скурай добра: як і якой цаной заключаны гэты хаўрус. Каб дабіцца яго, бальшавікі пайшлі на агромністыя страты. Для нас, беларусаў, асабліва жахліва, што Масква і намі, братамі-славянамі, заткнула

кайзеру рот, кінула чатыры пятых нашых зямель яму пад ногі на глум і грабеж. На поўначы і ў цэнтры пашай зямлі германскія войскі затрымліваюцца па лініі Расоны — Полацк — Орша — Жлобін, прасунуўшыся на ўсход сям-там больш чым па 250 кіламетраў. Ад Жлобіна лінія фронту паварочвае на ноўдзень-усход да Навазыбкава, пакідаючы ў зоне акупацыі Гомель, Рэчыцкі, Мазырскі, Пінскі і часткова Гомельскі паветы адышлі да Украінскай Народнай Рэспублікі. На астатніх неакупаваных беларускіх паветах — улада Саўнаркома Заходняй вобласці. Такім чынам, ніхто пра Беларусь не думаў і не думае, не клапоцішца, мы, сіраты, уніжаныя і зняважаныя, ахвяры чыіхсьці «вышэйшых інтарэсаў»...

Замаўчаў. Гэтая паўза зрабіла на ўсіх цяжкае ўражанне. Доўга ўсе сядзелі моўчкі; той-сёй апусціў вочы на засланы белай сурвэтаю стол, а той-сёй цікаўна, а заадно і сумна назіраў, як таўчэцца, жаласна зумкае за сонечны дзень ажылая муха каля падвешанай да столі лямпы з невялікім агеньчыкам.

— Як вы і даручылі,— далей павёў казань Аўторак,— мы, Лашкевіч, Еўзікаў і я, учора былі ў начальніка генеральнага штаба Усходняга фронту Гофмана, які браў удзел у Брэсцкай змове. Што мы ўбачылі і адчулі? Сапраўды, як мы і думаем, немцы спрабавалі груба, сілаю адпіхнуць нас ўбок, як летась адпіхнулі штыкамі і бальшавікі. Але калі мы рашуча запратэставалі, калі насцярожыліся ўсе іншыя палітычныя сілы ў Мінску, урэшце калі Германія лёгка дабілася такога выгаднага для сябе міру, яны, здаецца, пачынаюць мяняць тактыку. Нечакана Гофман папрасіў выбачэння ў Народнага сакратарыята за «прыкрую недарэчнасць 25 лютага», заявіў, што і цяпер яны «не маюць захопніцкай хціваці, найперш хочуць узнавіць лад і спакой, а таксама будуць дабівацца ад Расіі справядлівасці: каб карэнныя насельнікі на акупаваных імі землях маглі самі вырашаць свой лёс і каб гэта не ўспрымалася Масквою як здрада». Так што, сказаў Гофман, глядзіце самі, што і як вам рабіць для сябе. Што пра Доўбар-Мусніцкага, то мы, дадаў ён, стрымаем яго амбіцыі...

Зноў зірнуў кожнаму ў вочы, але ўжо не адрачона, а з увагаю, натхняльна:

— Так што, спадары, сапраўды давайце выйдзем
з дэпрэсіі, з адчаю, крыўды і зноў пачнём рабіць сваё...

— Што і як? — першы з усіх падаў голас Баравік, які вельмі змяніўся за апошні час. Паў духам, перастаў сачыць за сабою. Вось і ў гэтую хвіліну яго пышныя светлыя валасы, якімі ён так ганарыўся, былі не ўкладзеныя, тапырыліся, а не менш фацэтны шэры свэтар быў памяты, з выцягнутымі ніткамі.

— Калі і цяпер, у новую змову за нашымі плячыма, гісторыя дае шанец, то мы мусім спажыць яго спаўна...

— А што такое «спаўна»? — запытаў Баравік.

— Гэта тое, чаго ты хацеў на снежаньскім кангрэсе...

— Калі я тады дабіваўся нашай незалежнасці, то меў на ўвазе, што яе могуць даць бальшавікі, якія гэтак гучна аб'явілі ўсяму свету «Декларацию прав народов России». Але яны...

— Цяпер не іудзеі-марксісты, а культурная нацыя гатова паспрыяць...

— А! Усе яны — набрыдзь, чэрці!

— Ну! — усцепнуў плячыма, неяк паблажліва ўсміхнуўся з Баравіка, якога перамог, Аўторак.— У вас, Тарас, пераважае цяпер не розум, а пачуццё. Яно — цудоўная рэч, але не заўсёды для палітыка. Яно — для паэтаў, мастакоў, артыстаў. Для кабет.

— Мне і пачуццё падказвае: Германія загульвае з нацыянальнымі меншасцямі на акупаваных землях, рыхтуе з нас сабе падпору,— агрызнуўся Баравік, пунсовы цяпер, як памідор.— Каб надаўжэй затрымацца тут. А па-другое, наколькі я ведаю, па Брэст-Літоўскім трактаце, мы лічымся акупаванымі часова. Значыць, над намі захоўваецца юрыдычны суверэнітэт Расіі.

— Ніхто, Тарас, не ведае, колькі будзе гэты мір.— Аўторак быў цярплівы і разважлівы.— Можа, кароткі час. Можа, і доўгі. Мы, Лашковіч, Еўзікаў і я, лічым: сядзець у нары не варта. Трэба выходзіць на паверхню і рабіць тое, што ўдасца. А цяпер нам, думаю, можна: першае — пераўтварыць наш Савет Усебеларускага з'езда ў Раду, а Радзе пачаць утвараць Беларускую Народную Рэспубліку...

— ...у васальнай залежнасці ад Германіі...— з'едліва перапыніў яго злы Баравік.

— Гісторыя, Тарас, не дала нам лепшага выбару...— непарушна адпарыраваў Аўторак.— І мы павінны без лішніх ваганняў спажыць свой пакуль што адзіны шанец, паставіць перад фактам Маскву, Берлін і Еўропу!

— Еўропе напляваць на нас,— паныла прамовіў Баравік.— Масква пракляне, збэсціць, а Берлін, калі згодзіцца на нашу рэспубліку, то змусіць танцаваць пад яго дудку. Я асабіста не жадаю гэтага. Авантурызму і самазабойства! Ужо нават у маральным сэнсе. У вачах не толькі Масквы, але і ў вачах нашага народа!

— Ты кажаш праўду, Тарас,— уздыхнуў Аўторак.— Ды нам, кажу ж, на жаль, няма іншага выйсця.

Баравік зноў хацеў штосьці запярэчыць, але ў гэтую хвіліну яго ўзяў за локаць Лашковіч. Коратка пастрыжаны, у тоўстых акулярах, рашучы.

— Сябры,— уступіў у гаворку.— Гэтак мы можам спрачацца бясконца, і кожны па-свойму ў гэтай палеміцы будзе мець рацыю. Але рана-позна ўсё роўна трэба будзе штосьці рашыць. Асабіста я раю: давайце, пакуль немцы не змянілі тактыкі, аб'явім Другую Устаўную Грамату, Беларускую Народную Рэспубліку. У новым Маніфесце трэба пашырыць і паглыбіць, а то і ўвогуле сказаць пра тое, чаго было мала, а то і не мелася ў ранейшым нашым дакуменце. Што да нашай арыентацыі па Маскву ці Берлін, давайце пра гэта вельмі не ўпамінаць. Сам час расставіць усе акцэнты. А тое, што і ў Маскве, і ў Берліне будзе на языку, у вушах «Беларуская Народная Рэспубліка», то ўжо і гэты звон павінен саслужыць сваё. Урэшце прывучыць да нас.

— Прашу выказвацца, спадары,— калі Лашковіч скончыў, сказаў Аўторак.— Давайце разам рашаць, разам быць адказнымі перад гісторыяй і беларускім народам.

— Я — за Беларусь, нават і пад нямецкаю апекаю,— нечакана для ўсіх падняў угору руку Васілевіч, з выклікам акінуў усіх позіркам.

Усе, нават і Лашковіч, які найбольш ведаў яго, вытрашчылі вочы: ну й Сямён! Яшчэ нядаўна перабег да бальшавікоў, а цяпер гатовы перакінуцца да .немцаў! Сам жа Васілевіч у гэтую хвіліну адчуваў разгубленасць і сваю віну, баяўся, што могуць здагадацца: гэта не яго асабістая думка, так даручылі гаварыць яго новыя сябры-падпольшчыкі.

— А што,— ажывіўся Лашкевіч,— я — таксама за гэта...

— І я,— спакойна падаў голас Еўзікаў.

— Я быў за незалежнасць, калі вы амаль усе нават не заікаліся пра гэта, мямлілі толькі пра аўтаномію,— рэзка сказаў Баравік.— Але я рашуча супраць, каб мы купілі сваю «незалежнасць» за слугаванне Берліну.

— Што ж, спадары, будзем галасаваць,— паспяшаўся астудзіць спрэчкі, прадухіліць раскол Аўторак.— Першае: хто за тое, каб Савет Усебеларускага з'езда ператварыць у Раду?

Аднагалосна.

— Далей. Вылучаны дзве канцэпцыі наконт нашай незалежнасці. Першая: у саюзе з Расіяй. Другая: без гэтага саюзу, з арыентацыяй на Германію. Хто — за першую?

Большасць.

— Што ж, усё ясна. За другое і не будзем галасаваць,— пахітаў галавою Аўторак,— Далей. Калі мы вылучылі тэзіс нашай незалеж-

насці без арыентацыі на нямецкую апеку, то нам трэба абгрунтаваць яго. Мы ўжо маем накід Другой Устаўной Граматы, дзе мы ўлічылі тое, чаго не было ў Першай. Калі ласка, Максім,— павярнуўся да Лашковіча,— зачытай праект.

Лашкевіч дастаў з кішэні пінжака лісток, разгарнуў яго і пачаў чытаць:

«У часе сусветнай вайны, што бурыць адны моцныя дзяржавы і аслабляе другія, абудзілася Беларусь да дзяржаўнага жыцця. Пасля трох з паловаю вякоў няволі зноў на ўвесь свет кажа беларускі народ аб тым, што ён жыве і будзе жыць. Вялікі Народны Збор — Усебеларускі з'езд 15-17 снежня 1917 г., дбаючы аб долі Беларусі, зацвердзіў на яе землях рэспубліканскі лад. Выпаўняючы волю з'езду і баронячы дзяржаўнае права народу, Спаўняльны камітэт Рады з'езду гэтак пастанаўляе аб дзяржаўным устроі Беларусі і аб правах і вольнасці яе грамадзян і народаў:

1. Беларусь у рубяжох рассялення і лічэбнай перавагі беларускага народу абвяшчаецца Народнай Рэспублікай.

2. Асноўныя законы Беларускае Народнае Рэспублікі зацвердзіць Устаноўчы Сойм Беларусі, скліканы на асновах агульнага, роўнага, простага, патаемнага і прапарцыянальнага выбарчага права, не зважаючы на род, народнасць і рэлігію.

3. Да часу, пакуль збярэцца Устаноўчы Сойм Беларусі, заканадаўчая ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Радзе Усебеларускага з'езду, дапоўненай прадстаўнікамі меншасцей Беларусі.

4. Спаўняючая і адміністрацыйная ўлада ў Беларускай Народнай Рэспубліцы належыць Народна-
му Сакратарыяту Беларусі, які назначаецца Радаю з'езду і перад ёю трымае адказ.

5. У рубяжох Беларускай Народнай Рэспублікі абвяшчаецца свабода слова, друку, сходаў, забастовак, хаўрусаў, безумоўная свабода сумлення, незачэпнасць асобы і памяшкання.

6. У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі ўсе народы маюць права на нацыянальна-пэрсанальную аўтаномію, абвяшчаецца роўнае права ўсіх моваў Беларусі.

7. У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі права прыватнае ўласнасці на зямлю касуецца. Зямля перадаецца без выкупу тым, што самі на ёй працуюць. Лясы, азёры і нутро зямлі абвяшчаюцца ўласнасцю Беларускае Народнае Рэспублікі.

8. У рубяжох Беларускае Народнае Рэспублікі ўстанаўляецца найбольш 8-гадзінавы рабочы дзень.

Абвяшчаючы ўсе гэтыя правы і вольнасці грамадзян і народаў Беларускае Народнае Рэспублікі, мы, Спаўнялыіы Камітэт Рады З'езду, абавязуемся пільнаваць законнага парадку жыцця ў Рэспубліцы, сцерагчы інтарэсы ўсіх грамадзян і народаў Рэспублікі і захаваць правы і вольнасць працоўнага люду. А так сама даложым усіх сілаў, каб склікаць у найбліжэйшы час Устаноўчы Сойм Беларусі.

Усіх верных сыноў Беларускае зямлі клічам памагчы нам у цяжкай і адказнай нашай працы.

Спаўняючы Камітэт Рады 1-га Усебеларускага З'езду. Выдана ў Менску-Беларускім 9 сакавіка 1918».

— Выбачайце, спадары,— калі Лашковіч скончыў чытаць, першы сказаў Аўторак.— Забягу наперад. Мне здаецца: такой канкрэтнай і справядлівай праграмы, такой увагі да пародных клопатаў, да ўсіх нацыянальнасцей краю мы яшчэ ад нікога не чулі. Калі і пасля гэтага паш люд не падтрымае, дазволіць зганьбіць нас, то ён не варты, каб быць народам, мець сваю дзяржаву!

— Праграма папраўдзе дзелавая і гуманная,— упершыню за апошнія дні згадзіўся з Аўторкам, з Лашковічам Баравік.— Асабіста я цалкам за яе.

— Ёсць іншыя думкі? — павесялела запытаў Аўторак.

— Не,— сказаў Бурбіс, і яго слова, слова ветэрана руху, прагучала ўпушальна для ўсіх. Асабліва для навічкоў.

— Будзем галасаваць? — усміхнуўся Аўторак.

— Дзеля чаго? — прамовіў Баравік.— Усе ж згодныя.

— Тады — далей,— сказаў Аўторак, і ў ім, аскеце, нібы абудзіўся просты зямны чалавек, які ўмее і радавацца.— Калі будзе дзяржава, яе праграма, то трэба і ўрад, хто ўсё гэта трымаў бы на сваіх плячах. Давайце спачатку прыкінем, хто іменна з нас і на якую пасаду можа ўвайсці ў яго. Калі пасля, можа, і на з'ездзе, нашы саюзнікі пачнуць дабівацца крэсел і для сябе, то, можа, прыйдзецца ўносіць і карэктывы. Згодны?

— Згодны,— разам, у адзін голас, сказалі Васілевіч і Лашковіч.

— Добра,— прамовіў Аўторак.— Цяпер давайце пяройдзем на персаналіі. Каму мы дадзім права на заканадаўчую ўладу, права прэзідэнта рэспублікі?

— Табе,— першы забег усім наперад змрачнаваты, у вайсковай форме Заходка.

— Аўторак,— выгукнуў Еўзікаў.

— Іншыя думкі ёсць?— задаволена, але бясстрасна запытаў Аўторак.

Астатнія маўчалі; здаецца, моўчкі згаджаліся, што якраз ён цяпер іхні лідэр.

Калі прагаласавалі за яго, кандыдат у прэзідэнты БНР спачатку падзякаваў «за такі вялікі давер», а
пасля ўжо трохі іншым, «прэзідэнцкім», голасам папытаў:

— Ну, а каму дадзім выканаўчую ўладу, уладу старшыні ўрада і заадно народнага сакратара замежных спраў? Можа, спадара Баравіка?

— Я адмаўляюся,— тут жа кінуў Баравік.— Па той прычыне, якую я нядаўна называў...

— Ты, здаецца, намерыўся адысці ад нашага руху альбо раскалоць яго...— мякка, але на самай справе едка ўпікнуў Аўторак.

— Як хочаш, так і думай,— агрызнуўся той,— Я ж застаюся пры сваёй думцы.

— Не, дарагі,— нечакана накінуўся на яго Лашкевіч.— Для кожнага палітычнага дзеяча любой партыі ёсць яшчэ і такое святое ды строгае паняцце, як дысцыпліна. Зоймешся дурыкамі — хутка прыструнім...— Зрабіў паўзу, але, бачачы, што Баравік зацяўся, маўчыць, дадаў спакайней: — Але ладна. Раз адмаўляешся ад вялікага даверу, не мойваю: набыць раўнавагі ў такой цяжкай для нас сітуацыі, то змушаць не будзем. Параім іншага, болей ураўнаважанага.— І ўжо да ўсіх: — Я, спадары, хачу папрасіць: давайце не будзем адштурхоўваць тых, хто тут адраджаў наш рух адразу пасля лютаўскай рэвалюцыі, хто даваў новае жыццё БСГ — самай перадавой і боездольнай нашай партыі. Карацей, я раю на вышэйназваную пасаду аднаго з найбольш вядомых нашых дзеячаў Сымона Васілевіча.

— Згодны? — Аўторак абвёў усіх позіркам. Ніхто не запярэчыў і нікога іншага не вылучыў.

«Відаць, у падпольным камітэце будуць рады, што якраз я магу трапіць на такую высокую пасаду ў БНР»,— падумаў у гэтую хвіліну сам сабе Васілевіч.

Пасля рашылі параіць сходу ці з'езду па пасады народных сакратароў: скарбу — Заходаў, асветы — Шуляка, кантролю — Пячэрнага, вайсковых спраў — Еўзікава, сябрам народнага сакратара — Жытніка, маскоўскім консулам — Бурбіса.

— Што ж, спадары,— пазіраючы на ўнесеных у спіс, яшчэ болей палагоднеў Аўторак,— віншую вас, кандыдатаў у першыя беларускія дзяржаўныя мужы! Руплівасці, спору вам усім у нашай высакароднай рабоце і шчаслівага лёсу вам усім! Іншых нашых паплечнікаў шчыра прашу: памагайце нам, не кідайце нас адных на волю лёсу, бо мы без вас, без вялікай і моцнай падпоры не шмат дабёмся. Тым болей што

час, канечне, зробіць і свае папраўкі, той, хто варты, таксама будзе ва ўрадзе...

Заспакоіў, улагодзіў усіх, а пасля павёў рэй далей:

— Яшчэ. Думаю, цяпер у нас самыя бліжэйшыя чатыры задачы: першая — апублікаваць у друку нашу Другую Устаўную Грамату, тлумачыць ідэю БНР люду, усім тутэйшым палітычным партыям, Мінскай губеранскай земскай управе, Гарадской думе, каб яны не толькі не сустрэлі нас у штыкі, а падтрымалі, другая — як след далажыць пра ўсё немцам, каб яны не напужаліся і ўспрынялі ўсё спакойна, трэцяя — камусьці з'ездзіць у Кіеў і папрасіць украінскіх калегаў, каб яны аб'явілі па радыё пра нашу БНР і ад свайго імя папрасілі ўсю Еўропу прызнаць нас, чацвёртая — даручыць нашаму паважанаму спадару Бурбісу прарвацца ў Маскву, перамовіцца з Белнацкомам і са Сталіным, расказаць ім усё і запэўніць, што БНР не думае адрывацца ад Расіі, яна толькі змушана ў гэтай сітуацыі сама падбаць пра беларускі народ і яго будучыню... Так?

Усе выслухалі ўважліва, спакойна, але што да Бурбіса — маладжавага, у чорным касцюме, белай кашулі са стаячым каўнерыкам і пры гальштуку,— то, перавёўшы позіркі на яго, усміхнуліся: той пакручваў сваёй прадаўгаватай галавой з зачасанымі на бакі цёмнымі валасамі, адмыслова ўсміхаўся.

— Не ведаю, спадары, як я споўню такі далікатны наказ! — прызнаўся.— Чарвякоў і Гартны, можа, прымуць ды паслухаюць, а вось Сталін... Ці захоча ён нават бачыць мяне?!

— Трэба, мусова трэба, дзядзька Алесь, трапіць і да Сталіна,— прыязна папрасіў Аўторак.— Прыміце на сябе яго каўказскую запальчывасць, гнеў, захоўвайце нашу, беларускую, вытрымку і развагу. І, галоўнае, супакойце яго.

— Паспрабую,— пацепнуў плячыма Бурбіс.— Але перасцерагаю: не ўскладайце вялікіх надзей на маю місію... Думаю, Сталіну не вельмі спадабаецца, што мы дабіваемся сваёй дзяржаўнасці пры немцах... Нават больш — ён аб'явіць нас здраднікамі і нямецкаю марыянеткай...

— Вось вы і патлумачце яму ўсё як след. Больш падкрэслівайце той момант, што мы дбаем пра сябе якраз у такую незвычайную, заблытаную і цяжкую сітуацыю.

— Паспрабую,— паўтарыў тое, што сказаў раней, Бурбіс.

— І яшчэ, спадары, ёсць адна далікатная рэч,— зірнуў на ўсіх Аўторак.— Як нам быць з нашымі віленцамі?

Зрабіў паўзу, уважліва вывучаў, што ў каго ў вачах, але ўсе маўчалі.

— Сказаць шчыра, я добра не ведаю, што і як яны робяць. Адны кажуць: яны — заадно з немцамі. Другія — не, яны толькі загульваюць з акупантамі і дабіваюцца адраджэння Беларуска-літоўскага гаспадарства. Трэція — што яны і не заадно, і не загульваюць, а робяць якраз тое, што трэба... Дык што — можа, паклічам іх сюды, пагаворым, каб ведаць: знацца з імі, спадзявацца на помач ці, наадварот, адмахнуцца ад іх?

— Пабачыцца і пагаварыць не зашкодзіць,— прамовіў Бурбіс.— Яны, асабліва Ланкійскія, пачынальнікі ж нашага руху.

— Але цяпер са сваёй нямецкай арыентацыяй могуць зганьбіць яго,— забурчаў Баравік.

— Па-першае, Тарас, цяпер не Вільня, а Мінск — цэнтр нашага руху,— спакойна адказаў Бурбіс.— Па-другое, не яны, а мы на чале яго. Дык калі што якое, мы можам і паправіць іх. А па-трэцяе, ты даеш адсячы сваю галаву, што яны толькі нямецкія прыслужнікі?

Баравік змаўчаў.

— Дык, значыць, клічам іх сюды? — запытаў Аўторак.

Згадзіліся.

Пазней, калі пачалі разыходзіцца незадоўга да камендацкай гадзіны, да Лашковіча і Васілевіча прымкнуў Аўторак — у доўгім, лічы, да пят, старым паліто, у шырокім капелюшы, высокі і масіўны, нібы мядзведзь. Нават рослы Лашкевіч быў побач з ім за хлапчука. Васілевіч — зусім за падшывальца.

— Я лічыў: вы, Сямён, гарачы, дзёрзкі чалавек, нават вялікі блытанік,— паклаў руку на плечы, прыхіліў яго да сябе Аўторак.— Аж вы — разважлівы і кемны.

— Абцёрся, абабіўся ўжо,— усміхнуўся Лашкевіч, які апошні час пасябраваў з Аўторкам,— дык навучаны і правучаны...

Васілевіч адчуваў: Аўторак уплёўся ісці разам не толькі дзеля таго, каб пахваліць яго. Мае нейкую важную размову. Але рашыў не забягаць наперад, моўчкі крочыў побач.

Нейкі час прайшлі без гаманы ў паўзмроку, удыхаючы водар адталага за дзень сакавіцкага снегу, нагрэтых сонцам дрэў і дамоў, цяперашняга марозіку, які ўбіраў, выстуджваў усе гэтыя пахі, скоўваў павільгатнелы снег. Здалёку, з гарадскога цэнтра, можа, і з рэстарана «Акварыум» на Юраўскай, даносілася вясёлая музыка — там, мусіць, весяліліся госці-афіцэры, святкуючы сваю перамогу, якую яны атрымалі і на фронце, і на перамовах у Брэсце. Неўзабаве адтуль панёсся залівісты жаночы смех, нібы якуюсьці кабеціну заўзята казыталі пад пахі.

Яны, трое хадакоў, на хвіліну толькі павярнулі галовы туды, на сыты і задаволены свет, пасля ўнурыліся і закрочылі далей.

— Хлопцы, трэба пагаварыць шчыра,— першы парушыў маўчанне Аўторак.— Тое, што мы рашылі аб'явіць БНР, будзьма рэалістамі, вельмі рызыкоўны крок. Але цяпер жыццёва патрэбны. Але вось тое, як мы хочам паставіць на ногі наша дзецішча, амаль нерэальны спосаб. Добра, што немцы не замінаюць, ды было б у сто разоў лепш, каб яны памаглі нам сцвердзіцца не толькі на паперы, але і на справе! Так?

Лашковіч і Васілевіч змаўчалі ў знак згоды.

— Але ці прызнаюць, паспрыяюць яны, калі такія халодныя да іх мы?

І праз паўхвіліны, пасля паўзы:

— Не. Загадзя трэба прадбачыць: будуць халодныя да нас і яны. Як лёд. Нашто прызнаваць, умацоўваць пас, калі мы ўскосна супраць іх? Як будзьма рэалістамі: не прызнаюць, не захочуць нам памагаць ні Белнацком, ні бальшавікі...

Зноў змаўчаў, а пасля запытаў:

— Дык ці трэба нам такая кругавая ізаляцыя? Ці ўстоім мы ў ёй?

Падняліся на Верхні горад, да копкі. Сталі па прыпынку і пачалі чакаць вагона.

— Давайце разважаць далей,— сказаў Аўторак.— Цяпер Белнацком не мае сілы, каб штосьці зрабіць, а бальшавікі зусім не гатовыя, а то і неахвочыя рашаць нацыянальныя інтарэсы народаў Расіі. Значыць, увесь цяжар кладзецца на нас саміх. Адпаведна, мы, ведаючы ўсё вышэйпамянёнае, павінны, як кажуць, спажыць усё, нават і не самае прыемнае, што дае нам гісторыя. Значыць, калі будзем гаварыць з немцамі, уручаць ім копіі нашых дзяржаўных актаў, то заадно трэба на словах сказаць ім, што мы будзем супрацоўнічаць з імі, просім Германію апекаваць нас...

— Але ж гэта — парушэнне нашай сённяшняй дамовы, раскол нашага руху! — у гэтую хвіліну шчыра ўсклікнуў Васілевіч.

— Не ўсе нават з нашага ўрада павінны ведаць, пра што і як мы будзем гаварыць з Гофманам альбо з Фолькенгеймам, пра што і як будзем прасіць праз іх Берлін...

Лашковіч па-ранейшаму маўчаў, нібы згаджаючыся з такім хітрым Аўторкам, а Васілевіч вагаўся: не любіў і не ўмеў гуляць, тым болей у палітычныя гульні са сваімі ж.

— Будзьма, кажу, рэалістамі,— сказаў Аўторак.— Гісторыя дала цяпер толькі такі шанец. Дык давайце спажывём яго, хоць бы пасля і прыйшлося ісці на крыж! Калі трэба ахвяраваць, дык трэба!

Васілевіч мала ведаў гэтага Аўторка, пазнаёміўся з ім толькі летась, дык і тады, калі разам трапілі ў Выканком Савета Усебеларускага з'езда, і яшчэ цяпер добра не знаў: той сапраўды шчыры альбо толькі прыкідваецца і дбае найперш пра свае амбіцыі.

Але не забываючы, што ён па сваім тайным зароку павінен выяўляць прагерманскую палітыку, прамовіў:

— Што ж, рызыкаваць дык рызыкаваць...

— Дзякуй, Сымоне,— паціснуў яму руку Аўторак.— Паспрабуем павесці гібкую палітыку, у якой свае законы і правілы...

**10**

Выпіскі з дакладных Мінскаму падпольнаму раённаму камітэту РКП (б)

«Сёння, сёмага сакавіка, Аўторак і я хадзілі з візітамі.

Спачатку былі ў Мінскай гарадской думе, у Ванштэйна. Аўторак расказаў яму пра тое, што днямі рашыла Рада Савета Усебеларускага з'езда, даў яму копію Другой Устаўной Граматы і папрасіў думцаў не ўхіляцца, кааптаваць сваіх людзей, у тым ліку і сябе, у Раду Усебеларускага з'езда, каб пераўтварыць яе ў Раду БНР — адмысловы прадпарламент.

Калі пазнаёміўся з уручаным дакументам і паслухаў каментарыі, Ванштэйп сказаў прыкладна так: Рада Усебеларускага з'езда правільна арыентуецца ў цяперашняй своеасаблівай сітуацыі, законна робіць тое, што даручыў у снежні леташняга года выбранаму Савету Усебеларускі з'езд. Калі мы, падкрэсліў ён, не зусім разумелі гэта тады, дык добра разумеем гэта цяпер. Мінская дума ўхваліць вашу Другую устаўную Грамату, паможа, у тым ліку і грашыма, толькі павінна ясней ведаць адну вельмі важную рэч — адносіны будучай БНР да Расіі і Германіі...

Пасля гэтага адбыўся такі дыялог:

А ў т о р а к. Якімі бачыце гэтыя адносіны асабіста вы?

В а н ш т э й н. Давайце гаварыць шчыра: немцы адрадзілі і вас, і нас. Мы павінны дзякаваць ім, але... Ёсць вялікая закавыка якраз у гэтым «але». Славяне і немцы — усё ж чужародныя элементы. Значыць, яны ніколі не змогуць зблізіцца як след, іхні саюз можа быць толькі па разліку, толькі ў пэўных, як цяпер, прымусовых умовах. Расія — іншая рэч. Мы ўсе звязаныя з ёй даўняй повяззю. У эканоміцы і культуры. Значыць, БНР не можа быць супраць Расіі. Тым больш не забывайце: па Брэст-Літоўскім трактаце лічыцца, што нашы землі, апроч заходніх, акупаваны часова. Значыць, мы пад юрыдычным суверэнітэтам РСФСР.

А ў т о р а к (усміхнуўшыся). Калі мы не можам ісці супраць і Германіі, і Расіі, значыць, у нас ёсць трэці шлях — шлях поўнай сваёй незалежнасці...

В а н ш т э й н. (стрымана). Адчуваю: якраз гэты шлях найлепш грэе вашы беларускія душы. Але іншыя партыі, нацыянальнасці могуць не зусім падтрымаць вас. Мае браты па крыві — найперш. Нашы гандлёвыя людзі будуць баяцца, каб не апынуцца ў замкнёным крузе, каб вы не ўрэзалі іхнія правы і перспектыву. Яны будуць толькі за саюз з Расіяй, да якой у іх ужо даўно пратаптаныя сцежкі-дарожкі.

А ў т о р а к. І да Савецкай Расіі, якая ўрэзала правы і перспектыву маёмасных людзей?

В а н ш т э й н. Мае аднакрэвічы, я — за саюз з дэмакратычнай Расіяй, што будзе без бальшавікоў. Беларусь павінна ўвайсці ў яе на федэратыўных прынцыпах, як яе частка.

А ў т о р а к. А калі бальшавікі ўтрымаюцца? Калі Расія застанецца ў іхніх руках?

В а н ш т э й н. Мы павінны верыць, што гэта не здарыцца, арыентавацца, паўтараю, на іншую Расію.

А ў т о р а к. І вы думаеце: немцам спадабаецца наш такі тэзіс?

Ванштэйн. Яны не павінны ведаць яго.

А ў т о р а к. Ясна. Цяпер прэ іншае: колькі вы, пан Ванштэйн, хацелі б кааптаваць людзей ад Мінскай думы ў склад Савета Усебеларускага з'езда?

В а н ш т э й н. А колькі месцаў думаеце даць нам вы?

А ў т о р а к. Сем-восем.

В а н ш т э й н. Мала. Вельмі мала.

А ў т о р а к. Тады — дзесяць. Але болей прасіць не варта. Мы павінны думаць і пра іншых.

Калі пасля палемікі сышліся на тым, што Мінская дума пашле Ю чалавек у склад Савета Усебеларускага з'езда, у знак першай дзелавой помачы дасць БНР Ю тысяч на «неадкладныя патрэбы», Аўторак сказаў, што не варта адцягваць узаконьванне БНР, трэба не пазней 15 сакавіка склікаць у Мінску з'езд самакіраваішяў і грамадскіх арганізацый краю і на ім зацвердзіць закон па выбарах ва Устаноўчы сход Беларусі.

Ванштэйн — трошкі засмучаны, што мала будзе ў нас яго пасланцоў,— згадзіўся.

Пасля Аўторак і я пабывалі і ў Мінскай губеранскай земскай управе. Там нам паўтарылі тое, што сказаў Ванштэйн: БНР прызнаём, але толькі як частку будучай Расіі, лад якой павінен вызначыць Устаноўчы Сход. У заўзятай спрэчцы прыйшлі да згоды: і земцы бяруць Ю

месцаў у Радзе Усебеларускага з'езда. У гэты ж дзень Лашковіч перамовіўся з польскай суполкай Абадзінскага і генералам Доўбар-Мусніцкім, Шуляк — з лідэрам эсэраў Шуйскім, Заходка — з важаком меншавікоў Пайкесам, Еўзікаў — з бундаўцамі, Пячэрскі — з украінскай групай, Жытнік — з літоўскай, Бурбіс — з велікаротай. Усе, нават тыя, хто яшчэ нядаўна, пры Саўнаркоме Заходняй вобласці, не хацеў нават чуць ні пра якую Беларусь, згадзіліся спрыяць БНР, намагаліся займець у яе Радзе як мага болей крэслаў. Пасылалі Бурбіса і да Скуранога, але перамовы з ім і генералам Петрыкевічам ні да чога не прывялі: Скураны не захацеў, як сказаў, «быць чыімсьці пакаёвым», «будзе фарміраваць свой цэнтр беларускага руху».

Базыль (псеўданім С. Васілевіча).

«Сёння, 8 сакавіка, Рада Усебеларускага з'езда ўхваліла дасягнутае пагадненне з іншымі палітычнымі партыямі, прызнала за вялікую сваю перамогу тое, што летась «самавызначэння Беларусі прыходзілася дабівацца толькі нам самім, а цяпер гэтага ўжо дабіваецца блок розных палітычных партый і нацыянальнасцей краю».

Рашылі: заўтра, 9 сакавіка, апублікаваць Другую Устаўную Грамату да народаў Беларусі».

Стаўбцоўскі (псеўданім А. Нямкевіча).

«Сёння, 9 сакавіка, Аўторак, Еўзікаў і я папрасіліся на прыём да самога нямецкага камандуючага Усходнім фронтам.

Той, як і дагэтуль, ухіліўся ад сустрэчы, нам перадалі, што ён хворы, і нас прыняў яго давераны — добра знаёмы ўжо генерал Фінкельштэйн.

Аўторак уручыў яму ў перакладзе на нямецкую мову Другую Устаўную Грамату. Фінкельштэйн бегла кінуў на яе позірк (мусіць, ужо хтосьці даў яму пераклад з надрукаванага ў газетах) і не толькі не павіншаваў, але і не выявіў ніякіх эмоцый. Адчувалася: ён і яго вышэйшае начальства незадаволеныя.

Вось пераказ гутаркі, што далей адбылася:

А ў т о р а к (праз перакладчыка Еўзікава). Мы паведамляем нямецкаму камандаванню, што з вашай міласцівай згоды ажыццяўляем сваё законнае права на нашу дзяржаўнасць.

Фінкельштэйн (з ухмылкай). Вы, панове, па-свойму, вельмі ж па-славянску разумееце сваё права займацца такімі незвычайнымі рэчамі, папярэдне не раячыся з намі... Ці вы лічыце: нас зусім не цікавіць, што тут робіцца, і мы зусім не дбаем пра сваю бяспеку?!

А ў т о р а к (абачліва). Па-першае, пан генерал, наша акцыя не нясе пагрозы нямецкай арміі. Па-дру-
гое, БНР утвараюць усе буйнейшыя тутэйшыя палітычныя партыі і нацыянальнасці краю.

Фінкельштэйн. Усе? І фракцыя пана Скуранога?

А ў т о р а к. Не. Пан Скураны адмовіўся супольнічаць з намі.

Фінкельштэйн. Значыць, ваша акцыя — не агульнанароднае волевыяўленне.

А ў т о р а к. Пан Скураны не прадстаўляе наш народ, пан генерал. Ён — найперш выказнік яго маёмаснага слоя. Мы ўтвараем сваю дзяржаву без буржуазіі і не для яе. Для ўсяго працоўнага народа.

Фінкельштэйн. Дык вы — бальшавіцкія паслядоўнікі, ваша дзяржава — маскоўская марыянетка...

А ў т о р а к. Не. Уся кааліцыя, што ўтварае БНР, рашуча супраць бальшавікоў.

Фінкельштэйн. І Расіі?

А ў т о р а к замяўся.

Фінкельштэйн (ці то ўсцешана, ці то зларадна). Вось-вось! Маўчыце! А раз вы не супраць Расіі, якая, як вы кажаце, прыгнятала вас, значыць вы не за Германію!

А ў т о р а к. Мы не супраць Германіі.

Фінкельштэйн. Але — і не за! Вось тут (тыцнуў указальным пальцам на іхнюю паперыну) нідзе няма нават слоўца пра вашы адносіны да нашай арміі, да нашай краіны. Ці не красамоўна, панове?

А ў т о р а к (зірнуўшы на Еўзікава і мяне: чуеце-чуеце?! А пасля трошкі з блазенскай усмешкай гаспадару пакоя). Пап генерал без дай прычыны нападае па нас...

Фінкельштэйн (узбуджана). Як гэта — без дай прычыны? Пакажыце-пакажыце, дзе тут (пастукаў пальцам па паперыне) не толькі цёплыя словы,
але ўвогуле хоць адно слова пра Германію? Ці, можа, паміж радкоў?

А ў т о р а к. Іменна так, пан генерал. Паміж радкоў.

Фінкельштэйн. Пазбаўце, панове, нас, вайскоўцаў, ад палітычных красвордаў! Нам трэба поўная яснасць: вы — за ці супраць нас?

А ў т о р а к (стрымана). Як і казалі вам ужо, мы дзякуем вам за вызваленне і дазвол нам самім рашаць свой лёс, але мы не можам вось так, як вы гаворыце, ясна абнародаваць: мы — з Германіяй! Пасля гэтага бальшавікі ў Смаленску і ў Маскве, наш Белнацком пачнуць такі лямант, што будзе пякельна горача і нам, і вам. Цяпер,

пан генерал, найбольш разумна не ўсё афішыраваць. Нашы з вамі ўзаемаадносіны ў тым ліку.

Фінкельштэйн. А нам, панове, здаецца, што вы ведзіцё з намі прыкладна такую ж гульню, якую вялі і вядуць вашы калегі ў Вільні. На словах яны лаяльныя, а на справе робяць усё толькі для сябе.

А ў т о р а к. На жаль, мы мала ведаем, што і як робяць нашы землякі ў Вільні. Мы будзем рады, калі вы дазволіце ім прыехаць сюды і пагаварыць з намі. А што да Германіі, то, паўтараю, пан генерал, мы публічна не выступаем супраць яе. Як і дамовіліся, надаём ваш прыход сюды як вызваленчую місію. Але вы, выбачайце, зусім глухія да нашых інтарэсаў.

Фінкельштэйн. Ладна, я маю паўнамоцтва сказаць вам: што ж, мы можам пайсці і насустрач вам. Але толькі...

А ў т о р а к (пасля некаторага маўчання з абодвух бакоў) Што «толькі», пан генерал?

Фінкельштэйн. Вы павінны паводзіцца вельмі гібка, як і вашы суседзі — украінцы і літоўцы.

А ў т о р а к. Кажу ж, мы не маем сувязі са светам, дык шмат чаго не ведаем.

Фінкельштэйн (хітра ўсміхаючыся). Умова наша простая: вы аб'яўляеце сваю дзяржаву і аддзяляецеся ад Расіі. Тады, не парушаючы дагавор, Германія можа прызнаць вас. Не як частку Расіі, а як незалежную дзяржаву. Нават больш — прызнаўшы вашу дзяржаву, мы маглі б ужо разам дабівацца, каб далучыць да яе і астатнія вашы землі, што цяпер пад Расіяю.

А ў т о р а к пачакаў, што той скажа яшчэ.

Фінкельштэйн (напорыста). Калі вы пойдзеце на такі акт, тады афіцыйна ад імя свайго ўрада звернецеся да нашага кайзера, каб Германія прызнала вас. Каб уся Еўропа ўбачыла: не мы лепім паслухмяную марыянетку, а вы самі, спажываючы свае права і спрыяльныя ўмовы, будуеце сваю дзяржаўнасць. Без такога вашага звароту не можа быць ніякай гутаркі пра наша прызнанне, пра нашу помач.

А ў т о р а к слухаў, не перапыняў.

Фінкельштэйн (разгаварыўшыся). Ну, а пасля, калі ўсё адбудзецца, нашы ўрады па высокім узроўні пагавораць пра ўсе эканамічна-культурныя аспекты будучага саюза. А пагаварыць ёсць пра што прамысловай Германіі і аграрнай Беларусі, дзе высокі дух працавітасці і гаспадарства.

А ў т о р а к (гатовы сказаць «згодзен», але і цяпер стрыманы). Я павінен, пан генерал, параіцца наконт пачутага ад вас са сваімі калегамі.

Фінкельштэйн. Парайцеся. І адразу ж давайце знаць нам, што вы рашылі.

А ў т о р а к. Тады дазвольце яшчэ запытацца: вы дазволіце нам утварыць свае войска?

Фінкельштэйн (развёў рукамі). Я, панове, не маю паўнамоцтваў гаварыць на гэтую тэму. Але дакладу, што вы думаеце і пра такое.

А ў т о р а к. Дзякую. Думаю, мы хутка адкажам вам.

На гэтым наша аўдыенцыя скончылася. Калі выйшлі на двор, Аўторак аж усклікнуў: «Чулі?! Захопнік ёсць захопнік, яму абыякавыя нашы пачуцці, боль, яму найперш трэба наша сыравіна, наш дбайны люд! І душой адчуваю: не дадзім ускінуць на сваю шыю нямецкі хамут — не бачыць нам дзяржаўнасці як свайго носа!»

Базыль.

«Сёння, 18 сакавіка, Рада Усебеларускага з'езда аб'явіла сябе Радай БНР — заканадаўчым органам краю.

У Радзе 71 чалавек. 36 — ад беларускіх партый (27 ад Савета Усебеларускага з'езда і 9 ад павятовых рад), 20 — ад гарадскіх самакіраванняў і земства, 15 — ад рэвалюцыйнай дэмакратыі нацыянальных меншасцяў. Апошнія, улічваючы, колькі каго ў Мінску, атрымалі: яўрэі — 7 мандатаў, палякі — 4, велікаросы — 2, украінцы— I, літоўцы — I.

На 24 сакавіка назначаны з'езд Рады БНР. На яго можа прыбыць і дэлегацыя віленскіх радцаў».

Стаўбцоўскі.

«Сёння, 19 сакавіка, выбраны прэзідыум Рады БНР. У яго ўвайшлі Аўторак, я, Еўзікаў і Баравік».

Базыль.

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

### 1

Аўторак папрасіў Васілевіча сустрэць віленскіх гасцей.

Стоячы на пероне і чакаючы цягніка, Васілевіч усміхнуўся сам сабе: гісторыя нібы паўтараецца. Летась, у снежні, ён (разам з Лашковічам) спатыкаў важнага петраградскага земляка, Кужэльнага, які вёз сталінскі дазвол на Усебеларускі з'езд, а цяпер вось зноў яму трэба сустракаць важных землякоў — ужо з Вільні, Гэтыя, праўда, не маюць мандата, што ўзвышаў бы якраз іх, але яны не малавядомыя, як быў Кужэльны, а ветэраны грамадоўскага руху.

Неўзабаве, калі прыйшоў цягнік і з яго пачалі выходзіць пасажыры, Васілевіч зглядзеў: вунь, вагоны за тры ад яго, і віленская дэлегацыя. Два браты Лапкінскія, а з імі яшчэ трое маладых мужчын.

Янку і Антона Ланкійскіх ён ведаў добра. Яшчэ ў далёкіх 1900-1902 гадах вучыўся разам у мінскай гімназіі, зблізіўся і праз іх пазнаёміўся з пісьменнікам Карусём Каганцом і археолагам Генрыкам Татурам, якія запалілі ў яго душы агонь, любоў да роднага. З Ланкійскімі, з іншымі гімназістамі ўтварылі беларускі гурток, які гучна назвалі Беларускай рэвалюцыйнай партыяй, вялі дыскусіі пра зганьбаваную сваю гісторыю, сабралі такую-сякую бібліятэчку даўніх і навейшых кніжак на роднай мове, ладзілі літаратурныя вечары, дзе выступалі з рэфератамі.

У 1902 годзе абодва Лапкінскія скончылі гімназію, пакінулі Мінск і паехалі вучыцца ў Пецярбургскі універсітэт, але ніці з імі не абарваліся. Сяды-тады яны прыязджалі дадому, з ахвотаю заходзілі да яго. Напачатку распытвалі пра мінскія навіны, расказвалі, што дзеецца ў сталіцы і ва ўсёй Расіі, а пазней пачалі далучаць да сваіх таямніц. Здаецца, Ян прызнаўся аднойчы: неўзабаве пасля прыезду ў Пецярбург яны сышліся там з разумным земляком І., студэнтам тэхналагічнага інстытута, і згуртаваліся ў дружную тройку. Утрох пачалі работу сярод студэнтаў, выхадцаў з беларускага краю, і ўжо ў канцы таго ж, 1902 года заснавалі гурток Беларускай народнай асветы, намерыліся выдаваць беларускія кнігі і дбаць пра школы на роднай мове. Паколькі, гаварыў крыху пазней той жа Ян, у Расіі расце рэвалюцыйны рух, а на яе ўскраі ён набывае нацыянальную афарбоўку, то трэба і нам нарэшце сур'ёзна падбаць пра сваю палітычную нацыянальную партыю: без яе мы не зможам дабіцца таго, што павінен мець наш народ.

Яшчэ трошкі пазней, узяўшы ад яго клятву на маўчанне, ужо Антон сказаў, што ўжо ёсць такая іхняя сур'ёзная партыя — Беларуская рэвалюцыйная грамада, запрасіў быць яе сябрам і папрасіў далучыць да яе прыхільнікаў тут, у Мінску. Тая Грамада мелася дбаць пра школы на беларускай мове, пра дэмакратыю, пра зямлю для сялян і фабрыкі ды заводы для работнікаў, пра аўтаномію Беларусі ў складзе федэратыўнай Расіі. І трэба сказаць, што пакрыху ды паволі іхняя суполка пачала расці: у Мінску ў яе ўвайшлі Карусь Каганец, студэнты расійскіх вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, якія былі родам з тутэйшых мясцін, як, скажам, студэнт рыжскай палітэхнікі Аляксандр Уласаў, у Вільні — паэтэса Цётка, грамадскі і тэатральны дзеяч Аляксандр Бурбіс, а таксама студэнты і вучні праваслаўнай духоўнай семінарыі. Лапкінскія ў Пецярбурзе, а

ён тут, у Мінску, спрабавалі пасаюзіцца з тутэйшымі эсэрамі, найперш — з іхнім лідэрам Бонч-Асмалоўскім, з Пуліхавым, Кацяй і Соняй Ізмайловічанкамі, з Нядоляй і Лашковічам, разам збіраліся на тайныя сходкі, мітынгі, у сакавіку 1905 склікалі ў Мінску сялянскі з'езд, дзе пасля пальмянай прамовы Яна Лапкінскага ў абарону сялян эсэраўскія дэлегаты-сяляне пакінулі сваю партыю і перайшлі да Грамады, разам збіралі зброю, дамовіўшыся пакараць мінскага губернатара Курлова за тое, што той у кастрычніку 1905-га загадаў расстраляць на пляцы перад Віленскім вакзалам мірнае людское шэсце.

З усіх маладых дзеячаў тагачаснага іхняга маладога руху, канечне, завадатарам, яркай асобаю быў Ян. Ён, адукаваны, абаяльны, рашучы, не толькі дзелаваў у Мінску, у Пецярбурзе, у Вільні, але паволі пачаў выводзіць грамадоўскі рух і за мяжу. Да слова, у 1904-м, калі скончыў археалагічны інстытут, паехаў давучвацца ў Вену. Там, а таксама і ў Львове ён зблізіўся з украінскімі і польскімі суполкамі, а ў 1905-м, калі падаўся вучыцца ў Пецярбургскі універсітэт на юрыдычны факультэт, ужо як іхні лідэр ездзіў на з'езд сацыялістычных партый у Фінляндыю, дзе яго, як гаварыў, вельмі ўпадабалі дэлегатыірландцы. Яны падаравалі яму нават трохі грошай на выдавецкія клопаты. Якраз ён дабіваўся, каб у 1905 годзе — годзе першай рускай рэвалюцыі — іхні рух набыў найперш чырвоны колер.

Каб лепей паразумецца паміж сабою, вызначыць супольную лінію, мацней звязаць свае паасобныя цэнтры і мець спаяную сваю арганізацыю, іменна па яго настойванні склікалі два грамадоўскія з'езды.

На першым ён, Васілевіч, не быў, а вось на другі трапіў.

Другі з'езд тайна адбыўся паблізу Кальварыі на кватэры грамадоўца Зелязея. Васілевіч, як адзін з тых, хто пачаў вылучацца ў Мінску, не толькі слухаў там прамоўцаў, але і колькі разоў сам ускакваў ды кідаўся ў бойку. Нават з самімі Лапкінскімі. Калі згаджаўся, што трэба цалкам перайсці да сацыялістычнай арыентацыі, адмовіцца ад тэрору, скласці прадуманы план культурна-асветнай работы, то вось па зямельнай праграме спрачаўся.

Праўда, па ёй не мелі адной думкі і самі важакі — браты Лапкінскія. Ян быў за тое, каб якраз цяпер, калі затухае рэвалюцыя, кінуць кліч сялянам: людзі, не чакайце лепшага часу, дзяліце дворную, царкоўную, касцельную і «ўдзельную» зямлю ды утварайце з яе — разам з казённай — нацыянальны зямельны фонд, з якога трэба даваць надзелы малазямельным і беззямельным! Антон і іншыя былі супраць: не, цяпер не разумна, нават злачынна штурхаць безабаронных сялян на гвалтоўны захоп чыёйсьці зямлі, бо ідзе рэакцыя,

супраць якой і ўсе рэвалюцыянеры, і рабочыя ды сяляне бяссільныя ўжо. Урэшце праект Яна Нанкінскага, за які быў і ён, забракавалі.

З'езд выбраў ЦК з пяці асоб, з якіх было тры сябры і два кандыдаты: Лапкінскія, Уласаў, Іваноўскі, Бурбіс. Неўзабаве, пасварыўшыся з Антонам Ланкійскім, ён выйшаў з Грамады і ўжо ў 1907 годзе, калі сядзеў у мінскім астрозе, уведаў: рэакцыя ў Расіі, сачэнне і гвалт, непаразуменне паміж самімі зрабілі сваё — БОГ распалася. Але сцежкі-дарожкі з Ланкійскімі не абарваліся. Калі ён выйшаў з астрога, апынуўся без занятку і кавалка хлеба, тыя працягнулі руку — узялі па працу ў заснаваную імі ў Вільні газету.

Ланкійскія засталіся там і, кажуць, цяпер хаўрусуюць з немцамі, а ён перад нямецкай акупацыяй марсянуў з сям'ёю ў Мінск, пабадзяўся трохі беспрытульны, а пасля ўплывовы Муха памог яму ўладкавацца ў земскі статыстычны камітэт. Летась, адразу пасля лютаўскай рэвалюцыі, ужо ён быў адным з тых, хто тут першы пачаў адраджаць БОГ і станавіцца яе новым лідэрам.

Цяпер насустрач яму ішоў пачынальнік грамадоўскага руху, той, хто ўжо за дваццаць гадоў гарыць сам, запаліў іншых адраджэнскай ідэяй, прынёс шмат турбот былой царскай ахранцы і былым мінскім ды віленскім вернападданніцкім чыноўнікам. Насустрач крочыў Ян Ланкійскі — высокі, сутулы, у чорных бітых валёнках, паліто і шэрай аблавушцы. Яму было цяпер, здаецца, гадоў трыццаць сем, але на выгляд ён быў старэйшы, нават ужо зношаны: худы, як хрушч, з запалымі вачыма і белы да сінізны. Да ўсяго гэтага яшчэ вунь у глыбокіх зрэнках закамянеў сум. Антон, які крочыў крышку збоку, быў таксама высокі, гонкі, ало яшчэ маладжавы, лёгкі на хаду. Праўда, і ў яго позірку застыла нейкая цяжкая гаркота. Відаць, падумаў Васілевіч, нялёгка жывецца Ланкійскім пры немцах.

— Беларус? — праз сілу ўсміхнуўся Ян, падаючы яму бледную, быццам бяскроўную руку.

— Беларус, не выракаюся,— адказаў Васілевіч так, як яны віталіся некалі, яшчэ ў гімназіі.

Ян прыгарнуў яго да грудзіны, па-сяброўску паляпаў па спіне, а пасля, калі адпусціў, змахнуў пальцам слязу пад затуманеным вокам, сказаў незнаёмым для Васілевіча спадарожным:

— Гэта, сябры, той Васілевіч, пра якога мы з Антонам гудзелі вам усю дарогу.— І яму: — А гэта, Сымон, нашы калегі: Янка Станкевіч, Язэп Туркевіч і Дамінік Сямашка.

Ён спачатку Антону — як і брат, у валёнках і заечай аблавушцы, круглатвараму, з маленькімі дзёрзкімі вусікамі, а пасля астатнім тром падаў руку:

— Калі ласка, просім у Мінск!

— Хадзем, і хутчэй,— пацепнуў плячыма Антон Ланкійскі.— Вагон наш не толькі не апальваўся, але быў з выбітымі вокнамі, дык мы зусім акалелі.

Пайшлі па прыснеяганым пероне, удыхаючы стылае паветра. Хоць набліжаўся красавік, было не адзін дзень і святло ды цяпло, нямала растала снегу, але апошнія дні нечакана зусім пайшлі вельмі халодныя.

— Дык што — нарабілі, кажаце, шуму на ўсю Расею? — узяў пад руку Васілевіча Ян Ланкійскі,— Перапужалі сваімі «прэтэнзіямі» спачатку Часовы ўрад, а пасля і бальшавікоў?

— ...а цяпер і немцаў...— з усмешкаю дадаў ён.

— Малайцы! — усцешна сказаў Ян.— Прызнаюся: я не вельмі верыў, што тут, у Мінску, без ветэранаў адродзіцца грамадоўскі рух, што будзе такі бум. Ажно вы два значныя з'езды правялі, так хараша пытанне беларускай дзяржаўнасці завастрылі, а цяпер вось і ўшчыльную падышлі да яе...

— І немцы шмат спачуваюць, дакляруюць, але нават пальцам не кратаюць, каб памагчы,— уздыхнуў ён, адчуваючы, што не варта гуляць з бывалымі Ланкійскімі, а трэба гаварыць праўду. Інакш пазнаюць фальш, адыдуць альбо збэсцяць.— То ім часу няма займацца намі, то яны не ведаюць, што і як дазваляць.

— Ясна,— падаў голас Антон.— З каменняў цяжка ваду здабыць...

— А вы? — запытаў Васілевіч.— Тут кажуць: вы здолелі знайсці адну мову з імі...

— Што — сапраўды ў Мінску лічаць: мы знюхаліся з акупантамі? — трывожна запытаў Ян.

— І бальшавікі так казалі, і сярод нашых ёсць такія галасы...

— Лухта і брахня гэта, Сымон,— уздыхнуў Ян.— Не палюбілі мы адзін аднаго.

— Іў нас далей гульні ды кампрамісу асабліва не ідзе.

— Але ж во дазваляюць правесці з'езд і ўзаконіць самавызначэнне.

— Лепш сказаць — змушаны не замінаць.

— Чорт з імі,— сказаў Антон.— І за гэта трэба чапляцца абедзвюма рукамі. Хто ведае, колькі яшчэ ў іх будзе такая цярпімасць?!

— Дзе і калі нас чакаюць, Сымоне? — запытаў Ян.

— У Народным сакратарыяце па былой Саборнай, праз гадзіны дзве.

— Цудоўна! — прамовіў той,— А цяпер давай, калі ласка, зойдзем на хвіліну да нас, а пасля — на могілкі. Ты, можа, і не чуў: наша ж маці памерла.

— Я не ведаў пра гэта,— прызнаўся ён.— Даўнавата ўжо ў вас не быў. Можа, і з паўгода.

— Аддала богу душу матуля сёлета, у канцы студзеня,— тужліва сказаў Ян,— Мы якраз тады праводзілі канферэнцыю, дзе ўтваралі Беларускую Раду Вілейшчыны. Антон быў за маршалка, дык каб не выбіць яго з каляіны, я нават не сказаў яму, што прыйшла з-за кардона такая жахлівая для нас абодвух тэлеграма...

Змаўчалі. Паціху прыдыбалі да драўлянага доміка Лапкінскіх на Храшчэнскай вуліцы, што была непадалёку за Саборнай плошчай і гасцініцай «Еўропа». Сюды Васілевіч часта заходзіў раней, калі былі ў Мінску Ян і Антон, а за апошнія два гады зазіраў разы са тры, не болей.

«Нялёгкі лёс у гэтых Лапкінскіх,— падумаў,— Рана яны і іхнія тры сястры засталіся без бацькі, змалку загарэліся адраджэнскай ідэяй, змоладу зведалі цкаванне, паклёп, турму, але ад свайго не адмовіліся. Можа, яшчэ і да гэтага часу абодва халасцякі, не спазналі звычайнага чалавечага шчасця. Хоць, зрэшты, хто ведае, што такое шчасце?! Часамі яно зусім не ў сытасці, славе, абыякавасці да ўсяго, у тым ліку і роднага...»

Ступілі ў невялікі, ачышчаны ад снегу, тупкі ад марозу дворык, а насустрач ім з невялікай, у свой час пафарбаванай, а цяпер з патрэсканай ці нават і аблезлаю фарбаю верандачкі тыц жанчына — сястра Ланкійскіх, Ганна. Высакаватая, як і браты, у валёначках і паліто, у чорнай шапачцы. Вельмі падобная на Яна, нават і з такімі, як у яго, апалымі, вельмі схуднелымі шчокамі.

— Яначка! Антонік! — пляснула рукамі ў чорных рукавіцах. Як трошкі старэйшая, назвала іх, маладзейшых, так, як і ў маленстве. Хоць яны былі паджылыя ўжо дзядзькі.

Кінулася, пацалавала спачатку Яна, а пасля Антона. Міргаючы, стрымліваючы слёзы, пакланілася ім, братавым спадарожным.

— У хату цяпер, Ганначка, не пойдзем,— сказаў ёй Ян.— Завядзі, будзь ласкава, нас да матчынай магілы. Адтуль пойдзем з Сымонам у Народны сакратарыят, а потым ужо вернемся сюды.

— Божа, мой божа! — пахітала яна галавою.— Заўсёды вы ў вечных клопатах! — Заплакала.— Мама перад смерцю бедавала: «Хоць бы пажаніліся нарэшце, хоць бы адным вокам на ўнукаў зірнуць...»

— Дасць бог — пажэнімся, дзяцей шмат мецъ будзем,— прытуліў сястру Ян.— Але цяпер— іншыя, больш важнейшыя турботы...

Рушылі з двара. Мужчыны ішлі моўчкі, а Ганна Нанкінская, глытаючы слёзы, расказвала братам, як занемагла і як памірала іхняя маці.

Выходзіць, апошнія паўгода яна была спаралізаваная, не падымалася з пасцелі, вельмі пакутавала.

На могілках яны ўсе доўга пастаялі моўчкі каля авеянага жоўтага, цяпер умерзлага, з лёдам у трэшчынках грудка, на якім ляжаў вяночак з яловых лапак і каляровых кветак з паперы, а ў галаве стаяў невысокі драўляны крыж, перавязаны белым ручніком.

— Даруй нам за ўсё, дарагая наша матулька...— першы загаварыў тут Ян, падаючы знак, што трэба ўжо ісці. І першы падаўся на выхад.

За ім сумна пайшлі і яны, шкадуючы і душу, якая знайшла супакой толькі тут, і Ланкійскіх з іхнім сямейным горам.

За жалезнымі варотамі Ян пачакаў іх, азірнуўся, а калі падышлі, нібы здзівіўся:

— А дзе ж Сямашка?

Яны паазіраліся: вакол нідзе ні чалавека.

— Ці не даў драла, уведаўшы, што і тут немцы не мілуюць нас і нашу ідэю?..

**2**

Неўзабаве вярнуліся на Саборную плошчу.

— Нарэшце дачакаліся і такога,— усцешыўся Ян, паказваючы на былы губернатарскі дом, над парадным уваходам у які вісеў бела-чырвона-белы сцяг, а з боку дзвярэй была шыльда «Народны сакратарыят Беларусі».

Пастаялі, пагледзелі, трымаючы пад пахаю невялікую палачку, а пасля рушылі ўсярэдзіну, у былы губернатараў кабінет. Хоць дамовіліся сустрэцца пазней, але ўжо ў «рэзідэнцыі» іх чакалі. І нямала люду. Можа, дзесяткі і тры альбо чатыры. Адны з іх сядзелі за сталом літараю «Т», іншыя — абапал сцен. Над галоўным сталом, дзе цяпер сядзеў аскетычны, у вайсковай форме, але без пагонаў Янка Аўторак, вісеў намаляваны на белым аркушы паперы герб «Пагоня».

Ян, які першы ўвайшоў у пакой, зняў вушанку, паправіў рукой рэдкія злямчаныя русявыя валасы, усміхнуўся:

— Добры дзень, дзецюкі! Рады вітаць вас ад імя старыкоў, ветэранаў грамадоўскага руху і ад імя Беларускай Рады Віленшчыны!

— Добры дзень, паважаныя піянеры адраджэнскага руху, калегі па сумеснай барацьбе! — Устаўшы, стрымана, але годна павітаў іх Янка Аўторак, паказаў рукою на крэслы абапал сябе.— Прашу за гэты стол, дарагія спадары.

Ян пайшоў — адзін за адным ад стала падняліся тыя, хто ведаў Ланкійскіх: Бурбіс, Лашкевіч, Нядоля. Кожнага з іх Ян абняў пасяброўску, а Янку Аўторку падаў руку.

Ланкійскія пасталі за галоўным сталом: Ян — па правай Аўторкавай руцэ, Антон — злева. Усе, хто быў у кабінеце, пападымаліся і дружна, моцна заляскалі, вітаючы гасцей.

Калі паселі, Янка Аўторак, стоячы, сказаў:

— Хоць нашы госці стомленыя, можа, хацелі б акліматызавацца, паслухаць нас, прадаўжальнікаў імі пачатага, але мы папросім іх сказаць сваё слова. Нам вельмі цікава даведацца, што і як яны рабілі, робяць у Вільні, якія парады хочуць даць нам, каб разам ісці да адной мэты...

Зноў усе запляскалі.

Антон кіўнуў старэйшаму брату: давай трымай слова!

Ян падняўся, акінуў усіх цёплым позіркам, хвіліну-другую моўчкі папляскаў разам з усімі.

— Дзякую,— схіліў галаву, калі ўсе абшыліся.— Што асабіста мне хочацца сказаць вам? Па-першае, я рады, што зноў у Мінску, па-другое, усцешаны, што вы, нашы малодшыя паплечнікі, шмат зрабілі і робіце. А па-трэцяе, я павінен найперш вам, ужо цэнтру нашага руху, далажыць, чаго мы дабіліся ў Вільні.

Перавёў дыханне, закашляўся, чырванеючы на твары. Пасля спешна выхапіў з кішэні паліто насоўку і закрыў ёю рот.

«Ён вельмі хворы,— адчуў Васілевіч. — Можа, і на сухоты».

— Выбачайце,— выцершы пот на лобе, слабасільна прамовіў Ян, расшпіліў паліто і паказаў на сабе руды пінжак і белую вышытую беларускімі ўзорамі кашулю,— Мы ведаем: вы тут, у Мінску, маеце розныя погляды на нашу віленскую работу. Адны з вас лічаць: мы там служым немцам, другія думаюць, што мы пайшлі заадно з палякамі ці то з літоўцамі, а трэція...— Усміхнуўся.— Адным словам, розныя погляды ад розных чутак, ад нашай з вамі разарванасці. Але што на самай справе?

Паколькі ў кабінеце было цёпла, ён скінуў з сябе паліто, паклаў яго на спінку крэсла.

— Пачну сваю споведзь, спадары, з восені 1915-га, гэта значыць з таго часу, калі прыйшлі ў Вільню немцы. Праўда, вы можаце запытаць: а чаго ты, такі-сякі, застаўся, не выехаў разам з рускімі патрыётамі? Канечне, мы маглі выехаць. Асабіста мне ўлады нават давалі вагон для маёй калекцыі беларускай старасветчыны. «Мой абавязак,— адказаў я,— быць з родным краем, з народам заўсёды, не зважаючы па тое, якія войскі будуць тут гаспадарыць. Што я змагу зрабіць у бежанстве сярод чужых людзей? Найперш — зачахнуць, як перасаджанае старое дрэва на новым месцы!» — Зноў закашляўся, зачырванеўся і ўспацеў. А калі паадолеў прыступ хваробы, пачаў гаварыць

далей: — Тады ўлады задумалі сілком схапіць нас і вывезці. Нам прыйшлося некалькі сутак хавацца. А калі царскія службоўцы пакінулі Вільню, мы разам з іншымі пачалі ўтвараць «лятучыя дружыны», каб сачыць за ладам у час змены ўладароў, а заадно павялі перамовы з палякамі, літоўцамі і яўрэямі. «Браты,— сказалі ім,— калі мы згуртуемся, будзем разам заадно, дык акупанты ўбачаць у нас сілу, будуць з намі лічыцца: немцы баяцца толькі сілы і толькі з сілай рахуюцца». З неахвотаю, але спачатку ўсе згадзіліся: але, трэба яднацца. З чаго мы пачалі? Паколькі палова радных з віленскіх органаў самакіравання падалася ў Расію, дык мы параілі кааптаваць туды сваіх дэлегатаў, каб немцы бачылі: гэтыя органы паўнамоцныя. Але ў апошнюю хвіліну гонар і фанабэрыя затуманілі розум польскім панам. «Вільня — наш горад,— бесцырымонна заявілі яны.— І мы адны павінны ўсё ўзяць у свае рукі!» Як мы і перасцерагалі, немцы, не бачачы арганізаванай сілы, Раду разагналі, пачалі гаспадарыць самі.

Усе слухалі вельмі ўважліва: ніхто ж не ведаў такіх драбніц таго, што рабілася-дзеелася зусім непадалёку, у акупаванай Вільні — горадзе, які здаўна дарагі кожнаму беларусу.

— Не падумайце, калі ласка, што хвалюся, але мы паспрабавалі яшчэ раз аб'яднаць усіх,— гаварыў далей Ян.— Мы параілі ўтварыць сумесны Віленска-Ковенскі абыватэльскі камітэт, які будзе займацца гаспадарчымі клопатамі. Зноў зафанабэрыліся палякі: мы, сказалі яны, можам увайсці ў гэты камітэт толькі тады, калі палова месцаў там будзе наша. Літоўцы і яўрэі запратэставалі. Мы ледзь-ледзь угаварылі «іншародцаў» пайсці на кампраміс. Мы самі атрымалі ў гэтым камітэце толькі тры крэслы. Але, на вялікі жаль, толку было мала: палякі не лічыліся з намі, камандавалі, асабліва пасля таго, калі немцы падакляравалі ім першынство. Пасля гэтага яны пачалі проста таптаць нас. На апошнім нашым сумесным сходзе я перасцярог іх: «Панове, браты, калі мы цяпер разыдземся, то больш ужо сысціся не зможам ніколі!» Так яно і выйшла. Немцы пафліртавалі з палякамі, пасля — з літоўцамі і ўрэшце, як і задумлівая!, ушчэнт перасварылі ўсіх, яшчэ болей умацаваліся самі.

Уважліва зірнуў на залю. Лашкевіч, які сядзеў побач каля яго, Васілевіча, сказаў паважна:

— Ды ты садзіся, Ян.

Той з падзякаю кіўнуў галавою, сеў. І ўжо седзячы, прадоўжыў:

— Пасля гэтага мы рашылі перайсці ад чыста гаспадарчага да чыста палітычнага. Людзі, сказалі мы, давайце жыць не толькі сённяшнім днём, але і будучыняй. А будучыня ўсё роўна запатрабуе ці нашай еднасці, ці нашай раз'яднанасці. Мы, беларусы, раім шукаць

шлях еднасці, тым больш што яшчэ некалі, болей пяцісот гадоў назад, нашы продкі змаглі паразумецца. Карацей, мы параілі ўсім злучыцца ў Канферэнцыі Вялікага княства Літоўскага, выклалі напісаны намі адпаведны Універсал на чатырох мовах, які меў на ўвазе ўтварэнне беларуска-літоўскай дзяржавы.

Замаўчаў. Раскрыў папку і ўзяў верхні ліст.

— Вось, спадары, копія гэтага Універсала,— падняў ліст, паказаў яго, а пасля хітнуў галавой на папку.— Мы прывезлі вам усе нашы дакументы. Глядзіце, вывучайце, належна ацэньвайце.

Падняў галаву, зірнуў у залю.

— Што да ідэі аднаўлення Вялікага княства Літоўскага, то асаджаныя польскія дзеячы гатовыя былі ўжо змірыцца з гэтым, але цяпер ужо ўспыхнуў літоўскі сверб. Як самі разумееце, у гэтай сітуацыі мы, дбаючы пра сумеснае, у аснове антынямецкае, мусілі ў рэшце рэшт падумаць і пра сябе... Яшчэ ў лістападзе 1915-га мы адчынілі ў Вільні першую беларускую пачатковую школу, а ў 1916-м — яшчэ пяць. Адкрылі настаўніцкія курсы, утварылі Беларускі камітэт помачы пацярпелым ад вайны, кааператыў «Райніца», Беларускі сацыял-дэмакратычны работніцкі гурток, урэшце паспрабавалі ўтварыць падпольны Беларускі народны камітэт, праз які хацелі рэалізаваць пашы нацыянальныя ідэалы, якія хаваліся ў душы кожнага беларуса шмат стагоддзяў, а ў гэтым стагоддзі вырваліся на волю. На сённяшні дзень мы маем сетку з 126-ці школ, Свіславіцкую беларускую гімназію, беларускую кафедру ў Вільні, свае выдавецтва. Налёгшы па сваю культурна-асветніцкую работу, мы пільна сачылі за тым, што адбываецца ў Вільні, і яшчэ раз першыя пачалі шукаць саюзнікаў. На гэты раз у асобе літоўскай. І на сённяшняе, і на будучае, бо рана-позна нам спатрэбіцца нават выхад да мора. Вы адны не ўстоіце, сказалі мы ім, без нас вам не абысціся. А вось разам, як і некалі, мы змацуемся, не дадзімося нікому ў зубы. Але такая наша ідэя насцярожыла немцаў, і яны зноў пачалі сутыкаць ілбамі — на гэты раз літоўцаў і нас. Яны падакляравалі ім Літву, Віленшчыну і Гародзеншчыну, а на нас сказалі, што мы — «расіяне і вядзём тут валтузню з-за рускіх інтарэсаў». Словам, нас разлучылі. Улетку 1916-га я ездзіў на З'езд Народаў у Лазану, дзе гаварыў пра наш цяжкі лёс і мусіў не падтрымаць таго, што ўтвараецца ўласна Літва. Чаму? Літоўскім дзеячам, ясна, спадабаецца, што іх раптам ушанавалі, але немцы адных літоўцаў праглынуць альбо змусяць танцаваць пад іхнюю дудку. Адпаведна, немцы раззлаваліся і ўпотай аддалі нас пад назірк былога выкладчыка Пінскай гімназіі і, як выявілася, іхняга шпіёна Эдмунда Зузэміля. Прызначылі яго за нямецка-беларускага перакладчыка, але ён проста

віжаваў за намі. Дзеля гэтага для яго рэквізавалі частку нашай кватэры, і ён сачыў за кожным нашым крокам. Больш, гэты Зузэміль, пачаў інтрыгаваць і шантажыраваць, шукаць паразумення з тымі беларусамі, хто быў супраць мяне і Антона асабіста. Ён шальмаваў наша імя, як тых, хто слугуе нямецкаму непрыяцелю — Расіі. Да слова, калі мы ўтварылі Беларускі настаўніцкі саюз і калі ён выбраў мяне пасланцом у Цэнтральнае бюро прафесійных саюзаў, гэты Зузэміль прыйшоў і запатрабаваў: адмоўся, не ідзі, туды трэба пасланць іншага чалавека. Я, як вы павінны мяне зразумець, на новым сходзе сказаў пра гэта, паставіў пытанне рубам: я ці правакатар Зузэміль! Калі ж сход зноў прызнаў мае паўнамоцтвы, гэты саюз немцы разагналі.

Ян Лапкінскі апусціў галаву, пацёр далонямі шчокі, лоб, уздыхнуў, а пасля затрымаў кончыкі пальцаў— можа, і на забалелых — скронях.

— Што нам было рабіць у такіх цяжкіх варунках? — падняў галаву, запытаў,— Здацца? Сядзець, апусціўшы галаву? Гэта, ясна, лягчэй за ўсё. Ды мы рашылі, як кажуць, брыкацца з усіх сіл. Немцы я« усё болей і болей пачалі спрыяць літоўцам. І летась, 11 снежня, дазволілі ім аб'явіць Літву «незалежнай дзяржавай», злучанай з Германіяй «вечным моцным саюзам». Праўда, літоўцы ад нас не адцураліся зусім, далі нам у сваім урадзе адно месца (апошні час пагаворваюць, што могуць выдзеліць і пяць ці шэсць міністэрскіх пасад, у тым ліку міністра па беларускіх справах). Тут як тут увішны Зузэміль падшукаў у Тарыбе свайго пасланца. Але мы запратэставалі: і супраць таго, каб толькі адны літоўцы бралі ўладу, і супраць Зузэмілевага халуя. Мы перамовіліся з усімі палітычнымі віленскімі сіламі і дабіліся, каб склікаць мітынг і на ім публічна пратэставаць — і найперш супраць нямецкай двудушнай палітыкі. Немцы, канечне, ашалелі, паклікалі мяне і сказалі ўлабавую: «Паслухайце, кіньце сваю валтузню, бярыце прыклад з літоўцаў. Яны пайшлі на саюз з намі — мы дазволілі ім сцвердзіцца. Нават больш — можа быць, што наш кайзер выпусціць спецыяльны рэскрыпт, дзе афіцыйна прызнае Літоўскую дзярягаву. Ідзіце гэткім шляхам і вы, дык таксама тое-сёе атрымаеце».— «Не,— адказаў я.— Калі вы хочаце гэткім чынам заняволіць нас, замест былога цара-бацюшкі падсунуць нам свайго кайзера, дык выбачайце! Мы не згодныя! Але ведайце: вас чакае таксама рэвалюцыя, і яна змяце кайзера ды вас, яго сатрапаў!» Як самі разумееце пасля гэтага мы зусім адвярнуліся адзін ад аднаго...

Ян Ланкійскі зноў пацёр далонню твар, сціснуў вузкі падбародак у далоні, памаўчаў, а затым дадаў:

— Сёлета мы настаялі, каб немцы дазволілі нам правесці канферэнцыю, дзе мы павінны пагаварыць пра свой лёс. Яе мы правялі 25-27 студзеня, і на ёй утварылі Беларускую Раду Віленшчыны, якой, паўтараю, літоўцы дакляруюць пяць альбо шэсць месцаў у сваёй Тарыбе.

Развёў рукі, усміхнуўся:

— Вось кораценька і ўвесь мой даклад, спадары. Хочаце — мілуйце, хочаце — карайце. Але паколькі мы болей двух гадоў мусім знацца з немцамі, адчулі тое, што ў іх наўме, то лічу: па-першае вам цікава ўведаць усе нашы варункі, а па-другое, вы можаце з усяго гэтага ўзяць сабе тое-сёе на заметку... Ну, а на заканчэнне яшчэ пра адзін нюанс нашага руху ў Вільні. Некаторыя з вас ведаюць такога арыгінальнага чалавека, як Стася Лысковіча — былога нашаніўца, гісторыка і публіцыста, былога грамадоўца. Дык вось ён цяпер і нам замінае, і свае сілы попусту марнуе, надумаўшыся разам з баронам Шафнаглем, князем Святаполк-Мірскім утварыць клерыкальна-кансерватыўную партыю і стаць на чале яе. Прыехаць сюды і перамовіцца з вамі адмовіўся. Выбачайце, ён не прызнае ні Мінск за цэнтр нашага руху, ні вас... Ну, а цяпер усё. Дзякую за ўвагу.

— Дзякуем і вам,— пакланіўся яму пацяплелы Янка Аўторак.— Праўда, цяпер мы многае праяснілі сабе пра вас. Асабіста я лічу: рабілі і робіце ўсё вы цвяроза, узважліва, тое-сёе з гэтай работы, сапраўды, можа памагчы нам у нашай далейшай тактыцы і стратэгіі. Ці ёсць іншыя думкі, спадары?

— Адобрыць даклад,— падаў голас Лашкевіч.— І давайце ўжо разам пяройдзем да наступнага пункта нашага парадка дня работы.

— Усе згодны? — запытаў Аўторак.

— Згодны,— амаль у адзін голас сказалі Баравік, Еўзікаў, Нядоля і ён, Васілевіч.

— А вы, паважаныя бацькі? — Янка Аўторак зірнуў на Яна Лапкінскага.

— Я ж казаў: мы прызнаём Мінск за напі агульны цэнтр, вас — за лідэраў нашага руху на гэтым этапе, дык цалкам падпарадкоўваемся вам,— адказаў той з усмешкай.— Так? — зірнуў на Антона і ў залю, на сваіх спадарожных.

Тыя хітнулі галовамі — згодныя.

— Дзякую, спадары,— зноў пакланіўся ім Аўторак,— Вельмі добра, што ў нас цяпер пераважаюць не амбіцыі, а развага і здаровы сэнс.— Зірнуў на паперку, што ляжала перад ім.— Далей на нашым парадку дня такое: пасылка дэлегацыі на Украіну.

Падняў астрыжаную галаву, зірнуў на Яна Ланкійскага.

— Мы тут усе ведаем добра, а вось для вас, паважаныя госці, прызнаемся: мы, лічы, на безграшоўі. Адступаючы, бальшавікі амаль усю казну вывезлі ў Смаленск, а астатняе падчысцілі легіянеры Доўбар-Мусніцкага. Тую дробязь, якую дае нам гарадская дума і земства, хапае толькі на мізэрнае існаванне нашага Народнага сакратарыята. Немцы не даюць пі капейкі. Адным словам, ніхто не хоча, каб мы ўмацоўваліся...

Ян Ланкійскі, слухаючы, сумна паківаў галавою: усё нам знаёмае! Да драбніц!

— А цяпер, калі мы намерыліся аб'явіць БНР, калі мы бяромся ўзваліць на свае плечы і маральны, і матэрыяльны клопат пра народ, нам трэба грошы. І немалыя. Дык вось мы рашылі папрасіць помачы ў лаяльнай да нас, і, галоўнае, багатай Украінскай Народнай Рэспублікі. Другога выйсця няма. А Кіеў, асабіста я лічу, павінен паспрыяць нам, бо і ў яго інтарэсах, каб і мы пайшлі іхнім шляхам, сталі яму моцнымі саюзнікамі...

Ян Ланкійскі невыразна пацепнуў плячыма: калі ласка, рашайце. А сам дастаў з унутранай кішэні рудога пінжака сіні аловак, пашмальцаваны чырвоны блакнот, штосьці хуценька запісаў, а пасля вырваў лісток і падаў брату. Той, прачытаўшы, са згодаю заківаў галавою, таксама чыркнуў раз-другі і вярнуў запіску Яну. Абмацаўшы вачыма напісанае братам, і той кіўком адобрыў яго.

— Каго пашлём і з якім наказам? — Аўторак акінуў позіркам усіх.— Хто хоча сам узяцца за такую цяжкую, але пачэсную місію?

У кабінеце запанавала цішыня.

— Можна мне сказаць пару слоў? — падняў каля яго руку Антон Ланкійскі.

— Калі ласка.

Антон падняўся, расшпіліў старавper, але некалі шыкоўнае чорнае паліто, сцягнуў і паклаў на стол каляровы шалік. Высокі, стройны, з высокім прыгожым ілбом, з невялікімі вусікамі пад прадаўгаватым, на кончыку паднятым носам. Статны мужчына, еўрапеец, нічога не скажаш.

— Вы, канечне, усе бачылі: нядаўна Ян падаў мне запіску,— мякка, але гучна прамовіў ён і ўсміхнуўся.— Ян — юрыст, дык мысліць адпаведна, ясна і дакладна. А іменна: на якой юрыдычнай аснове будзем пазычаць вялікую грашовую суму? — зрабіў важкую паўзу, а пасля ў затоенай цішыні дадаў: — А што прыйдзецца ісці якраз у пазыкі, ніякага сумнення няма. Бо выбачайце, ніхто задарма, за прыгожыя вочы цяпер, у такі цяжкі час нічога не дасць!

У залі — па-ранейшаму ні гуку. Нават самыя нецярплівыя не падавалі голасу. Можа, і ад таго, што прамоўца змусіў задумацца пра тое, пра што ўсе дагэтуль як след не паразважылі.

— Першае, што запытаюць у дэлегацыі: які ваш, браточкі, статус? — Антон падняў сіні, як і ў брата, аловак. Прыцягнуў яшчэ большую ўвагу да сябе.— А статус яшчэ сёння невыразны. Як мы, прыезджыя, зразумелі, Рада БНР механічна лічыць сябе сябрам Расійскае Федэрацыі. Але, выбачайце, тая за гэткага сябра вас не лічыць, бо не прызнавала і не прызнае вас. Па-другое, ці захоча незалежная Украіна штосьці пазычыць нам як частцы Расеі без згоды, без гарантыі цэнтральнага ўрада? Канечне, не. Іншая, спадары, рэч, каб прыехала дэлегацыя незалежнай БНР. Тады перамовы пайшлі б зусім па-іншаму — як перамовы суверэнных дзяржаў...

Усміхнуўся, перавёў дыханне ці зноў знарочыста запаўзіў.

— Але, здаецца, у вас нозалеяотіцкая канцэпцыя зусім не ў пашане,— прамовіў. З усмешкай: але заадно і з далікатным папрокам.— Вы нават асцерагаецеся запратэставаць, што найперш намі там, у цэнтры, адкупіліся, кінулі нас пад ногі немцам як вабны кавал. Наша дэлегацыя, бачачы, што вы тут у вельмі спрыяльнай сітуацыі, раіць: ні хвіліны не марудзячы, аб'яўляйма незалежную БНР як патрэбу найперш самім бараніць свае жыццёвыя інтарэсы!

— Хвіліначку! — амаль насупраць Яна падняўся высокі, сёння з хораша ўкладзенымі светлымі валасамі, у дыхтоўным шэрым гарнітуры Баравік.— На нашым снежаньскім кангрэсе я быў адзін з тых, хто дабіваўся, як вы кажаце, незалежніцкай канцэпцыі. Але цяпер я супраць яе: цяпер змагацца за яе — значыць свядома ісці на разрыў з Расіяй і на хаўрус з Германіяй. Не толькі многія прымкнулын да нас усерасійскія партыі, але і многія з нас супраць замацавання на нашай зямлі тэўтонскай акупацыі.

— А хіба мы, міл-чалавек, за гэта?

— Мне здаецца: вы штурхаеце якраз да такога...

— Выбачайце,— спакойна адказаў Антон, але злосна прыплюшчыў вочы.— Мы ў Вільні рабілі і робім усё, каб не стаць нямецкімі парабкамі, але ўзяць ад іх усё для нашага руху. На жаль, мы не шмат дабіліся. Затое вы тут, у Мінску, можаце дамагчыся болей.

— Але гэта не значыць, што мы павінны запляміць сябе...

Прамоўца зусім збянтэжыўся:

— Я, міл-чалавек, здагадваюся, што вы хочаце сказаць. Але давайце гаварыць шчыра і цвяроза. Каб выратавацца, бальшавікі не пабаяліся ніякай плямы, падпісалі з Германіяй вельмі ўніжальную

дамову, сунулі ёй агромністы прэзэнт. Дык чаму дзеля с в а й г о выратавання мы не можам самі падпісаць сваю, можа, таксама не зусім прыемную дамову з той жа Германіяй? Ці за адно і тое ж хтосьці — дабрадзей, а мы — зламыснікі?

Заядлы палеміст і праціўнік Германіі Баравік сумеўся. Паазіраўся, як хто слухае, а пасля пачаў ратавацца:

— Можа, у вашых словах ёсць і рэзон, але я ўсё роўна супраць любога хаўрусу з тэўтонамі. Па-першае, што дазволена Юпітэру, тое не дазволена быку. А па-другое, хаўрусу шукае тут, у Мінску, пан Скураны са сваіх, панскіх, пазіцый. Я, сацыяліст, не хачу нюхацца з буржуа!

— Хачу сказаць вам, міл-чалавек, дзве рэчы,— па-ранейшаму непарушна, але напружана прамовіў Антон Лапкінскі.— Першае: канечне, зусім іначай трэба было б паводзіцца, каб цэнтр згаджаўся ўтварыць ці то Савецкую Беларусь, ці то БНР. Вось тады мы, калі б шукалі помачы ў акупанта, былі б звычайныя свінчукі. Але, на вялікі жаль, такой згоды цэнтра не было і няма. Дык што нам рабіць? А тое, чаму вучыць нас «Інтэрнацыянал»: «Никто не даст нам избавленья — ни бог, ни царь и не герой. Добьемся мы освобожденья своею собственной рукой».— Усміхнуўся.— Ці гэта ўсім дазволена, але толькі не нам?

Баравік зноў паазіраўся і, бачачы, што большая палова люду сімпатызуе не яму, здаўся і сеў.

— Другое,— прадоўжыў Антон.— Пра нашы сацыялістычныя ідэі. Канечне, мы былі і будзем толькі за іх. Канечне, немцы не будуць спрыяць нам. Але...— Паклаў руку на стол, задумаўся і ўчэпіста ўгледзеўся ў залю.— Каб вызваліць сялян і работнікаў з-пад уціску паноў і капіталу ды пабудаваць сацыялістычны лад, трэба не толькі даць ім зямлю, заводы, але і падняць у іх чалавечую годнасць. Каб дабіцца такога — гэта значыць адрадзіць наш люд як нацыю, трэба палітычная незалежнасць. Каб дамагчыся палітычнай незалежнасці, трэба сацыяльнае і нацыянальнае вызваленне сялян і работнікаў. Дык што ўрэшце выходзіць? Кола з трох дуг! І вось цяпер, стоячы на гэтых трох падвалінах, мы ўрэшце можам — не, павінны пачаць будаваць свой гмах...

З хвіліну памаўчаў, нібы павагаўся, гаварыць ці не, а пасля нагнуўся, узяў ад брата патачку, перабраў паперы і затрымаў некалькі ліасткоў.

— Вось, спадары, пастанова Віленскай рады ад 18 лютага. Мы просім далучыцца да яе,— не чытаў, каб, мусіць, не забіраць шмат часу, глядзеў на напісанае і гаварыў ад сябе.— Улічваючы, што Беларусь ад XIII да канца XVIII стагоддзя была з літоўцамі ў адной

самастойнай дзяржаве, што пасля гвалтоўнага прылучэння яе да Расеі з 1812 па 1905-ты не раз са зброяй у руках спрабавала аднавіць сваю волю, што Расея не здолела абараніць нас у гэтую вайну і ўрэшце ўлічваючы тое, што Часовы і Савецкі ўрады не прызналі нас, а цяпер мы кінутыя на волю лёсу, Віленская рада раіць парваць сувязі між Беларуссю і Расеяй ды прасіць усе краіны Еўропы памагчы нам аднавіць Літоўска-Беларускую дзяржаву.

Падаў паперыну Аўторку — той узяў і пачаў чытаць вышэйназваную пастанову. У залі маўчалі. Відаць, многія былі калі не ашаломленыя, дык уражаныя.

— Мы ведаем: цяжка рашыцца на такі крок...— прамовіў Антон Ланкійскі.— Але давайце паразважым: бізун ёсць бізун. Ці то польскі, ці то нямецкі, ці рускі. Дык і няма ніякай прычыны галасіць па чыімсьці бізуне. Ды цяпер, у час рэвалюцыі, абнаўлення, цягі ўсіх народаў свету да святла і волі. Што датычыць сувязі з Германіяй, то яе трэба будзе як след рэгламентаваць. А сваю пазіцыю варта выкласці ў Трэцяй Устаўной Грамаце.

Сеў. Стомлена пацёр лоб, шчокі. Мусіць, стаміўся. І за пятнаццаць гадоў удзелу ў беларускім руху, дзе было шмат усякіх перыпетый, і за апошнія суткі — за паездку сюды і за сустрэчу з матчынай магілай.

— Я — за незалежнасць! — першы падаў голас у набухлай цішыні Лашкевіч і абвёў усіх рашучым позіркам.

— І я,— услед за ім прамовіў гучна строгі Еўзікаў. Тут жа моўчкі паднялі рукі Шуляк, Заходка, Пячэрскі, Аўсянік.

Васілевіч сядзеў за Лашковічам, слухаў усё і бачыў: Ян і Антон сваімі прамовамі адагналі насцярогу да сябе, прывабілі — адным словам, нязмушана, але чэпка павялі за сабою. Паколькі Мінскі падпольны камітэт РКП (б) даручыў усюды і заўсёды выяўляць «прагерманскую» палітыку, ён, Васілевіч, мусіў цяпер таксама падняць руку. Але ў душы бунтавала, прыгнятала штосьці вышэй, чым тое даручэнне — можа, і вялізная трывога, нават нечалавечы страх: божа, на якую страшную сцяжыну мы выходзім! Колькі шчырых і талковых людзей можа прапасці на ёй альбо пазней, пры іншай сітуацыі, паплаціцца за гэта!

Узрушана зірнуў на калегу па цяперашняй падпольнай рабоце, на Алеся Нямкевіча: той, у паношаным пінжаку і тоўстым сялянскім свэтары, лысаваты, запунсавеўся і ад хвалявання грызе пазногаць.

Перавёў позірк далей — на кіраўніка, на Нядолю. Той, бледны, аж сіняваты, зусім нечакана падміргнуў яму гарэзна: усё, маўляў, добра! Але Бурбіс, які сядзеў побач і мяў рукі, захітаў яму з адчаем галавою: не туды кіруемся, не тое робім!

Не ведаючы, што ён і як робіць, Васілевіч з адчаем і з разгубленасцю падхапіўся. І каб утрымаць усіх ад параенага Ланкійскімі ды падтрыманага некаторымі тутэйшымі, каб выратаваць сумленных людзей ад ганьбы, сказаў не насуперак свайму даручэнню, але і не асабліва ў суладдзі з ім — найперш дзеля таго, каб адцягнуць, адсунуць тое, што гэтак паспешна навальваецца на іх:

— Асабіста я не супраць, каб нам самім падбаць пра сябе. А калі трэба будзе, то і падпісаць сваю дамову з Берлінам. Але я не хацеў бы, каб такія лёсаносныя рэчы мы рашалі толькі тут, лічы, келейна. Я раю: давайце склічам сход Грамады і пагаворым пра ўсё гэта там. І што рошыць Грамада, найбольшая, самая аўтарытэтная партыя ў Радзе, тое і вынесем ад яе імя на ўсеагульны наш з'езд.

«Можа, на сходзе збэсцяць, стопчуць гэтую канцэпцыю...» — падумаў сам сабе.

— Вельмі разумная парада,— упершыню за сённяшнюю сустрэчу пачуўся зычны Бурбісаў голас. І гэтая рэпліка аднаго з ветэранаў руху каго астудзіла, а каму памагла зарыентавацца.

— А можа, нам яшчэ раз перамовіцца з Доўбар-Мусніцкім,— падняўся і таксама ўпершыню сёння загаварыў Нямкевіч.— Па-першае, у яго значная сіла і вялікія грошы, а па-другое, ён спачувае нам...

У залі нечакана амаль усе выбухнулі рогатам. Зачырванелы Нямкевіч сеў і апусціў галаву.

«Сказаў тое, што трэба было яму сказаць, але незайздроснае ў яго цяпер становішча!» — паспачуваў сябру Васілевіч.

— Можа, яшчэ і іншыя парады ёсць? — усміхнуўся звычайна суровы, аскетычны Аўторак, навідавоку пацяшаючыся з Нямкевічавага слова.

— Сапраўды, спадары, давайце спачатку пагаворым пра такія важныя рэчы на грамадоўскім сходзе,— выратаваў Нямкевіча, а заадно і сам акрыялы Баравік і ўскінуў руку. Услед за ім падняла рукі большая палова з тых, хто быў у пакоі.

— Што ж,— прамовіў Аўторак,— спадар Сымон мае рацыю: няхай галоўная наша, беларуская, партыя, дзе старэйшыны руху, паразважыць пра ўсё і выкажа сваю думку. А цяпер, спадары, давайце падумаем пра наказ для нашай дэлегацыі. Лічу, найперш мы павінны Генеральнаму сакратарыяту Украіны афіцыйна аб'явіць пра нашу БНР.

— У другім пункце запісаць: нам трэба абмяняцца прадстаўніцтвамі,— параіў Лашкевіч.

Аўторак, сеўшы, пачаў шпарка запісваць. Калі падняў галаву, то падаў голас Баравік. Але Васілевіч добра недачуў, бо якраз у гэты час павярнуўся і зірнуў на Нямкевіча: як адчуваеш сябе, дружа?

— Дзякуй,— пачуўся голас Аўторка.— Якія яшчэ ёсць думкі? — Хтосьці сказаў глуха, а за ім — яшчэ адзін не вельмі выразна. Васілевіч, дачакаўшыся, калі разгублены Нямкевіч падыме галаву, падміргнуў: ну, не адчайвайцеся. Ты ж праверыў тое, што трэба было яшчэ раз адчуць.

— Ну, а цяпер варта сказаць і пра галоўнае для нас, пра грашовую помач,— гучна сказаў у гэты час Заходка.

— Трэба асобна сказаць пра таварны абмен з Украінай і з мяжою, без чаго нам не абысціся,— дадаў Пячэрскі.

Неўзабаве за ўсе гэтыя сем пунктаў з наказу дэлегацыі БНР прагаласавалі адзінагалосна.

**3**

Як і трэба было, сёння, увечар, Муха ўпотай прыйшоў да Дзядзі на Шпітальную вуліцу.

Як і заўсёды вось у такія рэдкія адмысловыя візіты, дзверы адчыніў сам гаспадар, моўчкі, толькі ўзмахам рукі запрасіў у невялікую зацемненую душную кватэрку-заканурак, запёрся, пастаяў і паслухаў, што робіцца на лесвіцы, а пасля прышлёпаў услед за ім у пакой. Быў у доўгай шэрай цёплай піжаме і ў мяккіх тапачках, на галаве — чорная аксамітная ярмолка. І ў змроку выдатныя вочы пранізлівыя, а загнуты нос падобны на ястрабіны.

— Ну што рашыла Грамада? — не вітаючыся і не запальваючы святла, нецярпліва запытаў.

— Даручыла Народнаму сакратарыяту вынесці на пленарны сход Рады БНР тэзіс незалежнасці рэспублікі і звярнуцца да народаў Беларусі з Трэцяй Устаўной Граматай,— як яму і належыць, коратка ды ясна адказаў Муха.

Нізенькі і кволы стары неяк вельмі хутка апусціўся на крэсла, што стаяла каля стала, пацепнуў плячыма:

— І колькі ж галасамі «за» і «супраць» рашылі такое дзёрзкае?

— Аднагалосна.

— Вы — што?! Аднагалосна — за разрыў з Расіяй? !

— Праўда, не адразу прыйшлі да такога. Спачатку была вострая палеміка.

— Якая? — вывуджваў навіны Дзядзя.— Хто што гаварыў?

— Васілевіч, Шуляк, Лашкевіч, Еўзікаў, Пячэрскі адразу павялі бой за незалежнасць. Баравік і яшчэ колькі яго аднадумцаў, асабліва

малады Касцюковіч, былі супраць, спрабавалі ўдарыць па Ланкійскіх за тое, што «тыя падліваюць масла ў агонь», але не змаглі ўзяць верх. Пасля і самі галасавалі «за», агаварыўшыся, што робяць так толькі таму, каб не расколваць Грамаду, не паказваць іншым, найперш небеларускім, партыям рознагалоссе.

— Незвычайная сітуацыя,— прамовіў Дзядзя.— І звышрэалізм, і звышавантурызм заадно. Спроба націснуць адразу на два бакі: і на Маскву, і на Берлін. Без вайсковай сілы, без грошай, без міжнароднай помачы.

— Ну, а я, як вы і сказалі, быў за БНР як будучую частку Расійскай Федэрацыі без бальшавікоў. І за гэта мяне лупцануў Лашкевіч.

— Як след падсыпаў ці няўдала? — укусіў, як снасаўская муха, гаспадар, можа, і ў душы радуючыся, што звёў, стукнуў ілбамі былых сяброў.

— Ён сказаў, што я быў, ёсць і заўсёды буду прыстасаванец, двудушнік і халуй,— Муха прызнаўся шчыра, пе асмельваючыся маніць, але сказаў такім тонам, каб пачулася, што дзеля іхняй ідэі яму прыходзіцца ісці і на выпрабаванні, і на знявагі.— Ды што за кашалёк, пасаду гатовы прадаць і сваю маці.

— Што ж, няблага пахваліў! Ясна?

— Ясна,— адказаў, усцешаны, што Дзядзя задаволены ім.

— Ну што ж,— сказаў той.— Займайце цяпер і вы прагерманскую пазіцыю, уціраецеся ў давер, натхняйце на авантурызм і збірайце новы кампрамат на «аднадумцаў». І яшчэ. Заўтра наладзіце мне сустрэчу з Антонам Ланкійскім. На нашай кватэры на Нова-Маскоўскай.

— Хіба ўдзень. Бо ўвечар пачнецца пленарны сход Рады БНР.

— Давайце ўдзень. У гадзіны дзве.

— Добра.

— Вам не цікава, пра што я хачу пагаварыць з нашым віленскім братам?

— Я навучыўся ўжо не задаваць лішніх пытанняў...— усміхнуўся ён у адказ.

— Малайчына! — не вытрымаў, пахваліў скупы на добрае слова Дзядзя.— І яшчэ калі будзеце разам, то ўвесь час, так сказаць, тонка правакуйце яго, вывучайце: ён шчыра служыць нашаму ордэну ці толькі маскіруецца і «выбівае» сваю, беларускую ідэю? Ясна?

— Ясна,— паслухмяна сказаў Муха.

— Ну, мама, блаславі на новы бой, на перамогу! — Адыходзячы, Лашковіч прытуліў невысокую, худзенькую маці.

— Ой, сынок, зноў вы ідзеце супраць цёку вады...— заўздыхала тая. Хоць ужо з год жыве ў Мінску, зноў разам з ім, але ніяк не можа прывыкнуць ні да горада, ні да яго, сынавых, клопатаў і турбот.— Скора саракоўка, лысееш вунь, а ўсё пачынаеш ды пачынаеш штосьці новае...

— Я зразумеў цябе, мама,— сказаў паўжартам,— Вось дабёмся сёння свайго — дадуць мне работу, кватэру. А як толькі абжывёмся, адразу прывяду Ванду, і пойдуць у нас кожны год дзеткі. Во будзе табе марокі!

— Дай бог чутае бачыць...— зноў уздыхнула старая.— Толькі мала веру я, што ты некалі можаш ажа-
ніцца. Змаладу ажаніўся ты на іншае жыццё, а не на сям'ю...

Лашкевіч пакінуў маці ў сваіх новых гаспадароў, а сам шпарка падаўся ў горад, у Народны сакратарыят, дзе неўзабаве павінен пачацца пленарны сход Рады БНР.

Ён нядаўна жартаваў з маці, паказваў, што ён зусім спакойны, але па душы было трывожна. Па-першае, з-за таго, што яны сёння задумалі, а па-другое, з-за таго, як паводзіцца ў апошні час ён сам. Сэрца, душа падказвалі, што іншыя і ён, задумаўшы аб'явіць сваю незалежнасць такім незвычайным чынам, не толькі памыляюцца, але і свядома глумяць справу і сябе. Але розум перамагаў пачуцці: а хіба Фрунзе, Мяснікоў, Ландар, якія наехалі і гаспадарылі тут, і Сталін у Маскве паваляюць і спрыяюць? Не. Ды яшчэ пякла крыўда, што Ландар з Калмановічам, змагаючыся супраць насілля пры царызме, самі ўчынілі гвалт — кінулі яго, былога катаржаніна, у падзямелле як ворага народа, як аднаго з лідэраў беларускага руху, які яны лічаць толькі буржуазным і вароніш, праяваю адсталых забабонаў, непатрэбным варункам, на іх думку, у той час калі якраз яны прыйшлі да ўлады. Вось некалі, асабліва тады, калі трэслі царызм, вы былі патрэбныя, а вось цяпер пайшлі прэч, бо замінаеце нашай вялікай мэце!

Ён узбуджана крочыў па горадзе, дзе было ўжо мала снегу, але які дзень запар трымаўся сакавіцкі развітальны мароз. Холад цяў, як галодны, і цяпер, калі ўжо зайшло сонца і падружоўленае, нагрэтае за дзень неба пачало астываць і зацягвацца шэраю павалокаю, апускаючы на зямлю ўжо вясновую, але яшчэ няласкавую ноч.

Хоць у залі для сходаў адразу запацелі акуляры, але ўбачыў: яшчэ за паўгадзіны тут ужо нямала люду. Сядзяць купкамі, гамоняць, і ўсе, здаецца, насцярожаныя. Як ні дзіўна, першыя прыйшлі саюзнікі і члены Народнага сакратарыята: Злобін як — таварыш старшыні зем-

скай управы Мінскай губерніі, а ў іх народны сакратар велікарускіх спраў, Макрэеў — эсэр, народны сакратар унутраных спраў і пасланец ад украінскіх суполак, Белкінд і Гутман (першы — эсэр, народны сакратар фінансаў, другі — паалейцыяніст, народны сакратар без партфеля). А таксама былі ўжо тут лідэры шматлікіх мінскіх партый, якія нядаўна згадзіліся ўвайсці ў Раду БНР: эсэр Шумскі, меншавік Пайкес, паляк Абадзінскі і нават сядзеў ужо старшыня Мінскай думы, член ЦК Бунда Бакштэйн.

Убачыўшы яго, многія замахалі рукамі: хадзі да нас! Раней, пры Часовым урадзе, многія з іх займалі высокія пасады і не хацелі бачыць ды чуць яго і ягоную Вялікую Беларускую раду, а цяпер, калі ён і яго калегі на паверхні, бач, запаважалі, нават некаторыя з іх пачынаюць вучыцца гаварыць па-беларуску. І трэба сказаць, даволі ўдала.

Запыніўся, сеў. Каля саноўнага Вашнтэйна, які акрыяў пасля таго, як нямецкія ўлады прызналі паўнамоцтва Гарадской думы і асабліва не заміналі ёй засядаць, вяшчаць і весці гаспадарку.

— Дзе гэта вашы калегі? — усміхнуўся, але не зусім зычліва той.— Ці не сабраліся на новую нараду?

— Не ведаю,— пацiснуў ён плячыма.— Мяне ніхто нікуды не запрашаў.

— А гэта праўда, што фракцыя Грамады рашыла дабівацца незалежнасці і парываць з Расіяй? — запытаў сусед Ванштэйна, Белкінд.

— Я не магу раскрываць тайны сваёй партыі, як і не дамагаюся такога ад вас,— ухілліва адказаў Лашкевіч.

Чуючы такую гаману, пачалі падымацца ў залі і падыходзіць да іх і іншыя.

— Якая ж гэта тайна, калі мы ўсе неўзабаве ўведаем? — заагрэсіўнічаў Белкінд.— А па-другое, чаму я, член Народнага сакратарыята, не ведаю, з чым ён будзе выходзіць на пленум?

— Я не член Народнага сакратарыята, дык не магу адказваць за яго.

— Гэта ўсё падобна на гульню з намі! — пакрыўдзіўся Ванштэйн.— Вы, як мы адчуваем, найперш вядзіцё сваю лінію і хочаце ці паставіць нас перад дэ-факта, ці зрабіць з нас паслухмяных памагатых. Гэта не па-таварысцку, не па-саюзніцку, пан Лашкевіч. Калі будзе парушацца наша дамова па платформе ўтварэння БНР, мы будзем пратэставаць альбо...— Развёў рукамі.— Альбо будзе канец усяму. Вы цяпер удала перахапілі першынства, але вы без нас не станеце на ногі!

— Давайце пачакаем пленума, не будзем спяшацца спрачацца да яго...— Усміхнуўся Лашкевіч, не могучы прызнацца пра ўсё і не жадаючы без пары і часу палемізаваць з тымі, хто стаў прыяцелямі па разліку.

**5**

Сесія Рады БНР пачалася, як і задумвалі, у восем гадзін вечара.

І сцэна, дзе стаяла некалькі накрытых зялёным аксамітам сталоў, і Заля былі ўрачыстыя. Сцэне надавалі шыкоўнасць вазачкі на стале з хваёвымі галінкамі, рознакаляровымі кветкамі і невядома адкуль узятымі жывымі чырвонымі гваздзікамі, а таксама вялікі герб «Пагоні» на бел-чырвона-белым палотнішчы, а залю ўпрыгожвала вялікае яркае электрычнае люстра, зіхоткія чырвоныя крэслы, а таксама абсвечаныя на сценах жоўтыя падсвечнікі з вялікімі парафінавымі свечкамі — на той выпадак, калі раптам патухне святло.

Вось з-за шырмы на сцэну выйшаў у сваім звыклым зялёным мундзіры, у хромавых ботах Аўторак — пачынаць сесію ад імя прэзідыума Рады БНР.

Ён стаў пасярод сталоў, пацёр суцэльна лысую, бліскучую ад святла галаву і вытрымаў належную паўзу. Усе запляскалі. І вітаючы аднаго з цяперашніх лідэраў Рады БНР, і вітаючы пачатак сесіі, на якую ўрэшце здолелі сабрацца разам усе розныя тутэйшыя палітычныя сілы.

— Дазвольце сесію Рады БНР лічыць адкрытай,— прамовіў і пільна зірнуў у залю, дзе была пераважная большасць членаў Рады.

Вопләскі.

— Хоць вашы апладысменты можна лічыць за ўхваленне пачатку нашай работы, але давайце ўсё ж замацуем паша паўнамоцтва галасаваннем,— сказаў непарушна Аўторак.— Хто за тое, каб адкрыць сесію Рады БНР, прашу галасаваць.

Ён першы падняў руку, за ім ускінулі рукі і ў залі.

— Аднагалосна,— усцешыўся.— Дзякую. Цяпер дазвольце ад імя ветэранаў рэвалюцыйнага руху шчыра павіншаваць вас з абраннем у склад Рады БНР, паспадзявацца на ваш належны ўдзел у яе дзейнасці і пажадаць нашай сесіі плённай работы! — А калі яго перапынілі вопләскі, памаўчаў, а пасля павёў сваё далей: — Для работы пашай сесіі трэба выбраць рабочы прэзідыум. Ёсць думка нашых старэйшын у прэзідыум абраць прэзідыум Рады БНР, спадара Злобіна — народнага сакратара велікарускіх спраў Народнага сакратарыята Беларусі, таварыша старшыні земскай управы Мінскага губеранскага земства, сацыяліста-рэвалюцыянера, спадара Макрэева — народнага сакра-

тара ўнутраных спраў, сацыяліста-рэвалюцыянера, украінца, спадара Ванштэйна — старшыню Мінскай гарадской думы, члена ЦК Бунда, спадароў Пайкеса і Шуйскага — лідэраў тутэйшых расійскіх партый, спадароў Ланкійскіх — ветэранаў грамадоўскага руху, спадара Гутмана — народнага сакратара без партфеля, паалейцыяніста, а таксама спадароў Костаса і Абадзінскага — літоўскага і польскага дэмакратаў...

Усе зноў запляскалі. Усім пакуль што было даспадобы, што пакуль што ўсё ідзе ва ўсіхных інтарэсах. А затым і прагаласавалі за ўсіх адзінадушна.

Неўзабаве Васілевіч, Баравік, Еўзікаў, а таксама персанальна названыя Аўторкам асобы падняліся на сцэну, паселі за сталамі.

Васілевіч мусіў сесці каля Аўторка — весці далей сесію. Прасілі ўзяць руль Баравіка з прамоўніцкімі і артыстычнымі здольнасцямі, але той адмовіўся.

— Спадары,— падняўшыся, з хваляваннем, аж зарэзала ў жываце, сказаў Васілевіч.— А цяпер нам трэба зацвердзіць парадак дня нашай работы. На вашу думку выносіцца некалькі пытанняў,— і калі зачытаў усё, што было загадзя запісана на паперцы, то аж разгубіўся: і ў прэзідыуме, і ў зале загудзелі. З незадавальненнем і з абурэннем.

Васілевіч адчуў, што да яго прылівае нейкае двайное пачуццё: папершае, ён загадзя ведаў, які будзе парадак дня, і хваляваўся, падругое, адчуваў, як будуць негадаваць саюзнікі. Яму трэба было ўтаймаваць незадаволеных, але ў душы яму хацелася, каб тыя здолелі абсекчы, не даць Аўторку, Лашковічу і іншым, пад'юшчаным Ланкійскімі, дабіцца таго, што яны задумалі,— разрыву з Расіяй. Ніколі яшчэ ў сваім жыцці ён не быў у такім супярэчлівым пераплёце. Яго часамі папракалі за іншае, за тое, што ён лабавы, захоплены нейкай адной сваёй ідэяй, а тут вось сам час змушае віртуознічаць, нават выкручвацца, як уюн у сетцы.

— Якія будуць думкі наконт парадка дня? — запытаў ён найперш у залі, дзе сядзела з паўсотні людзей.

— Дазвольце слова,— пачуўся ззаду голас. Азірнуўся: падымаецца грузны, як калода, з павіслымі чорнымі бровамі, з сівымі вусамі Пайкес і кіруецца да краю сцэны.

Пайкес стаў каля трыбуны, узвысіўся ў белых валёнках, афіцэрскім галіфэ і шэрым пінжаку, загуў:

— Мы, фракция социал-демократов (меньшевики), протестуем против пунктов: «Объявление независимой БНР», ибо усматриваем: а) тайный сговор белорусской части Народного секретариата с немецкими властями, б) сокрытие ею своих тайных замыслов от остальных.

Вместо вышеназванного пункта мы предлагаем его другую редакцию: «Обсуждение вопроса о БНР как о будущей автономной части Российской Федерации».

І ў прэзідыуме, і ў залі заляскалі прыхільнікі Пайкесавай парады — можа, чалавек і з дваццаць.

— Мы, фракция социал-революционеров, присоединяемся к мнению социал-демократов! — падхапіўся і з месца ў прэзідыуме выкрыкнуў рыжабароды плячысты Шумскі.

— Граяедане Белкйнд, Ванштейн и я полностью солидарны с предложениями граждан Пайкеса и Шуйского,— настойліва, таксама з прэзідыума падаў голас Гутман.

— Ты чаго цягнеш ката за хвост? — зашыпеў на яго, Васілевіча, Аўторак.— Вынось хутчэй прапановы на галасаванне!

— Спадары! Увага! — паспрабаваў суцішыць узбуджан ых радцаў ён.— Калі ёсць дзве розныя прапановы, то давайце прагаласуем за іх.— І, перамагаючы тых, хто не мог супакоіцца, гудзеў ды бубніў ці то на ўвесь голас, ці то толькі сабе: — Хто за першую прапанову, каб ужо на гэтую сесію вылучыць такі пункт: «Аб'яўленне незалежнай БНР і разрыў усіх адносін з Расіяй»?

Прагаласавалі. Паколькі блок беларускіх партый быў найбольш шматлюдны, то большая палова галасоў была якраз за гэты пункт.

Пасля са страсцямі, са спрэчкамі, галасаваннем зацвердзілі і іншыя пункты. Сярод іх былі і такія: «Утварэнне ўрада БНР», «Прыняцце Трэцяй Устаўной Граматы», «Дыпламатычны абмен БНР з іншымі хсраінамі».

Затым даў слова Аўторку.

Той, нібы не зважаючы на нядаўнія перапалкі, на розныя думкі ў залі, спакойна падышоў да трыбуны, зірнуў спадылба на залю.

— Спадары!— прамовіў суха.— Мне даручылі выступіць з дакладам Народны сакратарыят, прэзідыум Рады БНР, а таксама я маю давер і ад самай вялікай і аўтарытэтнай беларускай партыі, ад Грамады.

Далей аскетычна, без эмоцый ён пачаў напамінаць усім пра перапетыі палітычнага руху ў Мінску за 1917-ты і гэты год. Праўда, калі гаварыў пра «вераломныя адносіны насаджай бальшавіцкай брацііі тыпу Мяснікова, Ландэра, Калмановіча да беларускай справы», то глухаваты голас яго ажыўляўся — суровасцю і злосцю.

— Спадары! Сябры! — праз паўгадзіны падняў галаву ад паперыны, строга зірнуў на ўсіх. Цяжка было і зразумець, ці такі скупы ў чалавека характар, ці то такая «рэвалюцыйная», лепш сказаць, эсэраўская поза.— Мы, члены розных рэвалюцыйных з беларускаю

афарбоўкаю партый, рады сёння бачыць: мы не толькі ўстоялі ў такі віхурны час, але і сабраліся ў адзін згуртаваны цэнтр, сталі асноўнай палітычнай сілай краю. Мы рады, што змаглі пасаюзіцца з усімі палітычнымі суполкамі, з гарадскімі, земскімі самакіраваннямі і за кароткі час наша кааліцыя стала сапраўдным дзяржаўным органам, адказным за лёс спустошанай, абрабаванай і зняважанай Беларусі. З намі лічацца нямецкія акупацыйныя ўлады, хоць не вельмі хочуць спрыяць. А не дужа спрыяюць, можа, і таму, што ясна не бачаць нашай палітычнай праграмы. Блок беларускіх партый вылучае на разгляд высокапаважанай сесіі Рады БНР тэзіс незалежнасці Беларусі і разарвання ёю ўсіх сувязей з Расіяй. Я думаю: мы вымушаны гэта зрабіць цяпер, каб спыніць юрыдычны суверэнітэт Расіі на нашы землі, каб ва ўмовах акупацыі мы маглі самі рашыць свой лёс. Адпаведна, нам трэба сфарміраваць свой кааліцыйны ўрад, прыняць новую Устаўную Грамату і пачаць ажыццяўляць свае ідэалы. Разумнай альтэрнатывы гэтаму няма. Супрацьлеглае — палітычная блізарукасць, самападман, непавага саміх сябе...

Сабраў паперы і непарушна вярнуўся на сваё цэнтральнае месца ў прэзідыуме. Там, а таксама і ў зале заляскалі. Але не ўсе. У апазіцыю пайшлі саюзнікі — пасланцы іншых палітычных суполак, гарадскога самакіравання і земства.

Аўторак сеў, а Васілевіч-старшынствуючы падняўся і ўсхвалявана прамовіў:

— Давайце перакінемся словам-другім. Хто хоча пачаць спрэчкі.

— Дазвольце мне,— падняў руку ў прэзідыуме Лашкевіч, які сядзеў пасярод братоў Ланкійскіх.

— Калі ласка,— сказаў Васілевіч.

Лашкевіч — здаецца, яшчэ болей худы, чым летась, бела-сіні, у тоўстых акулярах, праз якія, здаецца, усё роўна мала бачыў, з нядаўна адпушчанымі вусамі і барадою, палыселы — рухава падышоў да трыбуны і абапёрся на яе.

— Я, браты, хачу найперш звярнуцца да пасланцоў іншых нацыянальнасцей, да тых, хто на пачатку сесіі ўстройваў тут абструкцыю,— гучна сказаў ён.— Тое, што вы пачулі, можа, і збянтэжыла, а то і шакіравала вас. Як-ніяк беларусы дабіваюцца сваёй дзяржавы, хочуць абарваць карані з Расіяй! Што ж, ірваць з Расіяй, блізкай нам па ладу і духу вялікай краінай, нават нашай сястрой, нас змушае горкі наш лёс. Па-другое, будзьма рэалістамі: наша сястра ўсё ж была неміласэрная да нас. Яна спажыла блізкасць гісторыі, ладу, культуры і праз гэта губіла ўсё наша і прывівала нам усё сваё. На вялікі жаль, на нас уплывалі не толькі Пушкін ды Талстой, але з большай сілай,

неміласэрнасцю ўплывалі найперш тупыя і жорсткія наезджыя чыноўнікі, якія рабілі сабе тут кар'еру, русіфікавалі, ганьбілі, тапталі, каб паставіць на нас крылі. Мы рана-позна мусім бараніць сябе. Патрэцяе, мы, дабіўшыся волі, павінны не паўтарыць існуючай дагэтуль філасофіі пануючай нацыі — г. зн. ні ў якім разе не імкнуцца да свайго шавінізму, да прыгнечання нацыянальных меншасцей і свядомага знішчэння іх культуры. Мы павінны гарантаваць усім правы ў незалеяпіай і вольнай Беларусі. Адпаведна, нашым братам няма патрэбы баяцца нашага такога няпростага змушанага кроку, і асабіста я чакаю, што яны зразумеюць і падтрымаюць нас.

Зноў хтосьці запляскаў, а хтосьці не.

— Я прошу слова,— падняўся ў прэзідыуме Пайкес, расчырванелы, а то нават і распараны.

А калі дазволілі прамаўляць, размашыста падышоў да трыбуны, зноў уразіўшы ўсіх агромністым ростам.

— Друзья,— забасіў.— Да, в частности мы, меньшевики, недооценивали национальный вопрос, не поддерживали образования белорусской государственности. Сейчас жизнь, позиция большевистского центра принудили нас изменить нашу позицию. Мы согласны поддержать образование Белоруссии. Но, друзья белорусы, зачем таким нехорошим, мягко говоря, образом вы начинаете свое дело? Когда вам трудно, позовите на помощь русского Ивана!

— Дзе той ваш Іван цяпер?! — выгукнуў Лашкевіч.— А па-другое, у вашага Івана-чыноўніка завельмі моцныя абдымкі! Ад іх аж выскаквае дух!

У залі пачуліся воплескі.

Пайкес пачакаў, калі будзе цішыня, а пасля прыстрашыў:

— Без России вы пропадете! Это раз. А во-вторых, нам не понравилось то, что когда мы с вами вели переговоры, чтобы и нам вступить в Раду БНР, мы условились: мы вместе добиваемся автономии Белоруссии в составе Российской Федерации без большевиков. И вдруг — вы такой поворот! Отрыв вообще от России! Мы не можем присоединиться к такому вашему безумию и безответственному шагу.

— Мы протестуем против него! — выкрыкнуў з прэзідыума Шумскі, нервова мнучы сваю рыжую бараду.

Далей, як кажуць, пайшло-паехала: Еўзікаў — за незалежнасць і аддзяленне, пасланец ад велікаросаў Злобін — супраць, Заходка, Аўсянік, Шуляк, Пячэрскі і іншыя — за, Сядых, Гутман, Белкід, Абадзінскі — супраць.

Пасля, пад раніцу ўжо, слова папрасіў Ванштэйн.

Ён важна, нібы спакойна, выйшаў да трыбуны, абапёрся на яе.

— Сябры,— прамовіў.— Усе мы разумеем нашых калег-беларусаў, якія рашылі спажыць момант і дабіцца таго, пра што яны марылі стагоддзямі. Але дзве рэчы, як убачылі мы, вельмі засмуцілі нас. Першае: тое, што яны вынеслі на гэтую сесію, рашылі ў сваім асяроддзі, келейна. Другое: парушылі дамову з намі, чым паставілі нас у цяжкае становішча.

Дабіўшыся ўвагі (бо дасюль быў і тупат нагамі, і свіст, і розныя выкрыкі), саноўны Ванштэйн пачаў заваёўваць давер далей:

— Мы, даражэнькія браточкі-беларусы, разумеем вас. Мы нават верым: вы, пазнаўшы гора ды бяду, будзеце лаяльнымі да ўсіх нас, іншародцаў. Але адчуйце лепш: мы можам пражыць без рускай культуры, але мы не здолеем пражыць без расійскай эканомікі!

— Зможам! — выгукнуў з прэзідыума Лашкевіч,— Не такія мы беднякі, як нас агаворваюць!

— А цяпер вы без капейкі ў кішэні станеце на ногі?

— Станем, бо нам паможа Украіна.

— Далей,— сказаў Ванштэйн.— Вы ап'янелі, сябры: упарта гняце сваю лінію, не слухаеце, а спрачаецеся з намі, гатовы паставіць пытанне на галасаванне. Але я завастраю ўвагу: на сесіі няма многіх дэлегатаў ад правінцыйных гарадскіх і земскіх самакіраванняў, таму з 71 месца механічна большасць за вамі. Я як старшыня Мінскай гарадской думы і член ЦК Бунда раю: давайце, сябры, не будзем сёння прымаць ніякага рашэння, палічым нашу сесію за дыскусійную нараду.

Меншая палова заўзята заляскала, большая — стрымалася.

— Спадары, прамовіла ўжо дваццаць шэсць чалавек,— падняўся Аўторак, які ўзяў руль у свае рукі.— Ёсць яшчэ ахвотнікі?

— Хопіць!— пачулася адразу некалькі выкрыкаў.— Світае вунь ужо!

У гэты час Лашковіч, які перайшоў у залю, адцягнуў на акне штору — сюды хлынула ранішняе святло. Пяшчотнае па-сакавіцку, зыркае ад маладога сонца.

— Будзем галасаваць,— непарушна і пасля бяссоннай ночы сказаў Аўторак.— Ёсць дзве прапановы. Першая: аб'явіць незалежную БНР і лічыць разарванымі ўсе адносіны з Расіяй. Другая: разглядаць Беларусь як будучую аўтанамічную частку Расійскай Федэрацыі. Хто за першую прапанову?

Пераважная большасць.

— Хто ўстрымаўся?

Усяго некалькі чалавек.

— Ну, што ж, няма патрэбы галасаваць за другую прапанову,— дазволіў сабе ўсміхнуцца Аўторак.— Я віншую вас ўсіх, спадары, з актам, які толькі што адбыўся! Ёсць упершыню за гісторыю незалежная Беларусь! Дзяржава!

Прыхільнікі гэтага горача запляскалі.

У прэзідыуме падхапіўся Злобін:

— В знак протеста против этого «исторического» акта мы покидаем пленум!

— П мы! — падскочыў услед за ім яшчэ хтосьці.

І сапраўды, яны, земцы, спешна выйшлі з залі.

— Баба з воза — каню лягчэй,— усміхнуўся Аўторак, і яго словы пакрыліся воплескамі.

— Няма чаго радавацца, сябры. Гэта — наш раскол і правал усёй справы,— падаў голас Ванштэйн, сышоў з прэзідыума, але падаўся не на выхад, а ў залю. За ім услед падаліся Пайкес і Шумелі.

— Мы зараз, пан Ванштэйн, пачнём фарміраваць наш урад,— спакойна адказаў яму Аўторак.— Можа, вы згодны ўвайсці ў яго?

— Не-не,— замахаў той рукамі.— Пасля ўсяго таго, што адбылося, я не магу пайсці на такі крок.

— Ясна,— ухмыльнуўся Аўторак.— Саюзнікі нашы аказаліся ненадзейныя. Нам зноў прыйдзецца адным дабівацца беларускай дзяржаўнасці.— І да ўсіх: — Мы, спадары, прадбачвалі, што не сустрэнем помачы сярод тых, хто прымкнуў да нас не з-за салідарнасці, а толькі па разліку, хто па-ранейшаму альбо не разумее, альбо разумее ды не хоча падсобіць беларускай адраджэнскай ідэі. Адным словам, мы хочам прапанаваць вашай увазе структуру і спіс урада БНР, дзе няма ні аднаго прадстаўніка пануючага класа і дзе выключна адны сацыялісты. Але ці будзе вашая згода на такі акт?

— Ёсць! — выгукнуў з залі Лашковіч.

— Дзякую,— нахіліў галаву Аўторак.— Давайце прагаласуем. Хто за тое, каб з нашага складу ўтварыць урад БНР.

Амаль усе паднялі рукі. Апрача Ванштэйна ды яшчэ трох чалавек-праціўнікаў, якія затрымаліся.

— Дзякую,— нібы ўсміхнуўся, нібы павесялеў Аўторак.— Савет старэйшын раіць наступную структуру нашага ўрада: прэзідэнт Рады БНР, старшыня і народны сакратар замежных спраў, народны сакратар скарбу, народны сакратар асветы, народны сакратар кантролю, народны сакратар вайсковых спраў і маскоўскі консул. Згодны?

— Згодны,— зноў першы падаў голас Лашкевіч.

Прагаласавалі. Тое ж: усе — «за», акрамя Ванштэйна і яго аднадумцаў.

— Ва ўрад БНР персанальна прапануюцца: Васілевіч, Заходка, Пячэрскі, Жытнік, Еўзікаў, Шуляк, Бурбіс, ваш ягамосць Аўторак. Ёсць пярэчанні, іншыя прапановы?

— Не.

— Няма.

— Трэба абмеркаваць кожную кандыдатуру,— сказаў Аўторак. Пачаў чытаць прозвішчы па аднаму — самаадводаў і адводаў не было. Пасля прагаласавалі. За кожнага паасобку. Усе названыя прайшлі ва ўрад БНР.

— Па праве старшынствуючага віншую ўсіх з першым у гісторыі народа сваім урадам! — зусім памякчэў Аўторак.— Па праве члена гэтага ўрада і ад імя калег шчыра дзякую ўсім за давер. Яго мы пастараемся апраўдаць спаўна, не пашкадаваць нават свайго жыцця для ажыццяўлення нашых спрадвечных мар і надзей. Думаю, вы дазволіце нам самім размеркаваць абавязкі ва ўрадзе з улікам здольнасцей і вопыту кожнага. Згодны?

— Згодны.

— Канечне.

«Колькі гадоў чакаў, марыў пра вось такую хвіліну, а радасці няма...— падумаў сам сабе Васілевіч, адчуваючы, што яго аж калоціць ад хвалявання.— Штосьці ўсё нібы не сапраўднае, нібы крадзенае, а значыць, і грэшнае! Ці ўсе вось так бяруць уладу?»

— Цяпер, спадары, нам трэба прыняць рэзалюцыю з'езда, а таксама зацвердзіць тэкст Трэцяй Устаўной Граматы. Мы маем накід гэтых дакументаў, таму зараз зачытаем іх на ваш разгляд.

Пасля, калі зачыталі, зрабілі папраўкі, Васілевіч пастараўся прыдбаць адзін з экземпляраў усіх дакументаў, ведаючы, што іх будуць чакаць і ў Смаленску, і ў Маскве.

Ён трымаў у руках два лісткі са зместам Трэцяй Устаўной Граматы і, адчуваючы дрыготку ў руках, перачытваў сам сабе, пакуль Аўторак спраўляў розныя заключныя працэдуры:

«Год назад народы Беларусі разам з народамі Расеі скінулі ярмо Расейскага царызму, які найцяжэй прыціснуў быў Беларусь, не пытаючыся народу, ён укінуў наш край у пажар вайны, якая чыста зруйнавала гарады і вёскі беларускія. Цяпер мы, Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнай залежнасці, якое гвалтам накінулі расейскія цары на наш вольны і незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнаю і вольнаю дзяржавай. Самі народы Беларусі ў асобе свайго Устаноўчага Сойму пастановяць аб будучых дзяржаўных зьвязях Беларусі.

На моцы гэтага трацяць сілу ўсе старыя дзяржаўныя зьвязі, якія далі магчымасць чуягому ўраду падпісаць і за Беларусь трактат у Бярэсьці, што забівае на сьмерць беларускі народ, дзелючы яго на часткі. На моцы гэтага ўрад Беларускай Народнай Рэспублікі мае ўвайсьці ў адносіны з зацікаўленымі старонамі, прапануючы ім перагледзець тую часціну Берэсьцейскага трактату, якая датычыць Беларусі, і падпісаць міравую ўмову з усімі ваяваўшымі дзярнсавамі.

Беларуская Народная Рэспубліка павінна абняць усе землі, дзе ятве і мае лічбенную перавагу беларускі народ, а ласьне: Магілёўшчыну, беларускія часьці Міншчыны, Гродзеншчыны (з Гродняй, Беластокам і ішн.), Віленшчыны, Смаленшчыны, Чарнігаўшчыны і сумежныя часьці суседніх губэрняў, заселеныя беларусамі.

Беларуская Народная Рэспубліка пацьвярдяхае ўсе тыя правы і вольнасць грамадзян і народаў Беларусі, якія абвешчаны Устаўной Граматай ад 9 сакавіка 1918 року.

Абвяшчаючы аб незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, Рада яе пакладае свае надзеі на тое, што ўсе любячыя волю народы дапамогуць беларускаму народу ў поўнай меры зьдзейсьніць яго палітычна-дзяржаўныя ідэалы.

Рада Беларускай Народнай Рэспублікі Дана ў Менску-Беларускім 25 сакавіка (марта) 1918 року».

Прачытаўшы, ён некалькі хвілін уюшана глядзеў на напісанае, дзе многія словы здаваліся яму праўдзівымі, але некаторыя пяклі нібы гарачым вугалем.

Хтосьці крануў яго за плячо. Падняў галаву — Ян Лапкінскі. Падміргнуў: падымайся, бо, бачыш, стаяць ужо ўсе.

І ў гэтую хвіліну амаль усе разам заспявалі беларускую «Марсельзу», якую, кажуць, хтосьці на Случчыне напісаў яшчэ ў 1906 годзе:

Адвеку мы шалі, і нас разбудзілі,
Мы зналі, што трэба рабіць.
Што трэба свабоды, зямлі чалавеку,
Што трэба зладзеяў пабіць.
Мы дружна устанем з касамі, з сярпамі,
Прагонім зямлі палазоў,
Няхай нас сустрэнуць палямі, лясамі
Грамады працоўных людзёў.

## 6

З сесii Васiлевiч вяртаўся разам з Ланкiйскiмi i Лашковiчам.

Ужо ўвабралася ў сiлу ранiца — марозная, але сонечная, з застуджаным пахам адталага за ўчарашнi дзень снегу, нагрэтых дрэў, каменя i асфальту — вось-вось павiнен быў адпасцi мароз i пачацца вялiкая паводка, зрынуць зiму i ўсталяваць вясну.

Горад жыў; то тут, то там чулiся людскiя галасы, панукванне коней на конках, аўтамабiльныя сiрэны, ляскат малаткоў па жалезе, а заадно дружна дымiлiся над усiм горадам завадскiя i фабрычныя трубы, працавалi крамы.

— Менск пачынае свой будзень i, канечне, не ведае, якая важная работа ўжо зроблена ў iм...— прамовiў Ян Лашанскi, аброслы, змарнелы за яшчэ адну бяссонную ноч.— Не здагадваецца, што ён ужо не губеранскi горад, а ўпершыню за сваю гiсторыю — сталiца!

I Лашковiч, якi шмат разоў выходзiў за трыбуну, палемiзаваў з месца, i Васiлевiч, якiя адмоўчвалiся, не абзыўнулiся.

— Што з табой, дружа? — прыхiлiў да сябе Васiлевiча Ян.— Цi не перапякаўся ты, як i наш Дамiнiк Сямашка? — Паляпаў па плечуку. Супакойваючы.— Не бойся. Канечне, наша акцыя выклiча на сябе агонь, вымыслы, знявагу, апашленне, абвiнавачваннi i помсту — чорт з iм! Але як нi круцi, мы заявiлi: ёсць Беларусь! Можна, кажу, як хочаш, бэсцiць нас, але як быць з Беларуссю? Зноў не прызнаваць яе, шматмiльённы народ? Не, цяпер ужо нiхто не зразумее таго, хто будзе цягнуць i далей царскую валынку!

Прайшоў крыху моўчкi, а пасля прыхiлiў другой рукой да сябе i Лашковiча:

— Хоць цяпер i ранiца, але нашу вялiкую падзею не грэх адзначыць i ранiцай. Хадзем, хлопцы, кульнём на кiлiшку нямецкага шнапса!

— Не, я не магу,— адразу адмовiўся Васiлевiч. Узрушанаму, яму хацелася пабыць аднаму.

— Баiшся не толькi нямецкага духу, але i пiтва?— пажартаваў Ян.

— Дзiця хворае, трэба бегчы дадому,— адказаў. Сапраўды, яго самы меншы сын быў не зусiм здаровы, меў запаленне лёгкiх, але цяпер гэта была не самая важная прычына, чаму ён не хацеў пайсцi з даўнiмi сябрамi, хто цяпер адыграў найбольшую ролю ў тым, што адбылося.

Калi Антон Ланкiйскi i Лашкевiч пакрочылi на блiзкую ўжо Храшчэнскую, Ян затрымаўся.

— У мяне, Сымоне, гэтаксама нялёгка на душы,— сказаў.— Я выхаваны на многiх культурах, але найбольш — на рускай. Тое, што

мы парвалі з Расіяй, балюча і мне. Але так цяпер трэба. Гэта — крайняя мера, каб змусіць расійскі ўрад нарэшце ўважыць нас. А што да рускай мовы, культуры, мы ад яе не адвернемся, як нельга адсланіцца ад усяго прыгожага.

І яшчэ:

— На днях мы вернемся ў Вільню. Бог ведае, як далей складзецца наш лёс, як лягуць нашы сцежкі-дарожкі. Дык хачу сказаць табе дзве рэчы, Сымон, на развітанне. Сумную і радасную. Сумная: пабыў я з вамі паназіраў і засмуціўся. Шмат сярод нас хворых, сухотнікаў: Лашкевіч, Нядоля, Заяц, Еўзікаў, я... Значыць, мы ўжо не доўгажыхары. Але мне і радасна: дзякуй богу, не страшна паміраць! У помач, у працяг нам нарасло шмат маладой таленавітай сілы, і яна пацягне далей тое, што цягнулі мы ды надарваліся без пары, без часу. Як ні цяжка, нават невыносна, Сымоне, але я веру ў нашу светлую будучыню!

Васілевіч падняў галаву: у глыбока запалых Янавых вачах выплылі слёзы.

«Увесь час лічыў, што ён жалезны,— здзівіўся.— А ён, бач, чуллівы!»

— Ну, будзь! Не маркоцься!— Ян моцна пацiснуў яму руку, усміхнуўся праз слёзы, рэзка павярнуўся і шпарка пайшоў да роднага дома.

Таня, ужо не худая, а зусім схуднелая, пакрытая на шчоках нібы мохам, са здзіўленнем зірнула на яго вялікімі, з застылым сумам вачыма. Мусіць, быў вельмі стомлены, але і зусім са страчанай духоўнай сілай. Найперш ад нерваў, якія ўжо даўно надарваныя і расхістаныя.

Раней, хоць і стамляўся, але распранаўся і заходзіў у пакойчык, які ўсе яшчэ наймалі ў Сацункевіча, гарэзна — дзеля дзяцей: двух сыноў і дзвюх дачок.

— Ну, што там выйшла? — запытала Таня.— Што — немцы разагналі і пратрымалі ноч у халоднай?

— Не,— прамовіў і сеў нераспрануты на адзіным у пакоі ложку (на ім спала Таня і меншы сын). На тапчане спалі дочкі, а ён з большым сынам спаў на матрацы на падлозе.

— Пасварыліся паміж сабой?

— Не. Аб'явілі БНР. А я нават трапіў ва ўрад.

— Парвалі з Расіяй?

— Парвалі.

Таня цяжка ўздыхнула, зразумеўшы, чаму ён як пабіты. Яна мала цікавілася палітыкаю, задавальнялася тым, што ён расказваў, для яе быў найвялікшы клопат — трымаць на сваіх плячах сям'ю.

— Можа, калі трапіў у начальнікі, нарэшце, кватэры сваёй, хоць самай маленькай, даб'ешся, на кавалак хлеба будзеш мець...— па-свойму ацаніла пачутае Таня. І, здаецца, не знянацку, а з таго разліку, спадзявання, якое мела раней, з-за якога часта адпускала яго на тлумную і небяспечную работу.

«Баюся,— падумаў сам сабе,— каб хутка яшчэ горай не было...»

7. З дакладной Мінскаму падпольнаму раённаму камітэту РКП (б)

«27 сакавіка 1918 года

Як расказаў мне ўчора Лашковіч, Ланкійскія хадзілі ў Беларускае народнае прадстаўніцтва.

Там іх сустрэла кіруючая купка на чале са Скураным. Пасля ўзаемных хітраватых бадзёрых прывітанняў слова ўзяў Антон Лашанскі, як старшыня віленскай дэлегацыі, расказаў пра віленскія і мінскія падзеі самага апошняга часу.

Далей адбылася прыкладна такая размова:

Антон Ланкійскі. Мы ведаем, што вы, пан Скураны, пакрыўдзіліся, адышлі ад агульнага беларускага руху, ідзяце са сваёй суполкай асобна. Нават больш — цяпер вы спрабуеце скампраметаваць перад немцамі Грамаду і ўсе сілы, што яна аб'яднала, ды спрабуеце сваёй яўнай нямецкай арыентацыяй сцвердзіць сябе.

Дазволю патлумачыць, пан Скураны: немцы цярпіма адносяцца да таго, што ўтварылася незалежная БНР. Гэта — не вельмі шмат, але і не мала. Але калі вы будзеце і далей чужыніцца, шаптацца з немцамі, каб найперш падбаць пра сябе, то гэтым можаце панесці велізарную шкоду нашай агульнай справе, бо вас могуць спажыць супраць таго, што ўжо адбылося. Дык ваша «Прадстаўніцтва» павінна не абскокваць Раду Рэспублікі, а мусіць уліцца ў склад апошняе і, нягледзячы на розніцу ў сацыяльных поглядах, у гэты выключны момант будаваць Бацькаўшчыну супольна з сацыялістамі, паклаўшы першы камень пад гэтую будоўлю.

Скураны (ускочыўшы, расчырванелы). Вы што — прыехалі аж з Вільні вучыць мяне?

Антон Л а п к і н с к і. Не. Я не вучу, я заклікаю вас да розуму і цвярозых паводзін.

Скураны (абурана). Вашы сацыялісты ні ў грош не цэняць таго, што я і мае калегі зрабілі і робім для нашай адной ідэі, кампраметуюць мяне як непапраўнага буржуа.

А н т о н Л а п к і н с к і. Пачуцці пачуццямі, пане, а розум розумам.

Скураны (мякчэй трохі). Зрэшты, ад чыйго імя вы агітуеце — ад свайго, ад іхняга?

Антон Л а п к і н с к і. Пакуль што ад імя Віленскай Беларускай рады.

Скурай ы. Дык вось што вам, віленцам, я ма-
гу сказаць: самі мы, ветэраны руху, не пабяжым кленчыць перад пыхлівымі юнакамі, але калі яны запросяць нас, дадуць нам у Радзе не меней Ю месцаў, будуць прыслухоўвацца да нас — тады мы, мо, жа, і палічым патрэбным далучыцца да іх. Але, паўтараю, не як пасынкі, а як паўнацэнныя людзі.

На гэтым сустрэча закончылася.

У гэты ж дзень, як сказаў мне Еўзікаў, Ланкійскія спаткаліся сам-насам з Аўторкам. Пра што яны гаварылі, не ведаю: я спрабаваў тое-сёе вывудзіць у Аўторка, але ён зацяўся і нічога мне толкам не сказаў. Маўляў, Ланкійскія заходзілі развітацца».

Базыль.

## РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ

### 1

Упершыню Алесь Нямкевіч дабіраўся ў свае Янкавіны не адзін, сам па сабе, а ўдваіх. З Волькай.

Едучы ў цягніку, а пасля, са Стоўбцаў, ідучы пехатою, ён быў спакойны, жартаваў, а вось Волька была ўзбуджаная, з чырвонымі плямінамі на шчоках, а перад павароткаю, за якой абрываўся лес і былі відаць Янкавіны на блізкай, адразу за рэчкаю, горцы, нечакана папрасіла:

— Алеська, давай так: я пайду адна ў свой дом, а ты — адзін у свой...

Ён, несучы за плячыма пляцак з мінскімі падарункамі і ласункамі на дзве сям'і, сваю і Вольчыну, на хаду прытуліў яе. Стройную ў гарадскіх чорных боціках, у паліто і шапачцы.

— Увесь век свой будзем таіцца, што мы муж і нюнка?

— Некалі прызнаемся, а вось цяпер — не трэба...— сказала пра тое, што не давала ёй спакою ўсю дарогу.— Кажу ж, абгаворацць мяне: «Сама аж у Менск паляцела, без вяселля жыве...» Ды і ваіпыя не прымуцць...

— Не, не будзем таіцца,— цвёрда сказаў ён.— Няхай усе прывыкаюць, хто мы адно аднаму... А калі прывыкнуць, дык будзем мы, як і ўсе...

— Які ты ўпарты! — паскардзілася і, здаецца, заадно ўсцешылася. А калі прыгарнуў, пахапліва азірнулася вакол і дала свае халаднаватыя жаданыя вусны.

Неўзабаве ўжо ўвайшлі ў Янкавіны — яшчэ з пластамі старога снегу на стрэхах, з улеглымі гурбамі ў гародчыках і каля платоў, здаецца, вясёлыя пад перадвечаровым нізкім чырвоным сонцам і з першымі пахкімі дымкамі.

— Бачыш, пазіраюць на нас з усіх акон?! — прамовіла Волька, стараючыся ісці воддаль ад яго.

Сапраўды, пад пільнымі позіркамі мінулі засценак, увайшлі ў сяло, дзе атабарылася вялікая Вольчына радня, і хутка былі ўжо каля яе двара — у ім стаяў з лапатаю гаспадар, Вольчын бацька, Сцяпан-паліцік. Прыгорблены, са слязлівымі выцвілымі вачыма, здаецца, чарнейшы і за цыгана. Высякаў у снезе чатырохкутныя кавалкі і скідваў іх у гародчык.

— Далібог, Волька з Алесем! — здзівіўся ён, толькі тут, зблізку, пазнаўшы дачку ў нязвыклым для яго гарадскім уборы.

Усадзіў лапату ў белы з рудым пластам снег, па звычцы абпёр рукі аб вайсковыя зношаныя і палатаныя ўжо галіфэ і пайшоў насустрач.

— Што — не пазналі нас? — усміхнуўся Алесь, рукаючыся з даўнім старэйшым прыяцелем, які даўно ўлад, з малых яго гадоў, любіць пагаварыць з ім пра жыццё-быццё, пра палітыку.

— Стары, сляпы ўжо, Алеська...— паскардзіўся ён. Але, пазіраючы на спрытную дачку, усцешыўся: — Увабралася наша паненка па-гарадскому, адразу і не пазнаеш. Як і не вясковая.

Волька, бачачы, як да акна прыпалі братавым, іхнія дзеці, пакінула іх, мужчын, адных і падалася Ў Дом.

— Зайдзі і ты, Алеська,— запрасіў Сцяпан Супраневіч.— Адпачні з дарогі, навіны раскажы.

— Цяпер, каб і не хацеў, трэба зайсці...— усміхнуўся ён.

Волька — ужо на ганку, пачуўшы яго гэтыя словы, хуценька азірнулася, прыклала палец да сваіх вуснаў, а пасля борздка шмыгнула ў сенцы.

Сцяпан ці то зразумеў, ці то ўсё адчуў, але нічога не запытаў, адказаў на яго жарт ухіліста:

— Зайдзі, Алеська.

— Мы ж з Волькай, дзядзька Сцяпан, шлюб узялі. Так што я цяпер ваш зяць...

Сцяпан чамусьці засаромеўся, адвёў вочы і доўга нічога не мог сказаць. А пасля пахітаў галавою:

— Такі праўду ў вёсцы гавораць...

— Што, дзядзька?

— Ды Марыся Драздовічава нядаўна дапала ў Менск, да сястры сваёй, дык бачыла там вас. Кажа, над ручку некуды ішлі...

— Але не падышла да нас,— усміхнуўся Алесь.

— Кажа, пасаромелася.

— Ну, а вы што скажаце? Не супраць?

— Хіба я, Алеська, вораг свайму дзіцяці? Але...— нахітаў галавою.— Не пара мы вам...

— Пра гэта не гаварыце, дзядзька,— папрасіў ён.— Чым мы горшыя ці лепшыя за вас? Па адной зямлі ходзім, адну работу робім, з плоці і крыві адной.

— Здаецца мне, што твой бацька, Алеська, за гэта не пахваліць цябе,— сказаў Сцяпан.— Волька мая, нічога не скажаш, вылюднела, файная дзеўка, але ж не мае тваёй галавы, граматы.

— Дык можа мець, дзядзька Сцяпан,— падбадзёрыў старога Алесь.— Цяпер...

— Ды і вяселля мы ёй не зробім...— перажываў за сваё той.— Сам ведаеш: былі галякі галякамі, імі і засталіся.

— Абыдземся і без пышноты, дзядзька Сцяпан. Абы здароўе ды шанцаванне было! Дык запросіце ў хату ці не?

— Заходзь, Алеська, заходзь,— замітусіўся Сцяпан. Ніколі дагэтуль не разгубліваўся перад ім, а вось цяпер зніякавеў. І можа, не столькі перад ім, як перад яго бацькамі і вёскаю. Што ні кажы, Нямкевічы — адны з самых паважаных людзей у Янкавінах.

## 2

Самым надвячоркам Алесь падышоў да свайго дома. Адзін. Як ні ўгаворваў Вольку, тая не пайшла з ім. Дагэтуль паважала яго бацькоў, а цяпер збаялася іх.

У сваім ачышчаным ад снегу двары ён убачыў незвычайнае відовішча: пасярод двара стаіць іхняя чырвонай масці карова, галяндэрка, як казалі ў вёсцы, а абапал яе топчуцца бацька, Янка і пляменнік Ясік. Вось стары — у валёнках, кажуху, згорблены, як і Сцяпан,— апусціўся наколенцы і пачаў абмацваць пярэднюю нагу каровы, а Янка — у вайсковай форме, толькі без пагонаў — узяў яе за рогі. Калі наблізіўся, дык згледзеў: бацька абмацвае не нагу, а драўляную белую, ці не з бярозы, кульцю, што была замест нагі — аж да калена.

Бацька разагнуўся — Янка пацягнуў карову за рогі. Яна ступіла — добра левай нагою, а вось прыладжаную кульцю, што была за правую, не падняла і не пераставіла, а зашмаравала па доле, а пасля і прыпала на яе і збіла.

— Ну, калі ты ўжо навучышся хадзіць! — дакорліва сказаў бацька.— У цырку звяры вунь не тое даробляюць!

Гаўкнуў каля будкі рослы шэры сабака — усе павярнулі галовы і ўбачылі яго. Ад нечаканасці бацька не падхапіўся, стаяў на каленях, пакуль ён не падышоў. Упад ён, вітаючыся, падаў руку, памог падняцца.

— Госць во нечаканы...— усміхнуўся стары, атрос снег з калень. А калі ён парукаўся з Янкам і Ясікам, запыніўся нібы ў нерашучасці, загарэзаваў: — Дык ты адзін прыехаў ці не адзін?

— З Волькаю,— трошкі ніякавеючы, адказаў.

— Дык дзе ж яна?

— Дома.

— Дык праўда гэта ці не, што вы пабраліся?

— Праўда.

— А...— няпэўна сказаў бацька і, здаецца, таксама ўжо сумеўся.

— А што гэта ў вас тут? — Алесь перавёў размову на іншае, іхняе, і паказаў вачыма на кульцю.

— А ў нас тут, сын, дзялы...— уздыхнуў бацька. Але не паспеў пачаць апавядаць, бо на двор выбегла Кастуся, а за ёю выйшлі Гіполь і маці.

Кабеты кінуліся з пацалункамі, а брат пацісну́ў руку і хітнуў на карову:

— Што, не бачыў гэткага дзіва?

І тут жа:

— Ія, брат, нідзе такога не бачыў. Ні тут, ні ў Амэрыцы.

— Ну што, мама, гэтак пазіраеце? — усміхнуўся Алесь, бачачы, што маці замілавана глядзіць на яго і плюскае вачыма.

— Чысценькі, харошы...— прамовіла яна скрозь слёзы.

— Бо ўжо дагледжаны...— не то пажартаваў, не то пакпіў бацька.

— Дык гэта праўда, Алеська, што ты з Волькай Сцяпанавай сышоўся? — запытала маці.

— Праўда, мама.

Яна аж пляснула рукамі:

— Дык няўжо вучаную, сабе да пары не мог знайсці?

— Не, мама,— усміхнуўся.— Ды яна лепшая за ўсякіх вучаных.

— Дык праўду-такі людзі кажуць...— уздыхнула маці,— Нездарма яна туды палящела і адзін, і другі раз!

Алесь, бачачы, што бацькі незадаволеныя, насупіўся. Бацька, убачыўшы гэта, замаўчаў, нагнуўся, пачаў папраўляць кульцю, а маці схамянулася:

— Дык заходзь, сынок, у хату.

— Дзякуй, што не выганяеце...— узяў сябе ў рукі, усміхнуўся Алесь.

— От, не па-людску ты кажаш, сынок,— пакрыўдзілася маці, затупала ўслед за ім у хату.

Там, на кухні, ён убачыў братавых. Ядзю і Анельку. Ядзя, зноў кругленькая, з маладым агняным, а заадно і сарамлівым бляскам у вачах, заўсміхалася, падала яму руку, а Анелька нязграбная, худая, здаецца, цяжарная, збянтэжылася звыш меры. Якраз яна цяпер паліла ў печы, бо вунь на лобе і на краёчку хусткі чарнеецца сажа — відаць, даткнулася ловам да коміна, калі накладала ў печ дровы.

— Вы цяпер, мама, мусіць, толькі камандуеце...— пажартаваў, каб асвойтацца.— Вунь колькі ў вас памочніц!

— Ды жывём жа неяк, дзякуй богу,— адказала тая.

Ён, распрануўшыся, сеў каля акна і зноў міжволі зірнуў на мужчын і карову: яе зноў вучылі ісці.

— Што гэта з нашай Зязюляй?

— Гэта ж, як толькі пачаўся люты, адсюль расейцы пайшлі,— стаўшы паблізу, пачала расказваць маці.— Дзён тры ці чатыры нікога не было, самі па сабе засталіся. Нават Сяргеенкі, Лядзяш ад нас уцяклі. І аднаго дня пад вечар, калі бацька выгнаў карову, цяля, каня паіць — бух, снарад на наш гарод упаў. Як грымне, дык аж хата закалацілася, шыбы ў сенцах павыляталі. Бацька цэлы, конь, цялё цэлыя, а вось Зязюлі асколак па назе смальнуў. Перабіў косць — кроў хлынула... Божа, мой боя«а! Я — у слёзы, а хлопцы — у адно: трэба прыразаць карову, нічога з яе не будзе ўжо. Бацька — за касу, адрэзаў нагу, паваліў карову і калена яе ў снег ды ў снег, а потым пераціснуў і перавязаў... У гэты ж вечар і немцы ў вёску прыйшлі... Назаўтра бацька кажух на плечы і да іхняга конскага фельчара: так вось і гэтак, ваш снарад мне карову загубіў... Прыйшоў той, тоўсты, у акулярах, паглядзеў, па-новаму перавязаў, уколы даў і кажа: не рэяще, будзе жыць. Дык вось бацька і прыдумаў ёй кульцю з капытом, вучыць, як калеку, хадзіць...

— Ну, а як тут наводзяцца немцы?

— Ай, сынок,— махнула рукою маці.— Калі іх тут не было, дык людзі хвалілі: от яны — добрыя гаспадара, разумныя!.. Ані гэткія чэрці, як і ўсе. Грабуць усё, што трапіць пад руку, да гарэлкі, да кабет ласыя. Можа, тэж падурэлі за вайну: дома былі адны, на фронце, а тут,— другія...

— Ёсць у нас на настоі?

— Ест. Аж трое,— уздыхнула маці.— Расейцы спалі на саломе на падлозе. А гэтыя — не. Вунь,— кіўнула за печ,— парабілі тапчаны,

палаці і на іх спяць. Кажуць, на доле можна застудзіцца: захварэць на рамантуе у паясніцы ці на запаленне лёгкіх.

Пасля, калі ўлучыў спрыяльную хвіліну (нявесткі выйшлі на двор), Алесь запытаў:

— Ну, а як нашы маладыя?

— Па-ўсякаму, сынок,— уздыхнула маці.— Гіполь трохі супакоіўся, дараваў Ядзі, а вось Янак... Колькі мы ні просім, колькі ні плача Анелька, усё роўна, як толькі выпадзе, да Зосі бяжыць, а яна — да яго. Ні вайна, ні Гадэ ці пасівелыя без пары валасэ не стрымліваюць...

— Любяць яны адно аднаго, мама...

— Любяць — не любяць! Але ж у яго — яаднка, у яе — муж, дзіця...— з дакорам сказала маці.— Ні ў нас, ні ў Гарбацэвічаў ладу няма з-за іх. І вёска не хваліць. Скажу табе па шчырасці: на людзі брыдка выйсці...

«Жыццё! — пахітаў сам сабе галавою.— На добры толк радавацца трэба, што людзі так любяцца, але не, наадварот, засмучэнне, бяда ад іхняй любові...»

**3**

Назаўтра Алесь і Янка рэзалі прывезеныя за часіну шарпака бярвёны, Гіполь калоў. Ясік падносіў паленцы дзеду, а той, стоячы, акуратненька складваў іх каля сцяны хлява.

Молада, ярка ззяла красавіцкае сонца. Ад яго яснеў і вышэў свет, далёка былі відаць белае поле ды зялёны лес, вярніўся на паверхні снег, прапускаючы кроплі вады ўглыб, да скаванай лёдам зямлі. Як і трэба, у паветры збіраўся лёгкі, але галавакружны вясновы водар.

Толькі дапілавалі круглячок і хацелі пакласці на ўмерзлыя ў дол козлы новае палена, як тут, на прыгуменні, заявіўся іхні малады сваяк — унук Стася Нямкевіча. У валёначках, расхлістаным кажушку, з рагамі поту на шчоках.

— Дзядзька Янак,— прамовіў ён,— вас немяц кліча.

«Немяц» — гэта камандзір раскватараванага ў Янкавінах і Крычатах нямецкага батальёна, капітан Дзюрэр. Ён камандаваў не толькі сваімі салдатамі, але заадно і іхняй воласцю.

— Чаго там яму задрэнчыла? — запытаў бацька.

— Не ведаю,— адказаў малы.

— От уеўся! — зморшчыўся бацька, ненавідзячы гэтага Дзюрэра — вельмі нудлівага і ўедлівага чалавека, які змучыў ужо вёску пaборамі, павучаннямі і штрафамі.— Ото падаткнулі людзі!

Апошнія словы былі пра вяскоўцаў — якраз тыя выбралі Янку за валаснога старшыну. Як толькі прыпёр у Янкавіны гэты пяхотны

батальён, дык адразу Дзюрэр загадаў усім сабрацца і праз перакладчыка спачатку пахваліўся, што «Германія нясе сюды мір, волю, лад», а пасля сказаў, што ім самім трэба замест былога валаснога старшыні выбраць новага. Мужчыны з Сяла, Чорныя, як кажа бацька, і «падаткнулі» Янку, а астатнія згодна падымалі за яго рукі. Хочаш ці не хочаш, а будзь у начальстве, служы гэтаму ўладнаму кайзераўцу. Пакуль што платы за гэта ніякай, а вось клопату, непрыемнасцей шмат. То зброю збяры і аддай ім, то сена, авёс, сала і яйкі, то штрафы па людзей. Той-сёй з вёскі, плоцячы, скажам, за сваю карову, авечку, за каня альбо за ненавязанага сабаку, за не пачышчаны своечасова комін (сажа, што загарэлася... несла пагрозу жыццю нямецкіх салдат») ці за «абразу воіна вялікай Германіі», ужо вока на яго косіць, нібы «дзярэ, грабе» з іх якраз ён і сабе.

Янка моўчкі ўскінуў на плечы інынель і падаўся ў вёску. Лёгка крочыў і адчуваў: уяго не толькі акрыяў пасля ранення, але ўвабраўся ў сілу — быццам не адчувае сябе і зямлі пад сабою.

Калі выходзіў з двара, пільна папасвіў вачыма суседскую, Гарбацэвічаву, сядзібу: ці не відаць дзе-небудзь Зося? Тры дні ўжо не бачыліся, дык вельмі засумаваў па ёй — здаецца, не трое сутак, а сама меней тры гады не сустракаліся. Бо хочацца сыходзіцца, быць разам кожны дзень, кожную хвіліну. Чым болей жыве з Анелькай, мае яе за жонку, тым мацней вабіць якраз да чужой, да Зосі.

Анелька — добры чалавек. Мяккая, шчырая, працавітая і паслухмяная, хоць не зусім удалая (да ўсяго кідаецца, усё хоча зрабіць сама, але не ўсё ў яе выходзіць альбо нямала чаго марнуе сваёй похапкавасцю), здаецца, вельмі кахае яго, адданая ўжо і звыш меры. Ды ўсё роўна нялюбая.

Ён не кахаў і не можа пакахаць яе. Калі паслухаў бацькоў, згадзіўся (лепш сказаць, здаўся) узяць яе замуж;, думаў: ён не першы, не апошні на свеце мусіць »жаніцца не па любові, а з-за пасагу, з-за зямлі і грошай, пакрыху прывыкне да яе, як прывыкаюць іншыя мужчыны да сваіх нечаканых спадарожніц, тым больш што павінна зблізіць цёмная і палымяная ноч, а пазней памогуць змацаваць сямейны саюз дзеці. Але не, ночы пакуль што мала памагаюць. Можа, і таму, што Анелька як жанчына сарамлівая, няўклюдная, а то і халодная, ёй трэба найперш не што-небудзь маладое гарэзнае, а цёплае слова. З ёю блізкасць — не ўцеха, не радасць, а нейкі прымусовы, сумны абавязак. Пагэтаму, як толькі яна зацяжарыла, ён адчуў вялікую палёгку, перастаў не толькі будзіць у ёй жанчыну, але і ўвогуле зважаць на яе, душой і целам пацягнуўся да Зосі. Анелька адчула гэта, яшчэ болей

стала стрыманая, толькі ўпотай плакала, а на пачатку гэтага года з адчаю ўцякла ўпрочкі.

Калі ад маладога мужа сыходзіць жонка, гэта — канфуз, а то і сорам для яго, гэта — тэма для людскіх размоў, плётак. Звычайна мужы помсцяць сваім няверным, але Янка не помсціў Анельцы, калі бацькі схадзілі да Гарбацэвічаў і папрасілі яе вярнуцца ў сям'ю, ён быў да гэтага абыякавы. «Як усё роўна вочы пазычыў у сабакі!» — не раз ужо дакарала яго за гэта маці. Што ён мог адказаць? Хіба загадаеш сэрцу тое, што яму не мілае, хіба стрымаеш яго ад таго, чаго яно само жадае?!

Вось і цяпер тое ж: выцікоўваў у Гарбацэвічавым двары не жонку, а Зосю. Але на табе — ад сянец ідзе вунь не любая, а яго мымза. У валёнках і кажушку, нязграбная. Відаць, забягала да бацькоў на хвіліну-другую па нейкіх сваіх клопатах, убачыла з акна яго, дык хуценька выскачыла з хаты, апярэдзіўшы іншую, сваю суперніцу.

Адчуўшы, што ён неўзабаве паверне і пойдзе ў вёску, заспяшалася насустрач, з неспакоем і трывогай пачала лавіць яго позірк, нібы намагаючыся ўведаць па ім, што ў яго на душы, у думках. Яму ж не хацелася ні пазіраць ёй у вочы, ні гаварыць. Але не паспеў. Ліčы, заступіла дарогу.

Убачыў: яе патрэсканыя вусны не толькі варухнуліся, але і затрымцелі. Шчокі, хоць і маладыя, але без чырванца, пакрытыя непрыемным светлым пушком, а вось прысадзісты нос чырванавата-сіні. Нібы яна шмат п'е, хоць на самай справе не бярэ ў рот і кроплі. Лыпае рэдкімі вейкамі, маўчыць. Нанружана і непрыхільна.

— Немяц кліча,— першы загаварыў. Як і заўсёды, нешматслоўна.

Яна, здаецца, паверыла, але ўсё роўна не расслаблялася. Можа, хацела запытаць, ці хутка вернецца, можа, я«адала ад яго ласкавага слова.

Нядобрая злосць, прыкрая віна зазмагаліся ў яго сэрцы. Ну ідзі сыходзь з вачэй, не муч нямым дакорам! Не гаворыць нічога, але добра ведае, чаму ён з ахвотай сыходзіць з дому, каго жадае сустрэць у вёсцы і каму сказаць тое, што не можа сказаць ёй.

— Ну, я пайду,— сказаў,— а то Дзюрэр зазлуе.

Крануўся, пайшоў, адчуваючы, што, можа, яна і стаіць, пазірае ўслед, кусае вусны ды глытае горкія слёзы. Але ён адганяў прэч такія адчуванні, намагаўся не думаць пра яе, змушаў свае думкі перакінуцца на нямецкага каменданта.

Дзюрэр для свайго пастою выбраў самы лепшы дом у вёсцы — былое Сяргеенкава жытло. Тут ён прымаў і сваіх калег-афіцэраў, з якімі піў шнапс, гуляў у карты, а са сваімі салдатамі, з вяскоўцамі су-

стракаўся ў валасці, у кабінеце былога старшыні — яму, Янку, як «галаве мясцовага самакіравання», аддаў невялікі пакой былога пісара.

Дзюрэр, сярэдніх гадоў, худы і злы, з рыжым чубком, доўгім тонкім носам, у акулярах, важна сядзеў за сталом і курыў цыгарэту, а непадалёку ад яго прымасціўся яго днявальны-перакладчык, паляк, які ведаў і рускую мову.

— Гутэн таг, гэр Дзюрэр,— стаў у парозе Янка, зняў шапку.

Дзюрэр, не запрашаючы садзіцца, моршчачыся ад дыму, моўчкі кінуў яму складзеную татарыну. Янка, падышоўшы да стала, узяў, разгарнуў: на звычайным лістку быў дзіўны герб, які дагэтуль не трапляўся яму на вочы, а ўсё напісанае было на беларускай мове — такая цыдула прыйшла ў воласць упершыню.

— Азнаёмцеся,— сказаў яму днявальны.

Янка пачаў чытаць:

«Шаноўныя землякі, спадары!

25 сакавіка гэтага года пасланцы беларускіх партый на з'ездзе ў Мінску абвясцілі Беларускую Народную Рэспубліку, сфарміравалі ўрад.

Ваша воласць знаходзіцца ў абшарах Рэспублікі і яе ўрада. Просім Вас кантактаваць з нямецкім камандаваннем, з павятовай радай і выбраць сваю валасную раду, яе старшыню, які будзе ў вас ад імя беларускага ўрада. Заадно пачынайце, на першы погляд, з самага малога, а на справе вельмі важкага: адчыняйце беларускія школы, хаты-чытальні.

Газеты, літаратуру, новыя інструкцыі дашлём пазней.

Старшыня Ашмянскай павятовай рады».

Да ўчарашняга дня Янка нічога не чуў пра тое, што робіцца ў тым жа Мінску, але ўчора даведаўся ад Алеся пра мінскія падзеі, пра БНР. Сказаць шчыра, ён не знаў: добра ўсё гэта ці не, бо, як і бацька, не любіў палітыкі, асцерагаўся яе, намагаючыся быць далей ад таго, дзе ёю пахне. А гэты ліст — палітыка ўжо. Варта было б паказаць яго Алесю, параіцца, але не трэба яго сюды ўблытваць. Хапае яму і там, у Мінску, клопатаў.

— Ну, што скажаш? — запытаў Дзюрэр.

Янка пацiснуў плячыма.

— Германская вызвольная армія,— важна адкінуўся ў крэсле і звысоку пачаў прамаўляць Дзюрэр,— спачувае расійскім народам, не замінае ім утварыць сваё самакіраванне. Калі ласка,— развёў рукі,— фарміруйце свой валасны орган, адкрывайце сваю школу. Як перадаюць мне з павета, нямецкія ўлады гатовыя нават выдаць вам пашпарты, пісаныя па-нямецку і па-беларуску.

Янка стаяў, слухаў і не ведаў, што казаць. Гэты новы, чыста палітычны, клопат быў вельмі неспадзяваны, небяспечны.

— Чаму не рады, не дзякуеш? — накінуўся Дзюрэр.— Вы ж, абарыгены, займелі пры нас сваю краіну, свой урад!

— Я, гэр капітан, нічога не разбіраюся ў паліты-
цы,— рашыў прыкінуцца дурнем Янка.— Я зусім малой граматы.

— Ну-ну! — паківаў пальцам Дзюрэр.— Ты — не дурань! Быў у арміі, фельдфебель.

— Але не палітыкаваў. Мне загадвалі — я загадваў...

— Колькі класаў скончыў?

— Толькі дзве зімы вучыўся.

— Як — дзве зімы?

— Тут, пан капітан, такая сістэма,— растлумачыў яму днявальны.— Вучацца толькі зімою, а ў астатні час працуюць на гаспадарцы...

— Чорт вас разбярэ,— пацiснуў плячыма Дзюрэр, пазіраючы на Янку.— Ці вы сапраўды ёлупні, ці хітрушчыя, абачлівыя, як і ўсе вясковыя!

— Малаадукаваныя мы...— мямліў сваё Янка.

— Ну, а хто тут у вас як след пісьменны, разбіраецца ў палітыцы?

— Ды Дзежка,— падаткнуў Янка былога валаснога пісара, якога і цяпер, хоць той перад немцамі вярнуўся з фронту паранены, не любілі ў вёсцы. Няхай той праныра пакруціцца перад гэтым Дзюрэрам і сваімі людзьмі, хай на яго будзе іхні гнеў, а калі што якое, няхай яму дастанецца па парку.

— Пакліч яго сюды.

— Добра,— прамовіў Янка і куляю вылецеў з воласці.

Дзяжко, калі пачуў, што яго клічуць, збялеў, але паслухаў, хутка прыпёр да нямецкага начальніка.

— Ты — хто? — нават не павітаўшыся, грозна атакаваў яго Дзюрэр.

Дзяжко — лічы лысы, камлюкаваты, у світцы і вайсковым галіфэ — недаўменна залыпаў вачыма. Баязлівы з начальствам, перад немцамі — удвая.

— Беларус?

— Не,— той мігам закруціў галавою.

— Рускі?

— Не.

— Паляк?

— Не.

— А хто ж ты?

— Тутэйшы.

— Але нідзе няма такой нацыі: тутэйшыя. Калі ты, нават пісьменны, асёл, не ведаеш, хто ты, дык я табе скажу: ты — беларус. Ясна?

Дзяжко замармытаў штосьці неразборліваe.

— Добра гаворыш і пішаш па-беларуску?

— Калі трэба, дык добра.

— Вось цяпер — трэба. Ясна?

— Ясна,— выцягнуўся ў струнку Дзяжко.

— Па вачах бачу: малайчына! — ухмыльнуўся Дзюрэр. Дзяжко замёр і ўжо аддана, як кажуць, еў вачыма начальства.

— Вазьмі, пачытай,— Дзюрэр паказаў рукою на паперняў, якую нядаўна чытаў Янка. А калі той прабег вачыма па ёй, загадаў: — Раз ты тут самы адукаваны, найлепш цяміш у палітыцы, то будзеш рабіць усё, што тут напісана. І, галоўнае, павінен кантактаваць з намі, памагаць ва ўсім. Думаю, ваш вясковы люд згодзіцца, каб якраз ты ўзначаліў воласць. Гэты таўкач,— кіўнуў на Янку,— малапісьменны, не кеміць у палітыцы... Ясна?

— Ясна,— здранцвела адказаў Дзяжко.

— Усё, ідзі,— махнуў рукою Дзюрэр.— Сёння падумай, што будзеш рабіць і як, а заўтра пасля абеду збірайце люд, будзем пераўтвараць вашу ўладу.

Дзяжко выйшаў з кабінета збялелы, не ведаў, ці яму радавацца, ці засмучацца, а Янка пасміхоўваўся сам сабе ў рукаво. Яму, калі паказаўся на вочы Дзюрэру, можна было ўжо ісці дадому, але ён наўмысна затрымаўся ў воласці, у сваім кабінеце. Каб увечар сустрэць тут Зосю — камендант і яго памочнік, як звычайна, пабудуць тут яшчэ з паўгадзіны ды паваланцца дадому.

Калі пасля шэрані пачала гусцець цемень, ён, як і заўсёды вось у такія хвіліны, не запальваў святла. Не трэба, каб кідалася людзям у вочы, каб забрыў хто і завёў гавэнды, каб не падкраўся да акна. Стаяў каля ліштвіны і з хваляваннем узіраўся на вуліцу: Зося ідзе ці не? Спачатку, пакуль можна было тое-сёе ўгледзець, бачыў рэдкіх вясковых прахожых, нямецкі начны патруль, які тэпаў з канца вёскі ў канец, а потым, калі наваколле нібы накрылася чорнай коўдрай, быццам аслеп, нібы застаўся адзін на вялікім свеце са сваім наданнем. Яно з кожнаю хвілінаю ўзбуджалася, захліствала, дык ад яго аж трымцелі ногі, рукі ды суха палалі шчокі.

Нечакана мацней забілася сэрца: здаецца, з вуліцы, сюды, у двор, мільгануўся цень. Ага, хтосьці крочыць: чуваць, як хрумстка рыпіць снег. А вось ужо чалавек каля будыніны. Яна. Зося.

— Нарэшце! — выдыхнуў ён, калі адчыніў дзверы і ўпусціў яе ў зборню.

Яна прыхілілася, паклала галаву яму на грудзіну і нічога не сказала — аддыхвалася. Ён трымаў у абдымках яе, халодную з марозу, жаданую, і аж не верыў сам сабе, што дачакаўся гэтай непаўторнай і дарагой хвіліны, што зноў з ёю побач. Калі яны разам, дык нібыява, а калі зноў паасобку, дык заўсёды здаецца: не, не было той явы, быў і ёсць толькі сон альбо нейкае адмысловае трызненне.

Яна, утаймаваўшы дых, а заадно і хваляванне, падняла галаву — і яны, не змаўляючыся, прыпалі, замёрлі ў доўгім прагным пацалунку. Спачатку яе вуспы былі халодныя, сціснутыя, а пасля раскрыліся, сталі слодычна гарачыя; ад пацалунку і ў яго і ў яе ўспламяпілася, забушавала маладая ўзбуджаная кроў.

— Ой! — адарваўшыся, шчасліва выдыхнула Зося.— Аж дыханне забівае!

— А ты так позна! — мякка падакараў ён.

— Калі ж і нашы ўсе, і твая каза вачэй не спускалі...— паскардзілася.— Абы вазьму якую ражку, каб выйсці на двор, дык тут як тут свякроў: пасядзі, я сама вынесу...

Янка накінуў на дзверы кручок, і яны, як змоўшчыкі, добра ведаючы дарогу і ў цемені, пайшлі ў яго цёплы, нагрэты ад грубкі кабінет — Дзюрэр любіў цяпло, дык змушаў яго, каб грэлі воласць кожны дзень.

— Аж галава забалела, гэтак цябе чакаў...— прашаптаў ён, ловячы яе рукамі. Праз якую хвіліну-другую, калі іх зноў з'яднаў пажадны пацалунак, і на іх невядома як уяю расшпілілася верхняя вопратка: на ім — шынель, на ёй — канюшок, ён з трапяткім хваляваннем адчуў, а таксама «ўбачыў» рукамі яе ўсю. Закручаныя ў куклу косы пад хусткаю, у меру даўгаватую прыгожую шыю, пакатыя плечы, гнуткую спіну, ладныя клубы, тугія грудзі, якім зусім песна яшчэ пад дзявочай блузачкай. Ад яе такога блізкага, знаёмага, успламянёнага цела ён усё больш і больш хмялеў, страчвала свядомасць ад яго такога бурнага парыву і яна, толькі, калі выпаў міг для перадышкі, прашаптала з надрывам:

— Яначак... Залаценькі і любімы мой чалавечак!

Пасля яны нібы назмагаліся. Не, яна нават і не
думала не падпусціць яго, яна, тое-сёе ўжо ведаючы як жанчына, спрабавала трошкі астудзіць, каб ён раптоўна не згарэў у гэтым маладым, незямным полымі. Ён адчуваў гэтае патрэбнае і ёй, і яму мудрае стрымліванне, але яму было цяжка, нават невыносна чакаць. Таму ён усё роўна спяшаўся, зусім п'янеў, гарэў, а пасля аж увесь

затрымцеў, калі яны апынуліся на ягоным канюху, калі ён мог, што хацеў, дазволіць сваім рукам і калі ён пачаў быццам падаць у бездань, а на самай справе ўзлятаць высока-высока...

Будыніна, ноч, свет ці то завіхурылі, ці то сарваліся і дзесьці зніклі — мояга, і за край зямлі, у апраметную. Тым больш што раней у гэтыя хвіліны Зося была скаваная, саромелася ці дакарала сябе, а цяпер вось адразу адгукнулася ўсім целам, дала волю сваім пачуццям, жаданню і, не вытрымліваючы таго страснага, жаданага і ў той жа час спапяляльнага, што абрынулася на яе, застагнала:

— Ой, Яначак, памру я... Паміраю... Ой, любы...

Ён жа, адчуваючы дзівоснае ўзрушэнне, а то нават і апіаломліванне, звышчаслівы ад яе гэтага шэпту, якога ён ніколі яшчэ не чуў ад сваёй Анелькі, далікатна, гуляючы, абрушваў і абрушваў на яе лавіну новых адчуванняў і пачуццяў, намагаючыся нібы згарэць у сваім каханні...

## 4

Ціхія, заклапочаныя ўбачаным у сваіх сем'ях і перажытым, з нейкім новым пачуццём Алесь і Волька вярталіся ў Мінск.

Сядзелі ў халодным і паўпустым вагоне насупраць адно аднаго, амаль не гаварылі, больш пазіралі ў акно — на лес, на вяршках і на ствалах якога ўжо не было снегу, на пацямнелы ад сажы дол на ўзбочыне, на заснежаныя, але ўжо вясновыя луг ці поле, на вёскі з лянівымі дымкамі,— і ўсё гэта ўзрушвала, клікала да новага жыцця, адрываючы ад таго, што было, што цяпер ёсць у іхніх Янкавінах.

Зірнуў на Вольку: па яе маладых, свежых, з прыемным чырванцом шчоках ціха коцяцца раўчуком дзве слязіны.

— Ты — што? — усміхнуўся ён, выцер гэтыя боль ці ўзрушэнне душы.

Яна схамянулася, залыпала павекамі, усміхнулася, злавіла яго руку і далонню прыклала да сваёй шчакі.

— Колькі на свеце нешчаслівых людзей, Алеська...— прамовіла.— А я вось такая шчаслівая!

Невядома, ад чаго яна пачулася такою шчаслівай. Ці ад таго, што на днях яго бацька сам схадзіў да іх, прывёў у сваю хату яе з бацькам, цёпла сустрэў, падакляраваў зрабіць ім вяселле, ці ад таго, што едзе з ім у горад, дзе па-свойму цяжка, але ўсё ж лягчэй, чым у Янкавінах.

— Цьфу-цьфу! — стрымаў яе радасць, хоць сам дужа ўсцешыўся, што Волька не толькі пайшла з Янкавін, але за гэты час, як і ўсе сказалі ў вёсцы, пахарашэла, пакруглела, набрала мілай жаночай

вабнасці. І яму з ёй нібы нанава адчыніўся, палагоднеў і падабрэў свет. Усё ж, што ні кажы, любімая жанчына не толькі мяняе жыццё, свет, але і надае высакароднасці. Ад яе пяшчоты, кахання ты зусім іншы чалавек.

— Я і сама, Алеська, баюся, што гэтакая шчаслівая,— прашаптала яна, з любоўю пазіраючы на яго.

— Кажу ж, не гавары пра гэта. Лепш памаўчы.

— Маўчу-маўчу,— а сама зноў заплюскала павекамі, і зноў з яе вачэй выплылі слязіны.

— Кажаш, што шчаслівая, а сама плачаш.

— Ды гэта ж, Алеська, ад радасці і заадно ад нейкай скрухі...

— Як бы там ні было, не плакаць!

— Не буду,— прашаптала, мацней прыціскаючы да шчакі яго далонь.

У Мінску, на пероне Брэсцкага вакзала, пры слабым святле ліхтара ўбачылі нямала нямецкіх салдат з вінтоўкамі. Праўда, тыя іх не чапалі, не заміналі заходзіць у сярэдзіну станцыі.

Але там, у добра асветленым праходзе, дзеелася штосьці незвычайнае: пажылы высокі нямецкі афіцар у шынялі і высокай фуражцы: ўчэпіста акідваў іх, пасажыраў, позіркам: адных пускаў ісці далей, у горад, а іншым паказваў рукою адысці ўбок. Змусіў збочыць і іх, Алеся ды Вольку.

Калі падышлі да гурту затрыманых, то згледзелі: сярод іх адна моладзь. Штосьці насцярожанае і нядобрае паласнула па сэрцы. І Волька адчула няладнае, нібы шукаючы абароны, прыціснулася да яго.

— Што гэта яны робяць, Алеська? — пасля і запытала з боязззю. Нібы ён усё ведае.

— Можа, будуць правяраць нашы дакументы ці рэчы? — паціснуў плячыма.

— Але чаму выпускаюць каторых?

І ў гэтую хвіліну ён згледзеў знаёмага чалавека. Адася Аўторка з іхняй, беларускай, камендатуры. Той стаяў на выхадзе са сваім чалавекам.

Адчуўшы яго позірк, Адась Аўторак з хвіліну-другую пастаяў, пазіраючы на афіцэра, а калі той захапіўся сваім, хуценька падышоў.

— Ідзіце за мною,— ціха прамовіў.

Чуючы, як нібы малатком малоціць сэрца, Алесь падаў руку Больцы і шпарка пайшоў за Аўторкам, які вывеў іх на скупа асветленую прывакзальную плошчу, на якой поруч, адзін каля аднаго, стаяла некалькі грузавікоў з высокімі бартамі.

— Уцякайце адгэтуль,— сыкнуў Аўторак.— Іначай паедзеце на работу ў Нямеччыну...

Алесь і Волька без лішніх роспытаў шпарка падаліся ўздоўж будыніны далей ад вакзала.

5. З дакладной Васілевіча Мінскаму падпольнаму раённаму камітэту РКП (б)

«Вось копія тэлеграмы нямецкаму імператару Вільгельму, якую вышле Рада БНР 25 красавіка:

«Рада Беларускае Народнае Рэспублікі, як выбраная прадстаўніца Беларускага Народу, звара-
чаецца да Вашай Імпэратарскай Вялікасці з словамі глыбокае падзякі за вызваленне Беларусі нямецкімі войнамі з цяжкага ўціску, чужога пануючага здзеку і анархіі.

Рада Беларускае Народнае Рэспублікі дакляравала незалежнасць цэлае і непадзельнае Беларусі і просіць Вашую Імпэратарскую Вялікасць аб абароне ў яе кіраваннях дзеля ўмацавання дзяржаўнае незалежнасці і непадзельнасці краю ў сувязі з Германскай Імпэрыяй.

Толькі пад абаронаю Германскай Імпэрыі бачыць край сваю добрую долю ў будучыні».

Заадно зазначаю: Аўторак, Лашковіч, Скураны, Жытнік, Пячэрскі і іншыя складалі гэтую тэлеграму ў глыбокай тайне ад многіх. Цяпер, калі пра яе ведаюць усе, той-сёй, скажам, Баравік, пратэстуюць.

Па ўсім адчуваецца, што ў беларускім нацыянальным руху тут, у Мінску, адбудзецца раскол...»

Базыль.

## Частка другая. БССР

Гары ж, агонь Кастрычніка, гары!
Свой промень зыркі раздувай.
Няхай ёнззяе з краю ў край!..
Хто спіць да гэтае пары —
Уставай!

*Цішка Гартны*

### РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

**1**

Імжэў халодны і нудны кастрычніцкі маскоўскі дождж.

Кожная пара года мае сваю вабнасць. Стылая, мокрая восеньская часіна — таксама. Бывае, якраз тады хочацца выйсці з цёплай, але цеснаватай і душнай кватэры на свежы двор і памаленьку ісці ды ісці кудысьці, любавацца хоць і гарадскімі, падрэзанымі, акалечанымі, але ўсё роўна прыгожымі жоўтымі, амаль азалочанымі дрэвамі, шуршэць па апалым зрудзелым лісці і думаць-думаць пра запаветнае альбо ўвогуле ціха брысці, адчуваючы лёгкую прыемную самоту. І золь, і бесперапынная, няласкавая склізата не замінаюць, не прытомліваюць — наадварот, спрыяюць засяроджанасці і супакойванню душы. Што ні кажы, па-свойму адмысловае, спрыяльнае і сырое, халоднае восеньскае надвор'е.

Але цяпер Зміцеру Жылуновічу было дрогка, нявесела, калі не больш — маркотна, і многае вакол, да чаго раней ён быў цярпімы, проста мучыла яго: нізкае цяжкое неба, вымыты сцюдзёны брук, шэрыя, а то і вельмі ж чырвоныя, ледзь не крывавыя сцены камяніц, увогуле агромністы чужы горад. Хоць у іншыя, весялейшыя, хвіліны гэтая Красная плошча з блізкім велічным Крамлём ды з прыгожым саборам не толькі падабалася, але больш — штосьці высокае і ўрачыстае падымала ў душы. Сёння — не. Зараз усё тут было нейкае недасяжнае і далёкае. Канечне, вуліцы, будынкі тут ні пры чым, якімі былі, такімі і ёсць, ва ўсім вінаваты яго кепскі настрой, які гняце, нават глыжа цяжкім каменем душу і ніяк не хоча мяняцца на іншы, хоць бы на кропельку лягчэйшы.

Як ні гнаў прэч душэўную згрызоту, але якраз з ёю прыйшоў дадому. Не запальваючы святла, марудна скідаў у цёмным калідорчыку намоклае паліто, вешаў капялюш — побач каля Алесевага шыняля: сусед, Чарвякоў, выходзіць, дома. Яны, Жылуновіч і Чарвяковы, жылі тут, у Маскве, у адным пакоі, адгароджаныя толькі паркалёвай шырмай.

— Кто там пришел? — пачуўся гарэзны Надзеін голас, а неўзабаве яна ступіла сюды, у цёмны закутак, і запаліла святло.

Абапіраючыся адной рукой на сцяну, а другой расшнуроўваючы чаравік на паднятай назе, ён намагаўся ўсміхнуцца, але Надзея, трымаючы на руках паўтарагадовую дачку, усё роўна з трывогаю запыніла позірк на яго вачах: што здарылася?

— Добры вечар, мае мілыя,— падбадзёрыў жонку, а калі скінуў чаравікі, прытуліў па-ранейшаму стройную, але прыкметна ўжо па-жаночаму акруглелую ў плячах ды руках Надзею, пацалаваў у мяккую шчаку. Дачка, коратка пастрыжаная, у суконачцы і мякенькіх тапачках, мігам абшчапіла яго за шыю і перабралася яму на рукі:

— Папа! Папа!

— Ну што, харошая мая, чакала? — запытаў, гаворачы, як кажуць, з французскім прононсам — карацей: трошкі ў нос.

— Чакаля,— залепятала тая. І зноў: — Папа! Папа!

— Действительно: вылитая папа!— усцешылася Надзея, папраўляючы на сабе паношаны, але чысценькі зеленаваты, з белымі кветачкамі халат.

— А мне здаецца: вылітая мамка,— прамовіў ён, які ўжо раз радуючыся, што японка вельмі задаволеная, што іхняя Галінка ўдалася ў яго — значыць, будзе шчаслівая, як і трэба быць шчаслівай дачцэ, падобнай на свайго бацьку.

— Нет — папка! Этакие Я№ оттопыренные губы, широкие ноздри!

— Не — мамка. Татка лысенькі, а наша Галінка гэтакая бялявая, як і мама.

— А что наш отец такой грустный? — нібы ад дачкі, жартуючы, а на самай справе ад сябе занепакоена запытала Надзея. Хоць пакрысе за час іхняга знаёмства, сямейнага жыцця вучылася гаварыць пабеларуску, але ў хвіліны вялікага ўзрушэння размаўляла па-руску, як і кожны, хто толькі блізкімі
словамі можа найлепш выказаць свае найтанчэйшыя пачуцці.

І, счакаўшы, дадала:

— Опять неприятности, Дима?

— Чаму ты думаеш, што ў нас павінны быць толькі адны непрыемнасці? — пагарэзаваў, хоць многія, хто мала ведае яго, лічаць: ён — чалавек панурысты, а то і злы ды помслівы.— Не, у нас усё добра.— Падкінуў дачку ўгору і, бачачы, што тая аж заплюшчыла вочы ад нечаканасці, прытуліў яе і пацалаваў.— Быць не можа, каб мы былі няўдалыя, каб нам увесь час не шанцавала!

— Дай бог,— уздыхнула Надзея і накіравалася на кухню. Яна, ужо вывучыўшы яго характар за той час, што не толькі жыве разам, але і

побач з ім працуе ў выдавецкім аддзеле Белнацкома, не паверыла, што ў яго сёння ўдача, бо душой адчула яго маркоту. Але ведала: ён не той чалавек, каб яго было лёгка збіць з панталыку альбо змусіць здацца і апусціць рукі. Мала што дробны, на выгляд без вялікай мужчынскай сілы, невысокі, але на самой справе дужы, з мускулістымі рукамі, ад гарбарскай працы, акуратны, настойлівы і рашучы.

Пачуўшы іхнія галасы, з-за шырмы, што дзяліла пакой на дзве палавіны, выйшаў Чарвякоў — высакаваты, прысадзісты, нават нібы камлюкаваты, з кучомкаю вусоў пад носам, з вялікімі залысінамі, які ўжо час (з ліпеня) у вайсковай форме Чырвонай Арміі. Ён таксама пільна зірнуў у вочы і, хоць маладзейшы, але настаўнік па прафесіі ды ўжо вучаны-правучаны, дык, здаецца, адразу адчуў прыгнечаны стан яго душы.

— На, кінь адным вокам,— сказаў Жылуновіч і, пакуль не было тут жонкі, хуценька выцягнуў з кішэні складзеную газету «Звезда» і падаў яму.— Хоць тое, што абведзена чырвоным алоўкам.

А ў чырвонай рамачцы, якую ён абвёў сам, было такое: «Мы считаем, что белорусы не являются нацией и что те этнографические особенности, которые их отделяют от остальных русских, должны быть изжиты. Нашей задачей является не создание новых наций, а уничтожение старых национальных рогаток. Белорусское же движение является таким воздвижением новых национальных рогаток, не существовавших до сих пор, а поэтому коммунисты не могут в каком бы то ни было виде принимать участие в этом движении».

Прабегшы па гэтым вачыма, Чарвякоў (а ў яго ў гэты час нервова захадзілі жаўлакі) выпрастаў газету: хто ж аўтар такіх «прыемных» і «зычлівых», знаёмых да надакучлівасці і прыкрасці радкоў? Ды сакратар Паўночна-заходняга абласнога камітэта РКП (б) Кнорын. Адзін з тых, хто зусім нецярпімы і да Белнацкома, і да «Дзянніцы».

— Ні на крок не адыходзяць ад сваёй лініі,— зашаптаў з крыўдай і болем Жылуновіч.— Белнаком[13] многія бежанскія і салдацкія камітэты па ўсёй Расеі пачалі дабівацца Савецкай Беларусі, а ён, як той дзяцел, дзяўбе і дзяўбе толькі адно: няма, не трэба ніякіх беларусаў — і ўсё! Не падымаць прыгнечаныя нацыі, а дарэшты дабіваць іх!

Чарвякоў моўчкі чытаў далей.

— І пасля гэтага ён — сапраўдны камуніст-інтэрнацыяналіст?! Прыносіць рэвалюцыі, партыі толькі карысць?!

Чарвякоў схмурыў лоб — на пераноссі паглыбіліся тры задуменныя шчыліны.

---

[13] Тагачасны варыянт назвы Белнацкома.

— Хадзіў з гэтай газетай да Сталіна,— Жылуновіч выказваў свой гнеў.— Хацеў абурыцца: Ленін, РКП (б) за самабудаванне народаў, вы, таварыш Сталін, таксама нібы не супроць, дык чаму і цяпер такое дазваляюць сабе Мяснікоў і яго аднадумцы? Ім што — партыйная лінія неабавязковая альбо ім хтосьці дазволіў эксперымент над намі? Не прыняў. Ён, фыркнула мне машыністка-сакратарка, вельмі затурбавалі і не мае часу разбіраць нашы спрэчкі. А Мяснікова, кажуць, учора дапусціў. І гаварыў з ім не адну гадзіну. Лёгка, як мы добра бачым, трапляе Мяснікоў і да Свярдлова, Троцкага, Дзяржынскага, Пятроўскага...

— Я спачатку думаў: Мяснікоў, Калмановіч, Кнорын, Берсан, Ландар, Алібегаў і іншыя абруселыя іншародцы — незвычайныя людзі. Перамаглі свае нацыянальныя пачуцці і шчыра хочуць інтэрнацыялізаваць усе народы для светлай будучыні,— нібы марудна, а на справе разважліва падаў голас Чарвякоў, садзячыся за стол, на якім стаяла карычневая ваза з галінкаю яшчэ не зусім распушчанага блакітнага зімародка.— Але пачаў прыглядацца, дык пакрыху ўбачыў і іншае: па-першае, яны вельмі ж спяшаюцца, гоняць усіх у інтэрнацыянальны рай сілком, а па-другое, адчулі немалы сверб да ўлады... Канечне, у 1917-м у Мінску, узяўшы ў свае рукі Савет, міліцыю, бадай, і паўтарамільённы Заходні фронт, яны зрабілі нямала для рэвалюцыі, для абароны Петраграда і Масквы. Але ў Смаленску з першых дзён побач з агульным пачалі абачліва дбаць і пра сваё месца пад сонцам: адразу кінуліся-рынуліся ліквідоўваць супернікаў у асобе Смаленскага, Віцебскага і Магілёўскага губвыканкомаў. Маўляў, эканамічныя патрэбы, новая савецкая з'ява патрабуюць, каб іх не было, а вось ім, абласному аб'яднанню, трэба ўмацавацца! У гэтым свербным парыве на сваім II з'ездзе Саветаў нават аб'явілі абласны выканком вышэйшым заканадаўчым органам Савецкай улады ў Заходняй вобласці, пасягнуўшы па тое, што павінна ісці толькі з цэнтра. Хоць Масква стрымлівае, ушчувае: таварышы, хопіць валтузні, хопіць дзяльбы ўлады, ёсць шмат і важнейшых клопатаў, але яшчэ і ў верасні на У Паўночна-заходняй абласной канферэнцыі яны дыскутавалі пра свае, дабіваючыся, каб усё ж падпарадкаваць Віцебск і Магілёў. Таму яны цяпер супраць і Белнакома, і нашай ідэі. Добра ведаюць: Заходняй вобласцю ці камунай будуць кіраваць якраз яны, а вось Беларуссю — можа, і не. Можа, прыйдзецца і саступіць карэнным. З-за гэтага супроць нас і кіраўнікі Віцебскага ды Магілёўскага губвыканкомаў. Асабліва ў Віцебску, дзе, як і ў Смаленску, нават чуць не хочуць пра Белнаком.

— Мяснікоў ідзе на ўсё, абы ўзаконіць юрыдычна Заходнюю вобласць,— прамовіў Жылуновіч.— Гаворадь, апошні час абівае парог у Народны камісарыят унутраных спраў, да Пятроўскага...

— Да Сталіна ўсё ж трэба трапіць...— уздыхнуў Чарвякоў.— Трэба часцей паказвацца на вочы, гаварыць і гаварыць, што канфрантацыя паміж Смаленскам і намі — не на карысць Савецкай уладзе, міру, ладу ў краіне...

— Толькі што — паказацца на вочы...— цяжка выдыхнуў Жылуновіч.— Большага ад яго не даб'ешся! Наставіць жоўтыя, па-тыгрынаму прыплюшчаныя вочы, не варухнецца, пазірае, як на сваю ахвяру, а потым ні з таго, ні з сяго сякане: «Нэт! Вы нэправільно панымаеце камуністычаскія задачы. Что — Ленін? Что — лутшэ перасаліць, чым недасаліць? Старык нэмножка ліберальнічает у нацыянальным вапросе...»

— Каб Ленін быў здаравейшы, каб не столькі меў турбот — дык, можа, зноў бы прыняў нас і як след памог бы. Нават змусіў бы Сталіна не гуляць у кошкі-мышкі з намі, а рабіць усё сур'ёзна.

— Цяжкі чалавек гэты Сталін,— пахітаў галавой Жылуновіч.— Вельмі хітры, няшчыры і грубы. На вялікае дабро ён, здаецца, не здатны.

Чарвякоў змаўчаў, а Жылуновіч не стаў болей гаварыць пра таго, з кім колькі разоў сутыкаўся і не меў вялікай радасці ад гэтых сустрэч — спярша, на пачатку года, калі яны перасталі пратэставаць супраць разгону Усебеларускага з'езда, цалкам прызналі Савецкую ўладу і пачалі супрацоўнічаць з ёю, Сталін наводзіўся міралюбна, падоўгу гутарыў з Чарвяковым, Скарынкам і з ім, распытваючы пра незнаёмую яму Беларусь, але пазней, калі яны ўзяліся дабівацца самавызначэння праз Белнацком, рэзка пахаладнеў. А ў маі, калі нечакана з-за асабістага ўспыхнула перапалка паміж кіраўнікамі Белнацкома, паміж вось гэтым Чарвяковым і Скарынкам, якраз Сталін спрытна спажыў такую сітуацыю: абодвух, непрыхільных яму, прагнаў, а на іх месца ўссадзіў эсэра Семяновіча, наладзіў праверку і ўзяў усю іхнюю работу пад свой пільны назірк. Яго людзі, лічы, не давалі кроку ступіць без іх згоды. Толькі пасля таго калі ў ліпені новы галава Белнацкома Усціловіч на чале іхняй бежанскай дэлегацыі пабываў у Леніна, расказаў яму пра беды і клопаты Белнацкома, яго барацьбу за Савецкую Беларусь, з іх знялі цяжкую апеку, што памагло ім тое-сёе зрабіць як след. А зрабілі яны не так уяад і мала: славілі Кастрычніцкую рэвалюцыю і Савецкую ўладу, развейвалі чуткі, што «бальшавікі прадалі Беларусь», заклікалі беларусаў трымацца за Расію і разам з ёю шукаць волі, пасылалі ў неакупаваныя і акупаваныя беларускія паветы агітатараў,

брашуры, заснавалі свой народны універсітэт, школы на роднай мове ў Петраградзе і Маскве, навукова-культурнае таварыства, паспрыялі (разам з беларускім бежанскім камітэтам на чале з Язэпам Дылам) не адной тысячы сваіх землякоў з больш чым двухмільённай арміі бежанцаў на сяўбу і сенакос вярнуцца на радзіму, прамацалі амаль усю еўрапейскую Расію, каб абсачыць, дзе тут і што вывезенае з Беларусі, апісаць і падрыхтаваць да звароту. Як выявілася, толькі адных навучальных устаноў было больш за 200. Хацелі выдаць нямала кніг па беларускай гісторыі, культуры, збораў твораў мастацкай літаратуры, слоўнікаў, падручнікаў, але на ўсё не хапала ні грошай, ні паперы. Ды болей за гэта засмучала іншае — непаразуменне з Мясніковым і яго штабам. Тыя не толькі не зважаюць, але і завальваюць іх каменнямі: маўляў, вы, як і вашы ў Мінску, буржуазныя нацыяналісты... Яшчэ ў чэрвені яны ліквідавалі нацыянальны аддзел пры выканкоме Заходняй вобласці (маўляў, «вносят разлад в работу краевой Советской власти, порождают национальную рознь и разбивают единый национальный фронт»), а ў верасні на новым з'ездзе Саветаў з выклікам адмовіліся нават пагаварыць пра Беларусь хоць бы ў якой форме, прынялі новае найменне — Заходняя камуна. Рэзка адмовіліся і ад таго, каб выдаваць у Смаленску газету на беларускай мове — «Рунь» (такую назву ён прыдумаў разам з Максімам Гарэцкім). Больш таго — кажуць, задумалі мецъ у Заходняй камуне і літоўскія землі, зусім не турбуючыся пра думку саміх літоўцаў. Карацей, не толькі словам, але і справаю ваўсю знішчаюць «национальные рогатки».

Зайшла Надзея, несучы місачку сасмажанай бульбы і талерку хараша, наўскасяк, парэзаных гуркоў.

— Падсілкуйцеся,— усміхнулася. І яшчэ гарэзна: — Не засмучайцеся ад малога прыкрага, бо наперадзе яшчэ вялікае прыкрае...

— Можа, і так, Надзя, — прызнаўся, уздыхам выдаў душэўны боль Жылуновіч. І пасля, калі жонка падала ім хлеб, ужо не баючыся замаркоціць яе, чуллівую і мяккую, адкрыта загаварыў пра сваё:

— А пра ўсё тое, што мы нядаўна гаварылі, я вось што думаю, Алесь. Па падпісанай РСФСР і Германіяй 27 жніўня Дадатковай дамове, па якой немцы будуць браць грошы і паступова ачышчаць захопленыя землі, а таксама па ўсім тым, што робіцца ў Расеі, што выбухае ў Германіі, відаць: немцы рана-позна адкоцяцца назад з Беларусі. Рада БНР без іх падзе адразу. Па-другое, з ёю альянсу ўжо не можа быць. Калі і рэальна як-небудзь ці калі-небудзь дабіцца Беларусі, то ўжо толькі нам. Але беларуская секцыя пры Петраградскім РКП (б) далёка адсюль, слаба звязана і з цэнтральным урадам, і з Белнакомам — значыць, адна яна воз не зрушыць і на савецкім

грунце. Бальшавіцкая фракцыя пры Белнакоме без статуса не шмат можа. Адпаведна, трэба зноў і тэрмінова збіраць бальшавікоў-беларусаў якраз тут, у Маскве, згуртаваць з іх моцную маскоўскую арганізацыю, чэпка ўзяць у свае рукі Белнаком і праз нашых гэтых партыйцаў дабівацца рэспублікі. Без свайго моцнага бальшавіцкага ядра жаданага мы не даб'ёмся, аддадзім яго ў рукі смаленцам. А тыя ўжо свайго не ўпусцяць...

Надзея ўзяла ад яго дачку — каб тая не замінала бацьку і есці, і гаварыць. Нават жэстыкуляваць рукамі, каб лепей выказаць сваю думку.

— Заадно трэба ўмацаваць, належна настроіць нашы партыйныя арганізацыі ў Самары, Тамбове, Казані. Як толькі выпадзе зручная хвіліна, варта адразу ж сабраць сумесны сход і разам сказаць сваё слова. Думаю, тады думку агульнага сходу беларускіх камуністаў будзе няпроста ігнараваць. І Сталіну, і Мяснікову.

— Я таксама, Змітрок, пра гэта думаў,— сказаў Чарвякоў.

— Ну, а Мінск — малая падмога нам... Там нашы былыя сябры і сябе апаганілі, і нас паставілі ў цяжкі стан, рух раскалолі на непрымірымыя часткі, у рэшце рэшт прывялі да ўлады пана Скуранога, даўшы такі магутны козыр нашым незычліўцам...

— Але ж хтосьці і з Мінчукоў інфармуе пра ўсё Смаленск, а той — Маскву,— сказаў Чарвякоў.— Значыць, не ўсе там верай і праўдай служаць акупанту, здрадзілі Расіі... Недарэмна ж многія з БСГ запратэставалі супраць уніжальнай тэлеграмы кайзеру, пакінулі лідэраў у адзіноце і ўтварылі новыя партыі, а той-сёй, як адчуваецца, супрацоўнічае нават з бальшавіцкім падполлем.

— Па Мяснікову і Сталіну — там усе нашы чэрці адной шэрсці,— ядучы і ў хваляванні амаль не чуючы смаку, прамовіў Жылуновіч, які і сам шмат напісаў, і іншых нямала прасіў напісаць рэзкіх слоў пра БНР у «Дзянніцу», перадрукоўваў яе дакументы, каб выкрыць цалкам, хоць і гэта не выратавала яго ад папрокаў.— А што да смаленцаў, то напішу адказ. Проста і ясна скажу: камуністам так паводзіцца няможна!

**2**

Іосіф Лагун прыйшоў у Народны камісарыят унутраных спраў РСФСР, каб сустрэцца з наркомам Пятроўскім. Але ў прыёмнай рыжы малады мужчына ў паўвайсковай форме сказаў, што таго цяпер няма ў камісарыяце, а калі яшчэ спытаў, чаго ён прыйшоў, адаслаў у належны аддзел — «там вам все объяснят».

Патоўкшыся з гадзіну ў невялікай прыёмнай, дзе стаяла некалькі крэслаў, а наведвальнікаў было удвая болей, да драбніц вывучыўшы плакат, дзе была намалёваная перакрэсленая чырвонымі рыскамі запаленая цыгарэта і былі словы «У нас не курят!», а таксама стол і маладую сакратарку-бландзінку за ім, Лагун, як прыйшла яго капейка, трапіў туды, куды яго паслалі. У невялікі, але ўтульны кабінет з партрэтам Карла Маркса, масіўным, але прыгожым рудым сталом, да пажылаватага чарнявага апранутага ў скураную чорную куртку і перапаясанага рамянямі мужчыны, які, курачы і моршчачыся ад дыму, складаў паперы ў папцы.

Падняў галаву, з асалодай зацягнуўся і тут жа на згорнутай газеце патушыў цыгарэціну.

— Садитесь,— ветліва паказаў на мяккае, хоць ужо трохі выцертае крэсла каля свайго стала, загарнуў папку.— Слушаю вас, товарищ.

— Дзякую,— схіліў галаву Лагун. Сеў. Узбуджана зацерабіў у руках макраватую рабочую шапку з глянцаваным чорным брылём, нацэліўшыся гаварыць пра тое, што ўчора абдумалі з Жылуновічам і Чарвяковым у іх на кватэры.— Я — загадчык Белнакома пры Наркамнаце РСФСР. Спадзяюся, чулі пра такі?

— Чуў,— спакойна адказаў гаспадар кабінета, учэпіста прыплюшчыў трохі такатныя чорныя вочы.

Дасюль не сустракаліся. Па-першае, не было выпадку, бо мала наведваліся сюды, часцей абівалі парогі ў іншых паркаматах — у Луначарскага, землякоў Бонч-Бруевіча, Лепяшынскіх — па клопатах, што тычыліся культуры, выдавецкіх турбот, а па-другое, Лагун толькі лічыўся загадчыкам Белнацкома, але мала кіраваў ім, апошні час шмат бываючы ў Петраградзе са справаздачамі, у іншых расійскіх гарадах, дзе было шмат іхніх бежанцаў, у Оршы, па прапускным пункце, а таксама ўпотай і ў акупаванай Беларусі. Белнацкомам, Молена сказаць, кіраваў іншы — Жылуновіч.

— Я ўпаўнаважаны заявіць Народнаму камісарыяту ўнутраных спраў вусны пратэст...— прамовіў Лагун.

— Слухаю,— мужчына паставіў вышмальцаваный локці на стол, падпёр складзенымі рукамі гладка паголены, з густымі чорнымі крапінкамі падбародак і смела ўставіўся на яго.

— Наш Белнаком са згоды ЦК РКП (б), Савета Народных камісараў, ВЦВК і Наркамнаца вядзе вялікую палітычную і культурна-асветную работу для ўтварэння Савецкай Беларусі,— утаймоўваючы хваляванне, сказаў Лагун.— Аблвыкамзах у Смаленску, губеранскія выканкомы ў Віцебску і Магілёве адзіным фронтам выступаюць супроць нас. Аблвыкамзах шукае ўсе шчылінкі, каб узаконіць сябе

юрыдычна. Цяпер ён знайшоў помач у вас. Вы на днях адобрылі існаванне Заходняй камуны як адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі РСФСР. Гэтым самым вы таксама не толькі перакрэсліваеце ўсе нашы законныя намаганні, але і законнае права ўсяго беларускага народа на сваю дзяржаўнасць.

— Але, таварыш, гэты дакумент, які падпісалі наш нарком і члены выканкома Заходняй камуны Пікаль, Рэйнгольд і Найдзёнкаў, не канчатковы. Яго павінен яшчэ зацвердзіць ВЦВК.

— Мы ведаем гэта,— прамовіў Лагун.— Але нам вельмі крыўдна і балюча, што ваш камісарыят паддаўся на просьбы і настойванні смаленскіх таварышаў, стварае такі непрыемны нам і нашаму народу прэцэдэнт... А заадно гэты акт недруяеалюбны і да літоўцаў, якія, згодна яго, таксама павінны быць у абсягах Заходняй камуны. Без іх згоды.

— Але ж вы, як мы ведаем, самі сцвярджаеце: край, населены беларусамі і літоўцамі, мае адны ці амаль адны глыбокія гістарычныя, эканамічныя, культурныя карані, адпаведна, гэтае аб'яднанне не будзе выпадковым. Па-другое, трэба аўтарытэтны, моцны савецкі орган, які супрацьстаяў бы Тарыбе ў Вільні і Радзе БНР у Мінску.

— Як вы кажаце, па-першае, для аб'яднання беларусаў і літоўцаў на такой аснове, трэба іхняя згода, а па-другое, што да беларускага боку, то Радзе БНР як след супрацьстаіць Белнаком,— сказаў Лагун.

— Мяснікоў і іншыя, як вы кажаце, смаленскія таварышы лічаць: Белнаком — слабое супрацьстаянне БНР. Многія яго кіраўнікі, Скарынка, Усціловіч, Жылуновіч, вы, былі на Усебеларускім з'ездзе, пасля пратэставалі супраць яго разгону — адпаведна, настроены нацыяналістычна.

— Сапраўды, той-сёй з нас браў удзел у вышэйназваным кангрэсе, той-сёй пратэставаў супраць яго разгону. Але цяпер мы разабраліся, дзе нацыяналізм, а дзе здаровае нацыянальнае, хочам, паўтараю, супрацоўнічаць толькі з Савецкай уладай і на яе прынцыпах будаваць беларускую дзяржаўнасць. Омеленцы памылкова недаацэньваюць увогуле нацыянальнае пытанне і ў прыватнасці беларускі народ, яго права на сваё імя. Адсюль — і варожасць, непрыманне нашага Белнакома. Але самачынна выступаць ад імя беларусаў і літоўцаў, абыходзіць іх суверэннае права на самавызначэнне, па-першае, не да твару камуністам, а па-другое, ганьбаванне заваёў Кастрычніка, «Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплуатуемага народа».

— Выбачайце,— непарушна перапыніў яго гэты ўпаўнаваяганы камісарыята ўнутраных спраў.— Дакумент, супраць якога вы пратэстуеце, прыпяты не па асабістай просьбе і настойваннях смален-

цаў, як віл сцвярджаеце, а на аснове 16-га артыкула Канстытуцыі РСФСР, дзе ідзе гутарка пра свабоду арганізацыі і аб'яднання працоўных.

— Выбачайце і вы,— мякка перабіў яго Лагун.— А хіба наш Белнаком — не выказнік дум і пачуццяў беларускіх работнікаў і сялян? Асабіста я, цяперашні кіраўнік Белнакома, па прафесіі рабочы-металіст.

— Ну...

— Не, цяжка запярэчыць, што мы не выяўляем інтарэсы бедных і прыніжаных,— настояў, не страціў ніць дыялогу Лагун.— Але з гэтым смаленні не лічацца. Значыць, не лічацца і з волевыяўленнем беларускага народа, прымусова навязваюць свой дыктат.

Гаспадар кабінета змаўчаў, здаецца, нават сумеўся. Пацёр левай далонню лоб, павекі, падбародак і аж пачырванеў ад натугі.

— У Канстытуцыі ёсць і 11-ты артыкул, Дзе гаворыцца, што Саветы абласцей, якія адрозніваюцца асаблівым побытам і нацыянальным складам, могуць аб'ядноўвацца ў аўтаномныя абласныя саюзы, якія ўваходзяць на пачатках федэрацыі ў РСФСР. Так?

— Ну, дапусцілі,— хмурна буркнуў чарнявы.

— Дык вось мы і пратэстуем супраць несумленнага спажывання заваёў Кастрычніка, Канстытуцыі: з аднаго боку падкрэсліваць нацыянальны аспект, а з другога — ігнараваць!

— Першае: я перадам вашу ноту наркому,— спакойна сказаў чарнявы.— Другое: размова пра подласці, пра іх лёс, статус яшчэ наперадзе. У ВЦВК. Для таго каб загадзя вывучыць гэта і абмеркаваць, у творана спецыяльная Адміністрацыйная камісія на дало з таварышам Свярдловым. Заходнюю вобласць у ёй будзе прадстаўляць таварыш Мяснікоў.

— Тады ўсё ясна...— ухмыльнуўся, паныла пахітаў галавою Лагун.— Той, хто сядзіць на суку, ніколі не будзе сам падразаць яго...

— Не варта даваць такой волі пачуццям, таварыш,— зноў узяў сябе ў рукі, павучыў гаспадар кабінета.— Самі ж гаворыце: вас трымаюць у полі зроку самыя высокія партыйныя і савецкія органы. А раз так, то яны рошаць усё справядліва. Як толькі надыдзе спрыяльная для гэтага часіна. Дык інайце
вытрымку,— і нават усміхнуўся, не зусім зразумела пажартаваў: — І не спяшайцеся паперадзе свайго бацькі ў пекла...

## 3

Задумлівы, нават, можа, зацяты, з душэўным рубцом, Жылуновіч з раніцы прыйшоў у рэдакцыю «Дзянніцы» — у сваё любімае дзецішча, каму ўжо аддаў шмат часу. Калі з-за нямецкай акупацыі перастаў знацца з Мінскам, аслабіў варункі з Петраградам, то тут, у Маскве, як кажуць, усяго сябе прысвяціў гэтай газеце. У ёй яны перадрукоўвалі многія важныя пастановы Савецкага ўрада альбо пісалі каментарыі да іх, змяшчалі тое-сёе з гісторыі, культуры Беларусі, навіны з цяперашніх акупаваных немцамі і незанятых паветаў, вялі агонь па Віленскай і Мінскай радах, лупцавалі іх за гешэфты з Берлінам, а зазаадно — надта ў апошні час — мусілі спрачацца і са Смаленскам, найперш з Мясніковым і Кнорыным, кіраўнікамі Паўночна-заходняга абкома РКП (б), вельмі нецярпімымі і да «Дзянніцы».

Цяпер Жылуновіч нёс у кішэні паліто некалькі лісткоў паперы, дзе было запісана тое, што апошні час найбольш хвалявала яго, нават мучыла, як можа прыносіць пакуту глыбокі душэўны боль, адчуванне чыёйсьці ўпартай несправядлівасці. Таму, як толькі зайшоў у пакойчык, дзе цяпер за сваім сталом сядзеў яго бліжэйшы памагаты, малады літаратар Япка Нёманскі, павітаўся і сказаў:

— Слухай!

Зняў капялюш, паклаў яго на горку кніг, што паспелі ўжо выдаць (а выдавалі ўсё вельмі і вельмі няпроста. Каб, скажам, выпусціць граматыку Тарашкевіча, дык рукапіс пасылалі нават праз Фінляндыю ў акупаваную Вільню, у друкарню Марціна Кухты), сеў пры сваім стале і дастаў ужо сёння, на досвітку, перапісанае чыста і акуратна.

«Вось ужо на працягу доўгага часу «Известія И. К. С. Западной Комунны» і «Звезда» нясціхана вядуць вайну сплетную, інтрыжную вайну супроць Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту і яго аддзяленняў, нападаючы на яго з усіх бакоў і чапляючыся к яму бяз усякіх прычын, за піма ніштo».[14]

Падняў галаву, зірнуў на малодшага калегу праз прыпацелыя пасля холаду акуляры: як, не вельмі рэзка? Той уважліва пазіраў, трымаючы аловак і асцерагаючыся нават паварушыцца,— каб даць яму, рэдактару і старэйшаму, паважанаму чалавеку і літаратару, без замінкі выказаць тое, што не дае спакою. Ён расшпіліў паліто, працёр кончыкамі шаліка акуляры і, начапіўшы іх, пачаў чытаць далей:

«Калі прачытаць іх нападкі, то сорамна неяк становіцца за іх! Ня крыўда, ня злосць, а проста пейкая няёмкасць забірае цябе, калі ты бачыш, што расейская дзійснасць, адбудоўваемая на закладзінах са-

[14] Тагачасная публіцыстыка Цішкі Гартнага (Зм. Жылуновіча), што цытуецца тут і далей, сям-там адаптавана.

цыялізму і рэвалюцыйнага развіцьця, мае перад сабою гэткія здрадныя рэчы, як напад аднае рэвалюцыйнае ўстановы на другую. Хочацца думаць, ды і трэба так думаць, што рэдакцыі «Изв. И. К. С. Зап. Ком.» і «Звезды» або не разбіраюцца ні ў чым па няведанню і няяснасці выяўленым сабе задачаў моманту ці знарочыста робяць непачэснае дзела — цкаваным другіх, роўных сабе, амо і вышэйшых установ і працуючых у іх таварышаў».

Зноў адарваў галаву ад паперыны, падняў вочы на Нёманскага: той па-ранейшаму слухаў уважліва і, здаецца, з усім згаджаўся. Толькі ва ўзрушэнні цёр пальцамі расшпілены каўнер цёплай шэрай кашулі.

«Беларускі Нацыянальны Камісарыят,— па памяці прадоўжыў Жылуновіч, скідаючы з сябе паліто і чапляючы яго на вешалку, што стаяла паблізу,— вызван к жыццю ходам і развіцьцём Вялікай Расейскай Рэвалюцыі, якая напісала на сваім штандары і правяла ў жыцьце прынцып: «Свабоднага самабудавання народаў на працоўных закладзінах».— Сеў, зноў пачаў чытаць: — Яна выпхнула на повярх жыцьця вышэйшую раўнапраўную з другімі інстытуцыямі Федэрацкай Расейскай Рэспублікі інстытуцый працоўных сялян і рабочых розных нацыянальнасцяў — Народны Камісарыят па справам Нацыянальным. Пры гэтым камісарыяце заложана ўжо цэлых 18 нацыянальных аддзелаў, у тым ліку і Беларускі, якія агулам прынясьлі нязлічоную карысць для Расейскай Рэвалюцыі. Гэта ясна кожнаму шчыраму прыхільніку гэтай рэвалюцыі, не толькі кіраўнічым людзям».

З хвіліну памаўчаў, пахітаў сам сабе галавою, а пасля выцер кропелькі поту на залысіне.

«Ясна гэта і «Извес. И. К. С. Зап. Ком.» ды «Звяздзе», але яны не хочуць сазнацца... бо то не ў іх карысці! Але, карысці. Мне, камуністу і быўшаму с.-д. з 1902 году, інакшая думка ў голаў не ідзе! Не можа ж краявая правіцяльсцвянная ўстанова баяцца Бел. Нац. Каміс.? бо няма на тое прычын.

Толькі тут і стаіць гэта адно — карысныя пазывы! Ну, а калі ў камуністаў на першым пляне гізуе карысць — то, выбачайце, таварышы, то непрыстойна для камуністаў! І крыўда за тое, што яшчэ ёсць такія пасля гадовага панства найвялікшай у сьвеце свабоды, дастатай народам розных нацыяў.

Яшчэ раз скажу,— чытаў і, адолены пачуццём, нібы сцвярджаў узмахам рукі,— не прыстойна камуністам варочаць дарэвалюцыйны парадак з інтрыгамі і сплёткамі чыноўнікаў!»

— Ну як, браце? — запытаў.

— Я лічу: коратка і ясна, — адказаў Нёманскі.

— Не будзе вельмі рэзка?

— Не.

— На пачытай яшчэ раз сам,— падаў Жылуновіч лісткі яму.— Калі дзе што трэба паправіць, то паправім. Не варта даваць хоць маленечкую зачэпку Мяснікову і Кнорыну ці то падлавіць на нечым, ці паскардзіцца Сталіну...— Уздыхнуў, махнуў рукою.— Хоць усё роўна дадуць залп у адказ...

**4**

Трэцяга лістапада, як і прасіла бальшавіцкая фракцыя Белнацкома, сабраліся на сход беларусы-бальшавікі: Крыцкі, Салтанаў, Дзедзя, Жукоўскі, Усціловіч, Клыш, Хрэнаў, Жылуновіч, Чарнушэвіч, Бампі, Няцэцкі, Рыбак, Савуніч. Тыя, хто прыехаў у Маскву і Петраград яшчэ да вайны ў пошуках лепшай долі і кавалка хлеба, мусіў уцякаць у вайну альбо перабраўся сюды нядаўна, як Зміцер Чарнушэвіч.

За старшыню сходу абралі Клыша, за сакратара — Чарнушэвіча.

— Таварышы! — калі скончыліся працэдуры і трэба было весці сход, усхвалявана, а заадно і афіцыйна, хоць ведаў усіх, сказаў маладзягавы, сярэдняга росту і круглатвары Клыш, абцягваючы па сабе кароткі, паношаны руды пінжачок і папраўляючы яркі чырвоны гальштук.— Бальшавіцкая фракцыя Белнакома лічыць: ёсць вялікая патрэба якраз нам, камуністам, пагаварыць пра паш Белнаком і пра ўсё іншае, што вакол яго. Не сакрэт, беларускай камуністычнай секцыі ў Петраградзе вельмі цяжка накіроўваць работу Белнакома. Само жыццё, час, нашы вялікія задачы проста-такі змушаюць нас мець якраз тут, у Маскве, баяздольную камуністычную арганізацыю. Хоць бы пры адным з маскоўскіх раённых камітэтаў РКП (б). Як вы ўсе таксама ведаеце, яшчэ ў маі-чэрвені, а пасля ў ліпені мы спрабавалі стварыць тут беларускую камуністычную секцыю пры ЦК РКП (б). Але тыя нашы спробы, на вялікі жаль, закончыліся няўдачай...

Ён перавёў позірк па сакратара сходу — Зміцер Чарнушэвіч угнуў галаву і хутка ўсё запісваў. Яны, як і хацеў Сталін, старанна пратакаліравалі ўсю сваю работу, пісалі ў Наркамнац справаздачы.

— Вось такая тэма і выносіцца на парадак дня нашага партыйнага сходу. Згодны?

Прагаласавалі. Адзінагалосна.

— Таварышы,— улад спакайней, усё яшчэ стоячы, вёў сваё, старшынскае, далей Клыш.— Нашы калегі Хрэнаў і Жылуновіч маюць даклады пра работу Белнакома, «Дзянніцы», а таксама пра акупаваную Беларусь і пра нашы новыя задачы. Давайце паслухаем іх. Не супраць?

— Не,— падаў голас Усціловіч. Яшчэ малады, гадоў дваццаці двух, жвавы чалавек, нядаўні рабочы-машыніст чыгуначнага цэха Пуцілаўскага завода. Летась, у кастрычніку, ён браў удзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі, разам з іншымі чырвонагвардзейцамі раззбройваў Міхайлаўскае юнкерскае вучылішча, быў намеснікам старшыні камітэта БСДП, з лютага гэтага года член РКП (б) і член ВЦВК.

— Тады слова дакладчыкам,— сказаў Клыш.— Таварыш Хрэнаў, калі ласка.

Сеў.

Хрэнаў, сярэдняга росту, плячысты, у гімнасцёрцы, лёгка падняўся, запыніўся каля стала, за якім сядзелі Клыш і Чарнушэвіч, акінуў мяккім позіркам невялікі, але спаяны гурт землякоў — калег па партыі.

— Я хачу пагаварыць пра ваенныя, палітычныя аспекты на нашых акупаваных землях,— хрыпла (можа, быў прастуджаны) сказаў ён,— Як вы ведаеце, нямецкая акупацыя дадала свае штрыхі ў сітуацыю, воблік нашага краю. Па-першае, кайзераўцы, як і трэба было чакаць, пачалі аднаўляць старыя, царскія, парадкі, стварылі спрыяльны клімат для паноў і купецтва. З другога боку, акупацыя ўзбудзіла палітычныя сілы, што засталіся ў краі. Выйшаў з падполля, ажывіўся Савет распушчанага леташняга Усебеларускага з'езда, які яшчэ да прыходу немцаў у Мінск утварыў Народны сакратарыят, аб'явіў сябе гаспадаром горада і краю, неўзабаве сабраў кааліцыйную Раду БНР, а 25 сакавіка яна ўжо аб'явіла незалежную БНР, адышла ад Савецкай Расіі і пачала загульваць з Германіяй. Праўда, апошні крок стаў тым асялком, на якім праверылася, хто ёсць хто. Не хочучы парываць з Расіяй (не з Савецкай, а з часоў Керанскага), адкалолася кааліцыя, не паладзіла паміж сабой БСГ. Той-сёй з яе, як з іншых партый, цалкам прадаўся акупанту, а многія сумленныя людзі не пайшлі гадзінай сцяжынай, адасобіліся і ўтварылі свае новыя партыі, сярод якіх адна з вялікіх Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя, дзе такія вядомыя нашы дзеячы як Лашковіч, Баравік, Нямкевіч і іншыя. БНР аказалася нетрывалым збудаваннем, і яе, як трэба было чакаць, урэшце прыбраў да рук спрытны пан Скураны і паставіў на службу Германіі і сабе. Праўда, і ён яе здолеў утрымацца, мусіў у верасні пайсці ў адстаўку.

На хвіліну замоўк, а пасля дастаў з кішэні блакноцік, разгарнуў яго. Мусіць, каб зазіраць туды.

— Пра крызіс, заняпад БНР яшчэ скажа Таварыга Жылуновіч, які мае пра яе шмат звестак,— прадоўжыў.— Я хачу больш сказаць пра іншыя сілы, на якія мы павінны цяпер зірнуць пільна і шукаць з імі

цяснейшых варункаў. Як усе ведаеце, з ад'ездам органаў Савецкай улады ў Смаленск, у краі, у Мінску прыйшлося, можна сказаць, нанова ладзіць сетку бальшавіцкіх суполак, прыстасоўвацца да новай сітуацыі. Як мы трохі ведаем, ужо ў лютым у Мінску ўзнік падпольны бальшавіцкі камітэт. З-за канспірацыі мы не знаем, хто кіруе ім, хто яго баявыя сілы, хто іменна з беларускіх дзеячаў памагае яму. Другі значны падпольны бальшавіцкі цэнтр, як па ўсім відаць, у Гомелі, ёсць, канечне, партыйныя камітэты ў такіх вядомых гарадах, як Магілёў, Бабруйск, Барысаў, партыйныя ячэйкі — у многіх і многіх вёсках. Як знак пратэсту супраць акупацыі, працоўнай салідарнасці, вернасці Савецкай уладзе — сёлетняя першамайская дэманстрацыя ў Мінску, дзе брала ўдзел болей тысячы чалавек і якую акупанты разагналі гвалтам. У жніўні, як цяпер мы ведаем, у Смаленску адбылася канферэнцыя 300 бальшавіцкіх суполак, на ёй быў абраны цэнтр — Краявы камітэт камуністычнай арганізацыі акупаваных зямель Беларусі і Літвы. Па ўсім адчуваецца, у падпольных арганізацыях Мінска і па-за ім цяпер даволі шматлюдна[15] У верасні, як нам нядаўна сказалі, каб лепш кіраваць рухам супраць акупантаў, ЦК РКП (б) параіў мець Цэнтральнае Бюро камуністычных арганізацыі! акупаваных зямель. Нядаўна, улад ў гэтым месяцы, як мы прачулі, ужо тут, у Маскве, адбылася Першая канферэнцыя камуністычных суполак акупаваных зямель, якой кіраваў сакратар ЦК, старшыня ВЦВК таварыш Свярдлоў. У акупаваную Беларусь пасланы сталыя людзі, літаратура, грошы.

Хрэнаў загарнуў блакноцік, падняў галаву.

— Як я і сам бачыў, партыйная работа ў акупаванай Беларусі мае некалькі нюансаў,— прамовіў далей.— Па-першае, там вялікая ўвага бальшавікоў да сялянства, дзеля чаго работа ў вёсках вядзецца і на беларускай мове, сялян просяць не даваць хлеб, мяса, фураж немцам, пакідаць для Савецкай улады. Я паказваў нашым таварышам адну з лістовак, дзе Паўночна-Заходні камітэт РКП (б) нават дакляруе за гэта даць сялянам плугі, бароны, малатарні, чаго нібы поўна на смаленскіх складах. Я не ведаю, як омеленцы будуць стрымліваць слова, але цяпер такія абяцанкі маюць на сялян уражанне. Па-другое, бальшавікам у гарадах прыходзіцца сутыкацца з Бундам, Паалей-цыёнам, меншавікамі. Па-трэцяе, рэзкі канфлікт з БНР і суполкамі, што каля яе трукца. Па-чацвёртае, многія тамтутэйшыя бальшавікі ўлічваюць зрухі, што адбыліся ў нацыянальнай свядомасці працоўных Беларусі з

[15] Там было болей 4400 чалавек.

часу Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пагэтаму не зусім выпадкова падпольны цэнтр называецца імем Беларусі і Літвы, хоць на нацыянальнае пытанне там няма аднаго погляду, той-сёй лічыць самавызначэнне народаў «мелкобуржуазным лозунгом». У цэлым бальшавікам прыходзіцца быць у падполлі, як у той час многія іншыя партыі працуюць легальна, выдаюць свае газеты. Таму, бывае, бальшавікі спрабуюць шукаць з тымі супрацоўніцтва.

Шырокі партызанскі рух. Я, на жаль, не маю лічбаў, але пра многія вядомыя народныя бунты, партызанскія акцыі пісала «Дзянніца», і вы, думаю, уяўляеце, што робіцца на радзіме. Акупанты проста шалеюць ад непакоры нашых людзей. Помніце, «Дзянніца» за 21 ліпеня пісала, як у Рэчыцкім павеце акупанты спалілі вёску Руднае толькі за тое, што сяляне збілі іхняга лесніка-халуя. Многія вёскі, як, скалкам, з Дрысенскага павета па агульным сходзе рашылі прасіць ваенныя ўлады РСФСР, каб тыя «вызвалілі іх ад дэспатычнага нямецкага іга». У Бабруйскім павеце ўвогуле быў ці яшчэ ёсць незвычайны выпадак: партызаны і насельнікі вызвалілі цэлую зону і аб'явілі сваю рэспубліку са сталіцай у Рудабелцы.

Савецкі ўрад, як усе мы бачым, не кінуў наш народ на гвалт і здзек, сочыць за ўсімі падзеямі, выплачвае вялікія грошы за тое, што немцы пакрыху вызваляюць нашы землі, пратэстуе супраць насілля нямецкай ваеншчыны, пра яго расказваюць «Правда», «Известия» і іншыя газеты. Паўнамоцны прадстаўнік РСФСР у Берліне толькі за кастрычнік тройчы, 5, 23 і 29, уручаў ноты ў Берліне пра рабаўніцтва нямецкімі войскамі на акупаваных землях, у тым ліку і беларускіх, перад тым як адысці згодна Дадатковаму пагадненню. Урад РСФСР мусіў затрымаць трэці ўзнос, які, па Дадатковым пагадненні, ён плаціў Германіі за тое, што тыя адводзяць свае войскі на захад. З усяго гэтага, таварышы, вынікае, што беларускі народ цяпер можа выратаваць ад няволі, пакут і гвалтоўнай галоднай смерці толькі Савецкая Расія, Чырвоная Армія. Нашы браты там, у акупацыі, а мы тут павінны ўсімі, сіламі спрыяць гэтай пачэснай місіі, як ніколі салідаравацца з вялікім рускім народам, з нашымі суседзямі ўкраінцамі і прыбалтамі, якія таксама чакаюць вызвалення.

Замаўчаў на хвіліну.

— Калі мы сёння ўтворым сваю камуністычную секцыю тут, у Маскве,— сказаў пасля,— дык я асабіста бачу такую яе задачу: I) цесная повязь з ЦК РКП (б) і Савецкім урадам, 2) кіраванне Белнакомам, 3) пошукі ўзаемапаразумення з Паўночна-заходнім абкомам РКП (б) і Цэнтральным Бюро камуністычных арганізацый акупаваных зямель Беларусі і Літвы, каб хутчэй выгнаць акупантаў і ўтварыць

Беларуска-літоўскую савецкую дзяржаву альбо асобную Савецкую Беларусь.

Схіліў галаву, а слухачы ў гэты час узнагародзілі цёплымі воплескамі яго прамову.

— Можа, хто хоча запытаць што-небудзь у таварыша Хрэнава? — падняўся, запытаў Клыш.

— Давайце паслухаем яшчэ дзядзьку Зміцера,— параіў Усціловіч, выяўляючы павагу да аднаго з ветэранаў іхняга рабочага руху.

Жылуновіч, як і заўсёды, не ў дарагім, але акуратна адпрасаваным касцюме, у белай кашулі са стаячым каўнерыкам, з вусікамі, жвава выйшаў да стала, нібы строга, а на самай справе чэпка зірнуў на ўсіх праз вялікія акуляры з тонкімі карычневымі дужкамі.

— Таварышы,— прамовіў ён, усё болей прывыкаючы да гэтага простага, але ёмістага слова,— бывае, калі глыбока задумаешся пра тое, што зноў прыйшлося ўзяць на плечы нашаму народу, жах бярэ. Вайна, больш двух мільёнаў нашых бенінцаў, мабілізаваныя на фронт, сутыкненне шматмільённых варожых армій на нашай зямлі, разруха, рабаванне, загінулыя, калекі, сіроты, нямецкая акупацыя і бязлітасны грабеж — усё гэта не толькі вялікі цяжар, а велізарнае гора, нават болей — новая трагедыя для нашага краю. Я, дарагія таварышы, не ўяўляю, што было б з намі, каб не Кастрычніцкая рэвалюцыя. Мусіць, мы ўжо вытапталіся б як народ, як нацыя. Кастрычнік цудадзейна ўваскрасіў нас, азарыў душы воляй...

Перавёў дыханне — яго ўсе слухалі вельмі ўважліва. Ён быў тут не толькі адзін са сталых (хоць яму на днях пераваліла толькі за 31 год), але і з самых самаадукаваных ды ўплывовых.

— Хоць Савецкай уладзе хутка будзе ўсяго толькі год, хоць яна цяжка становіцца па нogі, усё яшчэ ў вялікай небяспецы,— прамовіў далей,— але я ўсё болей і болей веру ёй.

Нечакана ён дазволіў сабе ўсміхнуцца — у яго вачах і на паўнаватых вуснах знікла ці то строгасць, ці то панурыстасць (прысутныя ўспрымалі звычайную Жылуновічаву знешнюю замкнёнасць пасвойму):

— Праўда, за гэтую веру нам трапляе на арэхі. І ад сваіх, як кажуць. Нават учора да мяне завітваў адзін з эмісараў ад БНР і зноў ад імя радцаў папікаў, што мы тут «прадаліся бальшавікам», «здрадзілі беларускай справе», «пераўтварылі наш Белнаком, «Дзянніцу» ў антынацыянальнае асінае гняздо».

Адагнаў усмешку, зноў стаў задумліва-хмурны.

— Хачу сказаць шчыра: я рашуча асуджаў і буду асуджаць тых з БНР, хто падаў голас за разрыў з Расіяй і за хаўрус з Германіяй. Але я

не хачу асуджаць усіх пагалоўна. Як мы ведаем, і ў Мінску ёсць тыя нашы дзеячы, хто таксама пайшоў з Савецкай уладай, працуе на яе ў падполлі, а таксама ёсць і тыя, хто шукае нейкі іншы шлях, апроч слугавання акупанту. Мы павінны, як кажа Ленін, кантактаваць з гэтымі людзьмі, усіх іх перавабліваць на свой бок, пераконваючы, што БНР не здолела і не здолее сцвердзіцца як беларуская дзяржава. Не, яна — не фікцыя, не фарс і не гульня, яна адна проста не мае сілы, грошай, ідэалагічнай моцы на гэта. Тыя, хто штурхнуў яе на паклон кайзеру і паставіў стаўку на яго, і пралічыліся, і, што ні кажы, наклікалі насцярогу, а то і варожасць да ўсяго нашага руху. Таму мы павінны былі змагацца з імі, і мы, як маглі, рабілі гэта. Як вы ўсе бачылі самі, мы перадрукоўвалі пастановы Савецкага ўрада, тлумачылі яго палітыку, заклікалі наш народ, бежанцаў-землякоў па ўсёй Расеі да мужнасці, да пралетарскага інтэрнацыяналізму і дабівацца Беларусі на савецкай аснове як часткі РСФСР. Таксама мы шмат друкавалі і друкуем пра тое, што робіцца на акупаваных землях, паказваючы захопніцкія намеры германскіх імперыялістаў і яшчэ, паўтару, мы вялі, вядзём агонь па БНР. Думаю, усе вы ведаеце нашы рубрыкі «Беларуская Рада», «З «незалежнай» Беларусі», помніце такія публікацыі, як «Мінскія правіцелі», «Рупіць», «Каміявая яхоры Беларускай Рады», нямала фельетонаў, памфлетаў, саміх дакументаў Рады БНР і каментарыяў да іх.

Уздыхнуў.

— Ёсць яшчэ, на жаль, і чацвёрты нюанс,— пахкаў галавою.— Гэта нашы спрэчкі, а ў апошні час ужо і зацятая барацьба з Мясніковым і яго аднадумцамі. Калі нас разумеюць тут, у Маскве, пачалі пакрыху разумець камуністы і іхнія сябры ў Мінску, то ў Смаленску — глухая сцяна... Ясна, калі Мяснікоў, Кнорын, Алібегаў, Берсан і іншыя вядуць бязлітасны агонь па БНР, хоць не зусім слушна ўсю віну за яе звальваюць найперш па беларускія партыі. Яны чамусьці не хочуць бачыць, што Раду БНР кляпалі і эсэры, паалейцыяністы, бундаўцы, а таксама дзеячы з гарадскіх і губеранскіх земскіх самакіраванняў, пасланцы ад асноўных нацыянальных меншасцей краю — ад яўрэяў, рускіх, палякаў, украінцаў, літоўцаў. Ды Мяснікоў і яго таварышы не толькі не бачаць гэтых нюансаў, але яны заадно залічаюць у «лагер беларускіх буржуазных нацыяналістаў» і нас, дзеячаў Белнакома, камуністаў-беларусаў: бачыце, мы — не сапраўдныя камуністы, не знішчаем «старые национальные рогатки», а дабіваемся «воздвижения новых национальных рогаток, не существовавших до сих пор», а пагэтаму яны, настоящие коммунисты, не могут в каком бы то ни было виде принимать участие в этом

движении». Я паўтару, таварышы: на вялікі жаль, ёсць, расце гэты канфлікт, які нясе вялікую шкоду. І камуністам, і Савецкай уладзе, і не надуманаму, а законнаму самавызначэнню шматмільённага беларускага народа, які цяпер, як ніколі адчуў цягу да волі...

Заціх, прыгладзіў далонню рэдкія валасы на патыліцы. Уздыхнуў:

— Дужацца са ^паленцамі нам вельмі цяжка. Яны ўсё болей умацоўваюцца юрыдычна, маюць немалую сілу, грошы, кіруюць падполлем, партызанамі на акупаванай зямлі і непрамую выходзяць на цэнтр — на ЦК РКП (б) і Савецкі урад. Ніякая Беларусь ім не трэба. Па-першае, замінае іхнім поглядам, мэтам, а па-другое, можа пахіснуць іхнюю вялікую ўладу... Пагэтаму, дарагія таварышы, цяпер якраз нам, камуністам-беларусам, трэба як след зразумець і ажыццяўляць нацыянальную палітыку РКП (б) і Савецкага ўрада, якія прызнаюць і нацыі былой Расейскай імперыі, і іх прыгнечанне, і іх права па самавызначэнне. Тое, што нядаўна, 29 жніўня, Савецкі ўрад спецыяльным дэкрэтам адмовіўся ад дамоў і актаў Расейскай імперыі аб падзеле Рэчы Паспалітай і прызнаў права польскага народа на самастойнасць,— яркі ўзор гэтага. Дык не марудзьма, таварышы, ладзьма тут сваю камуністычную суполку, накіроўвайма як след Белнаком, згуртоўвайма ў адзін цэнтр нашы партыйныя суполкі па ўсіх расейскіх гарадах і найперш сіламі камуністаў-беларусаў давайце яшчэ болей дабівацца Савецкай Беларусі. Цяпер, думаю, наш апошні шанец для гэтага. Болей, можа, гісторыя і не дасць нам такога зручнага выпадку. Значыць, мы павінны ўзяць на сябе альбо вялікую цяжкую місію, альбо вялікі грэх, калі ўсё праваронім у такі спрыяльны час! Я, сябры, заклікаю вае усіх быць вернымі сынамі сваіх бацькоў, роднай зямлі!

Заляскалі. Усхваляваны, але знешне непарушны Жылуновіч перачакаў, калі аціхнуць воплескі, а пасля дадаў:

— На днях, б лістапада, пачнецца VI Усерасійскі Надзвычайны з'езд Саветаў. На яго, канечне, прыбудзе і Мяснікоў. Як мы ведаем, ёй заўсёды прыязджае ў Маскву раптоўна і гэтак жа нечакана знікае, да пас, у Белнаком, дарогі не ведае і ведаць не хоча. Але з ім яшчэ раз пагаварыць трэба. Таварыш Усціловіч як член ВЦВК будзе на гэтым з'ездзе, дык павінен улучыць хвіліну і зноў паспрабаваць заклікаць таго да супрацоўніцтва.

І яшчэ, таварышы. Як і ўся Масква, мы таксама шыкуемся адсвяткаваць гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі. 8 лістапада ў гонар гэтага слаўнага свята мы запрашаем вас усіх і вашых знаёмых у клуб III Інтэрнацыянала, у дом 2 па Малой Броннай, на беларускую вечарынку, дзе будзе даклад і канцэрт.

Усміхнуўся:

— Усё.

Пакланіўся і сеў.

— Ёсць пытанні? — падняўся і запытаў Клыш.

— Усё ясна, што мала што ясна...— пажартаваў Бампі.

— Дык што — пачнём спрэчкі? — зноў спытаў ва ўсіх старшыня сходу.— Хто хоча выступіць першы?

Як такіх, спрэчак сёння не было. Сказала некалькі чалавек па пару слоў, згаджаючыся з Хрэнавым і Жылуновічам, ды параілі абраць бюро секцыі, якое павінна зарэгістраваць секцыю, скласці свой статут.

— Прашу называць кандыдатаў у члены бюро секцыі,— сказаў пасля Клыш.

Пачуліся галасы:

— Жылуновіч.

— Хрэнаў.

— Лагун.

— Усціновіч.

Значыць, назвалі тых, хто найбольш штосьці зрабіў для Белнацкома. Пасля, каб усё было як след, галасавалі тайна, праз запіскі. Усе вылучаныя набралі колькі трэба было галасоў.

Затым прагаласавалі і зацвердзілі гэтае бюро секцыі, даручылі Усціловічу прасіць Прэсненскі раёнцы камітэт РКП (б) прызнаць іх і даць мандат ды пячатку.

**5**

— Таварыш Мяснікоў,— голасна паклікаў Усціловіч.

Мяснікоў рэзка азірнуўся. Прысадзісты, нават ужо маяаіаваты, у новенькай вайсковай форме і хромавых бліскучых ботах, ён толькі што ў праходзе залы вітаўся за руку з купкай, мусіць, добра знаёмых дэлегатаў — два з іх, адзін нізкі, тоўсты і лысаваты, а другі сярэдняга росту, кучаравы і ў акулярах, былі гэткія ж чарнявыя, як і ён, трэці быў высокі і белабрысы, таксама ў вайсковай форме. Усе былі ўзбуджаныя. Канечне ж, ад нядаўняй прамовы на з'ездзе Леніна — бледнаваты пасля ранення, старшыня Саўнаркома РСФСР, прызнаны сябрамі і ворагамі правадыр рэвалюцыі, па-ранейшаму прамаўляў жыва і запаліла. І пра тое, дзе і ў чым ім цяжка, і пра тое, дзе і ў чым ёсць ужо немалыя ўдачы. А па-другое, сказаў незвычайную звестку — Германія рве з Масквою ўсе дыпламатычныя сувязі, лічачы, што Савецкі ўрад, савецкі пасол у Берліне Іофэ ўмешваюцца ў германскія клопаты, падбухторваюць нямецкі народ да рэвалюцыі і нібы ўвогуле

варожа настроены супраць Германіі: маўляў, прайшоў, ужо які час, а забойцы іхняга пасланніка графа Мірбаха ўсё яшчэ не пакараны.

Спачатку, калі пачуў гэта, Усціловіч. аж сцяўся, як сцяліся і іншыя дэлегаты: будзе новая ўспышка вайны! Але Ленін заспакоіў: у Германіі, увогуле ў Еўропе падымае галаву рабочы клас, які не дазволіць гэтага, бо гэта значыла б не толькі перамагчы Расію, але і іх саміх, ды і германская армія ўжо дэпаралізаваная, не здольная наступаць. Таму, пафасна гаварыў Ленін, трэба пільнасць, напружыць усе сілы і быць гатовымі да апошняй рашучай бітвы.

«Мы ведаем,— дадаў Ленін,— што звяры імперыялізму яшчэ мацнейшыя за нас, яны могуць яшчэ нам і нашай краіне прычыніць мноства насілляў, зверстваў і пакут, але яны не могуць перамагчы міжнародную рэвалюцыю. Яны поўны дзікай нянавісці, і таму мы гаворым сабе: няхай будзе, што будзе, а кожны рабочы і селянін Расіі выканае свой абавязак і пойдзе паміраць, калі гэта патрабуецца ў інтарэсах абароны рэвалюцыі. Мы гаворым: няхай будзе, што будзе, але якія б няшчасці ні наклікалі яшчэ імперыялісты, яны гэтым сябе не выратуюць. Імперыялізм загіне, а міжнародная сацыялістычная рэвалюцыя, нягледзячы ні на што пераможа». Гэтыя словы патанулі ўжо ў доўгай і бурнай авацыі.

У вялікіх цёмных вачах Мяснікова ўсё яшчэ, як кажуць, скакалі гарэзныя чорцікі, з усмешкаю ён зірнуў і на яго: малады чалавек, я цябе не ведаю!

— Мойша вас на хвілінку? — напытаў Усціловіч і трошкі адступіў назад. Ён таксама быў у вайсковай форме (праўда, не такой залíхвацкай, як у Мяснікова, а паношанай), затое нашмат вышэйшы.

— Выбачайце, хлопцы,— прамовіў Мяснікоў знаёмым і, усё яшчэ ўсміхаючыся, таксама зрабіў крокі тры ўбок, да яго.

— Я — Усціновіч, пасланец Белнакома і толькі што ўтворанай беларускай камуністычнай секцыі ў Маскве,— прамовіў ён.— Мне даручылі перамовіцца з вамі.

З вачэй Мяснікова мігам знікла ўсмешка — яго вузкія чорныя бровы папаўзлі ўніз, паўзакрылі вочы і сціснуліся на шырокім пераноссі, утварыўшы тры заглыбіны, поўныя, трошкі капрызныя вусны згарнуліся ў доўгую вузкую шчыліну, а масіўны, раздвоены падбародак нервова тузнуўся.

— Мы просім вас застацца пасля з'езда на дзень ці на паўдня ў Маскве і сустрэцца з кіраўнікамі Белнакома. Нам ёсць пра што ўдумліва пагаварыць.

— Я згодзен: нам сапраўды ёсць пра што пагаварыць удумліва,— спакойна, смела пазіраючы ў вочы маладому, дваццацідвухгадоваму

Усцілoвічу, прамовіў старшыня Аблвыкамзаха і адзін з лідэраў Паўночна-заходняга камітэта РКП (б).— Але, на жаль, я не магу застацца. Сёння яе вечарам, пасля першага пасяджэння, я мушу пакінуць Маскву.

«Ухіляецца»,— падумаў Усціловіч, па-маладому трацячы раўнавагу, а то і разгубліваючыся перад гэтым невысокім, але адукаваным, смелым, нават рэзкім і, трэба шчыра сказаць, уладным ды вядомым чалавекам. Ён нервова закусаў ніжнюю губу і зморшчыўся ад свайго бяссілля — зноў Мяснікоў не званае на іх, не хоча нават паслухаць, як не жадаў зблізжацца, калі ён, Усціловіч, раней, улетку, будучы на чале Белнацкома, пасылаў у Смаленск і сваіх людзей, і лісты, спрабуючы штосьці абудзіць у сэрцы гэтага ўплывовага дзеяча, які мог многае альбо, наадварот, нічога не зрабіць для самавызначэння Беларусі.

Той, на гадоў дзесяць сталейшы, умудроны жыццём, сутычкамі і барацьбою з супернікамі і ворагамі, здаецца, мігам адчуў яго прыгнечаны стан і нечакана нібы апраўдаўся:

— Паверце, я сапраўды павінен вяртацца сёння. Так рашылі таварышы Ленін і Свярдлоў. Відаць, з-за тых ускладненых абставін, пра якія вы чулі самі. Цяпер вось іду да іх,— зірнуў на гадзіннік. Ажыў. Нават спахапіўся: — Выбачайце, у мяне ў запасе ўсяго некалькі хвілін. Я мушу тут яеа пакінуць вас.

Выпрастаўся, схіліў у знак развітання і павагі галаву, а пасля, усміхнуўшыся і махнуўшы рукою знаёмай тройцы дэлегатаў, шпарка закрочыў па праходзе да сцэны, дзе ўлад не было нікога з прэзідыума.

Мяснікоў адыходзіў і адыходзіў, а Усціловіч знерухомлена ўсё стаяў у зале, што паволі абязлюджвалася, і адчуваў: у яго душы расце, захліствае ўсяго яго ці то абурэнне, ці то гнеў. Ці ж можна вось так — пысай аб стол? Хто ён, Усціловіч? Хлопчык? Хто яны ўсе ў Белнацкоме — лішнія рэвалюцыі, свайму народу людзі? Што — гэты Мяснікоў навек для іх?

Малады, узрушаны, Усціловіч у гэты вечар не ведаў: як ні цяжка на сэрцы, а злуецца ён дарэмна. Сапраўды, Мяснікоў не меў часу ні больш пагутарыць з ім, ні застацца на дзень-другі, бо сапраўды яго нечакана паклікалі на сустрэчу з Леніным і Свярдловым. Праўда, ён яшчэ не ведаў, пра што будзе гамонка і чаму яму трэба гэтак хутка выехаць з Масквы. Толькі ўжо неўзабаве, на сустрэчы, увазное: Савецкі ўрад не толькі адклікае з Берліна сваіх дыпламатаў, высылае германскіх з Расіі, але і намерыўся на дняхануляваць Брэсцкі дагавор, дык яму, Мяснікову, варта быць там, паблізу фронту, пільна сачыць за ўсім і, калі трэба будзе, то зрабіць усё, каб не даць немцам брыкнуць напаследак.

## 6

Сёння Жылуновіч прачнуўся рана як ніколі. Ледзь толькі ажыў, адразу ж успомнілася тое, пра што думаў учора перад сном — пра свой заўтрашні даклад. Пакуль было яшчэ змрочна, ляжаў ціха, абдумваў яго, а пасля, калі спачатку занепакоіўся, а пасля пырснуў, пачаў набіраць нястрымную моц світанак, ціха падняўся, узяў з крэсла сваю апратку і падаўся ў ванную.

Затым гэтак жа ціхенька, на дыбачках мяккіх тапачак падкраўся да пісьмовага стала, сеў і, напружваючыся ў ранішняй шэрані, абмацаў аловак. Ледзь-ледзь бачыў напісаныя ўчора радкі, але, прыцэліўшыся, пачаў хуценька запісваць тое, што прасілася па паперу цяпер.

— Запалі хоць свечку,— нечакана пачуў Надзеін голас. Як ні асцерагаўся, а бач, усё роўна пабудзіў яе.

Борздка азірнуўся: яна па-ранейшаму ляжала пад коўдраю каля сцяны, толькі яе рука была па падушцы, дзе нядаўна адпачывала яго галава. Прыціснуў палец да вуснаў: ціха, не пабудзі суседзяў! Махнуў рукою: спі яшчэ.

— Пабярог бы свае вочы...— уздыхнула і замаўчала, ведаючы, што ён ад стала ўжо не адыдзе.

Заснула. Можа, і на гадзіну. Падхапілася, калі заварушыліся, загаманілі за паркалёваю шырмаю Чарвяковы.

Неўзабаве кабеты затупалі па кватэры, а Жылуновіч і Чарвякоў, папіўшы гарбаты, падаліся ў горад, да плошчы Рэвалюцыі.

Раніца была халодная — у прыродзе ўжо адбыўся перапом цяпла і холаду; паветра, зямля астылі, усцюдзеньваліся, чакаючы блізкай зімы. Яна ўжо і спрабавала ўлегчыся ў апошнія дні: налятаў, пранізваў да касцей паўночны вецер, падаў яшчэ цяжкі вадзяністы снег, выбельваў вуліцы, дрэвы, падворкі, то раптам усё заціхала, нечакана выбліскваў нізкае сонца, але не здольвала хутка расслязіць белае покрыва, і яно ляжала нават пры яго скупым цяпле, пакуль не размываў дождж.

Але цяпер Масква не зважала на холад: па вуліцах з усіх яе канцоў цягнуліся ў цэнтр калоны рабочых і салдат. З музыкай, песнямі, з чырвонымі палотнішчамі і з гэткага ж колеру стужкамі на грудзях паліто, куртак, шынялёў. Хто ішоў у ботах, хто ў чаравіках ці туфлях, а хто ў валёнках і бурках, а то і абгортках, але ўсе былі бадзёрыя, нават узнёслыя.

— Хіба павернецца язык сказаць, што просты люд не рады рэвалюцыі? — паказаў рукою па людскую раку Чарвякоў.— Толькі ненавіснікі ці зайздроснікі могуць сіпець, што «народ супраць кастрычніцкага перавароту...».

— Эй, господин в шляпе! — нечакана з салдацкай калоны выгукнуў малады рыжы вайсковец.— Выше ногу, шире шаг!

Жылуновіч усміхнуўся, памахаў яму рукой і наўмысна вышэй падняў адну, а пасля другую нагу.

— Молодец! — нацешыўся салдат, таксама памахаў рукою.

— Ну што — зноў атрымаў за сваё еўрапейства? — пажартаваў Чарвякоў.

Жылуновіч сёння пі кропелькі не пакрыўдзіўся за недавер і кпіны з-за свайго адзення, моўчкі з усім згадзіўся, адчуваючы, як ад музыкі нібы самі нясуць ногі, урачысты святочны настрой на душы, і яна, спакутаваная, прагне ў гэтыя хвіліны велічнага.

Да Крамля было ў я; о не падступіцца — толькі, падняўшыся на дыбачкі, можна было ўбачыць перад сабою мора з вайсковых фуражак, розных шапак, капелюшоў і далёка, каля Крамлёўскай сцяны, купку людзей са сцягамі і вянкамі.

— Ленин! Ленин! — перадалося па агромністым натоўпе.— Идет от Сенатской башни.

Люд затаіў дыханні, быццам па камандзе дружна — хвалямі, нібы жыта ў вецер,— пачаў падымацца, абапіраючыся на плечы пярэдніх. Жылуновіч і Чарвякоў таксама, як маглі, выцягнуліся, сталі на дыбкі, ухапілі вачыма: сапраўды, вунь уздоўж высознай чырвонай сцяны ідзе невысокі чалавек у чорным паліто і чорнай шапцы, але тут жа іх, найперш яго, Жылуновіча, засланілі вышэйшыя.

Усе, як маглі, трымаліся на дыбках, намагаючыся ўбачыць ужо пры жыцці легендарнага чалавека, а неўзабаве пайшло-перадалося па натоўпе:

— Ленин говорит речь.

Натоўп замёр, слухаў, але сюды, на жаль, даляталі толькі абрыўкі прамовы. Ды яна была і кароткая. Пасля гэтага зноў з вуснаў у вусны:

— Ленин разрезает красную лепту.

— Открывает памятник Марксу и Энгельсу.

Неўзабаве новая звестка:

— Открывает мемориальную доску в память погибших революционеров.

Пасля копшай прамовы натоўп узрываўся воплескамі, а затым грымнуў гучны аркестр. А як толькі музыка сціхла, пачуўся шматгалосы хор:

Солнце златою печатью
Стражем стоит у ворот...
Спите, любимые братья,
Мимо вас движется ратью

К зорям вселенским народ...

Пасля, калі песня закончылася, люд зноў горача запляскаў, узбуджана загуў, недзе далёка пачуліся адрывістыя гучныя каманды — і ўсе пачалі цясніцца назад. Адступілі разам з імі і Жылуновіч ды Чарвякоў, вызваляючы месца для ваеннага парада і шэсця рабочай Масквы.

Назаўтра Жылуновіч і Чарвякоў з сем'ямі прыйшлі на Малую Бронную ў клуб III Інтэрнацыянала. Хоць заявіліся за паўгадзіны да вечарыны, але ўжо цяжка было зайсці ў залу. Люд запоўніў не толькі яе, але і ўсе праходы.

Іх угледзеў высакаваты, стройны Лагун у вайсковай гімнасцёрцы, замахаў рукою: хадзіце сюды. А калі прабраліся скрозь гурт узбуджаных, гаманлівых землякоў, дык убачылі: тут, на першым радзе, сядзяць ужо ажыўленыя Бурбіс, Фальскі (абодва яны, прыехаўшы ў Маскву, парвалі з БНР і пачалі супрацоўнічаць з Савецкай уладай), Мятла, Грыневіч, Дыла і іншыя знаёмыя літаратары, артысты, хто рыхтаваў гэтую вечарыну. Сярод іх знайшлося месца і ім.

— Бачыце, колькі сабралася!— усцешыўся Лагун.— А мы асцерагаліся, што мала хто прыйдзе!

Словы гэтыя былі не выпадковыя. Раней, мусячы ўцячы ад вайны і ў Петраград ды Маскву, землякі нібы рассыпаліся па адным, кожны жыў сваімі клопатамі, а вось сёлета, калі пачалі клікаць іх з усіх закануркаў Белнацком ды «Дзянніца», калі самі адчулі, што можна вярнуцца па радзіму, ажывіліся, пачалі гуртавацца, як ластаўкі перад адлётам, і цягнуцца да іх. Да ўсяго гэтага, мусіць, на чужыне засумавалі без роднага слова, песні, да чаго той-сёй некалі адносіўся ці абыякава, ці нават грэбліва.

— Ну што, дзядзька Зміцер, будзем пачынаць? — запытаў Лагун, а пасля як загадчык Белнацкома выйшаў на сцэну.

Гаманлівая зала сціхла, толькі чуліся рэдкія і далёкія пакашліванні, а пасля, лічы, узарвалася ад воплескаў. Малады Лагун, не прывыкшы да такой ува гі, ані збянтэжыўся.

— Таварышы! Землякі! — калі настала цішыня, прамовіў з хваляваннем.— Мы ад імя Белнакома паклікалі вас сюды, у гэты клуб з сімвалічнай назвар, каб разам з усім расійскім народам адзначыць вялікае свята працаўнікоў усяго свету — першую гадавіну Вялікага Кастрычніка. Дазвольце ад усёй душы шчыра павіншаваць вас з гэтай слаўнай падзеяй!

Зала зноў успыхнула воплескамі, нават больш — авацыяй.

У гэты час на сцэну пачалі выходзіць вайскоўцы — аркестранты. Пастроіўшыся, яны грымнулі «Інтэрнацыянал». Усе, хто быў у зале,

падняліся і замёрлі ад ужо ўсім знаёмага і блізкага пралетарскага гімна.

Калі аркестранты пайшлі, Лагун зноў выйшаў на сярэдзіну сцэны і сказаў:

— А цяпер, таварышы, папросім сказаць слова вядомага беларускага пісьменніка, рэдактара «Дзянніцы» Зміцера Жылуновіча.

Ён аддаў дачку на калені сёння хораша ўвабранай Надзеі, а сам, узрушаючыся ад авацыі, што была ўжо яму, выйшаў на сцэну і кінуў позірк на залу: у ёй, здаецца, было не меней паўтысячы людзей рознага ўзросту і полу.

— Сябры! — прамовіў, намагаючыся не «французіць», а гаварыць памалу, ясна.— Напраўду, сёння для нас усіх вялікае свята...

Пасля, пазіраючы ўжо не на ўсіх, а на аднаго чалавека — пажылога русявага дзеда з вусамі і барадой,— які сядзеў пасярод залы і слухаў, прыклаўшы руку да вуха, пачаў расказваць, чаму пачалася гэтая вайна, што яна дала, чаму былі лютаўская і кастрычніцкая рэвалюцыя. Як сведка, расказаў, што і як летась рабілася ў Петраградзе, як паволі брала моц Савецкая ўлада і як паволі разгортваўся беларускі нацыянальны рух на савецкай аснове, што і як робяць Белнацком, «Дзянніца», беларускія камуністычныя секцыі, каб хутчэй ім, бежанцам, вярнуцца дахаты.

— Сябры,— сказаў на заканчэнне,— пабадзяўшыся на свеце, паспытаўшы хлеба, долі на чужыне, нельга не палюбіць мацней свой родны кут, не зажадаць, каб у нас там быў не чужы, а свой, уласны дом, свая гаспадарка. Вось пагэтаму мы, хто прыйшоў да гэтай высновы, і дабіваемся, каб была прызнана наша Беларусь, каб яна займела хоць аўтаномію ў складзе Расеі...

Яго апошнія словы аж патанулі ў воплесках.

— Дык няхай жыве Вялікі Кастрычнік! — усклікнуў ён.— І давайце яго другую гадавіну адзначым улад на сваёй змардаванай, але жывой Бацькаўшчыне, у Савецкай Беларусі!

Зноў усе падняліся, наладзілі авацыю. З залы самі па сабе пачуліся галасы:

— Слава Кастрычніку!

— Няхай жыве Савецкая Беларусь!

Пасля на сцэну вывеў хор з беларускай моладзі Мачыхін. Спачатку ўрачыста, яднаючы ўсіх, загучала беларуская «Марсельеза» як іхні нацыянальны гімн, які паслухалі стоячы, а той-сёй і падпяваючы, а пасля былі песні: «Не згаснуць зоркі ў небе», «Чаму яе мне не пець», «Чалавек жонку б'е». Салісты пад акампанемент фартэпіяна праспявалі «Зялёную дубровачку», «Бяду», «Долю». Амаль усе песні спявалі па

некалькі разоў, як таго хацелі згаладалыя па родных мелодыях расчуленыя і заплаканыя слухачы. Чыталі і вершы. Бурбіс, Фальскі, а ён, Жылуновіч, прачытаў свой верш, што быў змешчаны ўчора ў «Дзянніцы»: «Да 25 Акцябра».

Пасля, калі вечарынка закончылася, доўга ўсе не разыходзіліся, амаль кожны хацеў прабрацца да іх, людзей з Белнацкома, артыстаў, і пацiснуць руку, пацалаваць.

## РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

### 1

Сібер узяў сваё, і ўладарна пачала ўлягацца зіма.

Жылуновіч з накінутым на плечы паліто сядзеў у сваім рабочым пакоі і пазіраў у акно: за ім было шэрае, са слабым блакітным адценнем неба, гуляў-шалеў вецер, наносячы ўжо сухі белы снег — вось новы парыў сыпнуў на дах блізкага невысокага дома белых круп, якія пакаціліся ўніз, а пасля, упаўшы з даху, рассеяліся нібы на беласіні дым, зніклі, але тут жа замест улеглай на зямлі сыпанкі пала, развеялася новая, насыпаючы каля падмурка дома мяккую гурбачку. І так нібы бясконца звычайны, а разам з тым і прыгожы зімовы баль. І тут, і ўжо, мусіць, у далёкім адгэтуль Капылі, дзе яго родны дом, сямейнікі — адным словам, родны кут, ад якога ён ужо даўно адарваўся, але які з кожным годам пражытым без яго ўсё мілей ды даражэй, як чалавеку і адлучанаму ад радзімы пісьменніку.

— Дзядзька Зміцер, пошта,— парушыў яго адасобленасць, думкі Янка Нёманскі і паклаў перад ім кійку лістоў. Дзякуй богу, землякі пішуць ім. Лічы, з усёй еўрапейскай Расіі.

Узяў нажнічкі, роўненька абрэзаў кант верхняга ліста з Тамбова (сам не любіў неахайнасці і іншым яе не дазваляў), дастаў невялікі сіні лісток.

Адразу кінулася ў вочы: напісана мала, а вось подпісаў пад ім шмат. І вунь якія знаёмыя прозвішчы: Барысёнак, Дзягель, Сечка, Клімавец, Клімашонак, Ісаёнак, Клімовіч!

«Дзяньдобры Вам! — пісаў хтосьці роўным прыгожым почыркам.— Прачыталі ў № 35 «Дзянніцы» «Ня прыстойна камуністам!» Камуніста Беларуса. Мы лічым: ён напісаў горкую, але вялікую праўду...»

Усцешаны Жылуновіч аддаў ліст калегу па рэдакцыі, а сам дастаў новы ліст.

«...Мы, кулямётчык Лявон Сівеня і артылерыст Пятро Гарбуз, чулі, што ці то ўжо ёсць, ці то будзе беларускі полк. Мы хацелі б запісацца ў яго, каб хутчэй выгнаць немцаў з нашай роднай зямлі...»

Гэтыя нядаўнія (мусіць, параненыя, а цяпер акрыялыя) салдаты цяпер жылі ў Казані.

«Да нас, у воласць, прыслалі вашу газэту. Мы чыталі яе ўсім нашым земляцкім гуртам...— пісалі ў новым лісце.— Чыталі і плакалі: і навіны ўведалі пра нашу старану, і як з вамі, са сваёй вёскай пагаварылі на сваёй гутарцы. Усё гэтак па-нашаму, папросту, ад сэрца і душы... Каб вы ведалі, браточкі, як цяжка, што мы тут чужыя, беспрытульныя, што вайне канца няма. Нам гэтак хочацца дарогу. Напішаце нам: а ці пускаюць Саветы і немцы пашых людзей? Калі пускаюць, то паедзем, хоць і зіма...»

Ліст быў з Самарскай губерпіі.

«Дарагі Камуніст Беларус! — хтосьці пісаў размашыста асабіста яму, праўда, не ведаючы, хто ён.— Дык усё ж як жа з Беларуссю?..»

Калі прачытаў гэтыя радкі, дык яму ані шугнула да галавы кроў. Бач, яшчэ адна жывая душа (адкуль жа яна? Ага, нехта Клаўсуць з Куршчыны) непакоіцца пра тое, што трывожыць і іх. Ён хуценька ўзяў самапіску і пасярод чыстага аркушыка вывеў загаловак, які падказаў іхні незнаёмы чытач-сябар: «Як жа з Беларуссю?»

«Кожны дзень нясе штосьці новае,— пісаў яму незнаёмы чытач,— але да нашага берага не прыстае нічога добрага. Увесь час, са дня яшчэ першай расейскай рэвалюцыі, да нас няма жаднай увагі, а калі ёсцека якая ўвага, то, як ты пішаш, надта ж злая, хоць мы маем поўнае права на сваю аўтаномію ў Расейскай рэспубліцы. Дык хто папраўдзе, калі не камуністам, мусяць уважыць досыць вялікі нешчаслівы народ?..»

Усё, сёння — не, неўзабаве! — будзе артыкул з вышэйазначаным загалоўкам. Але напісаць ні радка не паспеў: у пакой зайшоў сярэдняга росту, камлюкаваты малады русявы дужэц. Стаў у парозе, сцягнуў з галавы белую шапку.

— Дзяньдобры,— павітаўся па-беларуску.

Жылуновіч, як і заўсёды, рады, што ў Белнацком
і «Дзянніцу» усё часцей і часцей (асабліва пасля 13 лістапада, калі Савецкі ўрад ануляваў Брэсцкі дагавор) заходзяць землякі і хочуць хоць у чым памагчы, падняўся і падаў руку:

— Добры дзень, зямляча!

Прыязна ўсміхнуўся. Сціплы, нават вельмі сарамлівы хлопец, але, адчуваецца па ўсім, спакойны і цягавіты. Чамусьці прыемна пахне ад яго цёплым хлебам. Можа, трымае ў кішэні свежую лусту.

— Прысядзьце, калі ласка.

— Я на хвілінку,— адказаў той басам.— Я хачу запісацца ў беларускі полк.

— Цягне дадому?

Той хітнуў галавою.

— Малайчына! — пахваліў Жылуновіч.— Выбачайце, скуль самі будзеце?

— Я з-пад Стоўбцаў, з вёскі Горкі. Барысевіч. Рабіў да вайны на гаспадарцы, а ў вайну прыбіўся сюды. Працую ў хлебапякарні.

— У нас, у Белнакоме, ёсць чалавек з вашых мясцін. Мазур — былы настаўнік, салдат. Не чулі?

Той пацінуў плячыма: не, не чуў.

— Шкода, цяпер Мазур у адлучцы, а то пазнаёміліся б,— шчыра пашкадаваў Жылуновіч.— Але дасць бог — пазнаёміцеся ўжо ў Мінску... А цяпер сапраўды трэба нам, маладым, памагчы Чырвонай Арміі выгнаць акупанта з Бацькаўшчыны, а заадно дабіцца для нашага народа прызнання...— Усміхнуўся.— Чытайце «Дзянніцу», падзяляеце яе ідэі?

Негаваркі зямляк зноў хітнуў галавою. А пасля не вытрываў, запытаў:

— Як вы лічыце: ці ўдасца калі дабіцца нам сваёй Беларусі?

— А вы хочаце гэтага?

— Раней, да вайны, я не думаў пра гэта, а цяпер лічу: мы, як вы пішаце, краіна, народ...

— Чым болей такіх, як вы, будзе нашых землякоў, тым хутчэй мы свайго даб'ёмся,— усцешыўся Жылуновіч, узяў са свайго стала загадзя падрыхтаваную паперку,— Вось адрас Спаскіх казармаў, дзе мы памагаем фарміраваць 9-ты Полацкі Беларускі полк Заходняй стралковай дывізіі. Ідзіце туды самі, клічце іншых — Бацькаўшчына нас даўно ўжо чакае...

Пацінуў руку на развітанне, а калі малады госць-зямляк пайшоў, а за ім выйшаў з пакоя і Нёманскі, задаволена сеў за стол і адразу пачаў лёгка пісаць:

«З кожным часам сусьветныя здарэньні пашыраюцца і разьвіваюцца з няўтрымным пэнтам. Кожны дзень нясе з сабою новыя і новыя мажлівасьці, аб якіх не толькі ніхто яшчэ ўчора з нас не спадзяваўся, але і думаць не думаў. Гэтак, зусім нядаўна нельга было і заікнуцца аб гэткім скорым і раптоўным расколе сярод сярэдковых хаўруснікаў, Германіі і яе сяброў. Тым часам Балгарыя кінула вайну, за ёю хутка тое зрабіла Турцыя, Аўстрыя і Германьня.

Пабора апошняй прывяла да рэвалюцыі і сапхання Вільгельма.

Ня заўтра-паслязаўтра мы мопсам прачнуцца і прачытаць у газэтах, што дбайныя імпэрыялісты зрабілі згоду і маюцца ўсесціся за сталы плянаваць і кроіць Эўропу па-свойму. Тая паслухмянасць, з

якою адносяцца покуль што працоўныя станы да сваіх правіцяльстваў у Амэрыцы, Францыі, Англіі і інш. гасударствах, нас вельмі могуць трывожыць за лёс у скоры час сусветнай рэвалюцыі і праз гэта аб спакою ў праступнай гэтай працы буржуазіі. Праявы як наогул не даюць тчэ нам пэўнасці на тое, што працоўны народ усіх ваюючых гасударстваў сам скончыць вайну, як тое сталася ў гэтым прыпадку з расейскім пародам. І вось праз гэта вытыркае на поверх перад намі, беларусамі-камуністамі і ўсім беларускім працоўным народам адно дужа вагкае, дуяга значнае і ў той самы час вельмі казлытнае пытанне: што станецца з Беларусьсю? Які лёс яе чакае? З якой доляю ёй прыйдзецца спаткацца?»

Пісаў у такім запале і так хутка, што аж замлела рука — не вытрываў, расслабіўся, зірнуў у акно, за якім па-ранейшаму цешылася асмялелая мяцеліца, шчодра сыплючы лёгкі белы снег.

Паназіраў, нават нібы ўвайшоў душою ў гэты нястрымны танец зімовай сілы, што і палохаў, і радаваў заадно. Праўда, ён не цягнуў на двор, на яго толькі было прыемна пазіраць з цеплаватага пакоя.

Набраўся сіл, запалу і зачыркаў далей:

«Увесь час, са дня расейскай рэвалюцыі, беларускае пытаньне нядбайна прапушчаецца між пальцаў: яму не было ўдзелена ніводным складам правительства жаднае ўвагі. Нібы якая ліхая прымха гэтаму шкодзіць, нібы мара таму віною, што ўсе, хто б мог гэта і меў сілу, баяцца дакрануцца да яго і знарочыста ці забыўна адварочваюцца і ад думкі той, што ёсьцека Беларусь, а значыць, ёсьцека і беларускае пытаньне. Усе патугі звярнуць на гэта ўвагу каго належыць разбіваюцца ў дробкі, бы шкелка аб камень. Ні пастановы з'ездаў, ні патрабаваныі 10-тысячных мітынгаў — нішто не прабірае тоўстага слою поўнае адцураннасці ад столь значнай і важнай справы, як беларускае пытаньне. Наадварот, чым далей, тым болей расце такая сумыслая варожасць да яго ў кіруючых колах».

Перавёў дыханне і далей:

«Гэта не нармальна, гэта нават болей ненармальнага. Беларускім камуністам не горай сваіх расейскіх таварышаў вядома, што ўсякай нацыянальная справа не мояеа ладзіць з класаваю барацьбою, калі яна перамагае значнасць апошняй. Цяперака час не такі. Але павінны і расейскія таварышы, а таксама і ўлада рабочых і сялян пераканацца тою думкаю, што ў некаторых варунках без яе нельга абысьціся, каб не ўразіць, каб балюча не закалупіць рэвалюцыі, каб не прынесці для яе шкоды. Якраз справа стаіць у гэткай падмасці з Беларускім пытаннем. У той час, калі мы нядбайна адмахваемся рукамі ад яго, як ад ліхога духу шавінізму, калі ўсе баяцца сваім імем празваць

гістарычны жывучы край, калі ніводнага слова ў нотах ні т. Сталіна...»

Перапыніўся, закрэсліў «т. Сталіна», напісаў зверху «т. камісара спраў нацыянальных» і далей: «ніякіх крокаў, к таму ж у т. т. з Заходняе Камуны — з Беларусьсю чаўпецца нешта сапраўды страшнае, а грозіцьёй яшчэ страшнейшае».

Падняў галаву, але пахітаў сам сабе: сапраўды, дзеецца-робіцца на беларускай зямлі жахлівае: топчуць, рабуюць яе германскія войскі, добры кавал яе прырэзала сабе Украінская Народная Рэспубліка, а БНР, якой цяпер кіруе Антон «Нанкінскі, хаўрусуе і з немцамі, і са Скарападскім. І гэта яшчэ не ўсё. Польскія кіруючыя колы, якім, лічы, на днях удалося многае ўзяць у свае рукі, не думаюць абыходзіцца па-братэрску, пасягаюць на «спаконвечныя свае землі ад можа да можа, ад Віслы да Непры».

«Каб толькі якім-кольвек прычэпам адарваць ад Радавай Расеі большы кусок,— пачаў зноў пісаць,— буржуазія хаўруснікаў і з хаўрусніцкай з ёю нямецкай буряеуазіяй паложаць сваю руку для подпісу польскіх патрабаванняў, хутчэй таму, што беларускага голасу з Радавае Рэспублікі не чуваць ні званьня. І праз гэткія парадкі дзесяцімільённы беларускі народ можа быць ахвярованым па падмацаваньне буржуазіі, на шкоду Расейскай Рэвалюцыі.

Якімі ж вачыма мы тады, дачакаўшыся гэтага, паглядзімо ў вочы гарацешнаму беларускаму працаўніку? Што ён з нашай часткаю віны, падняпадшы ў прыгон, скажа нам? Пэўна — не падзякуе».

Падняў галаву. Адчуў: успацеў лоб, нос. Мусіць, ад вялікай энергіі, што, як вулкан, бушавала ў яго душы. Пакуль не астыў, перамагаючы боль рукі, пачаў закругляцца:

«Нашы таварышы, трымаючыя ўладу, павінны кінуць сваю нядбаласць да цэлага народу і ясна паставіць пытанне аб долі Беларусі. Беларусь мусіць быць аўтаномнаю часткаю Федэрацкае Расейскае Рэспублікі... Думаецца, што як т. камісар замежных спраў, гэтак і т. камісар спраў нацыянальных ды і т. т. з Заходняе Камуны загавораць пра гэта настаяшчай моваю. Чакаем гэтага, пакуль не позна.

Беларус-камуніст».

Падпісаў, але не падымаў галавы. Пазіраў на ўзбуджаныя радкі, астываў, як пасля доўгага і хуткага бегу, а з супакойваннем пачала падкрадвацца і насцярога: а ці не зарэзка? Ці не з адчаем альбо выклікам — найперш да Чычэрына і Сталіна?

Перавярнуў лісткі, кінуў позірк на загаловак і першыя радкі. Але перачытаць, тым болей правіць не мог: у пакой хтосьці пастукаў.

— Калі ласка,— гукнуў ён.

Дзверы адчыніліся — сюды зайшоў пажылаваты дзядзька ў ботах, чорнай тужурцы і фуражцы з цвёрдым бліскучым брылём.

— Здравствуйте,— схіліў галаву.— Я, собственно, с заявлением к вашему заведующему, но его нет. Так меня направили к вам.

Сапраўды, Лагуна цяпер не было ў Маскве — ЦК РКП (б) паслаў яго для разведкі пад выглядам рускага афіцэра, які нібыта ўцякае ад бальшавікоў, у толькі што вызваленыя беларускія раёны — недзе пад Баранавічы.

Жылуновіч зноў падняўся, цёпла прывеціў і гэтага госця — той, хуценька зняўшы фуражку, паціснуў руку ў адказ, а пасля падаў паперыну.

«Привыкнув к Белоруссии и полюбив белорусский народ,— пісаў ён, загадчык гаража Усерасійскага галоўнага штаба А. А. Мілушкін,— желаю послужить ему и отдать силы и многолетний опыт, а поэтому прошу не отказать и представить место, соответствующее моему образованию, опыту и знанию автомобильного дела, в Минске».

Белнацком шмат прасіў раней, а нядаўна, у кастрычніку, пастанавіў на сваёй калегіі яшчэ раз дабівацца ад маскоўскіх партыйных арганізацый, ЦК РКП (б), народных камісарыятаў, каб пасылаць камуністаў, ім спачуваючых спецыялістаў на Беларусь і каб з гэтымі людзьмі папярэдне маглі пагаварыць і ў Белнацкоме. Таго-сяго дамагліся, і з іхнім блаславеннем падаўся туды, у акупаваны край, не адзін дзесятак сур'ёзных палітработнікаў, але ехалі людзі і без іх згоды. Тое-сёе рабілася ў абыход ім альбо ў перамовах з Заходняй камунаю.

— Думаю: смогу по-настоящему пригодиться. Ведь грядет век техники...

Жылуновіч слухаў і пазіраў у светлыя спакутаваныя вочы чалавека. Позірк іх быў ясны, цёплы.

— Если надо будет выучить белорусский, то я это сделаю быстро. Я все понимаю по-вашему, только вот говорить не совсем умею.

— Дзякую, таварыш Мілушкін,— усміхнуўся Жылуновіч.— Такіх людзей, як вы, мы рады бачыць, вітаць і тут, і на сваёй радзіме...

**2**

З канца лістапада Жылуновіч, лічы, забыўся, што такое ноч альбо адпачынак, увесь з галавой кінуўся ў вір палітыкі, сходаў, самім жыццём вылучыўся ў партыйнага лідэра сярод землякоў.

Вось на сёння сабраў усіх сваіх камуністаў з нядаўна прызнанай Прэсненскім РК РКП (б) Маскоўскай Беларускай камуністычнай секцыі, адкрыў сход. Як старшыня камітэта.

— Таварышы, трэба пачаць з сумнага,—прамовіў нявесела.— На днях гішпанка вырвала ад нас таварыша Хрэнава — нашага паплечніка, маладога камуніста, які быў вельмі патрэбен нам. Давайце ўшануем яго памяць.

Дзесяткі два людзей — амаль усе маладога веку, у выцвілых гімнасцёрках ці ў цывільных паношаных пінжаках, русявых і цёмных — падняліся, памаўчалі хвіліну. Пасля, калі селі, Жылуновіч расказаў, як і дзеля чаго засноўвалася секцыя, пазнаёміў з новымі людзьмі.

Пасля, калі абралі прэзідыум (старшынёй яго, таварышам старшыні — Клыша, сакратаром — Чарнушэвіча, а таксама Дзедзю і Дыну) і зацвердзілі парадак дня. Жылуновіч стаў з боку стала, за якім сядзеў прэзідыум, учэпіста (строга, як падумаў той-сёй) зірнуў на знаёмых, затрымаў позірк на Мазуры — высакалобым, з вялікімі карымі цёплымі вачыма, з чарнявымі, лёгка кучаравымі валасамі, апранутым у шэры пінжак і ў кашулю з нацыянальным узорам, звычайна рухавым, а цяпер засяроджаным,— з ім, як і з Язэпам Дылам, Янкам Нёманскім, ён вельмі пасябраваў у апошні час. Па-другое, яму было лягчэй гаварыць тады, калі ён пазіраў не на ўсіх адразу, а на нейкага аднаго чалавека.

— Таварышы,— прамовіў ён, намагаючыся не гугнець у нос, а гаварыць ясна,— само жыццё змушае нас мець тут, у Маскве, моцную камуністычную сілу з беларусаў. Па-першае, якраз мы павінны памагчы Савецкаму ўраду, Чырвонай Арміі вырваць наш край з кіпцяў міжнароднага імперыялізму, з рук краёвай буржуазіі, па-другое, у эпоху вялікага разняволення вызваліць наш народ ад шматвекавога парабкоўства і зрабіць вольным, дзяржаўным народам — толькі мы, камуністы, абапіраючыся на найбольш свядомую нашу інтэлігенцыю, на работнікаў і сялян, можам заснаваць Беларускую Савецкую Рэспубліку.

Гаварыў памяркоўна, не спяшаючыся, але яго словы ў заціхлай невялікай зале не толькі чуліся выразна, але, як бачыў, пранізвалі душу кожнага чалавека.

— Як бачыце, за гэты месяц шмат змянілася ў свеце, у акупаванай Беларусі,— не з паперкі, а так гаварыў далей.— Для нас, для ўсяго нашага народа — велізарная падзея тое, што Савецкі ўрад ануляваў несправядлівы Брэсцкі дагавор, што Чырвоная Армія разам з нашымі землякамі вызваляе наш край. Але новы момант нясе і новыя клопаты. Пра іх нядаўна пісала «Дзянніца» ў артыкуле «Як жа з

Беларуссю?». Я тут хачу яшчэ і тое-сёе дадаць. Прайшоў тыдзень, як гэты артыкул не толькі заявіўся ў газеце, але і ў перакладзе на рускую мову пададзены і Сталіну, і ў Смаленск, ды адказу — ніякага... Нават болей, таварышы: ёсць чуткі, што Адміністрацыйная камісія ВЦВК на чале са Свярдловым мае праект, па якім Савецкая Расія будзе складацца не з нацыянальных рэспублік, а з эканамічных рэгіёнаў: Заходняя, Маскоўская, Паўночная, Уральская вобласці і г. д. Яшчэ. Да нас даходзяць чуткі, што расце напружанне ў акупаванай Беларусі: з аднаго боку дасягае апагею падпольная, партызанская барацьба супраць германскай агрэсіі, а з другога боку — сутычка за ўладу паміж нядаўнімі саюзнікамі. Эсэра-бундаўскі цэнтр губеранскага цэнтра адваёўвае яе ў БНР, застаючыся па пазіцыях вернасці скінутаму Часоваму ўраду Керанскага. Узніклі, як ядавітыя грыбы пасля першага дажджу, розныя афіцэрскія бюро, якія вярбуюць нашых землякоў у контррэвалюцыйныя паўночную і паўднёвыя арміі, каб шпурнуць іх на Савецкую ўладу. Да ўсяго гэтага «народны» ўрад Польшчы, «начальнік дзяржавы» Пілсудскі і «паляк з беларускім сэрцам» Доўбар-Мусніцкі з дня на дзень адчуваюць усё большы апетыт. Спачатку яны толькі пратэставалі, што Чырвоная Армія «навадняе спрадвечна польскія землі», а пасля пачалі патрабаваць: давай ім Польшчу ў былых яе межах, аж за Смаленск. Цяпер жа, калі сабралі сілу і адчулі спрыянне Антанты, замяшанне немцаў, рушылі на ўсход, захапілі Брэст і падышлі да Баранавічаў... Усё гэта, дарагія таварышы, вельмі сур'ёзна, нават небяспечна. Мы гэта ўлічылі і, ведаючы, што рана-позна прыйдзецца ці ўсё растлумачваць, папрасілі знаёмых вучоных Карскага, Сабалеўскага, Шахматава, Любаўскага, Пічэту і іншых, каб яны на аснове дакументаў як след даказалі, што ў свой час Беларусь і Літва не былі вотчынаю Польшчы, а разам з ёю ўваходзілі ў федэрацыю Рэчы Паспалітай. Пагэтаму Пілсудскі і Доўбар-Мусніцкі не маюць ніякага права падмяняць паняцці «Польшча» і «Рэч Паспалітая», замахвацца на нашы і літоўскія землі. Мы самі маем сваю спрадвечную Бацькаўшчыну, сваю гісторыю, культуру, пагэтаму цяпер самі, без апекуноў, будзем дбаць пра волю і нацыянальныя межы — у цесным саюзе з Расіяй... Адным словам, сама Беларусь наша і ўсё вакол яе кіпіць, як гарачы кацёл, і з гэтага кіпення можа выйсці самае непрадбачанае...

Кажучы гэта, узбудзіўся, бо не толькі на словах, але кожнаю жылкаю адчуваў навіслую новую пагрозу, марнасць таго, што яны рабілі і робяць.

— Я лічу: мы самой гісторыяй абавязаны,— прамовіў, падняў левую руку і загнуў мезенец.— Першае: ясней даказаць Сталіну, Мяс-

нікову, іншым кіруючым таварышам, што цяпер ставіць наша нацыянальнае пытанне толькі абстраітіа, і не гуманна, і небяспечна. Дзеля ўсёй Савецкай улады. Узяўшы Мінск, Магілёў, Пілсудскі з Доўбар-Мусніцкім зажадаюць ісці і далей на Усход. Дык Савецкая Беларусь не толькі задаволіць нашы мары, але і будзе заслонаю для прасоўвання буржуазіі на Усход! Другое: трэба вядомым нашым камуністам выехаць у Петраград, Тамбоў, Саратаў, Казань, Смаленск, Віцебск, Магілёў і як след пагутарыць з нашымі камуністамі, свядомымі землякамі, якіх разам не адна сотня чалавек. Трэцяе: трэба прабрацца і ў акупаваны Мінск, пастарацца знайсці адну мову з тамтутэйшым камуністычным падполлем, дабіцца ад іх разумення і помачы. І чацвёртае: давайце рыхтаваць з'езд усіх беларускіх камуністычных секцый, дзе ўтварыць наш партыйны цэнтр і заадно запатрабаваць: Савецкая Беларусь павінна быць мусова!

Перавёў дыханне. Адчуў: ад таго, што гаварыў страсна і рэзка, зачырванеўся. Але ўзяў сябе ў рукі, акінуў усіх позіркам і дадаў:

— Калі вы падтрымаеце ўсё гэта, то тады яшчэ можа быць нам нейкі шанец. Калі ж і цяпер будзем асцярожныя, нясмелыя ці чакаць міласці, то, убачайце...— Не любіў жэстыкуляваць, дык адагнуў чатыры загнутыя пальцы і махнуў рукою.— Тады не варты мы самі нічога і гэткіх жа нявартых наплодзім нашчадкаў, бо яблык ад яблыні недалёка падае...

Сеў па пярэдняе крэсла. Зала ўзарвалася воплескамі. Стрыманы, ён, аднак, у гэтую хвіліну шмат намагаўся, каб не пусціць на волю слязу — і ад свайго ўзрушэння, і ад вось такой ухвалы ад землякоў, некаторыя з якіх былі ці не зусім з развітымі нацыянальнымі пачуццямі, ці асцяроншыя, ці нават далёкія ад таго, што рабіў ён і яго калегі.

— Дзякую, таварыш Жылуновіч,— падняўся і схіліў галаву старшыня.— Як самі бачыце, вашы словы ўсхвалявалі ўсіх. А цяпер,— падняў вочы,— прашу, таварышы, пачаць спрэчкі. Хто хоча прамовіць?

— Дазвольце мне,— падняўся ў зале Мазур.— Я цалкам згодзен з усім, што сказаў наш паважаны прамоўца — адзін з самых вядомых на сённяшні дзень беларускіх дзеячаў, шчыры камуніст. Нам усім зразумелыя яго клопаты, боль, мары, бо ўсё гэта і ў кожнага з нас на душы, у сэрцы... Да пачутых намі слоў я хачу толькі дадаць: нам цяпер вельмі патрэбная свая партыйная газета, бо «Дзянніца» і выходзіць рэдка, і па сваім профілі мусіць мець свой накірунак.

За ім пачалі выступаць іншыя. Да слова, Язэп Дыла сказаў, што тут, у Маскве, патрэбен Беларускі камуністычны клуб як асяродак палітыка-культурнай работы для землякоў, Клыш гаварыў, што трэба

болей выдаваць партыйнай літаратуры і для тых, хто жыве тут, і для тых, хто ў акупацыі, а Чарвякоў, а за ім і Чарнушэвіч дадалі, што Белнацкому, Маскоўскай Беларускай камуністычнай секцыі трэба болей падбаць пра фарміраванне беларускіх чырвонаармейскіх часцей.

Затым, калі прамовіла яшчэ некалькі чалавек, запісалі ў рэзалюцыю:

— выдаваць беларускую партыйную газету;

— адчыніць у Маскве Беларускі камуністычны клуб;

— скласці спіс партыйнай літаратуры і ў самы блізкі час пачаць выдаваць яе;

— пасланць камуністаў усюды, дзе ёсць камуністычныя беларускія секцыі. А іменна: Жылуновіча і Чарвякова — у Петраград, Дзедзю — у Саратаў, Тамбоў і іншыя расійскія гарады, Лагуна, Клыша, Майзеля — у Мінск;

— рыхтаваць з'езд камуністычных беларускіх секцый РКП (б). Дзень пачатку работы, яго парадак аб'явіць пазней, як толькі скончацца перамовы.

Пасля гэтага пачалі спрэчкі пра іншае — пра Белнацком. Тыя, хто працаваў у ім, расказалі, што яны і як рабілі, паскардзіліся на Сталіна і Мяснікова: ад першага мала помачы, а ад другога — ніякай. Рашылі: даручыць Фальскаму, Няцэцкаму і Клышу сустрэцца са Сталіным і папрасіць патлумачыць, чаму той ў такі напружаны час рашыў перастрэсці Белнацком і скараціць яго штаты, а таксама дабіцца, каб цяпер на чале Белнацкома быў камісар і меў большыя правы, а заадно рашылі, што Маскоўская Беларуская камуністычная секцыя бярэ пад назірк Белнацком, на пасаду яго камісара варта параіць Жылуновіча, намеснікам — Мазура.

Пад канец абралі партыйны камітэт з 9 чалавек, а за старшыню — яго, Жылуновіча. Вылучылі сваіх пасланцоў у Прэсненскі раённы, Маскоўскі гарадскі камітэты РКП (б), у раённы саўдэп і ў сакратарыят ЦК партыі. А на самае заканчэнне сход секцыі абраў дэлегатаў на канферэнцыю Беларускіх камуністычных секцый: Жылуновіча, Дылу, Няцэцкага і Рыбака.

3. З «Ліста да Беларускага народу», змешчанага ў «Дзянніцы» за 25 лістапада 1918 года.

«З суседняе раднячае вольнае Расеі шлю я табе прывітаньне, мой бедны, замучаны і няшчасны народзе! Жывучы тутака, у краіне, дзе поўная воля, дзе бедны працоўны народ карыстае ўсім багацьцем, якое праз увесь час ён тварыў, фабрыкамі, заводамі, мураванымі дамамі і зямлёю, якую ён спакон веку абрабляў дзеля багатых, я

пераношуся к табе штораз і смуткую, бачачы цябе ў няволі, у прыгоне, як і ўперад, пры паншчыне і пры самадзяржаўі. Цяжкая рука ўціску вісіць над табою, гняце і не дае вольна сапці, не дае адплюшчанымі вачыма глядзець на яснае сонейка. Як пры цару ты, мой народ беларускі, працуеш на папоў, якія глумяцца з цябе, на немцаў, якія цябе наднявольваюць тым панам і мярцвяць, калі ты спрачаешся іх слухаць. Вось хутка цэлы год, а для іншых месцаў ужо болей і двух гадоў, як нішчыць задуманая багацеямі вайна родную тваю Беларусь, губіць сыноў тваіх пад кулямі і на абшары вялікай Расеі галоднымі. Час, дарагі, нясцэнены праходзіць час, а будаўніцтва свае краіны ты і не крануў, бо не мог... Гэта копшы дзень я чую рацыя, бадзёрыя песьні волі, а там — дома, у сябе, ты пяеш, як і пяяў да свабоды, да чырвоных феўральскіх і акцяберскіх дзён, свае плаксівыя, маркотныя песьні...

Прыходзяць да цябе весткі з братняе Расеі, і весткі гэтыя абмаляваныя ліхімі людзьмі, тымі, што цябе катуюць і хочуць у Расеі вярнуць цара, у чорную брудную мулю; імі страшаць цябе, хочуць настроіць супраціў вольнага парадку, наварожыць да яго, каб ты не любіў яго.

Я ведаю, што гэтым чуткам ты не верыш, а шукаеш другіх, якімі дзелюцца з табою многія твае сыны, што жывуць у Расеі і наязджаюць потайкам у тваю, Беларускую зямельку. Гэтыя весткі праўду кажуць аб той волі, што жыве тут. Ты павер ім! Усе паны і багацеі не маюць жаднае сілы ў Расеі і за іх няма каму ўзяцца, як то было нават пры Керанскім. У тваёй жа старонцы, Беларусі, яны крулююць, як самі хочуць.

Вось чаму, мой родны народ беларускі, гэтыя паны, твае прыцісакцелі ўвесь час стараюцца ўпрошваць нямецкае начальства, каб яно не брала да дому войска, а пакінула яго на Беларусі. Яны ведаюць, што калі немцы вывядуць войска, то ты не будзеш маўчаць і пастараешся прагнаць сваіх катаў ад сябе і завесці гэткія парадкі, нібы ў Расеі: забраць усё дабро ў свае рукі і завесці вольнае жыццё. Памешчыкі і буржуі выдалі нейкую Раду, пасадзілі яе ў Мінску, празвалі Беларускім Правительствам і гутараць з багачамі другіх краёў ад твайго Імяні, каб даць большую вагу гэтай гутарцы і хутчэй замацаваць над табою сваё панаваньне.

Пэўна, мой працаўнічы народзе, ты не дасіся сябе абмануць і не пойдзеш за сваімі катамі. Доўгія гады ўжо ашуквалі яны цябе, прыгняталі і не давалі патолі свабодна ўздыхнуць! Цяперака, мне здаецца, ні нямецкія, ні французскія, ні ангельскія багачы, купцы і памешчыкі, не сумеюць ускінуць на цябе цуглі і заставіць ім служыць. Ці не праўда? Я ведаю, што ты кахаеш волю, бо сам бедны, пяймючы,

вякамі тужыў аб ёй; а любячы волі, дастанеш з-пад усякае забароны; дастаўшы ж сам, забароніш ад ліхіх людзей. Ведаю я, што кіпіць у цябе пачуццё змаганьня і неўзабаве яго ты выліеш на поверх. Выліеш, бо прыдзецца шмат яшчэ змагацца з ліхімі ворагамі свабоды, з крапакамі і царскімі прыхільнікамі. Дагэтуль мучыў цябе, беларусе, нямецкі купец з генералам праз свайго салдата. Цяперака ж ужо гэты салдат адказаўся слухаць сваіх паноў і зрабіў рэвалюцыю, ды стаў тваім таварышам. Нямецкі салдат ужо не вораг, а сябар твой. Але ўслед ім думае накінуць путы на тваю, беларускі селянін, старонку французскі з англіцкім грашаўнікі. Іх слухаюць яшчэ іхнія салдаты, і яны катуюць Расейскую свабоду. Слабыя без паслухмяных салдат беларускія паны, папы і купцы запрашаюць на Беларусь іх, думаючы далей трымаць цябе ў няволі. Ці ж не ашукваюцца гэтыя прадаўцы? Няўжо ты ім паддасіся? Я думаю, што абмыляцца яны горка! Болей ты не будзеш цярпець ніякага прыціску, паўстанеш, як адзін чалавек, і прагоніш цяперашніх прыгпятацяляў, а ў лаючых пасягнуць на цябе адсячэш голаў пры іхняй патузе накінуць на цябе, народзе мой, прыгонны аркан.

Свае краіны ты зробішся гаспадаром вольным і слаўным, адбудуеш яе на новы лад і зажывеш свабодны!

Паліюцца вольныя песьні! Змоўкнуць песьні нядолі і жалю. Усё багацьце краіны стане тваім І многія твае сыны, вярнуўшыся з вымушанай вандроўкі, будуць напівацца шчасцем волі. Уваскрэсне Беларусь і ўвойдзе ў сям'ю вольных народаў.

Народ мой, беларускі! Не дай маёй веры абмануць мяне! Не хавай даўжэй свае помсты да ворагаў і разарві путы цярпеньня! Чым хутчэй ты гэта зробіш, тым болей выграеш! Расейскі працаўнік чакае ад цябе гэтага, нарыхтаваўшыся даць падмогу. Дык смела за справу!..

Твой сын Змітро».

4. З шыфраваных запісак Язэпа Лагуна з акупаванага Мінска Зміцеру Жылуновічу ў Маскву.

«...1 і 2 снежня меў перамовы з таварышамі з Мінскага падпольнага раённага камітэта РКП (б) і з Краявога камітэта камуністычных арганізацый Беларусі і Літвы. Настрой тут змяніўся, многія дзеячы ўжо за тое, каб утварыць Савецкую Беларуска-літоўскую дзяржаву, не супраць дыялогу з Белнакомам...»

«Учора, 3 снежня, у Мінску аформіўся падпольны Савет. У ім каля 200 дэпутатаў. З іх — каля 100 камуністаў і іхніх сяброў, 40 бундаўцаў, 35 палейцыяністаў, ёсць эсэры і меншавікі.

Пачынае ўтварацца Мінскі губрэўком.

Немцы вельмі нервовыя, пакуюць чамаданы. Земцы і думцы, БНР разгубленыя. Сёй-той з апошніх, хто знюхаўся з акупантамі, дае драла на Захад, сёй-той, хто быў у апазіцыі, не супраць далучыцца да пас...»

«...Сёння, 4 снежня, меў сустрэчу з некалькімі былымі грамадоўцамі, а цяпер лідэрамі новых беларускіх партый. Збіраюцца да Вас «у госці...».

«Сёння, 7 снежня, адбылося падпольнае пленарнае пасяджэнне Мінскага Савета. У рэзалюцыі ёсць пункт, які патрабуе «скорейшего вхождения Белоруссии в состав РСФСР на началах тесного единства и союза». Я гэта разумею так, што мінчане не згодны з антынацыянальнай палітыкай сваіх кіраўнікоў са Смаленска».

«Сёння, 8 снежня, у Вільні ўтвораны Часовы рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад Літвы...»

5. З паштова-тэлеграфнай тэлеграмы Лагуна Жылуновічу:

«Віншую. Сёння, 10 снежня, Мінск вызвалены ад нямецкіх акупантаў. Улада ў горадзе ў руках Савета і Губрэўкома».

6. З тэлеграмы Мінгубрэўкома Свярдлову:

«Лидеры Белорусской Рады... бежали в Англию за поддержкой, будут себя выдавать представителями демократических масс Белоруссии, якобы задавленной силой советвойск. Местные круги в интересах недопущения одурачивания рабочих Антанты считают необходимым самоопределение трудящихся Белоруссии и Литвы, создание Белорусско-Литовской трудовой коммуны на федеративной связи с Советроссией...»

7. З тэлеграмы Мяснікова Свярдлову:

«Некоторые местные работники будируют вокруг вопроса о так называемой Белоруссии. Как передают, по этому поводу Вам из Минска была послана телеграмма. Изложенное в ней является частным мнением. Ставшая в очередь литовская проблема как будто бы может стать общей и для Запобласти. Ввиду того, что в некоторых кругах местных Советов и на областной партийной конференции вопрос этот может всплыть, просил бы сообщить, как обстоит дело с литовской властью, не объясняется ли ее появление исключительно политическими, агитационными мотивами. Каково Ваше отношение к ней и литовско-белорусскому объединению? Не найдете ли возможным прислать представителей на областную партийную конференцию, которая состоится 27 декабря в Смоленске?»

## 3

У кабінет камісара Белнацкома, гэта значыць да Жылуновіча, зайшоў хлапчук — у наеханай на вочы салдацкай фураяшчы, у падрэзаным, але ўсё роўна даўгім шынялі, брудны, з хітрым і зладзеяватым позіркам у цёмных вачах.

Жылуновіч хвіліну-другую паазіраў яго, а пасля гарэзна ўсміхнуўся:

— Хочаш у Беларусь?

Малец няўцямна прыплюшчыўся, а пасля смела запытаў:

— Ты — Жилунович?

— Ну, я.

— Не врешь?

— Не, братка,— ужо і сур'ёзна, і заадно яшчэ трошкі гулліва адказаў ён.— Сам не маню і не люблю тых, хто лжэ.

Малады наведвальнік, блытаючыся ў полах шыняля, падышоў да стала, левай рукою падцягнуў доўгае рукаво на правай руцэ і з бруднай далоні кінуў на стол складзеную ўчацвёра паперчыну.

«Здароў, Цішка! — пісаў яму ў некалькіх радках хтосьці па-беларуску прыгожым почыркам.— Выйдзі, калі ласка, па хвіліну-другую за рог Гранатнага завулка. Мінчукі».

Значыць, як і перасцерагаў нядаўна Лагун, будуць «госці» з Мінска. Цікава: хто?

Ён моўчкі адчыніў шуфляду верхняга стала, узяў адтуль клунак з сухарамі — з імі, як і трэба па дыеце (былі нездаровыя ныркі), некалькі разоў на дзень піў гарбату.

— На, хлопча,— падаў.— Больш нічога не маю.

Той прагна схапіў клунак, у якім было некалькі карычневых хрумсткіх лустачак, і ўміг шмыгнуў з кабінета.

Жылуновіч падняўся, старанна акруціў шалікам шыю, нетаропка апрануў паліто, начапіў шапку-стаўбунок, узяў кіёк, папку і паволі падаўся з будынка.

На дварэ адразу ж апёк твар сцюдзёны вецер — які час дзьмуў паўночны ветравей, гнаў і гнаў холад, снег, якога вунь усюды поўна, што нават тут, паблізу «Метраполя», не паспяваюць яго адкінуць увішныя дворнікі.

Прыжмурыў вочы: сапраўды, вунь на рагу завулка стаяць трое з паднятымі каўнярамі. Адзін невысокі, таўсматы, а двое вышэй сярэдняга росту, стройныя, зухаватыя. Ды гэта Васілевіч, Лашкевіч і Баравік — тыя, з кім ён летась спрачаўся на грамадоўскіх з'ездах, з-за экстрэмізму якіх ён парваў з імі, мінскім камітэтам БСГ. Яны таксама

згледзелі яго, настрункіліся, а заадно пачалі счышчаць з сябе снег — хутчэй за ўсё ад хвалявання.

Наблізіўся. Э-э, не зухі, не дзёрзкія, якімі бачыў летась, а паніклыя. І ў Васілевіча з-пад выпацелай аблавушкі, і ў Баравіка з-пад капелюша, і ў Лашковіча з-пад папахі вытыркаюцца сівыя валасы.

— Ну, здарова, радцы! — павітаўся і заадно накпіў.

Тыя не ведалі, як паводзіцца, што адказаць: але калі ён пераклаў папку і падаў руку, з ахвотаю націснулі, усміхаючыся тропікі з ліслівасцю. Яму ў гэтую хвіліну не стала пацешна ці прыемна — не, наадварот, зашчымела сэрца: чэрці ж, усе здольныя людзі, шчырыя сыны свайго народа, але, бач, да чаго дайшлі: баяцца зайсці ў Белнацкам, да сваіх, туляюцца, як цюцькі, за задворкамі. Не такія адкрытыя нямецкія прыслужнікі, як Скураны, Аўторак, Еўзікаў і іншыя, але ўсё роўна рыльца ў пушку. Тым больш што адзін з іх падпісаў уніжальную тэлеграму кайзеру ад імя беларускіх нацыянальных сіл.

— Падпольна прыехалі? — запытаў.

— Не, легальна,— адказаў Баравік.— Мы ж, можна лічыць, парвалі з кіруючым ядром БНР...

— Ды ведаю: ты адзін з першых адышоў ад БНР, пачаў развальваць Грамаду і ўтвараць Беларускую партыю сацыялістаў-рэвалюцыянераў,— усміхнуўся Жылуновіч.— Як і ведаю, што Лашковіч разам з Рак-Міхайлоўскім, Нядолем, Ланкійскімі — у Беларускай сацыялдэмакратычнай партыі, а наш «неистовый» Васілевіч адзін з лідэраў Беларускай партыі сацыял-федэралістаў... Карацей, рабілі і робіце шмат глупства...— Учэпіста паназіраў ім усім у вочы, не даючы апамятацца, а пасля махнуў рукою.— Ладна, хадзем.

— Куды? — занепакоіўся Васілевіч.

— Да мяне дадому.

— Можа, не варта? — падаў голас Лашкевіч.— Давай перакінемся словам-другім тут.

— Хадзем-хадзем,— ужо міралюбна прамовіў ён.— Мне ж трэба і добра распытаць вас усіх, і даць наганяю, і паспрабаваць перавабіць у савецкую веру...

— Мы ўжо сталыя людзі, Цішка,— сказаў Баравік.— Нам ужо нялёгка мяняць свае погляды, прыстасоўвацца...— Памуляўся, а пасля дадаў: — Мы як лідэры буйнейшых цяперашніх беларускіх партый прыехалі сюды на перамовы з Савецкім урадам, з Леніным...

У Жылуновіча аж пахаладнела на сэрцы: яны — што? Зусім страцілі цвярозы розум?

— Нават і не патыкайцеся туды!!! — цыкнуў Жылуновіч.— Па-першае, з вамі ніхто не захоча тут гаварыць. А па-другое, вы сапсуеце тое, чаго можам дабіцца мы. На савецкай аснове.

— І многага ты ўжо дабіўся? — ухмыльнуўся Баравік.

— Таго-сяго і дамогся,— адказаў.— А цяпер можам дабіцца і наданага. Толькі, кажу, не лезьце на дах і не псуйце гонту!

— А мы?

— Астыньце, прыглядайцеся. Калі вы, а таксама і іншыя прызнаеце свае памылкі, захочаце супрацоўнічаць з Савецкаю ўладай, то не будзеце лішнія, знойдзеце адпаведны сваім ведам занятак... Хадзем, кажу, пагаворым у цішыні і цяпле.

— Не,— адмовіўся Баравік.— Мы маем дзе пераначаваць. Скажы, мы маглі б прыехаць сюды са сваім хорам, тэатрам?

— Думаю, можаце...

— Ну, ладна,— Баравік з кпінаю падціснуў вусны, зняў капялюш, рукою паправіў пышную светлую шавялюру.— Не будзем цябе кампраметаваць, замінаць табе. Толькі, калі станеш на чале савецкай беларускай дзяржавы, не адвярніся ад нас, грэшных: хоць мы ішлі іншай, чым ты, дарогай, але і мы рабілі ўсё для адной нашай мэты...

«Чэрці, вы чэрці! — сціснулася яго сэрца.— Ці здзекавацца, крыўдаваць адзін на аднаго, а то варагаваць нам цяпер?!»

Праўда, убачыў: не то крыўдзяцца, не то хмурацца Баравік ды Лашкевіч, а Васілевіч неяк вельмі добра, даверліва зазірае ў вочы і аж мыліць губамі — відаць, хоча штосьці сказаць шчыра (ужо ў новым, 1919 годзе Васілевіч прызнаецца яму, што па заданні ўваходзіў у Раду БНР, стаў членам Беларускай партыі сацыялістаў-федэралістаў, каб лепш ведаць, што задумліваюць такія непрымірымыя да бальшавікоў, як Аўторак, Еўзікаў, Заходка, Жытнік і іншыя).

— Ну што ж,— хмурна, але спакойна прамовіў Жылуновіч.— Глядзіце самі... Толькі будзе вельмі шкода, калі вы, разумныя людзі, і справе будзеце шкодзіць, і сябе зусім заводзіце ў тупік...

Махнуў ім рукою на развітанне і закрочыў дадому. Балазе якое не цёплае было паліто, а сцюжа ўсё роўна пачала ўжо прабірацца да касцей. А заадно горасна было на душы ад гэтай сустрэчы: свае людзі, а разумення няма! Збегліся, нюхнуліся, сапсавалі адзін аднаму настрой і разбегліся.

Калі ўвайшоў у свой двор, убачыў звыклую карціну: сусед, Чарвякоў, катае на саначках захутаную ў паліто і цёплую хустку яго Галю. Там, дзе павінен быў відаць яе твар, была толькі маленечкая дзірачка і з яе пазірала адно доччына вочка.

— Не змерзла? — прысеў на калені, разгарнуў хустку і ўзяўся за яе носік. Ён быў цёпленькі.

Тая задаволена захітала галавою: не.

— Ох, песціць цябе дзядзя Алесь!

— Наўмысна ўцёк з хаты,— усміхнуўся Чарвякоў, трымаючы ў руцэ вяровачку ад саней. І, бачачы, што Жылуновіч занепакоіўся (не дай бог, можа,, не паладзілі жонкі?), патлумачыў: — Ад госця...

— А хто такі? — ажывіўся Жылуновіч.— З Мінска хтосьці?

— Не. З Петраграда. Кужэльны.

— Чаго?

— Ды прыехаў быць пасрэднікам. Паміж намі і Сталіным з Мяснікровым. А па-другое, падае ідэю склікаць у Мінску новы Усебеларускі з'езд.

— Авохці мне! — аж пакруціў галавою Жылуновіч.— Зноў — Кужэльны!

— Кажа, калі Белнаком і Маскоўская Белкамсекцыя адвернуцца ад яго, дык ён адзін возьме ўсё на сябе...

— Ну, свінтух! А па-другое, мусіць, Сталін зноў, як і нядаўна, выцягнуў яго на свет божы, каб раскалоць наш рух... Якраз жа гэты авантурыст Кужэльны летась, у снежні, спачатку склікаў Усебеларускі з'езд у Магілёве, а пасля, калі нічога не дабіўся, лез у лідэры на з'ездзе ў Мінску...

— Можа нашкодзіць...

— Заўтра ж пашлём тэлеграмы ва ўсе нашы секцыі, у Смаленск, у Мінск, каб адусюль турылі прэч самазванца...

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

І. З газеты «Западная коммуна» — органа Аблвыказаха — за 21 снежня 1918 года.

«Спрашивается, зачем эта игра в советские республики, что она может дать положительного в борьбе пролетариев за власть? Ведь для нас ясно, что Советская власть ставит своей задачей не создание новых государственных границ и снесение старых, не создание национальной обособленности в рамках маленьких национальных государств, а снесение всяких национальных рогаток и слияние пролетариев всех стран в единую социалистическую республику... Провозглашение Советской республики Белоруссии не только не служило бы интересам борьбы с националистическими тенденциями мелкой буржуазии, но как раз развивало бы простор этим тенденциям. А это не в интересах социалистической революции. То, что мы признаем

допустимым в одном месте в силу тактических соображений, не должно быть перенесено в другие места, где таковых практически соображений нет и не может быть...»

**2**

**Першы дзень**

У гэты ж дзень, 21 снежня, а шостай гадзіне, у адным з самых вялікіх пакояў Белнацкома сабраліся дэлегаты буйнейшых Беларускіх камуністычных секцый на сваю першую Канферэнцыю.

Яе пачаў Жылуновіч. Як заўсёды, у сваім адзіным, але дыхтоўным гарнітуры, жвавы.

— Таварышы! — прамовіў ён урачыста, агледзеў усіх праз добра прачышчаныя акуляры.— У нашых камуністычных сэкцыях цяпер звыш 200 членаў і звыш 300 ім спачуваючых. Сюды, на наш з'езд, прыехалі ад пяці сэкцый: ад маскоўскае — Жылуновіч, Няцэцкі, Чарвякоў, Дыла, Чарнушэвіч, Блізнюк і Рыбак; ад пецярбургскае — Усціловіч, Памецка, Макарэвіч і Балбека; ад саратаўскае — Бяганскі, Баркоўскі і Пратакоўскі; ад Тамбоўскае — Драка-Дракон, Ханін і ад менскае — Русецкі. Ёсць звесткі, што яшчэ пад'едуць два дэлегаты ад невельскага павятовага камітэта РКП і адзін пасланец ад менскай белсэкцыі — Клыш. Дык якая ваша думка: пачаць работу нашага з'езда ці пачакаць астатніх дэлегатаў?

— Пачаць! — пачулася адразу некалькі галасоў. А калі ён папрасіў прагаласаваць, то паднялі рукі ўсе адзінагалосна.

— Таварышы,— павёў далей Канферэнцыю,— на наш з'езд прыйшло шмат тэлеграм. Ад нашых камуністычных сэкцый, ячэек у многіх расейскіх гарадах, камуністаў, ад бежанскіх, салдацкіх, работніцкіх камітэтаў, ад вучоных, дзеячаў культуры, а таксама ад менскіх камуністаў, якія вітаюць нас і ідэю абвяшчэння беларускай дзяржаўнасці. Дазвольце ад вашага імя ўсім шчыра падзякаваць.

Дэлегаты дружна запляскалі.

— Цяпер, таварышы, давайце выберам наш рабочы прэзідыум,— калі воплескі сціхлі, сказаў ён.— Каго вылучым за старшыню?

— Жылуновіча,— падаў голас Лагун.

Дыла, Усціловіч, Чарвякоў:

— Жылуновіча!

Прагаласавалі. За яго былі ўсе як адзін.

— Дзякую,— пакланіўся, адчуваючы прыліў расчуленасці ад такога ўсіхнага даверу.— А цяпер вылучайце ў прэзідыум і іншых таварышаў.

Макарэвіч: За таварыша старшыні — Усціловіча.

Рыбак. За сакратара — Чарнушэвіча.

Няцэцкі. І Блізнюка.

Ніхто супраць названых не быў, і яны выйшлі з залы і селі за два састаўленыя сталы, накрытыя зялёным сукном.

— Цяпер, таварышы, дазвольце зачытаць вам і нашы з'ездаўскія тэлеграмы,— сказаў Жылуновіч ужо як старшыня Канферэнцыі.— Вось наша пасланне таварышу Леніну: «Першая канферэнцыя беларускіх сэкцый РКП (бальшавікоў) пасылае вам, дарагі таварыш Уладзімір Ільіч, сваё гарачае прывітаньне, як натхненнаму правадыру пралетарыяту ўсіх краін і ўсіх нацый да сьветлага ідэалу інтэрнацыянальнага сацыялізму».

Толькі дачытаў — воплескі. Тут жа падняўся ў зале Лагун, а за ім падняліся ўсе і наладзілі бурную авацыю.

— А цяпер, таварышы, тэлеграма наркому па нацыянальных справах: «Першая канферэнцыя беларускіх сэкцый РКП (б) вітае вас, як шчырага спаборніка канечнае патрэбы вырашыць нацыянальнае пытаньне з клясавага пункту гледжаным і як адданага рэвалюцыянера і змаганьнніка за інтарэсы пралетарыяту і бяднейшага сялянства ўсіх краёў і ўсіх нацыянальнасцей. Канферэнцыя мае надзеі, што пры вашым аўтарытэтным падтрыманьнні работніцка-сялянская Беларусь зойме належнае месца ў Савецкай Сацыялістычнай Фэдэрацыі».

Дачытаўшы, Жылуновіч падняў галаву: дэлегаты з Тамбова, Саратава, Мінска тут жа ўзяліся таксама натхнёна апладзіраваць, а вось Чарвякоў і Дыла, а таксама іншыя — тыя, хто ў Петраградзе і тут, у Маскве, ці сустракаўся са Сталіным, ці бачыў, як той спатыкае,— злёгку іранічна заўсміхаліся: ну, дружа, зашмат ужо ялею для капрызнага і далёка не «шчырага спаборніка канечнае патрэбы вырашыць нацыянальнае пытаньнне».

Ён жа, заўважыўшы гэтыя адмысловыя ўсмешкі блізкіх сяброў, падмануў ім: што зробіш, трэба і так! Пасля прачытаў тэлеграмы ВЦВК: «...Канферэнцыя мае надзею, што ВЦВК, праводзячы ў жнцыцё прынцыпы фэдэрацыйнага сацыялістычнага будаўніцтва, ажыццёвіць ідэю стварэным Савецкае Беларусі», Вышэйшаму ваенна рэвалюцыйнаму савету РСФСР, у асобе якога «першая канферэнцыя беларускіх сэкцый РКП (б) вітае гераічных Чырвоную армію і Чырвоны флот, якія мужна і самаахвярна змагаюцца за ідэалы вялікае сусветнае рэвалюцыі супроць нападаючых на яе міжнароднай буржуазіі і капіталу. Канферэнцыя ўшаноўвае памяць таварышоў, загінуўшых у гэтым пачэсным змаганьні, і спадзяецца, што Чырвоная армія, у шэрагах якое не апошняе месца займаюць сыны працоўнае Беларусі,

здолее абараніць яе ад драпежніцкага захопу міжнароднай контррэвалюцыйнай буржуазіяй».

Калі ён з іншымі складаў гэтыя тэлеграмы, то яны хацелі, каб: папершае, паказаць цэнтральнаму ўраду, што яны звышмногага но прагнуць, згодны на «прынцыпы фэдэрацыі», а па-другое, ясна паказаць: не супраць, каб у іх з Расіяю былі адны ўзброеныя сілы. Асцерагаліся, каб той-сёй не змог папікнуць у «сепаратызме» — у самым ходкім і страшным на гэты час абвінавачванні.

— Дзякую,— зноў пакланіўся Жылуновіч, калі ўсе прагаласавалі, каб зацвердзіць тэлеграмы, а гэта значыць — і іхнюю падрыхтоўчую работу.— А цяпер, таварышы, давайце замацуем парадак дня нашага з'езда. У ім,— усміхнуўся,— аж сем пунктаў. На тры дні работы. А іменна: 1) Інфармацыя камітэта маскоўскай беларускай сэкцыі РКП (б) і агляд палітычнай працы камуністах на мясцох. 2) Нацыянальнае пытаньне. 3) Сучаснае палітычнае становішча на Беларусі і ўзаемаадносіны паміне палітычнымі партыямі. 4) Стварэньне работніцкасялянскага ўрада Беларусі. 5) Задачы, што стаяць перад беларускімі камуністамі: а) стварэньне аб'яднанага бюро; б) рэарганізацыя Беларускага нацыянальнага камітэта; в) выданьне партыйнага органа; г) агітацыйна-палітычная і арганізацыйная праца (беларуская Чырвоная армія, вясковыя камуны, культурна-асветная праца, сродкі, выпраўка на месцы і інструкцыя ад'язджаючым, адозва да беларускага народа і беларускіх камуністка). 6) Мабілізацыя беларусаў-камуністых. 7) Бягучыя справы.

Падняў галаву, акінуў позіркам залу:

— Якія думкі пра такі парадак дня?

Тут жа на другім радзе падняў руку дэлегат. Маладжавы, у цеснаватым рудым пінжаку і шэрым свэтры. Здаецца, Бяганскі з Саратава.

— Як я зразумеў, мы будзем утвараць беларускі ўрад? — здзівіўся ён.

Жылуновіч напружыўся: дагэтуль усё ішло гладка, а цяпер вось, як толькі выйшлі на дарогу, адразу, бач, наскочылі на калдобіны.

— Мы, ініцыятыўнае бюро, раім гэты пункт для парадку дня работы нашага з'езда, каб найперш перамовіцца пра яго, а па-другое, штосьці і рашыць,— як мага спакойна адказаў Жылуновіч.— Вы што — супраць?

— Я хацеў лепш ведаць...— прамовіў дэлегат і сеў.

— Якія яшчэ заўвагі, парады?

На апошнім радзе паднялася рука, а пасля ўстаў і сам чалавек — высокі, цёмны, з гарбаватым, нібы перабітым, а таму і нібы апушчаным на губы носам.

— Наша тамбоўская дэлегацыя раіць,— басавіта загуў ён, ані усе азірнуліся, хто мае гэткі магутны голас,— паколькі гэты з'езд мае вялікую вагу, то варта запісваць у пратакол усё і прамоўцаў не перапыняць.

Пасля гэтага Канферэнцыя зацвердзіла парадак дня і пачала работу.

Як запіша ў сваім блакноціку Жылуновіч, у гэты вечар прамаўляла Ю чалавек. Што да яго, дык ён ведаў, што рабілі і робяць Белнацком, яго аддзяленні, камуністычныя секцыі ў Петраградзе і Маскве, таму дэлегаты з гэтых гарадоў мала сказалі яму чаго новага, а вось іншых прыезджых слухаў вельмі ўважліва. Да слова, дэлегаты з Саратава Пратакоўскі і Бяганскі сказалі, што ў іх 30 партыйцаў-беларусаў і 32 спачуваючыя, што іхняя секцыя адчыніла клуб, наладзіла шэсць мітынгаў беларусаў-беяганцаў, нямала выязджала ў суседнія паветы, дзе нямала землякоў. У тамбоўскай секцыі, па словах Драка-Дракона, да 60 камуністаў-беларусаў і да 100 спачуваючых. У многіх тамбоўскіх установах яны займаюць адказныя пасады, а ў часе белагвардзейскага паўстання беларусы-камуністы ўзялі на сябе шмат, каб не даць яму разгарнуцца і спыніць яго ў зародку. Русецкі з Мінска даў звесткі пра тое, як іхняя секцыя спрыяла ўтварыць у горадзе савецкі апарат пасля таго, калі яго пакінулі немцы, а таксама як наладяйвае беларускае культурнае жыццё.

Тут жа, на хаду, Жылуновіч прыкінуў рэзалюцыю: «Са здавальненнем заслухаўшы даклады з месц пра выключную рэвалюцыйна-камуністычную ролю, якую адыгралі і адыгрываюць беларусы-камуністыя ў Вялікай Расійскай Рэвалюцыі і ў шмат якіх мясцох Расіі, і прымаючы пад увагу адказны момант у жыцці Беларусі, які абавязвае беларусаў-камуністых прыняць самы чынны ўдзел у стварэньні Савецкае Беларусі, канферэнцыя пастанаўляе: 1) вясці далей арганізацыйную працу ў справе стварэньня беларускіх сэкцый, карысць існавання якіх ужо выявілася; 2) беларускія сэкцыі павінны, не парушаючы адзінай рэвалюцыйнай чыннасьці, вылучыць зараз нса магчымы максымум камуністых-працаўнікоў для адпраўкі іх у Беларусь, і гэту сваю работу — забеспячэнню! Беларусі падрыхтаванымі працаўнікамі — вясьці і далей; 3) усе беларускія сэкцыі, у справе аб'яднання свае работы, павінны трымаць самую цесную сувязь з тым сваім цэнтрам, які абярэ канферэнцыя; 4) сродкі, патрэбныя на арганізацыйную работу і інш., сэкцыі могуць атрымаць часткаю ад мясцовых камітэтаў РКП (б), часткаю ж ад свайго цэнтру».

Калі Жылуновіч зачытаў гэтую рэзалюцыю ўголас, то дэлегаты дружна прагаласавалі за яе. Усцешаны, ён адчуў: па-першае, запісалі

тое, што і трэба цяпер, а па-другое, паверылі яму, а то нават прызналі і за лідэра. Быць такім, канечне, вялікі гонар, але заадно і не меншы цяжар. Тым больш у тым, чым займаюцца яны. Тут трэба вельмі чуйны нюх, смеласць, абачлівасць, розум і вялікія веды, каб нічога не перабольшыць і не прынізіць.

**Другі дзень**

Пасяджэнне пачалося таксама ў шэсць гадзін вечара ў той жа зале і ў тым жа складзе.

— Таварышы,— сказаў на самым пачатку Жылуновіч,— учора, а таксама і сёння некаторыя таварышы падаюць думку, што мы можам пункты 2, 3 і 4 з парадка дня злучыць у адзін, бо яны вельмі блізкія па змесце і духу. Як вы?

Адразу некалькі галасоў з залы:

— Можна!

— Калі ласка!

— Згодны!

— Тады запрашаю да размовы. Хто прамовіць?

Пасля, калі пачалі гаварыць прамоўцы, кораценька запісваў іхнія думкі для сябе. А іменна:

Усціловіч. Лічу: у Расіі нацыянальнае пытанне, беларускае таксама, абвастрылася. З аднаго боку, ім па-ранейшаму жанглююць сацыял-згоднікі і буржуазія — скажам, у блізкіх нам Польшчы, Украіне, Літве, Латвіі ды і ў нашай Беларусі, а з другога боку, да яго блізка падышлі і працоўныя. Значыць, з ім трэба лічыцца, бо яно цяпер нямала значыць для лёсу Савецкай улады. Як мы ведаем, Аблвыкамзах супраць нашых нацыянальных клопатаў, дагэтуль чуць не хацеў пра Беларусь, не прызнаваў ні Белнакома, ні нашых секцый. Кіраўнік петраградскага аддзела Белнакома, таварыш Каўшыла, нядаўна з'ездзіў у Смаленск і перамовіўся там з кіруючымі таварышамі і, здаецца, здолеў тое-сёе зрушыць у іх свядомасці...

Рэпліка з залы. Мы тут, у Маскве, нейкага зруху у іх не бачым.

Жылуновіч сам сабе: «Рашыў спажыць сітуацыю ў сваю карысць гэты Каўшыла!»

Дыла. Я вось што думаю: мы не можам, не маем права гаварыць пра лёс Беларусі апошняе слова. Нам трэба перакінуць пашы значныя сілы ў Мінск і якраз там рыхтаваць глебу для таго, чаго жадае наш з'езд,— для Беларускае Рэспублікі.

Б а л б е к а. Усё ж нам, камуністам, трэба ясна сказаць сваё слова пра лёс нашага краю. Бо там, адкуль мы прыехалі, пра гэта шмат блытаніны, спрэчак. Адны кажуць: трэба савецкія рэспублікі, Бела-

русь таксама. Другія — не, не трэба, бо гэта ўсё пашкодзіць перспектыве сусветнай рэвалюцыі.

Бяганскі. Сапраўды, таварышы, давайце вызначым цвёрдую лінію: ці трэба асобная Беларусь і якая менавіта? А калі вылучым тэзіс абвяшчэння сваёй рэспублікі, то давайце заадно і пагаворым: як, з каго будзем фарміраваць яе ўрад?

Жылуновіч (Каб не ўспыхнулі лішнія спрэчкі і не затапілі Канферэнцыю, падняўся і спажыў права старшыні). Таварышы! Той, хто паклікаў вас на гэты з'езд, не дабіваўся, каб ужо па ім мы ўтварылі рабоча-сялянскі ўрад Беларусі. Нам, камуністам, найперш трэба прыйсці да адной думы: варта патрабаваць Беларускай Рэспубліцы ці не? Па ўсім відаць: наш з'езд мае сваю ясную лінію. А іменна: трэба самаазначэнне нашага краю! Што да мяне, дык я за тых таварышоў, якія раяць паслаць нашы сілы ў Мінск і там разам з камуністамі, з працоўнымі ставіць падмурак для нашай дзяржаўнасці. Але гэта не значыць, што мы, белнакомаўцы і камуністы з нашых сэкцый, тут, у Маскве ці ў іншых расейскіх гарадах, можам сядзець склаўшы рукі. Не. Мусім сваё рабіць і мы. Сваімі шляхамі ды сіламі, каб, як кажуць, разам трапляць у адну цэль. Тым больш павінны болей старацца тыя, хто працуе тут, у Маскве, блізкі да цэнтра.

Няцэцкі. Нам цяпер, таварышы, трэба болей пільна зірнуць самім і паказваць у цэнтры, на правінцыі, на інтрыгі міжнароднага імперыялізму. Якраз яны найбольш змушаюць, каб мы паклапаціліся пра рабоча-сялянскую Беларускую Рэспубліку.

Рыбак. Таварышы! Паколькі, сапраўды, усе мы дружна за тое, каб пад камуністычным сцягам абвясціць Беларусь, дык раю: спрэчкі спыніць і прыняць рэзалюцыю.

Жылуновіч (падняўшыся і зірнуўшы ў залу). Як, таварышы?

Галасы:

— Спыніць спрэчкі!

— Давайце праект рэзалюцыі!

З рэзалюцыі, прынятай Першай Канферэнцыяй беларускіх камуністычных секцый па нацыянальным пытанні, аб палітычным становішчы Беларусі і ўзаемаадносінах паміж палітычнымі партыямі, а таксама пра пытанне аб стварэнні на Беларусі рабоча-сялянскага ўрада:

«Сучаснае становішча Беларусі — выключна складанае і адказнае. Створаныя нямецкім бронявым кулаком і імпэрыялістычнай Антантай дзяржавы Польшчы, Літвы і Украіны, на чале з прадстаўнікамі буйнае буржуазіі і нацыянал-шавіністых, з першых жа дзён свайго існавання выяўляюць імкненьне да імпэрыялістычнага захопу і

прыгнечаньня суседніх з імі народаў, у тым ліку і Беларусі. Нямецкая акупацыя зусім разбурыла Беларусь у эканамічных адносінах і, імкнучыся дарэшты зьнішчыць рэвалюцыйны пастрой рабочых і сялянскіх гушчаў, нечувана жорсткімі рэпрэсіямі душыла кожную праяву самачыннасьці і спробы беларускага народа да вызваленьня з-пад ярма прыгоньнікаў; карыстаючыся на сваім крывавым шляху дружным падтрыманьнем духавенства, памешчыкаў, капіталістых і ўсіх выглядаў іхных паслушных — да сацыял-згоднікаў уключна,— уся гэта зграя намагалася затуманіць рабочых і сялян рознымі хлусьлівымі, абмоўнымі нападамі па Расійскую сацыялістычную рэвалюцыю, старалася заглушыць іх клясавую сьвядомасьць і пераняць ненавісьць да іх адвечных ворагаў-капіталістых,— каб гэткім чынам калі і не зусім абмінуць, дык адцягнуць на магчыма доўгі час канец іх неабмежаванага панаваньня і глуму над рабочымі гушчамі. Але, нягледзячы на самае жорсткае занішчэнне ўсякага рэвалюцыйнага руху сярод беларускага пралетарыяту і сялянства, рэвалюцыйны дух у іх не забіты, а, наадварот, яшчэ болей рэвалюцыянізаваў іх. З прычыны дзевяцімесячнай вакханаліі на Беларусі нямецкага бронявага кулака, які часткаю зьнішчыў і адправіў у нямецкія вастрогі, часткаю прымусіў эмітаваць у Расійскую сацыялістычную рэспубліку лепшых правадыроў беларускага пралетарыяту і вясковай бедноты, цяпер зусім мала засталося на мясцох сьвядомых і дасканала падрыхтаваных да сацыялістычнага будаўніцтва працаўнікоў. Тыя, што засталіся там, стараюцца як мага выкарыстаць спагаднае для іх становішча. Але вядома, што паны-згоднікі, якія ўжываюцца з нямецкім імпэрыялізмам, калі сусьветная гісторыя зробіць паварот, вельмі лёгка могуць зьмяніць нямецкую арыентацыю на арыентацыю амэрыка-ангельска-французскую з тым, каб зноў прадаць справу сацыяльнае рэвалюцыі па Беларусі ў рукі літоўскіх і польскіх паноў, капіталістых і клерыкальнага духаьенства. Усе гэтыя паказальныя факты ўладна вымагаюць стварэньня, у шчыльнейшым кантакце з вялікаю Расійскаю сацыялістычнаю фэдэрацыйнаю рэспублікаю, моцнага Беларуска-сялянскага ўрада, выяўніка волі беларускае бедноты. Трэба, каб гэты ўрад мог з прыязнай дапамогай Расійскай сацыялістычнай рэвалюцыі абараніць беларускую бедноту ад сусьветнай контррэвалюцыі, якая пасуваецца ў выглядзе вызваліцеля нацыянальнасьцей ад «запрыгоненьня іх расійскім бальшавізмам» і іх самавызначэння, каб гэты ўрад даў магчымасць і беларускаму пралетарыяту зрабіць свой уклад на карысць наспяваючай сусьветнай сацыяльнай рэвалюцыі».

У гэты ж вечар перамовіліся і па пятым пункце парадка дня. Прамоўцы, а іх было нямала, найбольш гаварылі пра яго першыя тры падпункты.

З рэзалюцый па гэтых падпунктах:

а) па Белнацкому: «Зацвердзіць камісарам Белнацкома т. Жылуновіча, сакратаром т. Мазура».

б) пра беларускую Чырвоную Армію: «Прымаючы пад увагу выключна адказнае міжнароднае становішча, у якім знаходзіцца цяпер вызваленая Беларусь, канфэрэнцыя лічыць канечна патрэбным стварыць беларускія палкі Чырвонае арміі, ганаровай і адказнай задачаю якіх будзе абарона Беларусі, як аднаго з фарпостаў Вялікае Расійскае Сацыялістычнае Рэвалюцыі ў змаганні з сусветным імпэрыялізмам... Сфарміраваны ў Пецярбургу самаахвотніцкі атрад беларусаў-камуністаў выправіць у Мінск, дзе ён будзе добрым камуністычным асяродкам для беларускіх палкоў, фармаваньне якіх там пачнецца...»

в) пра сельскія камуны: «Бачачы ў сельскагаспадарчых вытворчых камунах, апроч усіх іншых бакоў іх вартасьці, яшчэ і новую форму камуністычнага будаўніцтва жыцьця, а таксама лічачы грамадскае карыстанне зямлёю пераходам да камун, капфэрэнцыя прызнае асаблівую каштоўнасьць будаўніцтва камун і працу ў кірунку аформленьня грамадскага землякарыстаньня ў беларускай вёсцы і заклікае ўсіх партыйных працаўнікоў, апроч агульнапалітычнай і культурна-асветнай работы, побач распачаць у вёсцы і працу для будаўніцтва камун...

Разам з тым канфэрэнцыя выказваецца за выкарыстанае вялікіх панскіх маёнткаў пад буйныя савецкія гаспадаркі, як гаспадаркі ўзорныя, што вытвараюць максімум сельскагаспадарчых прадуктаў. Гэта дазволіць Савецкай уладзе з большым поспехам вырашыць харчовае пытанне, разбураючага ўплыву якога так упэўнена чакаюць ворагі рабоча-сялянскай улады».

Затым, ужо ноччу, прынялі рэзалюцыі пра культурна-асветную, агітацыйна-палітычную і арганізацыйную работу, пра орган бюро секцыі, а таксама прынялі адозву «Да Беларускага народа».

**Трэці дзень**

Пра яго Жылуновіч запісаў такое: «Бягучымі справамі канфэрэнцыя заняла сваё апошняе пасяджэнне 23 снежня. Бягучыя справы ахапілі сабою інфармацыю т. Лагуна пра становішча каля Баранавіцкага раёна, куды ён накіроўваўся Белнацкомам, інфармацыю т. Клыша пра работу і яе ўмовы ў Менску і выбары цэнтральнага бюро сэкцый. Абранне бюро стала апошнім. Праз галасаванне запіскамі

абраны былі ў цэнтральнае бюро беларускіх сэкцый РКП (б) наступныя таварышы: З. Жылуновіч, Ф. Балбека, А. Чарвякоў, І. Няцэцкі, М. Дракон і Я. Дыла. Цэнтральнаму бюро было даручана склікаць Усебеларускі з'езд камуністычных сэкцый пасьля партыйнай канфэрэнцыі ў Смаленску, назначанай на 27 сьнежня. Якраз у часе выбараў бюро маскоўская сэкцыя атрымала тэлеграму са Смаленска за подпісам сакратара Абласнога камітэта РКП (б) т. Кнорына з запрашэньнем прыслаць прадстаўнікоў на памянёную канфэрэнцыю ў Смаленску. Пасьля абгавору канфэрэнцыя вылучыла са свайго складу дэлегатамі ў Смаленск трох таварышоў: П. Клыша, В. Ханіна і Я. Лагуна.

Заключнай прамовай старшыні канфэрэнцыя была зачынена а палове першай гадзіны ўночы. Удзельнікі канфэрэнцыі з уздымам і натхненьнем прасьпявалі перш «Інтэрнацыянал», а пасьля беларускую «Марсэльезу».

**3**

Сталіну сказалі, што прыйшоў ён, Жылуновіч, але той не спяшаўся запрашаць у свой кабінет.

Жылуновіч доўга, можа, і з гадзіну, сядзеў у прыёмнай, цярпліва чакаў, калі яму можна будзе зайсці да наркома па нацыянальных справах, і ўвесь час гадаў: з-за чаго такая затрымка? Сталін прачытаў усё і цяпер па тэлефоне дакладае наверх альбо звоніць свайму сябру, Мяснікову, у Смаленск? Ці наўмысна парыць яго вось тут, як кажуць, у прылазніку, каб ён перакіпеў і не дазваляў сабе лішняга?

Нарэшце паклікалі. Ён зайшоў у кабінет, які быў прадымлены: гаспадар — каржакаваты, з апалай на нізкі лоб чорнай густой шавялюрай, з прыплюшчанымі паўмангольскімі вачыма, рабы, са знакамі воспы, вусаты, у фрэнчы зялёна-карычневага колеру — сядзеў за сваім сталом з люлькай у зубах і пускаў спакойныя струменьчыкі шызага дыму.

— Садыцесь, таварышч Жылуновіч,— паказаў узмахам галавы на крэсла, што стаяла перад ім.

Ён сумеўся: Сталін ні словам, ні рукою не павітаўся, дык што рабіць яму? Таксама не паздароўкацца, сесці і чакаць, што той скажа? Не, не хораша так.

— Здравствуйте, товарищ Сталин,— прамовіў ён.

— Здравствуйте-здравствуйте,— адказаў той, зажмурваючыся ад дыму і заклапочана складаючы на стале паперы.

Сталіна Жылуновіч убачыў толькі летась у Петраградзе ў «Правде», і тады той, вярнуўшыся са ссылкі, быў худы, стомлены, з запалымі вачыма. Цяпер вось пакруглелы, пасвяжэлы. Можа, паспрыяла і тое,

што ён, як кажуць, нядаўна ажаніўся з зусім маладою дзяўчынаю, пачаў жыць па-сямейнаму.

— Скажыце, таварыш Жылуновіч,— Сталін падняў галаву, зірнуў на яго ўпалымі, не то карымі, не то жоўтымі, як здавалася, безжыццёвымі вачыма,— вы ведаеце, што ўчора ВЦВК зацвердзіў вывады Адміністрацыйнай камісіі і прыняў пастанову аб абласных аб'яднаннях?

— Не, яшчэ не ведаю,— адчуваючы, як замірае сэрца, адказаў ён.

— Дык вось учора юрыдычна зацверджана Заходняя камуна з цэнтрам у Мінску,— ціха і паволі (ці то абдумваючы кожнае слова, ці то ратуючыся ад няўмення складна гаварыць па-руску і ўвогуле хараша прамаўляць) сказаў Сталін.— Так што гэтыя вашы пастановы, дакументы,— падняў і патрос паперы, што яны падалі сёння ранічкай,— не да месца...

— Як мопса быць не да месца думка ўсіх беларускіх камуністаў?

— Факт адбыўся, паўтараю: Заходняя камуна зацверджана цэнтрам юрыдычна. Хіба не разумееце?

— Гэты акт, таварыш Сталін, юрыдычны, але паспешлівы і несправядлівы.

— Нават гэтак? — крыва ўсміхнуўся Сталін, і яго дугападобныя бровы надняліся на прамы і нізкі лоб.

— Якраз гэтак.

— Я думаў: вы толькі памыляецеся,— непарушна прамовіў Сталін.— Ай? вы — заядлы нацыяналіст і сепаратыст!

— Я ніколі не ўзвышаў, не абсалютызаваў сваю нацыю, не прыніжаў іншых,— узбуджана, але таксама спакойна сказаў Жылуновіч.— Але любіць сваё, нацыянальнае, і быць у нацыяналістычным ачмурэнні — гэта зусім розныя рэчы.

— Не ведаю, таварыш Жылуновіч,— развёў той рукамі, і ў гэты час Жылуновіч заўважыў, што левая рука Сталіна нібы меншая за правую.— Цяпер вельмі напружанае міжнароднае становішча, цяжка ў Савецкай Расіі, а вы найперш носіцеся з нацыянальным пытаннем. Мы павінны дбаць пра ўвесь свет, а вы...

— Але дбаючы пра ўвесь свет, таварыш Сталін, нельга выпускаць з поля зроку і асобныя куты,— сказаў Жылуновіч.— У іх таксама жывуць людзі. Са сваімі бедамі, клопатамі, марамі і надзеямі, са сваёй гісторыяй і культурай. Каб ашчаслівіць увесь свет, трэба спачатку зрабіць шчаслівымі іх. Як я разумею, усіхнае шчасце не можа быць без шчасця кожнага чалавека... Дык і давайце не столькі будаваць абстрактны планетарны рай, колькі клапаціцца пра блізкіх людзей, пра нашы народы, якія нагараваліся пры царызме, чакаюць

не прыгожых слоў, абяцанак, а дзелавой увагі, міру, волі, права людзьмі звацца... А па-другое, інтэрнацыяналізм, што з'яўляецца асяродкам нашай партыйнай ідэалогіі — гэта ўсё лепшае з нацыянальнага, а не разбурэнне яго.

Сталін адвярнуў галаву, зацягнуўся — на яго левым вуху быў вялікі радзімы знак.

— Мала гэтага. Той-сёй ці крыўдзіцца, што мы, у каго моцныя нацыянальныя пачуцці, не адмаўляемся ад іх, не пераскокваем праз дарагое ў рай, а то і абвінавачваюць у нацыяналізме...

— А вашыя радаўцы ў Мінску? — рэзка павярнуўся, наставіў на яго сапраўды нечалавечыя вочы Сталін.— Яны таксама з «моцнымі нацыянальнымі пачуццямі»?

— Ёсць і такія. Ёсць і заблудзяганыя, авантурысты, а то і здраднікі. Мы, як вы ведаеце, з апошнімі ваявалі і ваюем. А па-другое, давайце гаварыць шчыра, таварыш Сталін: каб Мяснікоў, Ландар і іншыя не разагналі ў снежні Усебеларускі з'езд, падтрымалі левую плынь на ім, ідэю беларускай дзяржаўнасці, то, можа, і не было б ніякай БНР...

— Вось як!

— Той-сёй пайшоў на гэта з-за недальнабачнай вышэйназванай акцыі Мяснікова і Ландара, з адчаю. Я, паўтараю, гавару гэта толькі вам, бо мы ў Белнакоме і «Дзянніцы» ніяк публічна не высоўваем гэтай думкі, не падтрымліваем і заблуканых, выкрываем у прынцыпе БНР. Мы толькі за Савецкую Беларусь як аўтаномную частку РСФСР.

— Мяснікоў і Калмановіч супраць. І іхнія аргументы, ведаеце, пераканаўчыя.

— Ілжывыя! Не гуманныя!

— Што вы сабе дазваляеце? — выхапіў з рота люльку і ўспыхнуў Сталін.

— Тое, на што мне даюць права Кастрычніцкая рэвалюцыя, ідэі Камуністычнай партыі, Канстытуцыя, урэшце тое, чаго не робіце вы як нарком па нацыянальнай справе!

— Па-вашаму, я — лодыр, бюракрат, як вы публічна абазвалі мяне ў сваім артыкуле «Як жа з Беларуссю?».

— Што да ўсёй вашай работы, я не магу такога
сказаць. Але што вось да нас, то — так... Наш Белнаком у вашай сістэме існуе ўжо ледзь не год, а вы, прабачце, па беларускай справе ўсё яшчэ не маеце ніякага дзелавога праекта. Толькі паўтараеце ўслед за Мяснікоўым: «Няма і не можа быць ніякай Беларусі», «Не час цяпер займацца гэтым» альбо: «Сусветнай рэвалюцыі замінаюць нацыянальныя настроі, межы...»

Сталін, здаецца, аж затросся ад злосці і гневу, але не ўзарваўся, толькі з нянавісцю зірнуў на яго высокі лоб, акуляры, на чысценькую кашулю і прыгожа завязаны гальштук, нібы сам сябе ўгаворваючы: стрымайся, астынь, будзе час — ты яшчэ пакажаш сваё гэтаму мужыку, які лезе не толькі ў інтэлігенты, але і ў кіраўнікі дзяржавы! Хоць і невялікай!

— Калі вы і цяпер не прыслухаецеся да нашага голасу, да голасу ўсіх беларускіх камуністаў, то я не змагу болей заставацца з вамі ў адным камісарыяце!..

— Гэта што — ужо шантаж? Ультыматум?

— Крык душы.

— Трэба ўмець стрымліваць сваю душу,— Сталін рэзка вытрас попел з люлькі ў попельніцу.

— Асабіста я — не магу. Доўгі час цярпеў, закусваў вусны, як мог падтрымліваў партыю і Савецкі ўрад, але цяпер, калі мы тварам да вас, а асабіста вы — усё задам, буду пратэставаць, крычаць на ўвесь свет! Па-другое, мы кідаем кліч: «Беларусы — дахаты!» Будзем самі ўтвараць у Мінску беларускі ўрад...

— Камуніст! — з ухмылкаю хітнуў галавою Сталін.

— Камуніст. Маладзейшы па стажы за вас з Мясніковым, але шчыры.

— Не. Вы яшчэ не сапраўдны камуніст. Не загартаваны, не біты. Не пераадолелі пачуццяў, жывяце не па законах цвярозасці і халоднага розуму.

— А хіба трэба вынішчаць у сабе ўсё жывое?

— Можа, і так...

— Але машына можа не толькі ствараць, яна здольная і разбураць, нішчыць. Усё запар.

— Не,— зноў пахітаў галавою Сталін, набіваючы трубку новым тытунём.— Вы — не стратэг. А нестратэгі — кепскія палітыкі...

— Пра гэта, таварыш Сталін, калі захочам, мы можам падыспутаваць у вольны час,— таксама ўжо аспакайнела прамовіў Жылуновіч.— Цяпер мяне цікавіць іншае: які ваш тактычны і стратэгічны адказ на рэзалюцыі нашага з'езда?

— Я павінен расказаць пра нашу «мілую» бяседу таварышу Свярдлову,— ужо непарушна, марудна адказаў той.— Наш адказ атрымаеце пазней.

— Дзякую,— прамовіў Жылуновіч, падняўся.— Да пабачэння.

— Усяго добрага,— холадна буркнуў Сталін, не падымаючы галавы і далей пхнучы шчопаць тытуню ў сваю любімую люльку.

Жылуновіч шпарка выйшаў з кабінета. Ён не ведаў, што ўслед закруціцца хуткае кола: Сталін тут жа пазвоніць Свярдлову і распаяла яму пра іхнюю гутарку і пра тое, што Жылуновіч не згадзіўся з пастановаю ВЦВК пра Заходнюю камуну, а Свярдлоў адразу затэлефануе Леніну. К вечару гэтага дня Сталін будзе ўжо добра ведаць, як у ВЦВК і ЦК РКП (б) ацанілі тое, што рашыла Канферэнцыя беларускіх камуністычных секцый.

**4**

25 снежня пазванілі з Наркамнаца. Мяккі і далікатны жаночы галасок папрасіў, каб як хутчэй да іх «падышло кіруючае ядро Белнацкома і ЦБ беларускіх камуністычных секцый».

Жылуновіч, які трымаў трубку каля вуха, слухаў і паволі затрывожыўся (відаць, будзе ўсім наганяй за яго ўчарашнюю рэзкасць), і заадно захваляваўся: няўжо з іншага боку падзьмуў вецер? Каму пазваніў, па каго паслаў, і неўзабаве ўлад ён, Чарвякоў, Лагун, Дыла шпарка пакрочылі ў Наркамнац.

Сёння не затрымалі ў прыёмнай ні на хвіліну. Як толькі зайшлі, распрануліся, дык іх адразу запрасілі ў кабінет Сталіна.

Той, у звыклай трошкі зашырокай паўвайсковай форме, у мяккіх белых ботах, дымячы з люлькі, паходжваў уздоўж сцяны з крэсламі. Убачыўшы іх, заўсміхаўся, пайшоў насустрач і кожнаму з іх падаў лёгкую і мяккую руку, ветліва запрасіў садзіцца. Сам не падаўся за свой начальніцкі стол, не зазначыў розніцу паміж ім і імі, а ўзяў за высокую спінку просценькае крэсла, паставіў яго тыльным бокам да іх пасярод кабінета і сеў, кладучы левую руку на яго спінку — правай трымаў люльку.

— Які настрой, таварышы беларусы?

Яны — а сярод іх трапіліся амаль усе не вельмі гаваркія, ахвочыя да звычайнай балбатні — былі засяроджаныя, толькі, можа, трошкі ўражаныя ад такога вось настрою капрызнага і рэзкага, нават, як гаварылі, жалезнага наркома-каўказца.

— Якія ўсе сур'ёзныя! — пакпіў Сталін.— Што — прыйшлі з намерам даваць здачы?

Бачачы, што насцярожаныя, супакоіў:

— Не трэба. Бойка, таварышы, адмяняецца. Усе канфлікты ўжо вычарпаны.

У гэтую хвіліну адчыніліся дзверы, і ў праёме між іх паказалася маладая, у доўгай шэрай спадніцы і чорнай скураной куртцы, дзяўчына.

— Выбачайце, таварыш Сталін,— ветліва прамовіла яна.— Вам звонящь са Смаленска.

— Злучайце,— адказаў той, марудна падняўся і важна пайшоў да апарата, які стаяў на ягоным стале.

І праз хвіліну:

Сталін. Здравствуй, Алёша.

Яны ажыўлена пераэірнуліся: Алёша — гэта Мяснікоў, як кажуць, блізкі сябра гаспадара гэтага кабінета. Голасу таго, канечне, не чулі. А размова павялася вось такая:

Мяснікоў. Я слушаю тебя, Коба.

Сталін (прыжмурана пазіраючы ў верхні кут кабінета, дзе была цёмная плямінка). Есть срочное дело. Тебе, Калмановичу надо прибыть в Москву.

Мяснікоў. Если можно, то в нескольких словах: что за дело?

Сталін (павярнуўшы галаву на іх). Будзем упорядочивать белорусский вопрос.

Мяснікоў (здзіўлена). Мы же закрыли его!

Сталін. ЦК партии по многим соображениям, о которых теперь говорить не приходится, согласился с белорусскими товарищами по образованию Белорусского советского правительства.

Яны не вытрывалі: і зноў пераэірнуліся, і з палёгкаю ўздыхнулі, а Дыла дык і ціхенька запляскаў сам сабе.

Сталін (занепакоена). Ало, ало! Ты меня слышишь?

Мяснікоў (абурана). Слышу, но не могу, не хочу верить. А во-вторых, я не сумею срочно прибыть. На 27-ое назначена областная партийная конференция, и необходимо время на ее подготовку. Кстати, на нее мы пригласили московских и минских белорусов и вот здесь, в Смоленске, мы подискутируем о так называемом белорусском вопросе...

Сталін (без эмоцый, але нібы апраўдваючыся). Дискуссии, Алёша, отменяются. Все уже решено здесь, в центре. Старик решительно поддержал белорусских коммунистов. Он — не только за автономию Белоруссии, но и за ее значительно большие, суверенные, права. Так что отложи свою партконференцию, езжай сюда. Говорю все это по поручению ЦК. Иначе будут осложнения (зноў азірнуўся і зноў усміхнуўся ім). Белорусы могут уехать в Минск и на месте, без вас, провозгласить республику...

Жылуновіч, бачачы, што Сталін нібы. прыязны, а на самай справе напружана сочыць за імі, стараўся быць непарушным, строгім, але гэта ўдавалася яму з цяжарам: з душы нібы споўз агромністы валун, і душа заспявала, ірвалася, як кажуць, на паверхню — хацелася

падскочыць, не, мала было пацiснуць рукі калегам і сябрам, а моцна, горача ўсіх пацалаваць, а то і па-маладому загалёкаць: «Ура!!!», пабегчы кудысьці, трымаць узнятую, сціснутую ў кулак руку і гарлапаніць, спяваць, як чалавек, які знайшоў больш, чым мільён,— волю, годнасць, дзяржаўнасць для роднага народа!

Мяснікоў (разгублена). Я не могу опомниться, Коба... Как так?

Сталін. Вот так, Алёша.

Мяснікоў. Как могли принять такое решение?

Сталін (падміргнуўшы ім). Возьми себя в руки, слышишь? Срочно собирайся сюда, настраивайся на сотрудничество с белорусами, чтобы они тебя приняли. А они, считаем мы, не откажутся от нужных, авторитетных людей из твоего обкома и Облисполком-, заха, сделавших и делающих немало для революции, для освобождения Белоруссии (Гэтае, ясна, ужо гаварыў больш для іх, чым Мяснікову). Короче, рекомендуй своих толковых людей в Компартию и правительство Белоруссии.

Мяснікоў (пасля доўгага маўчання). Что — ты не приедешь на партконференцию?

Сталін (звышспакойна). Нет. Я очень занят. Просто разрываюсь на заседания. Все. Приезжай. О б остальном поговорим здесь.

Паклаў трубку, з прагаю зацягнуўся і падзьмуў убок вялікі клуб дыму. Вярнуўся да крэсла, апусціў абедзве рукі на іх, хітравата ўсміхнуўся:

— Добра ўсё чулі? Здольны пераЖыць радасць?

— Мы сапраўды сёння самыя шчаслівыя людзі на свеце, таварыш Сталін,— прамовіў Жылуновіч, падняўся, сашчапіў і прыклаў да грудзіны рукі, каб не мяць іх ва ўзбуджэнні.— Мы просім вас ад імя нашага ЦБ беларускіх камуністычных секцый, Белнакома, ад імя ўсяго шматпакутнага беларускага народа перадаць шчырую і сардэчную падзяку Камуністычнай партыі, Леніну, Савецкаму ўраду.

Сталін выслухаў, а пасля, нібы яшчэ ўчора не гаварыў рэзка з ім, адказаў мякка:

— Добра. Мы рады такое чуць ад вас, нашых братоў.— Пыхнуў дымам і быццам стомлена зморшчыўся.— Цяпер, таварыш Жылуновіч, засталіся такія-сякія працэдурныя нюансы. Ведаючы пра канфлікт, які існуе паміж вамі і смаленскімі таварышамі, ЦК запрашае ўсіх вас на 27-е на нараду. Можа, вас прыме нават сам таварыш Ленін.

— Добра, таварыш Сталін,— сказаў Жылуновіч.

Сталін паставіў на месца да сцяны крэсла, нібы павагаўся, а пасля з усмешкай падаў руку:

— Віншую, таварыш Жылуновіч, з вашай дзяржаўнасцю! Гэта — вялікае дасягненне нашага з вамі народнага камісарыята! — Моцна парукаўшыся, дадаў з жартам: — Так што недарэмна мы з вамі наркомаўскі хлеб ядзім...

— Дзякую, таварыш Сталін,— моцна паціснуў руку ў адказ Жылуновіч, ужо трошкі перажываючы, што ўчора гэтак вось тут узбуджаўся.

Сталін падаў і ўсім астатнім руку, а пасля, праводзячы іх і трымаючы Жылуновіча пад локаць, нечакана запытаў яго ўжо сваім звыклым, марудным і з грузінскім акцэнтам голасам:

— Як вы думаеце, таварыш Жылуновіч:: ці не зрабіць нам сталіцу Савецкай Беларусі ў Смаленску альбо ў Магілёве? Мінск, які вы лічыце цэнтрам краю, усё ж вельмі блізка каля буржуазнага Захаду...

— Не ведаю, таварыш Сталін,— паціснуў ён плячыма.— Трэба параіцца.

— Парайцеся, калі ласка, і пазваніце мне. Я, разумееце, павінен ведаць усе нюансы.

— Добра, таварыш Сталін,— пачціва адказаў Жылуновіч.

**5**

У прыёмную Леніна Жылуновіч, Чарвякоў зайшлі першыя. Распрануліся і прыселі на крэслах. Неўзабаве зайшлі і астатнія — Сталін, Мяснікоў і Калмановіч, з кім нядаўна, сёння, былі ў ЦК РКП (б), вялі дыскусіі.

Як заўважыў Жылуновіч, у Сталіна ў вачах скачуць чорцікі, а на вуснах блудзіць ухмылістая ўсмешка — можа, і рады, што нядаўна, на сустрэчы ў ЦК РКП (б), яны, Жылуновіч і Чарвякоў, Мяснікоў і Калмановіч, добра-такі счапіліся, папсавалі адзін аднаму нервы, успомніўшы ўсе старыя і пачаўшы новыя спрэчкі паміж Белнацкомам і Паўночна-заходнім камітэтам РКП (б). Сталін сядзеў моўчкі, усміхаўся, а пасля, калі абодва бакі, белнацкомаўцы і смаленцы, так і не прыйшлі да згоды, развёў рукі і нібы паскардзіўся таварышам з ЦК:

— Бачыце, якія яны незгаворлівыя! Бачыце, як мне цяжка з імі! Але лінію ЦК, не сумнявайцеся, Наркамнац будзе праводзіць цвёрда...

Апошнія сталінскія словы былі прымальныя Жылуновічу, а вось Мяснікоў тады недаўменна і дакорліва бліснуў на Сталіна вялікімі цёмнымі вачыма: ты што — Коба? Але Сталін нібы не заўважыў гэтага, далей запэўніваў, што ён, нарком па нацыянальных справах, будзе тонка і гібка займацца гэткаю далікатнаю, як нацыянальная, справаю.

Вось цяпер ён таксама быў спакойны, а Мяснікоў — хмурны, Калмановіч — разгублены.

У прыёмнай іх доўга не затрымалі.

Сталін знарочыста ветліва запрасіў першымі заходзіць у кабінет Леніна Жылуновіча і Чарвякова, пасля — Мяснікова ды Калмановіча, а сам ступіў апошні.

Жылуновіч і летась, і сёлета не раз і не два бачыў Леніна, але вось гэтак блізка — ніколі. Ленін яшчэ сядзеў за сталом, штосьці хуценька дапісваў, але, як толькі яны зрабілі крок-другі, падняў галаву.

Жылуновічу прыходзілася бачыць Леніна ў паліто і ў зімовай ці летняй шапцы, у касцюме і з адкрытай галавой, заўсёды жвавага, запалістага, гаваркога, а вось цяпер, здалося яму, тут — не то Ленін, не то не: той жа ясны, высокі лоб, шырокія шчокі, вусны і бародка, але вунь у глыбокіх вачах нейкая бездань стомы, якогасьці цяжару, а на твары — бледнасць. Ды нечакана Ленін ажывіўся, усміхнуўся, борздка падняўся і рухава пайшоў насустрач.

— Здравствуйте, товарищи,— прамовіў, трошкі картавячы літару «р», моцна пацiснуў яму, Жылуновічу, Чарвякову, а пасля і іншым руку.— Прашу садзіцца.

Яны селі паблізу яго стала, з начною лямпаю, у выглядзе вялікага грыба, з чарнільным прыборам і акуратнымі грудкамі кніг ды папер, а ён запыніўся збоку яго і, абапёршыся адной рукою аб краёк, а палец другой засунуўшы ў кішэньку камізэлькі, гарэзна ўсміхнуўся:

— Ведаю і нават бачу, таварышы: Белнацком у асобе таварыша Жылуновіча і Чарвякова, Паўночна-заходні камітэт РКП (б) у асобе таварышаў Мяснікова і Калмановіча да згоды не прыйшлі нават пасля таго, калі Канферэнцыя беларускіх камуністычных секцый рашыла дабівацца аб'яўлення Савецкай Беларусі, а ЦК падтрымаў гэтае рашэнне. І нават таварыш Сталін, які мае не малыя арганізатарскія здольнасці, жалезны характар, не здолеў прымірыць.

Павярнуўся, зірнуў на смаленцаў.

— Таварыш Мяснікоў, прашу коратка і аргументавана выкласці сваю пазіцыю.

Мяснікоў — у вайсковай новенькай форме, мажнаваты, з кароткай пастрыжкай, дык нібы маладзей за свае трыццаць два гады — устаў.

— Нашая пазіцыя, таварыш Ленін, ясная,— паколькі ў гэтую хвіліну хваляваўся, дык выразней пачуўся яго каўказскі акцэнт.— Мы яе пастаянна і абнародваем у друку, і гэтак жа пастаянна праводзім у жыццё. Мы, камуністы, павінны сыходзіць з тых пазіцый, што час нацыянальных дзяржаў і ўвогуле ўсяго нацыянальнага мінуў. Мы

ідзём да наднацыянальнага аб'яднання дэмакратыі, працоўных. Пагэтаму цяпер не разумна бурыць той вялікі расійскі дзяржаўны арганізм, што склаўся за стагоддзі, дзяліць яго на асобныя рэспублікі, свядома распальваючы ў іх нацыяналістычны сверб. Мы ў гэтым сэнсе павінны не адракацца ад заслуг імперыялізму, які зрабіў нямала для таго, каб утварыць новы тып дзяржаўнасці — наднацыянальнай дзяржавы. Мы павінны рухацца далей у гэтым накірунку. Да сусветнай сацыялістычнай рэвалюцыі, да сацыяльна-класавых пераўтварэнняў ва ўсім свеце. Тое, што мы на самым пачатку сацыялістычнай пабудовы адступаем ад гэтага прынцыпу, цацкаемся, а то і ідзём на павадку жменькі нацыяналістычнай інтэлігенцыі з розных куткоў Расіі, не паспрыяе, а затармозіць наш рух да вялікай і светлай мэты. Што да Беларусі, яе, таварыш Ленін, ніколі не было, дык няма ніякай патрэбы яе выдумляць. Дастаткова абласнога самавызначэння...

Ленін уважліва выслухаў Мяснікова, а калі той сеў, павярнуўся да яго.

— Прашу, таварыш Жылуновіч, вашы аргументы.

Ён паволі падняўся і, ведаючы, што Ленін яшчэ да 1917 года напісаў нямала прац пра нацыянальнае пытанне, цяпер уважліва адносіцца да клопатаў, просьбаў вялікіх і малых народаў, цёпла выказваецца асабіста пра іх, беларусаў, не захваляваўся, адчуў спакойнасць, што добра спрыяе самавалоданню і развазе.

— Мне здалося, што таварыш Мяснікоў гаварыў шчыра,— прамовіў ён,— Буду шчыры і я. Не ведаю: мопса, і найвышэйшая мэта для ўсяго чалавецтва — адзіп дзяржаўны арганізм, адна мова, адна культура. Можа. Не буду спрачацца. Але таварышу Мяснікову і яго сябрам-іншародцам, якія лёгка русіфікаваліся, вельмі нецярніцца адвабіць ад свайго і астатнія нацыянальныя меншасці, адным рыўком трапіць у наданую будучыню...

Бачачы, што Леніну цяжка стаяць, але той не хоча замінаць яму, дык нават не варушыцца, Жылуновіч зрабіў паўзу і перавёў позірк на крэсла за сталом — Ленін сапраўды крануўся туды і сеў.

— Працягвайце, таварыш Жылуновіч,— падпёр правай далонню падбародак і зірнуў на яго ўважліва і, здаецца, цікаўна ды цёпла. Можа, як і на рабочага, які здольны не толькі працаваць каля станка, але і займацца літаратурай, палітыкай, вырас у буйнага дзеяча. Мяснікоў і Калмановіч у гэты час папунсавелі, сядзелі наструненыя і нібы недаўменна пазіралі на Леніна, а Сталін на нікога не глядзеў, апусціў галаву.

— Я — сын таго амаль дзесяцімільённага народа, які і раней не прызнавалі, і цяпер многія, у тым ліку і некаторыя нашы камуністы,

не лічаць за народ, а за галінку вялікага рускага дрэва,— сказаў Жылуновіч.— Сапраўды, беларусы, бадай, з найменш развітым нацыянальным пачуццём за ўсе іншыя народы і народнасці былой Расійскай імперыі. На тое шмат прычын. Але толькі не галоўная прычына ў тым, што сам наш народ адмовіўся ці адмаўляецца ад усяго свайго: ад дзяржавы, ад мовы, ад культуры. Не! Яшчэ ў даўніну Полацкае княства спрабавала быць самастойным, самастойнасці дабіваліся і дабіліся нашы землі ў Вялікім княстве Літоўскім і Рэчы Паспалітай. А ўжо толькі тое, што якраз на беларускай мове ўпершыню сярод усходніх славян надрукавана кніга, выдадзены адзін з першых у Еўропе сістэматызаваных законаў па ўсіх галінах тагачаснага права — Статут, сведчыць, што і наша мова, культура таксама былі самастойныя і развітыя. Ды лёс склаўся так, што блізкія па землях і духу дзяржавы, польская і расейская, зрабілі шмат, каб нашы продкі не толькі не падняліся, але, наадварот, каб страцілі ўсё. Стагоддзі мы зведалі паланізацыю, а апошнія амаль 150 гадоў жорсткую русіфікацыю. Канечне, моц, дух нашага народа тухлі, але ва ўсе часы былі тыя, што дзеля адраджэння народа ішлі і на плаху. Гэтая вайна, адна і другая рэвалюцыі ажывілі, узбудзілі не толькі жменьку нашых свядомых сіл альбо нацыяналістаў, як той-сёй сцвярджае, але і ўвесь наш люд. Канферэнцыя беларускіх камуністычных секцый, калі сказала сваё рашучае слова пра беларускую дзяржаўнасць, улічвала не толькі думку нашых камуністах, але і агромністага натоўпу нашых бежанцаў, параскіданых па ўсёй Расеі, вялікай масы нашых чырвонаармейцаў, значнага слою нашай інтэлігенцыі і, галоўнае, карэннага люду, які праз пакуты прыйшоў да высновы, што ў яго павінна быць дзяржава. Дык што — забіваць гэтую мару, цягу дзеля будучых светлых мэт? Але дазвольце тады запытаць: ці будуць гэтыя мэты светлыя, калі мы будзем ісці да іх гвалтоўна, па крыві і слязах?

Перавёў позірк на Мяснікова — той апусціў галаву і, ужо зачырванелы, нават з ярка-цёмнымі плямінамі на шчоках, уважліва слухаў.

— Вы, таварыш Ленін, летась у артыкуле «Удержат ли большевики государственную власть?» надзейна і слушна сказалі, што трэба «немедленное восстановление полной свободы для Финляндии, Украины, Белоруссии, для мусульман и т. д.». Сапраўды, тут да месца гэтае «восстановление свободы». Камуністы з Мінскага Савета, Губрэўкома, хоць сярод іх шмат небеларусаў, таксама цяпер зразумелі гэта, цяпер не супраць беларускай дзяржаўнасці,— усё ж захваляваўся, дык відочна ў нос сказаў Жылуновіч.— А вось таварыш Мяснікоў са сваімі калегамі па-ранейшаму зацята, я сказаў бы нават не на жыццё, а на смерць, вядзе супраць нас, а цяпер ужо і супраць Мінчукоў вайну. Я

паважаю таварыша Мяснікова як партыйнага і дзяржаўнага дзеяча, які нямала зрабіў для рэвалюцыі, найперш на былым паўтарамільённым Заходнім фронце, але што да нацыянальных спраў, то смела сцвярджаю: тут ён абмежаваны альбо вельмі паспешлівы. Калі пайсці за ім, то можна дапасці да вялікай бяды, самае малое да тэрору супраць нацыянальнае дэмакратыі. І яшчэ, таварыш Ленін. Мы ведаем, што ЦК, Савецкі ўрад добра ўяўляюць, якая пагроза, натхнёная Антантай, ідзе з буржуазнай Польшчы. Мы ж, беларусы, адчуваем яе кожнаю жылкаю. Польская буржуазія, штурхаючы на Усход Пілсудскага, Доўбар-Мусніцкага, замахваецца і на пашы, і на ўкраінскія, літоўскія, і на многія расейскія землі, бессаромна манячы свету, што гэта спрадвечна польскае.

Прыклаў руку да грудзіны, схіліў галаву.

— Паверце, таварыш Ленін, і вы, таварыш Мне-
нікоў, мы не хочам зноў трапіць у крывапіўныя лапы паноў і буржуазіі,— прамовіў аж з надрывам.— Мы, хто ўжо дыхнуў тут волі, хочам яе і ўсяму свайму народу, хочам у сваім краі ўлады работнікаў і сялян, жадаем ісці па дарозе сацыялізму, братэрства разам з Расеяй і іншымі братнімі народамі, хочам развіць усё тое лепшае, што ёсць у нашых сціплых, працавітых і таленавітых людзях. А гэтае добрае, высакароднае мы можам на поўную моц развіць якраз ва ўмовах беларускай дзяржаўнасці. Пагэтаму мы толькі вітаем, што ВЦВК прызнаў Літву, Латвію і Эстонію як незалежныя савецкія рэспублікі.

— Дзякую. Ваша слова, Іосіф Вісарыёнавіч,— калі ён сеў, Ленін перавёў позірк на Сталіна.

— Цяжкая сітуацыя, Уладзімір Ільыч,— падняў галаву, усміхнуўся той,— Паслухаеш — абодва маюць рацыю. Але трэба прымаць канчатковае рашэнне. Асабіста я за тое, каб улічыць сусветны рэзананс, міжнароднае становішча, а таксама пазіцыю беларусаў і ўтварыць Савецкую Беларусь.

— З якім статусам? — запытаў Ленін.

— Думаю, на правах аўтаноміі.

У гэты час пачуўся дробны і часты тупат — гэта, як усе ўбачылі, ад нервовага перанапружання дрыгае нагою Мяснікоў.

— Дзякую, таварышы,— прамовіў Ленін, паклаў рукі перад сабою,— Сітуацыя, сапраўды, сур'ёзная. І, на жаль, многія нашы таварышы не гатовыя да яе. Спачатку перад намі востра стаяла пытанне ўлады, пасля навіслі германскае наступленне, мяцяжы, ваенная інтэрвенцыя з усіх бакоў, эканамічны хаос... На нацыянальнае пытанне ў нас проста яшчэ не было, а то і няма часу. Але братоў беларусаў мы крыўдзіць не павінны. Яны і гаротныя, і мужныя. Не адзін год

трымалі па сабе агромністы фронт, а пазней узялі на сябе вялізны цяжар нямецкай акупацыі і самаахвярна сабою памаглі нам выратаваць Савецкую ўладу. Да ўсяго гэтага народ са сваёй гісторыяй, культурай, яркай славянскай мовай. Пра гэта ў свой час мне шмат і цёпла гаварыў Максім Горкі ды шмат чытаў і я сам. Сапраўды, наша партыя, Савецкі ўрад павінны падтрымліваць усё лепшае ў народзе, а не знішчаць яго. Тады нашы ідэі не будуць навязаныя, а стануць плоццю, жыццём. Сыходзячы з гэтага, мы павінны ўлічыць мары беларускага народа на сваю дзяржаўнасць. І, думаю, не толькі з аўтанамічным статусам, але і са значна шырэйшым... А што да боязі драблення былога расійскага дзяржаўнага арганізма, таварыш Мяснікоў, дык, па-першае, ён быў скляпаны па воўчым законе, а па-другое, не варта панікаваць. Колькі б ні было самастойных рэспублік, мы не павінны іх асцерагацца. Для нас не самае важнае, дзе будзе дзяржаўная мяжа. Важней іншае: каб былі павага, дружба, саюз паміж працоўнымі ўсіх нацый для барацьбы супраць буржуазіі любых нацый. Пагэтаму, таварышы Мяснікоў і Калмановіч, адкладзіце абласную парканферэнцыю з задуманым парадкам дня і рыхтуйце Першы з'езд Кампартыі Беларусі, дзе першым пунктам павінна быць гутарка пра абвяшчэнне Савецкай Беларусі...

— Таварыш Ленін,— падняўся Мяснікоў,— Мы, хоць і не згодныя, падпарадкуемся рашэнню ЦК. Але я хачу сказаць пра адзін вельмі валены аспект. Калі будзе Беларусь, то трэба і яе ўрад, яго старшыня. Так склалася, што яшчэ ў лютым асноўныя інтэлектуальныя беларускія сілы засталіся ў акупацыі ў Мінску і ўтварылі контррэвалюцыйную БНР. Значыць, разлічваць на іх мы не мопсам. А тут, у Савецкай Расіі, я не бачу тых, хто можа ўвайсці ва ўрад, тым больш — узначаліць яго...

Чуючы гэта, Жылуновіч не вытрываў:

— Калі гэта, таварыш Мяснікоў, ваш апошні аргумент супраць таго, каб абвяшчаць Беларусь, то ён вельмі ж надуманы і несумленны,— рэзка сказаў.— Паверце, і я, калі будзе згода ЦК, Савецкага ўрада, здолею сфарміраваць беларускі ўрад. І з інтэлектуальных таварышаў, сапраўдных камуністаў. Так што яшчэ можам падумаць, ці ўключаць туды вас.

Ленін усміхнуўся; Мяснікоў хутка перавёў разгублены позірк на Сталіна, але той зноў апусціў галаву і зноў штосьці маляваў у сваім блакноціку.

— Я думаю, таварыш Мяснікоў,— сказаў Ленін,— беларусы вас не пакрыўдзяць, прымуць на парытэтных пачатках — у Кампартыю і ва ўрад Беларусі. Так, таварыш Жылуновіч?

— Мы не супраць парытэтнага пачатку.

— Добра,— усцешыўся Ленін.— Гэта — вельмі важныя ўмовы для ўтварэння Савецкай Беларусі. ЦК і Саўнарком якраз за іх. Дарэчы, таварыш Жылуновіч, у якіх межах вы бачыце сваю рэспубліку?

— Нашы гісторыкі і мовазнаўцы, таварыш Ленін, вызначаюць, што беларусы жывуць да Чарнігава, да Брэста на поўдні, да Беластока і Вільні на захадзе, у Латгаліі, на Пскоўскай, Смаленскай і Бранскай землях на ўсходзе...

— Аж да Масквы! — пакпіў Мяснікоў.

Сталін, якому яны ўжо гаварылі пра гэта і не толькі пра гэта, нібы нічога не чуў і ні на што не зважаў. Быццам скідваў з сябе ўсё на плечы Леніну ці чакаў ад яго загаднага слова. А то, здаецца, усім выглядам паказваў сваю стомленасць, а то і не такую ўжо вялікую важнасць таго, пра што тут гаварылі.

— Мы цвёрда лічым, таварыш Ленін: у Беларусь найперш павінны ўвайсці Віцебская, Гродзенская, Магілёўская, Мінская губерні, беларускія паветы Віленскай і Ковенскай ды заходнія паветы Смаленскай са сталіцаю ў Мінску,— не зважаючы на пачуты кпін апанента, дадаў Жылуновіч.

— Іосіф Вісарыёнавіч,— зірнуў Ленін на Сталіна,— я вас прашу: вельмі асцярожна, тактоўна і на навуковай глебе падыдзіце да фарміравання ўрада Беларусі, вызначэння яе меж. Бо, прадбачу, часамі нават з-за адной нейкай воласці можа ўспыхнуць сыр-бор паміж маладымі рэспублікамі. Вы, таварыш Жылуновіч, таксама, калі ласка, праявіце тут цвярозасць і розум. Бо, адчуваю, сапраўды якраз вам як камісару Белнацкома, віднаму грамадскаму і культурнаму дзеячу, прыйдзецца рыхтаваць маніфесты да свайго народа, фарміраваць і, відаць, узначаліць беларускі ўрад. Калі, канечне, гэтае наша прадбачанне супадзе з думкай камуністаў на Першым з'ездзе Кампартыі Беларусі.

Ленін падняўся, выйшаў з-за стала.

— Хачу спадзявацца, таварышы, што вы пераадолееце чыста чалавечыя непаразуменні, будзеце дружна працаваць дзеля такой важнай справы, як утварэнне новай савецкай рэспублікі,— сказаў падаючы кожнаму руку. А калі падаў Сталіну, дадаў некалькі слоў і яму: — Іосіф Вісарыёнавіч, яшчэ раз папрашу: прасачыце, каб усё было як след.

— Ёсць, Уладзімір Ільіч,— пачціва прамовіў, усміхнуўся той.— Не хвалюйцеся. Падыдзем да ўсяго гэтага вельмі сур'ёзна і адказна.

Калі выйшлі з ленінскай прыёмнай і ішлі па калідоры, задаволены, нават шчаслівы як ніколі, Жылуновіч нібы падляцеў да Сталіна:

— Дык калі, таварыш Сталін, пачнём работу?

І тут жа асекся. Сталін паволі павярнуў да яго галаву і холадна, непрыступна, як кажуць, стаўляючы на сваё месца, працадзіў скрозь зубы:

— Чакайце. Вам пазвоняць.

І пайшоў з Мясніковым і Калмановічам.

Ледзь толькі Жылуновіч, перакінуўшыся словам-другім з Чарвяковым пра сустрэчы ў ЦК, пра прыём у Леніна, вярнуўся ў свой рабочы пакой у Белнацкоме, як яму сапраўды пазванілі з Наркамнаца.

— Таварыш Жылуновіч,— сказаў яму Сталін.— Прыходзіць сёння не трэба. Рыхтуйце спіс беларускага ўрада. Заўтра-паслязаўтра мы паклічам вас.

— Добра,— адказаў ён і адразу ж пачаў абзвоньваць, склікаць калег з калегіі Белнацкома, Цэнтральнага бюро беларускіх камсекцый і Маскоўскай беларускай секцыі РКП (б).

**6**

Паклікалі яго да Сталіна назаўтра. Сёння той, пастрыжаны, у белым кіцелі з радком карычневых гузікаў пасярод і па гузіку на шырокіх нагрудных кішэньках, выглядаў молада і жвава.

— Прынеслі спіс свайго ўрада?

— Прынёс. Учора тры гадзіны засядалі і выбіралі з 70 чалавек...

Сталін, уведаўшы, што яны не пераспрачаліся, зрабілі ўсё хутка і ў згодзе, не захацеў слухаць пра ўсе для іх важныя, а для яго лішнія падрабязнасці:

— Калі ласка, спіс.

Жылуновіч падаў.

Сталін, жмурачыся ад дыму, яшчэ болей звузіў вочы, і на яго, можна сказаць, непрывабным твары яшчэ болей абазначыліся паўмангольскія рысы.

Сталін. Міхаіл Фаміч Драка-Дракон — нарком па ваенных справах. Чуў. Мільгала прозвішча ў вашых, белнацкомаўскіх, справаздачах.

Жылуновіч. Драка-Дракон — паліткамісар 1-га беларускага Полацкага палка Заходняй стралковай дывізіі, таварыш Сталін. Адданы...

Сталін (не даслухаў, перапыніў). Іосіф Сцяпанавіч Няцецкі — нарком шляхоў зносін. Таксама трапляла на вочы гэтае імя.

Жылуновіч (уражаны, што нарком Наркамнаца мае ўчэпістую памяць, але цяпер вядзе нейкую адмысловую гульню). Загадчык аддзела друку Вікжэдора і старшыня чыгуначнага саюза Палескіх чыгунак.

Сталін. Якаў Аляксеевіч Рыбак — нарком коштаў і тэлеграфаў. Помню прозвішча, але не ведаю, што за чалавек.

Жылуновіч. Механік Маскоўскага галоўпаштампа.

С т а л і н (ухмыльнуўся). У Маскве — механік, а ў вас — нарком... Вось што значыць свая рэспубліка!

Жылуновіч (стрымана, але смела). Рабоча-сялянская рэспубліка! Не ў прыклад цэнтральнаму ўраду ў нас будзе шмат рабочых і выхадцаў з вёскі.

Сталін (уздрыгнуўшы ад ягонай папраўкі, як ад удару токам). Аляксандр Рыгоравіч Чарвякоў — нарком асветы. Гэтага ведаю, сустракаліся, размаўлялі... Ён на сваім месцы. Восіп (Язэп) Лявонавіч Дыла — нарком фінансаў. Чуў. Ён адзін час узначальваў ваш Цэнтральны бежанскі камітэт.

Жылуновіч. А так ён — загадчык мануфактурнага аддзела Цэнтрсаюза.

С т а л і н. а) Іваноў, б) Іосіф Васільевіч Лагун — нарком унутраных спраў. Чаму таварыш Іваноў без імя і імя па бацьку?

Ж ы л у и о в і ч. Паколькі ён у Смаленску, дык мы не ведаем яго імя і імя па бацьку. Мы яшчэ ў двух выпадках вылучаем двух на адну пасаду.

Сталін. Фабіян Гіляравіч Шантыр — нарком юстыцыі. (Пасля паўзы, марудна, ледзь не па складах). Наколькі я помню, таварыш Усціловіч ў свой час скардзіўся мне на яго: ён не наладзіў як след сувязі паміж Белнацкомам і Паўночна-заходнім камітэтам РКП (б) ды Аблвыкамзахам. Нават больш — пакінуў Смаленск і паехаў у сваю вёску.

Жылуновіч. Мы пасля ўведалі: ён не столькі сам з'ехаў, як яго змусілі з'ехаць... Але ён не адышоў ад грамадскай дзейнасці, цяпер зноў у Смаленску, у Чырвонай Арміі.

Сталін. Аляксандр Іванавіч Квачанюк — парком замежных спраў (прачытаў і замаўчаў. Можа, і не сустракаў нідзе гэтага прозвішча).

Жылуновіч. Ён — ад Мінскай беларускай секцыі РКП (б).

Сталін, а) Рэйнгольд, б) Мікіта Васільевіч Галасной — нарком прамысловасці і гандлю. Што "(усміхнуўся) — ушаноўваеце Рэйнгольда за тое, што пайшоў насуперак Мяснікову і падтрымлівае вас?

Жылуновіч. ...І яшчэ ўлічваем тое, што ён — старшыня Мінскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта.

Сталін. Іларыён Ісаевіч Пузыроў — нарком працы. Гэты з Тамбова?

Жылуновіч. Але. Старшыня Тамбоўскага павятовага камітэта РКП (б).

Сталін. Зміцер Сілыч Чарнушэвіч — нарком харчавання. Чуў. Ваш калега па Белнацкоме і зямляк. Так?

Жылуновіч. Так.

Сталін (з кпінам). Значыць, зямляк будзе забяспечваць вам стол?

Жылуновіч. ...І народу.

Сталін (раздражнёна). Ігнат Мікалаевіч Мазур — нарком земляробства. Гэты таксама з Белнацкома, друг?

Жылуновіч. Вясковец, добра ведае сялянскія клопаты, адукаваны, барацьбіт за Савецкую ўладу.

Сталін. Усевалад Сцяпанавіч Фальскі — нарком сацыяльнага забеспячэння і аховы здароўя (ажывіўся). Блытаўся з вашымі нацыяналістамі?

Жылуновіч. Мы яго ведаем як загадчыка прытулкаў былога камітэта Усерасійскага земскага саюза Заходняга фронту, які памагаў выжыць дзесяткам тысяч абяздоленых людзей, а таксама ён вядомы як акцёр, тэатральны дзеяч і здатны на чулае, душэўнае слова. Гэтыя якасці — цяпер тое ж лекарства.

Сталін. Зміцер Хведаравіч Жылуновіч — нарком па справах нацыянальнасцяў. Значыць, мой калега і падначалены. А) Найдзянкоў, б) Ігнат Вікенцьевіч Зыбко — нарком дзяржкантролю. Ведаю. Першы — член Аблвыкамзаха, а другі — сакратар Вярхоўнага Трыбунала. Жылуновіч — старшыня Саўнаркома Беларускай Сацыялістычнай Рабоча-сялянскай Савецкай Рэспублікі.

Жылуновіч. Мяне вылучылі большасцю галасоў тайным галасаваннем.

Сталін (нібы не чуючы). Спіс ёсць, урад можа быць, але слана ці нават сланоў вы не прыкмецілі...

Жылуновіч. Не згодзен, таварыш Сталін. Мы вылучылі адных з самых аўтарытэтных і адданых новай уладзе нашых таварышаў, а таксама людзей са Смаленска, Тамбова і Мінска.

Сталін (рэзка). А дзе Мяснікоў, Калмановіч, Кнорын, Алібегаў і іншыя, як вы кажаце, смаленцы?

Ж ы л у н о в і ч. Той-сёй з іх трапіць у кіруючае ядро Кампартыі Беларусі, а без паслуг таго-сяго мы можам і лёгка абысціся альбо можам спажыць іх на іншых пасадах. Паверце, таварыш Сталін, мы, кажу, усё добра ўзважвалі, падабралі сур'ёзных людзей, якія будуць на сваім месцы. Ведаючы характар, патрэбы беларускай вёскі, спецыфіку нашых гарадоў, маючы адпаведныя веды, вопыт, палітычна-класавую загартоўку, ніхто з іх не будзе чужы народу.

Сталін (пакруціў галавою). Добра гаворыце, таварыш Жылуновіч! Але мяне вы не абманеце. Вы — хітры сепаратыст! Вы хочаце ўпрыцірку з Савецкай уладай зрабіць для сябе тое, што хацелі зрабіць вашы мінскія калегі ўпрыцірку з немцамі...

Жылуновіч (адчуваючы як шалёна затрапяталася сэрца, але стрымліваючы сябе). Я ніколі не гуляў, таварыш Сталін. Але Я заўсёды — і ніколі не пабаюся яшчэ раз паўтарыць: заў-сё-ды! — дбаў пра свой прыгнечаны парод. Калі я і мае калегі чаго-небудзь дабіліся, то, сапраўды, толькі з помачы Савецкай улады...

Сталін. Акцёр!

Жылуновіч. Няможна так не верыць людзям, таварыш Сталін. Мы ж з вамі разам павінны будаваць новы свет, новы лад... Мы з Белкамсекцый яшчэ не ўмудроныя бальшавікі, але - бальшавікі! Са сваім розумам, са сваёй душой, са сваім поглядам на сацыялізм. Дык чаму не прыслухацца і да нас, да таго, хто нясе штосьці сваё з народных глыбінь?

Сталін. Цяжкі лёс прадбачу я вам, таварыш Жылуновіч... З-за вашай народнасці ў тым ліку. Рана-нозна яна можа кваліфікавацца як ухіл...

Жылуновіч. Хто ведае свой лёс, таварыш Сталін?! Усякае ў жыцці бывае...

Сталін. Сапраўды, усякае (пахітаў галавою). Па сабе бачу... Але цяпер не час для перастрэлкі красамоўства ці ўспамінаў... Давайце бліжэй да справы. Цяпер я павінен пазнаёміць вас з умовамі ўтварэння Кампартыі, урада вашай рэспублікі (пачаў чытаць з паперкі). 1) Урад Беларускай рэспублікі складаецца са старшыні і 15 членаў урада 2) Для бягучых спраў будзе прэзідыум з трох асоб: старшыні ўрада і двух членаў з яго складу. 3) У склад рэспублікі ўваходзяць губерні — Гродзенская, Мінская, Магілёўская, Віцебская і Смаленская (апошняя спрэчна, як рашаць мясцовыя таварышы). 4) Абласны камітэт партыі Паўночна-заходняй вобласці ператвараецца ў Цэнтральнае бюро КП(б) беларускай рэспублікі. 5) Старшыня ЦБ партыі павінен быць прадстаўніком ЦК партыі і ўрада. 6) Правы ЦБ партыі і аддзелаў урада застаюцца такімі ж, як у былога Абласнога камітэта і Аблвыканкомзаха.— Падняў галаву, зірнуў дапытліва.— Што скажаце на гэта?

Жылуновіч. У аснове я згодзен (сам сабе падумаў, што нарком па нацыянальных справах павінен быў спачатку пачуць яго думку, а пасля ўжо гаварыць сваю).

Сталін. Аў цэлым?

Жылуновіч. Я павінен ведаць усе дэталі. І пра ўрад, і пра партыйны оргап. Пра тое, хто будзе пасланцом ад ЦК РКП (б).

С т а л і н (нібы здзівіўшыся). Далёка закідаеце...

Жылуновіч. Мы ж, думаю, не гуляем у дзіцячыя забаўкі, а займаемся сур'ёзнай справай.

Сталін. Сапраўды, так. Значыць, вы — старшыня ўрада. Кампартыю можа ўзначаліць хтосьці і са смаленцаў.

Жылуновіч. І ён будзе прадстаўляць ЦК РКП (б) ? Не! Мы на гэта не згодныя!

Сталін. А што вы хочаце?

Ж ы л у н о в і ч. Ці хтосьці з нас узначальвае Кампартыю, ці мы таксама захоўваем такі ж прынцып, што і ў ЦК РКП (б) —гэта значыць будзем старшынстваваць на пасяджэннях бюро па чарзе, а галоўнай пастаццю будзе старшыня ўрада...

Сталін. Хочаце самі іграць першую ролю?

Жылуновіч. Я гавару не пра сябе, а пра прынцып. Далей. У Цэнтральнае Бюро Кампартыі Беларусі павінна цалкам увайсці Цэнтральнае бюро Беларускіх секцый РКП (б). Другое: я не зусім зразумеў, таварыш Сталін, вашы фармуліроўкі пра перайменаванне абкома і яго аддзелаў...

Сталін. Яны натуральныя. Абком ліквідоўваецца, а будзе ЦБ Кампартыі Беларусі.

Жылуновіч зноў пільна зірнуў Сталіну ў вочы. Ці няма тут якой казуістыкі? Але той нават не міргнуў, нібы акамянеў і ўжо незадаволена зморшчыўся — у мяне шмат важнай работы, а ты...

Сталін (спакойна). Маніфест гатовы?

Жылуновіч дастаў з папкі новыя паперкі.

Сталін. Чытайце па-беларуску. Паслухаю, як гэта гучыць па-вашаму.

А калі ён пачаў чытаць, неўзабаве перапыніў, усміхнуўся: «Вполне самостоятельный язык»,— і папрасіў далей чытаць па-руску.

Калі тое-сёе паправіў, аддаў яму яго ўсе паперы і сказаў:

— Добра. Спіс урада і ЦК узгаднілі, Маніфест ваш ухваляем. Едзьце ў Смаленск. Асабіста сам дам тэлеграму Мяснікову, каб вас сустрэў і прыняў як малодшых братоў, яшчэ не зусім вопытных, але гатовых аддаць сваё жыццё дзеля нашай партыі, дзеля Савецкай улады...

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

### 1

Цягнік, пакінуўшы Маскву, панёсся далей і далей, на захад.

Неўзабаве тут, у калідорчыку, патухла святло, засталася толькі блішчэць цьмяная лямпачка ў тамбуры, але Жылуновіч не адыходзіў ад акенца і па-ранейшаму засяроджана пазіраў туды, на свет за акном: там яшчэ ўладарыла ноч. Доўгі час мільгалі толькі цёмныя станцыі, вёскі, але вунь ужо, можа, і праз вёрст дваццаць Няць, нечакана

ў адной з хат за прычыгуначнымі дрэвамі вабна засвяцілася акно — хтосьці рухавы рашыў пачаць ужо новы дзень, новыя бясконцыя сялянскія турботы.

Выскачылі, здаецца, на вялікае поле. Яно, цёмна-шэрае, застылае пад халоднаю коўдрай, чамусьці адразу абудзіла ў душы лёгкі сум па тых фарбах і пахах, што былі ўлетку ды ўвосень. Ды яно хутка скончылася: вось пачалі ўжо ўскокваць у малады, прыгорблены ад белых падушак хвойнік, а пасля і ў стары, яшчэ цёмны лес. Хоць усё мільгае, нібы ляціць назад, але вочы ўсё роўна выхопліваюць і адзінокія высокія кусцікі па засненсанай абочыне, і чорныя, здаецца, з аднаго боку і белыя слупы, і асобныя высокія ды тоўстыя дрэвы — ва ўсім гэтым, на першы погляд суцэльным, аднолькавым, і цяпер, на досвітку, можна ўбачыць адметнае і непаўторнае. А заадно штосьці незразумелае штурхае і штурхае пад сэрца: усё бліжэй і бліннай радзіма!

Пачуў: на калідор выйшаў Дыла.

— Зміцер,— прамовіў ён,— астывае гарбата.

Жылуновіч схамянуўся і на гэты раз паслухмяна
пайшоў у купэ — адно на дваіх, цёплае, з прыгонным ходнікам, з сухімі чырвонымі кветкамі, з беленькімі сурвэткамі і дзвюма настольнымі лямпамі на століку, а таксама вось з гарбатаю. Ведама, яны — ужо не простыя пасажыры, а новыя, савецкія, чыноўнікі.

— Зблажэў ты зусім...— пахітаў галавою Дыла, бачачы, як ён намешвае лыжачкай цукар у кубку, а сам няўцямна пазірае кудысьці ў кут купэ.

— Што ты кажаш? — зноў схамянуўся Жылуновіч, перавёўшы позірк на спадарожнага — той, старэйшы ледзь не на дзесяць гадоў, у белай кашулі і элегантным гальштуку, выглядаў сёння маладжава, а заадно хацеў усё жартаваць і яго раскатурхаць.

— Пі гарбату, ляж і адразу пастарайся заснуць,— сказаў Дыла.— У Смаленск ты павінен прыехаць свежы і бадзёры.

— Штосьці мне вельмі трывожна, Язэпе...— прызнаўся Жылуновіч.

— Ясна,— зноў перавёў усё на жарт Дыла.— Быў гарбар, а цяпер — старшыня Цэнтральнага Бюро Кампартыі і старшыня ўрада Рэспублікі, а заадно і прадстаўнік ЦК ды цэнтральнага ўрада!

— Цяжар дзяржаўных клопатаў, што хутка ляжа на нашы плечы, канечне, непакоіць,— уздыхнуў ён,— Але трывожыць нейкае нядобрае прадчуванне...

— А ў мяне, Зміцер, іншы настрой. Я рады. Я нават не веру сам сабе, што мы такога дабіліся! Маглі ж нічога не мецць! І, можа, ужо назаўсёды!

— ...калі б не Ленін...— дадаў Жылуновіч, паспрабаваў гарбату. Яна сапраўды астыла ўжо.

— І ты, дружа, зрабіў усё, што мог! Нават і звыш сваёй могі! — сказаў Дыла, укладваючыся на пасцель і накрываючыся коўдрачкай у бялюткім чахле.— Табе, вось паглядзіш, некалі помнік паставяць, тваім прозвішчам назавуць установы, вуліцы...

— Не да жыру, браце! — зноў уздыхнуў ён,— Быць бы, як кажуць, жывым!

— Што ж,— кракתануў, адвярнуўся Дыла.— Пераначуем — штосьці новае пачуем... А цяпер — спаць!

**2**

Здаецца, толькі як след заснуў — пабудзілі: падымайцеся, блізка Смаленск.

Калі выйшлі на перон, то іх ласкава сустрэла невысокае зіхоткае сонца на ясным, але яшчэ амаль без блакіту небе. Ступілі два-тры крокі і адчулі: не, святлынь абманлівая, сёння зноў моцны мароз — ад яго не толькі хрумстка рыпіць снег, але і пячэ ў лоб, у шчокі, перахоплівае дыханне. Сама ўбіраецца ў сілу зіма. Мірна плыве над горадам вялікі клуб шыза-белага дыму, а вакол стаіць-дрыжыць звыклы для ўсіх гарадоў адмысловы гул. Каля вакзала, над кім замёр чырвоны сцяг, прагульваўся вайсковы патруль, два чырвонаармейцы ў шынялях былі з вінтоўкамі, а трэці, у скуранай куртцы, меў на баку наган.

Мінулі халодны, прадымлены і пахкі ад сырой вады і хлоркі вакзал, паазіраліся: у каго б запытаць, як дабрацца туды, куды ім трэба. І тут нечакана перад імі паўстаў, нібы ішоў услед, паджылы чорны мужчына ў доўгім чорным паліто і чорнай фуражцы, учэпіста агледзеў іх і іхнія сумкі.

— Вы из Москвы?

— Але,— адказаў Жылуновіч.

— Пожалуйста, к машине,— ветліва, але без эмоцый сказаў чарнявец і паказаў рукою па чорны легкавік, што стаяў непадалёку і папыхваў дымком.

Радуючыся, што ўсё гэтак выходзіць удала («Бач,—падумаў Жылуновіч,— як уважылі пас!»), яны пайшлі за гаспадаром, селі і неўзабаве ўнсо намагаліся праз замерзлае шкло ўбачыць, нудою яны едуць, што за горад гэты Смаленск, які па-свойму дарагі і ім, беларусам.

— Выбачайце,— па-руску загаварыў Жылуновіч.— Партканферэнцыя пачалася ўжо?

— Пачынаецца,— буркнуў чарнявы, які сеў спераду.

— Дык чаго мы так марудна цягнемся? — здзівіўся ён, а пасля дакрануўся рукою да шафёравага пляча.— Таварыш, калі ласка, паехалі хутчэй!

Шафёр — у каноніку, у белай папасе — не азірнуўся і хуткасці не дадаў. Чарнявы ў скураным паліто таксама не пазважаў на яго просьбу. Іхняя гэтая алімпійская непарушнасць выбівала з раўнавагі, але што зробіш — не спыніш жа машыну і не пабяжыш.

Неўзабаве пад'ехалі, як убачыў праз прахуканую дзірачку, да невялікай двухпавярховай камяніцы.

Чарнявец шпарка вылез з легкавіка першы, адчыніў ім дзверцы.

— Прашу.

— Тут — партканферэнцыя?— са здзіўленнем запытаў у яго Жылуновіч.

— Не. Тут — рэгістрацыя.

Прамовіў і падаўся ў будыніну, яны — за ім. Прайшлі трохі па цёмным і халодным калідоры, а пасля чарнявы адступіў і адчыніў перад імі дзверы. Яны ўвайшлі ў невялікі паўпадвальны пакой, дзе стаялі два старыя дубовыя сталы, каля іх — старыя крэслы, а адзінае акно было загачанае.

Яны недаўменна пераглянуліся (нідзе ні папер, ні людзей) і, як па камандзе, павярнуліся да суправаджаючага — той у гэтую хвіліну хляпнуў дзвярыма, пакінуўшы іх тут адных, а пасля, як чуваць было, шчоўкнуў замком. Жылуновіч хуценька падышоў і тузнуў за клямку — так, іх замкнулі. Наваліўся плечуком — дзверы трывалыя, не выламіш.

— Што гэта? — разгублена запытаў ён у Дылы.

Той пацісНуў плячыма, а пасля, апамятаўшыся, прамовіў:

— Здаецца, нас зняволілі, Зміцер.

— Хто? — запегадаваў ён.— І па якім праве?

Адчуў з трывогаю: вось і пачынаюць спраўджвацца яго трывожныя прадчуванні. Але якія! Самыя неверагодныя! Чаго-чаго, а вось такога ён не чакаў! Але чаму не сустрэў іх Лагун?

Грукнуў раз-другі кулаком па дзвярах.

— Не трэба бузіць! — пачуўся з калідора голас чарнявага.— Лепш адпачніце з дарогі.

Што ж, усё ясна. Іх пратрымаюць тут, рошаць усё самі, а на іх скажуць: прагулялі. І нічога не дакалаці. Ні тут, ні ў Маскве ў Наркамнаце. Будзеш толькі вінаваты. Без віны.

Падышоў, зняможана сеў на крэсла.

«Што рабіць? Дзе выйсце з новага тупіка?»

— Слухай, трэба перадаць запіску,— бачачы яго адчай, ажывіўся Дыла.

— Кім? — паныла запытаў.— І каму?

— Каму перадаць — ясна. Леніну, і толькі Леніну.

Жылуновіч падхапіўся.

— Грошы ёсць?

— Крыху ёсць.

— Давай усе,— сказаў і сам дастаў кашалёк, пачаў вытрасаць з яго рублёўкі і капейкі. А пасля хутка выцягнуў з унутранай кішэні пінжака блакнот, моўчкі вырваў лісток і хутка напісаў запіску знаёмаму, якога яны нядаўна прыслалі сюды ад Белнацкома па сваіх клопатах — расказаў, што з імі, і папрасіў тэрмінова затэлеграмаваць Леніну. Пасля паперку з гэтым запісам усунуў у адну сваю рукавіцу, грошы — у другую. Сюды ж паклаў і паперку з хатнім адрасам свайго знаёмага.

Затым падышоў да акна і замёр — чакаў, калі ўбачыць ногі якога-небудзь прахожага. Неўзабаве ўгледзеў: спачатку — жаночыя чаравічкі, пасля — хромавыя боты, але гаспадароў гэтага абутку не зачапіў. Ненадзейныя. Пасля, калі ўбачыў паношаныя мужчынскія чаравікі з абмоткамі, загадаў Дылу, каб той моцна затупаў нагамі, а сам у гэты час прасунуў руку між кратаў, рукавіцай з грашыма выбіў шкло ў невялікай рамцы і кінуў туды, на тратуар сваю прыманку.

Прахожы сапраўды запыніўся, падабраў нечаканую для сябе знаходку, нагнуўся: гэта быў падлетак гадоў пятнаццаці ў ватовачцы і шапцы-аблавушцы. Рыжы, са светлым пушком на шчоках і пад задзёртым носам.

— Дружа,— мякка, з ноткамі просьбы сказаў яму Жылуновіч.— У адной рукавіцы — грошы. Гэта табе. У другой — запіска майму сябру. Аднясі яе яму, калі ласка.

— Буржуй? — насцярожана запытаў той.

— Не, браце. Рабочы.— Узмаліўся: — Я па вачах тваіх бачу: ты — чэсны хлопчык. Бяжы, харошы мой. Дарагая кожная хвіліна...

Пасля, калі падлетак знік, Жылуновіч узбуджана хадзіў па пакоі; Дыла сядзеў і маўчаў. Абодва то верылі, што выпадковы малец пачалавечаму зміласцівіцца, пашкадуе іх, то трацілі на гэта ўсякую надзею: Яго Вялікасць Выпадак ёсць усё ж выпадак!

Праз гадзіны тры дзверы адчыніліся. У пакой рашуча зайшоў малады мужчына ў дыхтоўным афіцэрскім шынялі і папасе, падперазаны рамянямі, з сумкай-планшэткай і наганам. Услед за ім ступіў Лагун. У салдацкім шынялі і шапцы.

Незнаёмец мільгнуў на іх шэрымі вачыма, рэзка падняў галаву і ўставіўся на выбітую шыбіну ў акне. Пасля нібы апомніўся, казырнуў:

— Я от комиссара внутренних дел,— прамовіў выразна, па-вайсковаму.— Вышло досадное недоразумение. Вы дожны срочно быть на партконференции.

— А можа, на новай «рэгістрацыі»? —ухмыльнуўся Жылуновіч.

— Не попял...

— Ладна, паехалі.

Калі выходзілі з калідора, Жылуновіч са знявагай зірнуў на чалавека ў скураным паліто, які стаяў тут, а пасля запытаў у Лагуна:

— Дык чаму ты не сустрэў нас, браце?

— Я не мог...

— Як і мы, быў на «рэгістрацыі».

Селі ў тую ж чорную машыну. Жылуновіч — наперадзе, а Лагун, Дыла і вайсковец — ззаду. Жылуновічу сцярпелася распытаць у Лагуна пра ўсё, але стрымаўся перад чужым чалавекам. Запытаў толькі пра «нейтральнае», хоць на самай справе таксама важнае для яго:

— З усіх губерній прыехалі дэлегацыі?

— Не,— адказаў Лагун,— Няма з Гродна і Гомеля.

«Значыць, будуць пераважаць дэлегаты са Смаленскай і вызваленых раёнаў Чарнігаўскай губерні,— паразважыў.— Амаль усе з іх будуць за Мяснікова: гэта яго людзі. Як і многія з Віцебска ды Магілёва, дзе шмат абруселых і дэнацыяналізаваных. Нам адна надзея — на Мінчукоў...»

— Колькі ўсіх дэлегатаў? — запытаў, каб лепш уявіць сілы.

— З вамі будзе больш за 170.

«Нашых, ад секцый, толькі пяць... Ды, можа, Мінчукоў з дзесятак-другі... Адпаведна, шмат будзе значыць, які тон задасць Мяснікоў...»

— Які першы пункт парадку дня?

— Меўся быць справаздачны даклад абкома,— «нейтральна» адказваў яму Лагун,— але ўчора вырашылі наперад вынесці «Аб бягучым моманце». Па ім выступіць...— зірнуў на гадзіннік.— Ужо выступае Мяснікоў...

— Таварыш,— Жылуновіч занепакоена дакрануўся да рукава шафёра,— калі ласка, хутчэй.

Вадзіцель на гэты раз паслухаў.

Калі яны неўзабаве зайшлі ў залу (а ў ёй сядзеў люд рознага ўзросту, ва ўсякай, вайсковай і цывільнай, апратцы, дымеў так, што пад столлю вісела шызае воблака), то ўбачылі: на сцэне пасярод прэзідыума — Мяснікоў. Усё яшчэ з кароткімі чорнымі валасамі, лабаты,

з адтапыранымі вушамі, з ямачкаю пад посам і на падбародку, валявы.

— А вось і астатнія нашы калегі з цэнтра,— як бы нічога не здарылася, усміхнуўся той і паказаў рукою на праход, па якім ішлі яны, Жылуновіч і Дыла.

У зале пачалі азірацца на іх: што там за Жылуновіч, які здолеў не толькі супрацьстаяць, але, можна сказаць, і перамагчы іхняга ўладнага і гаварыстага лідэра, знайсці помач у ЦК, у Лепіна? Здаецца, многія акідвалі яго позіркам з пачцівасцю, а той-сёй — з расчараваннем: што — гэты Жылуновіч (у прозвішчы чуецца штосьці ж жылістае!) такі невысокі, шчуплы?

— Ёсць думка, таварышы, запрасіць Жылуновіча Дзмітрыя Фёдаравіча ў прэзідыум,— гучна прамовіў Мяснікоў.

Воплескі. І трэба сказаць дружныя, цёплыя.

Калі за гэта прагаласавалі, то Жылуновіч пакланіўся адной, другой палове залы і пайшоў на сцэну. Да Мяснікова. Той падаў руку, чаго дагэтуль ніколі не рабіў. Ясна, дзеля публікі. Яму свярбела не адказаць на гэткі жэст, але перамог сябе, парукаўся.

— Працягваю, таварышы,— пазіраючы ў залу, сказаў Мяснікоў.— Як мы ведаем, наша Заходняя вобласць з'яўляецца тым праходам, нудою імкнуцца на Савецкую Расію сілы чорнага інтэрнацыяналу... Каб яшчэ больш умацаваць заваёвы расійскага пралетарыяту, для таго, каб перамагчы нашага агульнага ворага — міжпародны імперыялізм, які нясе з сабою патрапце свабодных правоў нацый пад выглядам ўстанаўлення фактычна буржуазнага самавызвачэння пародаў, нам неабходна абвясціць самастойную сацыялістычную рэспубліку Беларусь...

Жылуновіч, само па сабе зразумела, не чуў, што гаварыў Мяснікоў дэлегатам дасюль, але цяпер з непрыемнасцю падумаў: бач, прамоўца не кажа ці не паўтарае, што беларуская дзяржаўнасць яшчэ павінна быць і таму, што яе дабіваюцца Белнацком, Беларускія камуністычныя секцыі, многія бежанцы і чырвонаармейцы-беларусы з ўсёй Расіі, а таксама многія рабочыя і сяляне з самой Беларусі.

— Таварышы,— прамовіў Мяснікоў,— паслухайце рэзалюцыю: «Абвясціць Заходнюю камуну Беларускай Савецкай Рэспублікай». Ёсць іншыя думкі?

У зале паднялася адзінокая рука.

— Я делегат от витебских коммунистов,— рэзка картавячы, прамовіў чарнявы хлопец, калі яму далі слова.— Как вас понимать, товарищ Мясников? Еще недавно вы даже не допускали белорусский вопрос на повестку дня, абвиняли нас, витебчан, в се-

паратизме, а сейчас у вас поворот на 180 градусов? Вы что — отказались от идеи мировой революции, сами ударились в сепаратизм?

— Вы что, товарищ, не слышали о решении ЦК и Советского правительства?

І далей:

— А якая ваша асабістая думка, таварыш Мяснікоў?

— Я падпарадкоўваюся ЦК. А вы што — супраць?

— Тыя, хто пасылаў нас сюды, упаўнаважвалі нас быць супраць. Гэтая Беларусь — прыхамаць жменькі інтэлігентаў з Паўночна-заходняга краю.

— ЦК, як бачыце, лічыць іначай. А лінія яго, напомню, абавязковая для нас.

Хлопец замяўся, а пасля сеў, паціснуў плячыма.

— Ёсць іншыя думкі? Не? — запытаў у залы Мяснікоў.— Тады галасуем. Хто за тое, каб зацвердзіць вышэйназваную рэзалюцыю?

Амаль усе ў зале ўскінулі рукі.

— Хто «супраць»?

Ніхто.

— Хто ўстрымаўся?

Адзін, два... пяць чалавек.

— Такім чынам, таварышы, мы перайменоўваем Заходнюю камуну ў Беларускую Сацыялістычную Рэспубліку...

У зале запляскалі. І даволі дружна.

— Трэба, таварышы, вызначыць межы Беларусі,— вёў далей Мяснікоў,— Ёсць думка ўключыць у склад Савецкай Беларусі тыя землі, дзе найбольш выяўлены беларускі элемент. Так лічаць і ў ЦК, за тое і таварыш Сталін. Як мы ведаем, і нашы беларускія таварышы згодныя, што ў межах рэспублікі павінны быць Мінская, Гродненская, Віцебская, Магілёўская і Смаленская губерні. А іх варта падзяліць на 7 раёнаў і 53 падраёны. Якая ваша думка, таварышы? Згодны?

Зацвердзілі.

— Ну, а цяпер, таварыш Жылуновіч,— нахіліўся і ціха сказаў яму Мяснікоў,— час абнародаваць Маніфест. Калі ласка бярыце слова.

— Паспеем,— таксама ціха адказаў ён.— Трэба яшчэ закончыць усе працэдуры: зацвердзіць партканферэнцыю Першым з'ездам Кампартыі Беларусі, выбраць яе Цэнтральнае Бюро, узгадніць спіс урада. Пасля ўжо ўрачыста аб'явім Маніхвэст.

Мяснікоў рэзка, нібы ад агню, адхіснуўся.

— Далей,— сказаў. Узбуджана, строга.— З усяго гэтага вынікае, што сённяшнюю нашу партканферэнцыю трэба перайменаваць у

Першы з'езд Кампартыі (бальшавікоў) Беларусі. Хто за гэта, прашу галасаваць.

А калі прагаласавалі, дадаў:

— Каб кончыць усе працэдурныя аспекты і перайсці да другога пункта парадка дня нашай партканферэнцыі...— Усміхнуўся.— Выбачайце, каб перайсці да другога пункта нашага з'езда і працаваць ужо як рэспубліканскі форум, нам трэба абраць Цэнтральнае Бюро — вышэйшы партыйны орган у рэспубліцы. Мы, параіўшыся ў ЦК, з таварышам Сталіным, а таксама з нашымі таварышамі, раім такія кандыдатуры: Кнорын, Найдзёнкаў, Пікель, Рэйнгольд, Іваноў, Пярно, Собалеў, Лагун, Селязнёў, Алібегаў, Калмановіч, Андрэеў, Жылуновіч, Яркін, Мяснікоў.

Жылуновіч адчуў: цямнее ў вачах. Што гэта? Толькі двое, ён і Лагун, ад Беларускіх камсекцый у ЦБ Кампартыі Беларусі? Яны ж у ЦК, са Сталіным дамовіліся, што іх і смаленцаў тут будзе пароўну!

А Мяснікоў яшчэ болей аглушыў яго:

— У склад Прэзідыума ЦБ КП(б)Б прапануюцца: Мяснікоў — старшыня, Калмановіч — намеснік, Кнорын — сакратар.

Дрыготкімі рукамі Жылуновіч хуценька знайшоў у сваёй папцы патрэбны лісток і рэзка падхапіўся. Стаў побач з Мясніковым. Абодва амаль аднаго росту. Толькі Мяснікоў больш плячысты.

— Пачакайце,— заапеляваў Жылуновіч да залы.— Таварыш Мяснікоў штосьці блытае. Вось тут у мяне спіс кандыдатаў у ЦБ КП(б)Б, прагледжаны наркомам па нацыянальных справах. У ім — парытэт паміж камуністамі абкома і Белкамсекцый.

— А ў мяне, таварышы, спіс, напісаны рукою таварыша Сталіна,— спакойна, з пераможнаю ўсмешкай адпарыраваў Мяснікоў, падняў угору руку з паперынаю і патрос ёю.— Як бачыце, у яго трапілі найбольш аўтарытэтныя камуністы, якія ўжо зрабілі шмат для рэвалюцыі, для Савецкай улады...

— Гэта... гэта...— аж задыхнуўся ад узбудяеэння Жылуновіч, — У мяне не хапае слоў для абурэння...

— Ну што ж,— зусім не разгубіўся Мяснікоў.— Абурайцеся, калі маеце такія вялікія амбіцыі!

— Вось цяпер я добра разумею, чаму Сталін гаварыў з вамі і з намі паасобку...— пахітаў галавою Жылуновіч.— Як цяпер і разумею пункт VI з «Умоў». Ваш абком толькі пераўтвараецца ў Кампартыю Беларусі, а на справе захоўвае і сваю ўладу, і свой змест... Вы ж далей і на гэтым з'ездзе будзеце працаваць па сваёй ранейшай праграме...— І да залы: — Я прашу вас, таварышы: не дапусціце несправядлівасці.

Нашых і вашых камуністаў павінна быць у ЦБ толькі пароўну. І беларускую Кампартыю павінен узначаліць карэнны чалавек.

— Няма ні «вашых», ні «нашых» камуністаў, таварыш Жылуновіч,— упэўнена перабіў яго Мяснікоў.— Ёсць камуніст і не. камуніст, незалежна ад таго, якой ён нацыянальнасці, дзе жыве і працуе...

Калі пачалі галасаваць, Жылуновіч нічога не дабіўся. У ЦБ КП(б)Б трапілі толькі двое з Белкамсекцый — ён і Лагун.

### 3

— На пасяджэнне ЦБ я не пайду...— гнеўна выдыхнуў Жылуновіч, узбуджана ходзячы туды-сюды па пакоі.— Ці буду даваць тэлеграмы ў Маскву ва ўсе інстанцыі, ці складваю з сябе ўсё...

Клыш, Ханін і Лагун, якія як дэлегаты партканферэнцыі прыехалі раней, а таксама Дыла, панікЛыя, хмурныя, сядзелі моўчкі. Яны добра разумелі яго, але нічым не маглі памагчы. Кожны з іх нават не мог зрабіць тое, што было па сіле яму.

— Я не магу пасля сённяшняга паказацца на вочы ні ў Белнакоме, ні ў Белкамсекцыі,— бадай, упершыню ў сваім жыцці не мог стрымацца на людзях, паказваў боль душы і разгубленасць Жылуновіч.— У мяне ж спытаюць: што гэта такое? У Маскве ты гаварыў нам адно, а ў Смаленску зрабіў усё інача! Ухапіў сабе партфель, кінуў таварышоў і аддаў нашу справу ў чужыя рукі! Падманшчык і кар'ерыст ты! А то і горш — адступнік ці прадаўца!

Усе па-ранейшаму паныла маўчалі.

— Ну, Сталін! Ну, вераломны тыгр-людаед!

Адчыніліся дзверы — у пакой зазірнуў чарнявы мужчына ў чорнай скуранцы. Той, што сустракаў яго.

— Таварышы Жылуновіч і Лагун,— бясстрасна прамовіў,— Члены ЦБ сабраліся, чакаюць вас.

— Зачыніце, калі ласка, дзверы з таго боку! — мякка, але настойліва папрасіў Жылуновіч.

Той сапраўды борздка адскочыў, хляпнуў дзвярмі.

— А калі ісці, то я не магу даць гарантыю, што такое не паўторыцца, калі будзе фарміравацца ўрад. У сіле ж дамова не са мною, а з Мясніковым.

— Я думаю так, Зміцер,— як старэйшы, а таксама і па сяброўскім праве падаў голас Дыла.— Крыўдна, горка, баліць душа, ды кідацца ў роспач не трэба: усё ж дрэўка мы пасадзілі!

— Але на нашым дрэўку абрэзана зашмат каранёў і кроны, Язэпе...— з болем сказаў Жылуновіч.

— Усяк бывае, Зміцер. Здараецца, параненае жывое цела надта чэпкае за жыццё...

— То здаровае, дужае цела, Язэпе...

Зноў адчыніліся дзверы, і ў пакой зайшлі ўжо два мужчыны. Абодва ў хромавых ботах, у вайсковай форме, чарнявыя.

— Дазвольце, таварышы,— прыстойна па-беларуску загаварыў старэйшы. Хутка акінуў усіх позіркам, усміхнуўся Лагуну. Значыць, быў з ім знаёмы.

Жылуновіч запыніўся каля акна і напружыўся: хто — гэтыя парламенцёры? Што скажуць? Старэйшы тут жа скіраваў позірк якраз на яго.

— Таварыш Жылуновіч,— прамовіў.— Як ведае ваш калега,— хітнуў галавой на Лагуна.— Мы — з Мінска. Я — Рэйнгольд, старшыня Мінскага губеранскага ваенна-рэвалюцыйнага камітэта, а ён — Берсан, старшыня Мінскага ваеннага савета.

— Слухаем вас,— спакойна сказаў ён.

— Наша дэлегацыя просіць вас, таварыш Жылуновіч, адмовіцца ад байкоту і прыйсці на пасяджэнне Цэнтральнага Бюро Кампартыі Беларусі.

— Скажыце, калі ласка: вы ведаеце ўсіх, хто ўвойдзе ў беларускі ўрад?

— Не.

— А я знаю, хто павінен быў туды ўвайсці. Але цяпер у мяне няма ўжо веры ў дамову са Сталіным...— прамовіў Жылуновіч.— Дык што мне рабіць? Паступацца сумленнем? Быць блазнам?

— Я разумею вас, таварыш Жылуновіч,— спакойна сказаў Рэйнгольд,— Сітуацыя вельмі цяжкая. Я мала ведаю таварыша Сталіна, але я добра ведаю Мяснікова. Супярэчлівы, уладны чалавек, вялікі прыхільнік Троцкага. Ён, канечне, засцярогся, каб не страціць сваіх пазіцый...

— Дык што — патураць яму?

— Як вы ведаеце, таварыш Жылуновіч, мы яму падпарадкоўваемся,— добра трымаючы сябе ў руках, адказаў мінскі пасланец.— Але мы не заўсёды з ім згодныя. У нацыянальным пытанні найперш. Пагэтаму мы, мінуўшы яго, далі з Мінска тэлеграму таварышу Свярдлову, каб абвясціць Савецкую Беларуска-літоўскую рэспубліку.

Усе, таксама Жылуновіч, уважліва слухалі гэтага чалавека.

— Канечне, не ўсё ідзе гладка, так, як хацелася б...— дадаў той.— Але заляжалы лёд крануўся, растае. Дык, адчуйце, не варта, нават небяспечна хоць нейкім чынам не спрыяць гэтаму працэсу...

— Добра,— нават нечакана для самога сябе сказаў Жылуновіч і кіўнуў Лагуну.— Хадзем.

Калі яны зайшлі ў прасторны пакой, то ўбачылі: усе «смаленскія» члены ЦБ сядзяць купкаю і, усміхаючыся, слухаюць Мяснікова, які стаіць паміж першым і другім радам крэслаў наперадзе іх ды штосьці баіць ім вясёлае.

Убачыў іх — абцягнуў на сабе гімнасцёрку, разагнуўся, аж большаючы ў росце, і ветліва паказаў рукою на рад перад сабою: прашу, сядайце на самым ганаровым месцы! Але Жылуновіч з Лагуном селі не там, а ззаду ўсіх. Наўмысна. Нібы сіроты.

Ды Мяснікоў толькі іранічна, пераможна ўсміхнуўся з гэтага.

— Мы тут віншавалі ўсіх з абраннем у ЦБ Кампартыі (б) Беларусі,— прамовіў ён.— Адпаведна, віншуем і вас, таварышы Жылуновіч і Лагун.— І, убачыўшы, што яны не зважаюць, паапускалі галовы, не затрымаўся, перавёў гутарку на іншае: — Цяпер нам, ЦБ, трэба разгледзець спіс, структуру ўрада Савецкай Беларусі. У выніку перамоў з таварышам Сталінізм мы прыйшлі да думкі, што на першым часе ва ўрадзе павінна быць 17 наркомаў. А як вы, таварышы? Згодныя?

— Згодныя,— падаў голас хтосьці з першых радоў.

Прагаласавалі.

— Старшынёй Часовага рабоча-сялянскага савецкага ўрада Беларусі рэкамендуецца таварыш Жылуновіч — рабочы, вядомы беларускі грамадскі і культурны дзеяч. Няма пярэчанняў?

— Няма,— зноў пачуўся чыйсьці незнаёмы голас.

Прагаласавалі.

— Членамі ўрада прапануюцца камісары,— Мяснікоў дастаў з кішэнькі гімнасцёркі лісток і пачаў чытаць з яго.— Земляробства — Андрэеў, дзяржаўнага кантролю — Берсан, працы — Дыла, унутраных спраў — Іваноў, харчавання — Калмановіч, юстыцыі — Квачанюк, ваенных спраў — Мяснікоў, аховы здароўя — Пузыроў, поштаў і тэлеграфаў — Разенталь, фінансаў — Рэйнгольд, шляхоў зносін — Савіцкі, замежных спраў — Фальскі, народнай асветы — Чарвякоў, сацыяльнага забеспячэння — Чарнушэвіч, па нацыянальных справах — Шантыр, старшыня Саўнаргаса — Пікель.

«Тут нас восем чалавек,— налічыў Жылуновіч.— Дыла, Квачанюк, Пузыроў, Фальскі, Шантыр, Чарвякоў, Чарнушэвіч і я».

— Далей,— сказаў Мяснікоў.— У Прэзідыум урада прапануюцца тры чалавекі: Жылуновіч, Мяснікоў, Калмановіч. Кіраўніком спраў урада — Кнорын. Друкаваны орган — газета «Известия Временного

Рабоче-Крестьянского Советского Правительства Белоруссии» на чатырох мовах...

Адарваў галаву ад паперыны, зірнуў на ўсіх:

— Якая ваша думка, таварышы?

— Згодны,— зноў хтосьці забег наперад.

Мяснікоў кінуў позірк сюды: які настрой у іх?

Жылуновіч вычакаў хвіліну-другую, калі пачулася яшчэ некалькі ўхвальных галасоў, а пасля падняўся.

— Таварышы,— прамовіў, ужо тонам заклікаючы да ўвагі,— як я буду працаваць з тымі камісарамі, якіх я дагэтуль у вочы не бачыў, нічога не ведаю пра іх як пра людзей і спецыялістаў? Па-другое, зноў, таварышы, несправядлівасць...

— Якая? — рэзка запытаў Мяснікоў.— Выбачайце, тут захаваны парытэт.

— Які парытэт? Вонкавы? — павысіў голас Жылуновіч.— Усе важнейшыя паркаматы аддаюцца вам, смалянам. Нам вы пакінулі другія і трэція ролі.

— Вашы прапановы? — нахмурыўся Мяснікоў.

— Мы просім вывесці з членаў урада вас, Калмановіча і Пікеля.

— Як, таварышы? — заапеляваў Мяснікоў да членаў ЦБ.

— Я рашуча супраць,— падняў руку чарнявы, кучаравы чалавек каўказскага тыпу.— Калі мы дазволім вывесці з урада таварышаў Мяснікова, Калмановіча і Кнорына, то гэтым самым мы пазбавімся ад адных з самых аўтарытэтных асоб.

— Дарма не бядуйце, таварыш,— абсек яго Жылуновіч.— Мы лёгка на гэтыя пасады знойдзем не менш аўтарытэтных карэнных таварышаў.

— Вы ўвогуле маглі б абысціся без нас! — агрызнуўся той.— А то, як і вашы калегі з БНР, без Савецкай улады і Расіі!

— На знявагі не адказваю,— адвярнуўся ад яго Жылуновіч.— Калі члены ЦБ і тут не ўлічаць нашу думку,— рашыў прыстрашыць Жылуновіч,— то, па-першае, я і мае таварышы з Белкамсекцый адмовімся ўвайсці ў такі фармальна беларускі ўрад, а па-другое, я не аддам вам адобранага ў Наркамнаце Маніхвэста пра абвяшчэнне Савецкай Беларусі.

— Ну, сепаратыст! — крутнуў галавою Мяснікоў.

— А ты — узурпатар! — успыхнуў Жылуновіч.— Ды толькі мы не дазволім таптаць нас!

— Абыдземся, калі трэба будзе, і без цябе...

— Не сумняваюся. Як і ў тым, што хочацца мець Беларусь без беларусаў...— адказаў Жылуновіч, дастаў з папкі і падаў лісток чала-

веку, які сядзеў перад ім, каб той перадаў далей, Мяснікову.— Вось спіс справядлівага незалежнага ад вас урада...

Мяснікоў але задрыжэў, успыхнуў чырванню, але стрымаўся. Папрасіў усіх галасаваць за яго варыянт. Бачачы, што Мяснікова вылучэнцы падымаюць руш за свайго апекуна, Жылуновіч шпарка пайшоў да дзвярэй. Услед за ім падаўся і Лагун.

— Жылуновіч! — рэзка кінуў наўздагон Мяснікоў.— Маніфест!

— Не аддам!

— Тады — пойдзеце з партыі, калі не захоўваеце партыйную дысцыпліну!

**4. Мяснікоў — Сталіну**

«Список правительства я получил только сейчас и то с оговоркой Жилуновича, который заявил, что он и его приехавшие товарищи согласны на него лишь при условии исключения из списков трех членов правительства. Персонально по военным делам, снабжения и совнархозу, да еще при условии независимости членов правительства от Центрального Бюро партии. Манифеста не видел, ибо его не предъявляют. Поскольку вопрос остается в том виде, как мы обсуждали в Москве, я всецело стою за то, чтобы немедленно было приступлено к делу. Но, по-видимому, товарищи на этот счет имеют свои особые соображения. Нахожу, что необходимо предписать им или же предоставить нам выдвинуть соответствующие белорусские фамилии, какие здесь у нас имеются. Предвижу определенные трения на почве самого неприкрытого национализма. Весь день Центральное Бюро находится в сборе и ждет Ваших указаний, дабы наконец перейти к делу. Жду определенного ответа».

**5. Сталін — Мяснікову**

«Предложение Жилуновича о невключении трех членов нахожу дезорганизаторским и в корне противоречащим решениям партии. Никаких особых решений группы Жилуновича не может быть...»

**6. Жылуновіч — Сталіну**

«Мы протестуем против нарушений, выработанных с вами же...»

**7. Сталін — Жылуновічу**

«Во-первых. Прошу Вас ответ прочесть Мясникову.

Во-вторых. Материал (відаць, маецца на ўвазе Маніфест.— *Аўтар твора*) должен быть срочно опубликован. Жду сообщений о дне опубликования.

В-третьих. Все разногласия должны быть разрешены на совместном совещании с моим присутствием...

Завтра выезжаю...»

**8. Мяснікоў — Сталіну**

«Сегодня, I января 1919 года, Жилунович после долгого упорства огласил Манифест об образовании Советской Белоруссии. Мною отдано распоряжение распространить его почтой, телеграфом, радио, через газеты, отдельной брошюрой. Споры с группой Жилуновича продолжаются...»

**9. Сталін — Беларускаму ўраду і Цэнтральнаму Бюро КП Беларусі, 2.01.1919**

«Ввиду катастрофического положения фронта в районе Перми, мне предложено ЦК партии и Советом Обороны выехать туда для расследования и принятия мер на месте тоже срочным порядком. Имея в виду, что положение у Вас все же улучшилось, я откладываю свою поездку в Минск дней на десять... Через десять дней буду у Вас. Ведите себя смирно и не деритесь, а то будет плохо.

Белорусское правительство получает директивы непосредственно от Цека партии через Мясникова как представителя последнего...»

**10**

Позна ўвечар, хаваючы каўнярамі твары ад шалёнай завірухі, топчучы снег ледзь не да калена, Жылуновіч і Дыла прыйшлі на ціхую і цёмную смаленскую вуліцу Малая Багаслоўская, 5.

Дзверы ім адчыніў сам гаспадар. Высакаваты, з прыгожа зачасанымі набок светла-русымі валасамі, у ботах, шэрым галіфэ і пінжаку.

Ад цяпла адразу запацелі акуляры, але і скрозь гэты туман Жылуновіч угледзеў: гаспадар пільна зірнуў на яго, а пасля перавёў позірк на Дылу.

— Ну што? — глухавата запытаў, падаючы руку.

— Ды таго-сяго дабіліся, дзядзька Янка...— пачціва адказаў Дыла, хоць быў і старэйшы за гаспадара. Як і ён, Жылуновіч, як і многія, пакланяўся перад вялікім мэтавым талентам.— Вось перад вамі першы ў гісторыі беларускага народа старшыня Рабоча-сялянскага ўрада і камісар працы!

— Ну, малайцы! — усцешыўся гаспадар, пацалаваў іх.—Каб вы ведалі, як я чакаў вас сёння!

І ўбок:

— Уладна! Бяжы сюды!

Тут жа з суседняга пакоя шпарка выйшла рослая, з буйнымі рысамі твару, маладая гарэзная жанчына ў чорнай кофце і шэрай спадніцы, таксама, як і муж, занепакоена сустрэла пытаннем:

— Устоялі?

— Устоялі-ўстоялі! — усміхнуўся задаволены гаспадар, і ад гэтай шчаслівай усмешкі, здаецца, уміг памаладзеў, яшчэ болей папрыгажэў і пашляхотнеў.— Утварылі ўрад, абвясцілі рэспубліку!

— Вялікі дзякуй вам, слаўныя вы нашы! — Уладзіслава нізка пакланілася ім, а пасля сардэчна пацалавала аднаго і другога,— І як жа ўдалося гэта вам, такім маленькім?

— Ростам малыя, але сілы вялікай! — у тон жонцы захапляўся, як бачна было, вельмі шчаслівы Купала.— Нацыянальныя героі!

— Распранайцеся, Мужчынкі, заходзьце,— замітусілася Уладзіслава, можа, як гаспадыня перажываючы, што першы раз, як завіталі сюды, яна не змагла іх як след пачаставаць.— Пасядзіце, пагаманіце, а я мігам прыгатую на стол. Грэх не адсвяткаваць такую падзею.

Павесіўшы свае паліто, яны, госці, пайшлі ў лепшы пакой, дзе даволі ярка гарэла газавая лямпа, селі на канапцы. Купала прымасціўся на крэсле, што стаяла каля яго пісьмовага стала, заваленага кнігамі.

— Цяжка было? — запытаў ён.

— Нялёгка, дзядзька Янка,— адказаў Жылуновіч.— Вельмі шмат у чым прыйшлося саступіць. Галоўныя пасады ва ўрадзе не за намі.

— Але самае галоўнае, што ёсць, ёсць яна, наша Беларусь і яе дзяржава,— сказаў Купала.— А гэта, вось паглядзіце, усім — сялянам, работнікам, інтэлігенцыі, моладзі, бенінцам — дасць новыя сілы, акрыліць... Колькі нашага люду пацягнецца з усіх куткоў дадому, як ажыве дух у тых, хто дома!

Неўзабаве на стале, што стаяў пасярод пакоя, заявілася міска парнай беленькай бульбы, талерка з кавалачкамі засмажанай, пахкай кменам, часначком сялянскай кілбасы і яйкамі, талерка тлустага сялянскага сыру, хлеб і высокая пляшка з чырвонаю налёўкай.

— Сядайце, дарагія госцікі,— запрасіла іх рухавая Уладзіслава.— Адкаркоўвай, Яначка, налівай па поўненькай ім, як ты кажаш, на першы погляд малым, нядужым, а на справе гэтакім цягавітым.

— Добра, добра,— зноў хораша заўсміхаўся Купала, таксама сёння борздкі ад хвалявання і радасці. А калі напоўніў чарачкі, павярнуўся да яго.— Ну, скажы слоўка, наш шаноўны старшыня.

— Не-не! — замахаў рукамі Жылуновіч.— Першае слова скажыце якраз вы.

— Чаму — ж Вы — героі!

— Каб не ваша паэзія, дзядзька Янка, дык не было б не толькі нас, але, можа, і нават гаворкі пра Беларусь...

Купала расчуліўся, усхвалявана ўзяў чарку на тоненькай высокай ножцы, устаў.

— Сказаць шчыра, я не ведаю тостаў. У нас што звычайна кажуць: «Ну, будзьце здаровыя!» — «І ты будзь здаровы!» Але сёння цягне аж на прамову... Я, дарагія Зміцер і Язэпе, не палітыкаваў, як вы,— быццам цяпер каючыся за тое, што раней лічыў вартасцю, прамовіў ён,— Але сёння вельмі рады, што ўсё ж былі, ёсць у нас слаўныя сыны, што не цураліся гэтага, смела кінуліся ў вір, што завецца палітыкай, змагаліся, траплялі ў турмы, трацілі змоладу здароўе, цярпелі, гартаваліся і вось нарэшце дабіліся прызнання, пасаду для свайго прыгнечанага і прыніжанага народа.

— Я, дзядзька Янка, толькі памагаў,— усміхнуўся Дыла.— А вось Зміцер — наш волат, Удовін-сын! Не аднаго Змея перамог!

— За Удовінага-сына! — усцешыўся Купала.— За цярплівы і мужны народ, які нараджае і герояў!

**Эпілог**

*(Пра далейшы лёс асобных герояў трылогіі «Гаспадар-камень»)*

Ясь Нямкевіч. Дбайна, з вялікімі высілкамі, часамі ўжо і на мяжы адчаю ўратаваў сваю вялікую сям'ю ў першую сусветную і грамадзянскую войны, пры неаднаразовых зменах улады. Пасля Рыжскага міру 1921 года, калі нарэшце ваюючыя дзяржавы засунулі шашкі ў ножны і пачалі залізваць раны, калі развеяўся пах пораху, можна было спакойна класціся спаць, гаспадарыць, жыць, неяк раптоўна счэз. Перад смерцю даў незамужняй дачцэ і ўнукам па залатой пяцёрцы, блаславіў сыноў і папрасіў даравання ў Янкі за тое, што не дазволіў яму ўзяць замуж Зосю.

Памёр у 1922 годзе, калі новыя, польскія, улады змусілі выехаць з Янкавін айца Феадора, пачалі перабудоўваць царкву на касцёл, янкавінцаў пераводзіць у каталікі, а каталікаў запісваць палякамі.

Г а н н а, Ясева жонка. Гадуючы ўнукаў, дажыла свой век пры малодшым сыне, Янку. Памерла вясной 1927 года, калі ў Янкавінах арыштавалі гурток Грамады, а саму гэтую партыю забаранілі.

Я н к а. Колькі быў у Янкавінах, жыў у старой, але ўтульнай бацькавай хаце. Маючы добры жончын пасаг і залатыя рукі, хутка стаў не толькі гаспадаром, але і адным з самых заможных у вёсцы. Палітыкай не займаўся, да людзей вельмі не імкнуўся, хоць быў шчыры, уважлівы да чужой бяды, не піў і не брыдкасловіў. І ён, і яго

сям'я вялікага шчасця не мелі. З-за яго нязгаснага кахання да Зосі — яе, сапраўдную красуню-багіню, з кожным годам кахаў усё мацней.

У верасні 1939 года яго, Анельку, дзяцей («кулацкую сям'ю») арыштавалі і вывезлі з Янкавін. Назаўсёды. Можа быць, што іх без суда і следства супрацоўнікі НКУС расстралялі ў Курапатах.

Алесь — сярэдольшы сын Нямкевічаў. Шмат чаго ўбачыў на' свеце і перажыў, перапакутаваў усё сваё жыццё.

На яго вачах адыходзілі немцы з Мінска ў снежні 1918, развальвалася БНР, прыехаў у Мінск беларускі ўрад на чале з Жылуновічам. Здавалася, усё: дасягнулі, дабіліся таго, чаму прысвячалі сябе і свае лепшыя памкненні. Ажно не. Спачатку чэкісты патрэслі яго, не верачы, што ён браў удзел у руху БНР па просьбе асобага аддзела Мінскага Савета, а неўзабаве, калі саспела савецка-польская вайна, цэнтр скасаваў Савецкую Беларусь, аб'яднаў яе ў адной з Літвой дзяржаве. Далей — болей. У Мінск прыйшоў Пілсудскі. Ён пачаў загульваць з БНР, з усімі беларускімі дзеячамі, дакляруючы Беларусі поўную самастойнасць у федэрацыі Рэчы Паспалітай. Той-сёй паверыў яму, згадзіўся на саюз, Алесь вельмі не хінуўся, прыглядаўся.

Увярваўшы «ўсходнія крэсы», Пілсудскі тут жа забыў пра свае ранейшыя дакляраванні.

Стаміўшыся, не верачы міласці новага гаспадара, Алесь з Волькай і маленькім сынам вярнуўся ў Янкавіны, каб назаўсёды адысці ад палітыкі і быць настаўнікам. Ды яго зноў чакала новае расчараванне: яго, як і многіх настаўнікаў з «усходніх крэсаў», паслалі на курсы, трохі падвучылі польскай мове, гісторыі і культуры ды накіравалі ў Польшчу, а сюды перакінулі настаўнікаў-палякаў.

Алесь не зажадаў апалячвацца, вярнуўся ў Янкавіны. У школу яго, канечне, не дапусцілі.

У 1926 годзе, аддаўшы Янку сваю гаспадарку, ён зноў пакінуў свае Янкавіны.

У Мінску сустрэлі ласкава. Яго ўзялі на работу інспектарам у гарана, Вольку — рабочай на хлебапякарню. Але шчасліва пражылі мала. У 1930-м яго арыштавалі і выслалі ў Вятку. Верная Волька з дзецьмі паехала за ім услед. У Вятцы працаваў бібліятэкарам, цесляром, бетоншчыкам. У 1938-м яго, хворага, знямоганага духам, прывезлі ў Мінск на перасуд, а неўзабаве расстралялі. Дзе і як ён пахаваны, ніхто не ведае.

Алесеў сын загінуў на фронце ў сорак другім годзе, дачка, зведаўшы пекла жыцця «члена сям'і ворага народа», пасля 1956 года вярнулася ў Беларусь, працавала бухгалтарам, цяпер — на пенсіі, жыве разам са старэнькай маці.

У 1958 годзе Алеся рэабілітавалі, але дачка і маці ўведалі пра гэта толькі ў 1988-м. Усе яго рукапісы, плён творчай працы за 25 гадоў, дзесьці зніклі.

Гіполь — старэйшы сын Нямкевічаў. Яшчэ да палякаў аддзяліўся. Жыў па-серадняцку, меў пяцёра дзяцей. Усё жыццё, выпіўшы чарку, помсціў жонцы, Ядзі, за яе некаляшнюю здраду, «за казачка». Як і многія ў Янкавінах, перайшоў у каталіцкую веру. Раптоўна, ад сардэчнага прыступу, памёр у 1951 годзе, калі толькі што ўтвораны янкавінскі калгас імя Карла Маркса ўзяў у яго адну з дзвюх кароў, каня, гумно, калёсы, плуг і абрэзаў яго поле.

Ясік — Гіполеў сын, Янкаў і Алесеў любімец. У 1930-м падаўся ў БССР, да дзядзькі Алеся, з тоўстым сшыткам вершаў. Але дзядзькі ўжо не заспеў, яго прытуліла дзядзькава жонка, Волька.

Умудроная перыпетыямі свайго цяжкага жыцця, яна падвучыла Ясіка памяняць прозвішча і пайсці працаваць на завод. Папрацаваўшы крыху, абвыкшыся, Ясік пачаў друкавацца і хутка сцвердзіўся як малады таленавіты паэт.

У 1935-м, калі ажаніўся, чакаў першую кнігу, яго рэпрэсіравалі. Яго жонка неўзабаве нарадзіла сына, пасумавала год-другі і выйшла замуж за другога. У 1946-м Ясік вярнуўся на радзіму, два гады працаваў на Віцебшчыне на будоўлі, а ў 1948-м зноў над прымусам паехаў у «далёкія краі». Там, за Магаданам, і загінуў, кажуць, на самым пачатку пяцідзесятых гадоў.

Кастуся — дачка Нямкевічаў. Мела адзін трагічны лёс з любімым братам Янкам.

Зося Гарбацэвіч. Была па-свойму шчаслівая і нешчаслівая. Бог шчодра даў ёй хараства, жаноцкасці — люба было зірнуць на яе спрытныя ногі, на вабныя клубы, на пышныя грудзі альбо на мілы твар, люба было адчуваць яе багатую душу,— даў ёй хлеба і да хлеба, але пашкадаваў лепшай долі. Колькі ні жыла, пакутавала з Віцем, цягнулася да Янкі Нямкевіча, з якім па-сапраўднаму зведвала грэшнае, але шчаслівае каханне, жыццё. Якраз ад яго нарадзіла яшчэ дваіх дзяцей.

Калі ў 1937 годзе памерлі састарэлыя свёкар і свякроў (у той год у Янкавінскай школе забаранілі ўрокі беларускай мовы, якую к гэтаму часу пакрыху выціснулі з усіх павятовых школ, разагналі Таварыства беларускіх школ), узяла ўсю гаспадарку ў свае рукі.

У верасні 1939-га яе, Віцю, дзяцей і старэйшага сына з маладою жонкай вывезлі з вёскі як «кулацкую сям'ю». Дзе яны пасля дзеліся, ніхто не ведае.

Уладак Дземідовіч і Гарбуковіч. У 1921 годзе вярнуліся з польскага войска і, само па сабе зразумела, атрымалі прывілеі, надзелы зямлі, як і прыезджыя польскія асаднікі. Жылі заможна, але крыва, са здзекам з вёскі, асабліва з Чорных. Памагалі ўладам утрымліваць вёску ў пакоры, душылі ў ёй усё беларускае і праваслаўнае.

У верасні 1939-га над канвоем паехалі ў Сібір. Выжылі. Пасля вайны перабраліся жыць у ПНР — «як палякі».

Чорныя. Гэты галіністы янкавінскі род гібеў і пры панскай Польшчы, перабіваўся з хлеба на квас на найміцкай і парабкоўскай рабоце. Адны з вёскі не перайшлі ў каталіцкую веру, засталіся ў праваслаўнай і пісаліся беларусамі.

Пасля вайны маладыя Супраневічы і Вайтковічы раз'ехаліся па ўсіх кутках Савецкага Саюза, абруселі, пажаніліся з рускімі, фінкамі, татаркамі, казашкамі, чукчамі. Тыя, хто застаўся ў Янкавінах,— жывёлаводы. Працуюць добра, але бяда: шмат п'юць.

Пятрусь Супрыневіч. Пачаўшы служыць у міліцыі ў 1917 годзе, застаўся ў органах НКУС, дарос да падпалкоўніка. Меў цяжкую долю памагаць знішчаць лепшых людзей са свайго народа. У 1938-м самога расстралялі як «ворага народа».

Фрунзе. Як вядома, выехаў з Мінска восенню 1917-га. У гады грамадзянскай вайны праславіўся як палкаводзец, як буйны дзяржаўны дзеяч. Пазней мог быць на самых высокіх партыйных і дзяржаўных савецкіх пасадах, але ў 1925 годзе памёр на аперацыйным стале.

Мяснікоў. Нямала зрабіў, каб прышчапіць, умацаваць Савецкую ўладу ў Мінску і ва ўсім Паўночна-Заходнім краі. Займаючы тут высокія партыйныя і дзярлеаўныя пасады, зацята не прызнаваў беларускі народ як народ, яго права на сваю дзяржаўнасць, рабіў усё, што мог, каб не было Савецкай Беларусі. У 1921 годзе, калі Савецкая Расія і Польшча замірыліся, калі вырашыўся лёс Беларусі, якая была распалавіненая, сувязі Мяснікова з Беларуссю абарваліся. Яго паслалі ўмацоўваць Савецкую ўладу ў Арменіі. У 1925-м загадкава загінуў у авіяцыйнай катастрофе.

Яго імем назвалі вуліцу, плошчу, завод у Мінску. Выношваецца задума паставіць яму помнік — дзіўны знак падзякі ад рэспублікі, якой ён варожа не хацеў.

Ландар. Будучы старшынёй СНК Заходняй вобласці, ён быў адным з тым, хто рашыў у снежні 1917-га разагнаць сілай Усебеларускі з'езд, хоць на ім была значная і левая, сацыялістычная плынь. З лютага 1918 года яго сцежкі-дарожкі павялі ў бок ад Беларусі, быў на другіх і трэціх ролях. Кажуць, прасіўся ў Мінск, дзе мог бы быць і на першых.

Яго не стала ў 1937-м. У Мінску ёсць вуліца ягонага імені.

Кнорын. Паплечнік Ландэра і Мяснікова. Нямала намог сцвердзіцца Савецкай уладзе на беларускай зямлі, але побач з Мясніковым змагаўся з усіх сіл, каб не ўтвараць беларускую савецкую дзяржаву, быў за тое, каб не развіваць нацыянальнае, а разбураць яго.

У 1927-1928 гадах дарос да першага сакратара ЦК КП(б)Б. Апрача добрага, нямала зрабіў і для таго, каб падрыхтаваць рэпрэсіі на беларускіх партыйных і савецкіх дзеячаў, пісьменнікаў, вучоных, сялян.

Паў у 1938-м. Яго імем названа мінская вуліца.

Цішка Гартны (Зм. Жылуновіч) — яркі прыклад таго, як разнявольіў, падняў чалавека Вялікі Кастрычнік. Рабочы, пісьменнік, Цішка Гартны, усёй сваёй плоццю ўспрыняўшы ленінскія ідэі і ў 1918-м стаўшы бальшавіком, уяго ў першы год Савецкай улады вырас у буйнага грамадскага і дзяржаўнага дзеяча. Ведучы палемічную вайну з БНР, спрачаючыся з Мясніковым і са Сталінам, гуртуючы вакол сябе беларускіх камуністаў, сярод якіх амаль усе былі рабочымі, сялянамі, ён зрабіў выключна шмат для таго, каб спачатку падрыхтаваць думку для абвяшчэння, а пасля і абвясціць Савецкую Беларусь.

Мала ён пакіраваў беларускім урадам, усяго нейкі месяц, але той падмурак, які ёп заклаў, трымае нас і цяпер. Пазней Цішка Гартны працаваў як выдавец, рэдактар і пісьменнік. Амаль пастаянна ашальмоўваўся, а ў 1937-м у сталінскіх засценках яго давялі да страшнай гібелі.

Аднаўлены ў партыі толькі ў 1988 годзе. Названы ягоным імем вуліцы, але помніка ў Мінску яму пакуль што няма.

Чарвякоў. Доўга, займаючы высокія пасады ва ўрадзе БССР, паказваў прыклад, як трэба сыну народа дбаць пра свой народ. Але бязлітасная сталінская сістэма не толькі не дала разгарнуцца, але ламала, глушыла ў ім усё чалавечае, а ў 1937-м гвалтам абарвала яму жыццё.

Чарвякоў варты таго, каб Мінск ушанаваў яго помнікам.

Скарынка, Лагун, Усціловіч, Дыла, Чарнушэвіч, Шантыр, Квачанюк, Фальскі, Клыш, Хрэнаў, Няцэцкі, Дзедзя, Крыцкі, Салтынаў, Жукоўскі, Рыбак, Савуніч, Блізнюк, Мазур, Балбека, Драка-Дракон і ікні, і інш. Яны ў цяжкім 1918 годзе згуртаваліся вакол Белнацкома і Белкамсекцый, памаглі дабіцца законнага права беларускага народа на сваю дзяржаўнасць, некаторыя з іх былі ў першым урадзе, але мы сёння, на вялікі свой сорам, амаль нічога не ведаем пра тых, хто падбаў пра нас у тыя далёкія, віхурныя гады, а пазней, можа, жыццём паплаціўся за гэта...

Васілевіч у 20-я гады звязаў свой лёс з Інбелкультам, пісаў успаміны, артыкулы па беларускім рэвалюцыйным руху, апавяданні.

Часта, як амаль і ўсе, хто пачынаў тварыць да рэвалюцыі, меў на арэхі ад тагачасных маладых пісьменнікаў «за дзядоўшчыну».

У 1930-м яго арыштавалі як «нацдэма», судзілі і вывезлі на Калыму. Праз тры гады зайшоўся ад голаду і хвароб.

Лашкевіч. Яшчэ ў 1919-м парваў з БНР, прызнаў Савецкую ўладу, адышоў ад палітыкі і займаўся мовазнаўствам. Стаў прафесарам, аўтарам некалькіх арыгінальных кніг. У 30-я гады яго бязлітасна цкавалі за «буржуазнасць», за «нацыяналізм», у 1935-м рэпрэсіравалі. Загінуў у адным з сібірскіх лагераў перад пачаткам другой сусветнай вайны. Хоць сказана, што за ім, як і за Васілевічам, «няма саставу злачынства», але яго імя асобныя бессардэчныя «а ля вучоныя» ашальмоўваюць і цяпер.

Муха. У 30-я гады гісторык-акадэмік. Расстраляны ў 1937-м.

Нядоля. Памёр ад сухотаў у 1920-м. Доўга лічыўся польскім агентам, ворагам Савецкай улады. Справядлівасць перамагла толькі ў 1988-м, калі выйшла адзіная кніга яго паэзіі, што вярнула аўтару добрае імя.

Ян Ланкійскі памёр у 1919 годзе за мяжой ад сухотаў. Адносіны да яго дваістыя.

Антон Лапкінскі. У 1919 годзе, будучы адным з лідэраў Рады БНР, спрабаваў паразумецца з Пілсудскім, дабіцца аўтаноміі Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай. Калі паразуменне не выйшла, адышоў ад палітыкі, займаўся навукай, культурай, пісаў успаміны, выкладаў у гімназіі.

У 1939-м, калі заходняя і ўсходняя беларускія землі аб'ядналіся ў БССР, прызнаў Савецкую ўладу і быў гатовы з ёю супрацоўнічаць, але неўзабаве яго зняволілі і ўжо ў даволі пажылым узросце паслалі ў сібірскія лагеры зведаць усе кругі дантавага пекла. Памёр адразу пасля вайны. Цяпер, у 1989-м, прызналі, што і за ім «няма саставу злачынства». Але некаторыя вучоныя-грамадазнаўцы па-ранейшаму настроены супраць яго варожа.

Д з е д з я. Памёр на 97-м годзе свайго жыцця як «ціхі пенсіянер».

Скураны. На пачатку 20-х гадоў дабіваўся аўтаноміі Беларусі ў складзе Рэчы Паспалітай, а пасля ўвайшоў у польскі ўрад і служыў яму. У 1939-м недзе знік, як скрозь зямлю праваліўся.

Я н к а в і н ы (168 двароў) у 1943 годзе, у блакаду, згарэлі, а іхніх ацалелых людзей фашысты вывезлі ў Германію. Адрадзіліся ў канцы саракавых гадоў (цяпер у іх 65 хат). Вёска, як і ўся Беларусь, а таксама як і ўся акупаваная фашызмам савецкая зямля, у гады вайны і нейкі час пасля яе аб'яўлялася Сталіным «не внушающей

доверия» — усяго разам гэта амаль 70 мільёнаў чалавек, трэць даваеннага савецкага люду.

Падзеі, чалавечыя лёсы, лёсы, лёсы... Колькі яшчэ трэба расказаць пра наш зялёны, рачны і азёрны запарушаны чарнобыльскай бядой край, пра нашых добрых, працавітых і цярплівых людзей, пра маіх янкавінцаў!

1987-1989

© OCR: Камунікат.org, 2012
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2012
© PDF: Камунікат.org, 2012

Далідовіч Г.

Свой дом: Рамай,— Мн.: Маст. літ., 1992.— 351 с.: 4 л. іл.

ISBN 5-340-00678-6.

Новы раман вядомага пісьменніка Генрыха Далідовіча «Свой дом» заканчвае трылогію «Гаопадар-камень». У цэнтры аўтарскай увагі — драматычныя падзеі 1918 года, калі ўтварылася беларуская дзяржаўнасць, зараджалася рэспубліка. Сярод герояў рамана — вядомыя імёны: Зм. Жылуновіч, А. Чарвякоў, А. Мяснікоў. І. Сталін і іншыя. Аўтар выкарыстаў шмат новых архіўных матэрыялаў, якія нямала часу знаходзіліся ў спецсховах.